Міністрэства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт”

Витебский государственный технологический университет

**А.А. Субоцін**

# СТАХАНАЎСКІ РУХ ЯК САЦЫЯКУЛЬТУРНЫ ФЕНОМЕН САВЕЦКАГА ГРАМАДСТВА (1935 – 1941 ГГ.): НА МАТЭРЫЯЛАХ БССР

Манаграфія

Віцебск
2016

УДК 94(476)
ББК 63.3(2)614(4Беи)
С 89

Рэцэнзенты:
Люты А. М., прафесар кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў УА "БДПУ імя М. Танка", доктар гістарычных навук, прафесар;
Дулаў А. М., загадчык кафедры гісторыі Беларусі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Рэкамендавана да выдання рэдакцыйна-выдавецкім саветам УА "ВДТУ", пратакол № 7 ад 28 верасня 2016 г.

**Субоцін, А. А.**
С 89 Стаханаўскі рух як сацыякультурны феномен савецкага грамадства (1935 – 1941 гг.) : на матэрыялах БССР : манаграфія / А. А. Субоцін. – Віцебск : УА "ВДТУ", 2016. – 181 с.

ISBN 978-985-481-458-2

Манаграфія прысвечана аднаму з ключавых феноменаў савецкага грамадства – стаханаўскаму руху, які набыў шырокае распаўсюджванне ў БССР у 1935 – 1941 гг. На падставе вялікага кола архіўных і друкаваных крыніц разглядаюцца сацыяльна-эканамічныя, псіхалагічныя і палітычныя аспекты разгортвання гэтай формы сацыялістычнага спаборніцтва. Паказаны ўплыў стаханаўскага руху на фарміраванне культуры штодзённасці і сацыяльныя паводзіны тагачасных працоўных.
Для гісторыкаў, выкладчыкаў і студэнтаў ВНУ, усіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі савецкага перыяду.

**УДК 94(476)**
**ББК 63.3(2)614(4Беи)**

**ISBN 978-985-481-458-2**
© УА «ВДТУ», 2016

Витебский государственный технологический университет

# ЗМЕСТ

**Пералік умоўных скарачэнняў** ........................................................4
**Уводзіны** ...................................................................................5
**Глава 1.** Гістарыяграфія, крыніцы і метады даследавання.......................9
1.1 Гістарыяграфія пытання.......................................................................9
1.2 Крыніцы. Метады даследавання ........................................................17
**Глава 2.** Стаханаўскі рух і становішча стаханаўцаў у грамадстве .........26
2.1 Разгортванне стаханаўскага руху ў БССР і
яго ўплыў на эканоміку ............................................................................26
2.2 Асаблівасці статусу стаханаўцаў, іх сацыяльная мабільнасць і
роля ў грамадска-палітычным жыцці .........................................................47
2.3 Сацыяльна-псіхалагічная характарыстыка стаханаўцаў:
матывацыя паводзін і працы, каштоўнасныя арыентацыі,
успрыманне ў працоўных калектывах ......................................................72
**Глава 3.** Матэрыяльна-бытавое становішча і
ўмовы жыцця стаханаўцаў ....................................................................... 92
3.1 Матэрыяльныя ўмовы жыцця.................................................................92
3.2 Арганізацыя вольнага часу ..................................................................111
**Заключэнне**. ............................................................................................130
**Бібліяграфічны спіс**.................................................................................135
**Дадаткі** ....................................................................................................167

Витебский государственный технологический университет

# ПЕРАЛІК УМОЎНЫХ СКАРАЧЭННЯЎ

**БДАКФФД** – Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў
**БССР** – Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка
**ДАВВ** – Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці
**ДАГАМВ** – Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці
**ДАГомВ** – Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці
**ДАМВ** – Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці
**ЗДА у г. Полацку** – Занальны дзяржаўны архіў у горадзе Полацку
**ІТР** – інжынерна-тэхнічныя работнікі
**калгас** – калектыўная гаспадарка
**КП(б)Б** – Камуністычная партыя бальшавікоў Беларусі
**леспрамгас** – лясная прамысловая гаспадарка
**МТС** – машынна-трактарная станцыя
**НАРБ** – Нацыяльны архіў Рэспублікі Беларусь
**прафсаюз** – прафесійны саюз
**саўгас** – савецкая гаспадарка
**Саюзмалтрэст** – Усесаюзны дзяржаўны трэст малочных саўгасаў
**СНК** – Савет народных камісараў
**СССР** – Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік
**УКП(б)** – Усесаюзная камуністычная партыя бальшавікоў
**ЦВК** – Цэнтральны Выканаўчы Камітэт
**ЦК** – Цэнтральны Камітэт
**ЦСПСБ** – Цэнтральны савет прафесійных саюзаў Беларусі

Витебский государственный технологический университет

# УВОДЗІНЫ

Вызначальнай рысай дзяржаўнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь на сучасным этапе з'яўляецца заахвочванне дзейнасці чалавека ў вытворчай і невытворчай сферах жыцця грамадства. Тым самым падтрымліваецца актыўнасць беларускіх грамадзян у ажыццяўленні далейшых сацыяльна-эканамічных і культурных пераўтварэнняў у нашай краіне. Характэрным прыкладам дзяржаўнай падтрымкі такой актыўнасці з'яўляецца штогадовае правядзенне конкурсаў на званне "Чалавек года" па асобных рэгіёнах рэспублікі, калі вызначаюцца імёны людзей, што дасягнулі самых лепшых вынікаў у рэалізацыі сацыяльнай і эканамічнай палітыкі дзяржавы, ажыццяўленні мер па забеспячэнні законнасці і правапарадку, у галіне навукі і культуры, а таксама пры ажыццяўленні грамадскай працы. У Беларусі актыўна ажыццяўляецца падтрымка лепшых работнікаў Аграпрамысловага комплексу, якія перамаглі ў спаборніцтвах па дасягненні лепшай ураджайнасці па рэспубліцы.

Правядзенне падобных мерапрыемстваў з'яўляецца па сутнасці пераймannем у змененым выглядзе некаторых форм арганізацыі працоўнай актыўнасці савецкага часу. Таму для ўдасканалення сістэмы дзяржаўнага заахвочвання дзейнасці членаў соцыуму ў разнастайных сферах грамадскага жыцця, далейшага выяўлення патэнцыялу спецыялістаў узнікае неабходнасць вывучэння асаблівасцяў развіцця форм сацыялістычнага спаборніцтва ў БССР, а ў прыватнасці, яго сацыяльных складнікаў, якія датычыліся становішча перадавікоў у грамадстве, матывацыі паводзін чалавека ў вытворчасці і зменаў у яго штодзённым жыцці па выніках актыўнай прафесійнай дзейнасці. Апошняя акалічнасць з'яўляецца найбольш важным пытаннем для сучаснага грамадства, бо сёння якраз матэрыяльныя ўзнагароды і павышэнне ўзроўню жыцця вылучаюцца для людзей на першае месца пры ажыццяўленні любой працы і займаюць цэнтральнае месца пры ажыццяўленні дзяржаўнай палітыкі.

Адной з самых характэрных форм сацыялістычнага спаборніцтва, безумоўна, з'яўляўся стаханаўскі рух, што зарадзіўся ў сярэдзіне 1930-х гг. і быў найвышэйшым праяўленнем савецкага працоўнага энтузіязму. Магчыма таму да сённяшняга часу ў мове захавалася дэфініцыя "стаханавец", якая сімвалічна выкарыстоўваецца ў дачыненні да людзей, што праяўляюць звышактыўную працоўную дзейнасць, нярэдка гэта азначэнне носіць іранічны характар, што звязана з асаблівасцямі ўспрымання стаханаўскага руху яшчэ ў другой палове 1930-х гг., якія сталі вынікам негатыўных з'яў ў працэсе разгортвання дадзенай формы сацыялістычнага спаборніцтва ў працоўных калектывах.

Витебский государственный технологический университет

Ранейшае вывучэнне стаханаўскага руху было абумоўлена, як правіла, наяўнасцю моцнага ідэалагічнага фактару, калі на першае месца ставіўся пафас гераічных здзяйсненняў стаханаўцаў, факты іх працоўных подзвігаў, вызначалася вялікая роля перадавікоў у ажыццяўленні эканамічных задач, якія ставілі партыя, камсамол і ўрад, пры гэтым сацыяльная праблематыка руху, звязаная з асаблівасцямі становішча яго ўдзельнікаў як асобнай катэгорыі грамадства, іх псіхалагічнымі рысамі, матывамі праяўлення вытворчай актыўнасці, а таксама са спецыфікай іх штодзённага жыцця заставалася маладаследаванай. З-за ідэалагічных прычын не былі прааналізаваны і некаторыя эканамічныя праблемы разгортвання стаханаўскага руху, звязаныя з яго ўплывам на вытворчыя працэсы і недахопамі пры арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва.

Асновай для вывучэння феномена стаханаўскага руху намі быў выкарыстаны сацыякультурны падыход, які заключаецца ў разуменні грамадскіх працэсаў як сінтэзу культуры і сацыяльнасці, што ўтвараюцца дзейнасцю чалавека. Культура ў дадзеным выпадку разумецца ў якасці сукупнасці як матэрыяльных умоў жыцця, так і духоўных складаючых: норм, каштоўнасцяў, вобразаў, якімі валодаюць асобы, што ўступаюць ва ўзаемаадносіны паміж сабой і раскрываюць такія значэнні, а сацыяльнасць – як адносіны аднаго індывіда з іншымі суб’ектамі ў межах эканамічных, сацыяльных, палітычных і ідэалагічных працэсаў [206, с. 3 – 4]. У гэтай сувязі стаханаўскі рух разглядаецца намі не толькі як з’ява чыста эканамічная, але і як сукупнасць сацыяльных адносін, праяўлення савецкіх каштоўнасцяў і норм, як спроба стварэння новага тыпу чалавека, які служыў бы эталонам у працы, грамадскім жыцці, побыце.

Важным пры вывучэнні стаханаўскага руху як сацыякультурнага феномена будзе выкарыстанне тэрмінаў, што прымяняюцца ў сацыялогіі. У прыватнасці, для апісання сацыяльных працэсаў у межах разгортвання стаханаўскага руху намі прымяняліся азначэнні сацыяльны статус і сацыяльная мабільнасць. Сацыяльны статус разумеецца як інтэграваны паказчык становішча сацыяльнай групы і яе прадстаўнікоў у грамадстве, у сістэме сацыяльных сувязей і адносін [194, с. 388]. Так, у ходзе развіцця стаханаўскага руху ў грамадстве паралельна адбываўся працэс фарміравання асобнай катэгорыі працоўных – стаханаўцаў, што валодалі высокім сацыяльным статусам, на аснове якога дзяржаўная прапаганда стварала новыя гераічныя вобразы. З сацыяльным статусам стаханаўцаў цесна былі звязаны працэсы сацыяльнай мабільнасці, што вызначаецца сацыёлагам П. Сарокіным як пераход індывіда або сацыяльнай групы з адной сацыяльнай пазіцыі ў іншую [412, с. 373]. Калі карыстацца вызначэннем П. Сарокіна, то для стаханаўцаў была характэрна ўзыходзячая плынь



Витебский государственный технологический университет

сацыяльнай мабільнасці, калі адбываецца пранікненне індывіда ці групы з ніжняга пласта грамадства ў больш высокі пласт [412, с. 374]. У нашым выпадку перадавікі пераходзілі у катэгорыі ІТР і гаспадарчых кіраўнікоў, што стаялі ў сацыяльнай структуры на ступень вышэй за працоўных. Разгляд асаблівасцяў сацыяльнага статусу і сацыяльнай мабільнасці стаханаўцаў неабходна звязаць і з іх удзелам у грамадска-палітычным жыцці.

Па прычыне таго, што для даследавання мы вызначылі ў шэрагу важных праблем культуру як сукупнасць норм, каштоўнасцяў і стэрэатыпаў, безумоўна, што нам неабходна зрабіць сацыльна-псіхалагічную характарыстыку ўдзельнікаў стаханаўскага руху ў якасці адметнага тыпу асобы тагачаснага грамадства, дзе трэба больш шырока раскрыць матывацыю вытворчага энтузіязму і знайсці яго вытокі, што, у сваю чаргу, прадугледжвае і выяўленне асаблівасцяў каштоўнасных арыентацый і жыццёвых установак перадавікоў, стратэгій іх паводзінаў. Працэс разгортвання стаханаўскага руху павінен быць прааналізаваны праз прызму самаго працоўнага чалавека з яго ўнутранымі памкненнямі, спецыфікай свядомасці і адносінамі да рэчаіснасці.

У кантэксце вывучэння культуры і для вызначэння стаханаўцаў як працоўнай эліты, выяўлення матэрыяльных стымулаў разгортвання стаханаўскага руху неабходным з'яўляецца дэталёвае і падрабязнае даследаванне іх матэрыяльна-бытавога і культурнага становішча, спецыфіка чаго таксама абумоўлівалася пэўнымі нормамі паводзін і каштоўнасцямі ў адносінах да сваёй побытавай прасторы. У рамках вывучэння штодзённага жыцця вялікая ўвага надаецца характару ўспрымання побыту чалавекам, або, па вызначэнні нямецкага гісторыка А. Людтке, разнастайным спосабам, з дапамогай якіх індывіды і сацыяльныя групы выражаюць свае адносіны да тых ці іншых сфер жыцця [225, с. 83]. У выніку пры даследаванні штодзённага жыцця стаханаўцаў нам важна будзе ўлічваць спецыфіку як іх матэрыяльных умоў існавання па-за вытворчай дзейнасцю, што ў большасці сваёй падтрымліваліся з боку дзяржавы, так і працэсы засваення культуры і духоўнага ўзбагачэння, асаблівасці індывідуальнага асэнсавання змен у сваім вобразе жыцця і суаднясенне іх са сваімі жыццёвымі стратэгіямі, што акрэсліваліся набыццём новых высокіх сацыяльных статусаў, а таксама звязваліся са стымуламі далейшага ўдасканалення працы.

Мэтай дадзенага даследавання з'яўляецца раскрыццё асаблівасцяў стаханаўскага руху 1935 – 1941 гг. як сацыякультурнага феномена савецкага грамадства на прыкладзе яго разгортвання ў БССР.

Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя задачы:

- вызначыць асаблівасці працэсу разгортвання стаханаўскага руху ў БССР і паказаць яго ўплыў на эканамічнае развіццё;



Витебский государственный технологический университет

- выявіць характэрныя рысы статусу стаханаўцаў у грамадстве і спецыфіку іх сацыяльнай мабільнасці, ролю, якую яны выконвалі ў грамадска-палітычным жыцці;

- даследаваць асноўныя сацыяльна-псіхалагічныя рысы, матывацыю вытворчага энтузіязму стаханаўцаў;

- разглядзець асаблівасці матэрыяльнага забеспячэння стаханаўцаў як стымулы да ўдасканалення працы;

- прасачыць адметнасці арганізацыі вольнага часу стаханаўцаў і формы яго баўлення.

Аб’ектам даследавання з’яўляецца стаханаўскі рух у БССР у 1935 – 1941 гг.

Прадметам даследавання – сацыяльныя і культурныя працэсы, што адбываліся ў рамках разгортвання стаханаўскага руху.

Ніжняй храналагічнай мяжой даследавання з’яўляецца канец жніўня 1935 г. – момант зараджэння стаханаўскага руху ў галінах прамысловасці і сельскай гаспадаркі, верхняй мяжой служыць чэрвень 1941 г., які быў азнаменаваны пачаткам Вялікай Айчыннай вайны і прыпыненнем савецкіх эканамічных пераўтварэнняў у БССР у сувязі з нямецкай акупацыяй.

Геаграфічнымі рамкамі даследавання прынята тэрыторыя Беларускай ССР у межах 1926 г., якая ў 1939 г. была ўзбуйнена землямі Заходняй Беларусі ў складзе Баранавіцкай, Беластоцкай, Брэсцкай, Вілейскай і Пінскай абласцей.

Витебский государственный технологический университет

# ГЛАВА 1
# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПЫТАННЯ, КРЫНІЦЫ І МЕТАДЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

## 1.1 Гістарыяграфія пытання

Першыя даследаванні ў СССР па стаханаўскаму руху з’явіліся ў 1935 –1941 гг. ва ўмовах яго зараджэння і развіцця. У іх закраналіся пераважна эканамічныя аспекты, вывучаліся метады гэтай формы сацыялістычнага спаборніцтва, пытанні ўдасканалення сістэмы планавання, праводзіўся параўнаўчы аналіз сацыялістычнай і капіталістычнай эканомікі, разглядалася праблематыка далейшай рэалізацыі ленінскіх ідэй і ролі камсамольскай моладзі ў руху [23, 128, 186, 199, 200, 232, 326, 359]. У падобным жа кантэксце адбывалася вывучэнне стаханаўскага руху і беларускімі даследчыкамі, якія прааналізавалі асаблівасці яго развіцця ў асобных галінах прамысловасці і сельскай гаспадаркі БССР, паказалі яго станоўчую ролю ў павышэнні прадукцыйнасці працы, зніжэнні сабекошту і значным паляпшэнні матэрыяльнага становішча працоўных [172, 229, 234, 401, 474]. Працы даследчыкаў адзначанага перыяду мелі практычны характар і ставілі перад сабой мэту даследавання патэнцыялу савецкай эканомікі, а таксама шырокага распаўсюджвання стаханаўскіх метадаў працы.

У савецкай гістарыяграфіі 1950 – 1980-х гг. даследаванне праблемы сацыялістычнага спаборніцтва, у тым ліку і стаханаўскага руху, значна актывізавалася, што тлумачылася неабходнасцю ідэалагічнага абгрунтавання далейшага развіцця форм вытворчага энтузіязму сярод працоўных СССР. Так, аднымі з першых сацыялістычнае спаборніцтва як грамадскую з’яву прааналізавалі ў сваіх працах І. Чанглі і Г. Еўстаф’еў [129, 471], дзе вызначалі яго ў якасці рухаючай сілы працэсу станаўлення сацыялістычнай эканомікі і савецкага грамадства ў цэлым. З цягам часу з’яўляюцца даследаванні, прысвечаныя непасрэдна гістарычнаму развіццю форм сацыялістычнага спаборніцтва ў СССР. Сярод такіх даследаванняў можна вылучыць працы І. Варажэйкіна, Н. Лебедзевай, А. Шкаратана, У. Казлова [39, 40, 180, 208]. Гэтыя даследчыкі адзначалі, што толькі рабочы клас здольны да ініцыятывы разгортвання стаханаўскага руху, а сам рух з’яўляецца сацыльна-палітычным феноменам, уласцівым толькі савецкаму строю. Больш дэталёва праблему стаханаўскага руху разглядзела ў сваёй манаграфіі Л. Рагачэўская [389]: даследчыца прасачыла пераемнасць стаханаўскага руху з папярэднімі формамі сацыялістычнага спаборніцтва і вызначыла стаханаўцаў як новы тып рабочых, што ў вышэйшай ступені авалодаў тэхнічнымі ведамі. Грунтоўным

Витебский государственный технологический университет

дэследаваннем праблемы развіцця стаханаўскага руху з’яўляецца таксама праца В. Сахарава [398], у якой ён на прыкладзе аўтатрактарнай прамысловасці СССР паказаў, што разгортванне стаханаўскага энтузіязму стала магчымым дзякуючы паляпшэнню матэрыяльнага становішча рабочых і якаснай сістэме падрыхтоўкі кадраў, а вызначальную ролю ў першапачатковым развіцці руху надаваў дзейнасці прафсаюзных арганізацый. Аўтар таксама даў сацыяльна-псіхалагічную характарыстыку стаханаўцаў як тыповых людзей сацыялістычнага грамадства, але абмежаваўся толькі пералікам некаторых іх асабовых рыс, закладзеных ў аснову актыўнай вытворчай дзейнасці. Спроба даць сацыяльную характарыстыку стаханаўцаў на прыкладзе прадпрыемстваў Ленінграда была зроблена Р. Хабібулінай у адным са сваіх артыкулаў [464]. Даследчыца вызначыла высокую долю партыйнай праслойкі сярод перадавікоў і паказала, што палова ўдзельнікаў руху мела вялікі працоўны вопыт. Са спецыяльных даследаванняў, прысвечаных непасрэдна стаханаўскаму руху, можна вылучыць таксама шэраг прац, што разглядаюць вытворчы подзвіг асобна ўзятых стаханаўцаў на аснове апісання іх біяграфій [56, 328]. Акрамя пералічаных даследаванняў былі выдадзены калектыўныя манаграфіі па тэме сацыялістычнага спаборніцтва [161, 414], дзе быў дадзены агульны аналіз разгортвання стаханаўскага руху як вышэйшай ступені аваладоння тэхнікай і вызначаны яго ўплыў на павышэнне колькасных і якасных паказчыкаў у прамысловасці.

Вялікі пласт сярод даследаванняў гісторыкаў савецкага перыяду, дзе разглядалася тэма стаханаўскага руху і вытворчага энтузіязму стаханаўцаў, займаюць працы, прысвечаныя праблемам эканамічнага развіцця СССР у другой і трэцяй пяцігодках [162, 163, 190, 198, 340, 413, 465, 466, 480], сацыялістычнай індустрыялізацыі [214, 215, 218], а таксама станаўленню і развіццю савецкага рабочага класа [30, 35, 121, 386, 402, 403, 408, 461]. У адзначаных даследаваннях стаханаўскі рух вызначаўся як важны сродак павышэння тэмпаў эканамічнага росту СССР і пабудовы сацыялізму. Савецкія гісторыкі паказалі станоўчы ўплыў сацыялістычнага спаборніцтва на тэхнічную рэканструкцыю прамысловасці, прыводзілі факты значнага павелічэння колькасці стаханаўцаў, на аснове чаго сведчалі пра фарміраванне высокай культуры сацыялістычнай працы ў рабочага класа. У падобным жа кантэксце праблема сацыялістычнага спаборніцтва разглядася пры вывучэнні станаўлення саўгасаў і калгасаў СССР [46, 47, 148], дзе стаханаўскі рух не быў асобна прааналізаваны, а былі толькі прыведзены прыклады працоўнага энтузіязму сялян у якасці важнага ўкладу ў развіццё сацыялістычных форм гаспадарання ў вёсцы.

Значная колькасць прац савецкіх гісторыкаў 1950 – 1980-х гг. была прысвечана праблемам ролі партыі і камсамола ў разгортванні

Витебский государственный технологический университет

стаханаўскага руху [55, 149, 157, 158, 209, 217, 440], паказваліся вядучыя пазіцыі гэтых палітычных інстытутаў у справе арганізацыі новай формы сацыялістычнага спаборніцтва, а таксама прыводзіліся прыклады самаадданай працы камуністаў і камсамольцаў як станоўчых прыкладаў для пераймання ў вытворчасці. У рамках праблем грамадска-палітычнага развіцця СССР было закранута і пытанне ўдзелу стаханаўцаў як лепшых прадстаўнікоў рабочага класа ў дзейнасці Саветаў, пры гэтым адзначаўся рост палітычнай свядомасці перадавікоў і іх арганізацыйных якасцяў, што ў поўнай меры адпавядалі рысам савецкага рабочага класа [377].

Некаторыя асаблівасці грамадскага аблічча стаханаўцаў былі вызначаны у даследаваннях В. Касьяненка, А. Ваксера, В. Ізмозніка [27, 191]. Гісторыкі прывялі прыклады высокіх маральных якасцяў удзельнікаў стаханаўскага руху і далі агульную характарыстыку стаханаўцаў як людзей, што былі цалкам адданыя ідэалам сацыялізму. Больш грунтоўным у гэтым плане можна лічыць артыкулы А. Удовіна і У. Дробіжава [28, 29], якія паставілі праблему фарміравання сацыяльнай псіхалогіі савецкага рабочага класа. Даследчыкі даказалі, што стаханаўцы з’яўляліся прыкладам кадравых рабочых з передавой псіхалогіяй, і станаўленне іх актыўных грамадскіх якасцяў адбылося за больш кароткі час у параўнанні з іншымі рабочымі, што было падцверджана малым працоўным стажам удзельнікаў руху. Аднак пры гэтым гісторыкамі не было вызначана, якім чынам сфарміравалася сацыяльнае аблічча перадавікоў і не былі цалкам раскрыты асаблівасці іх псіхалогіі.

Спецыфіка сацыяльнага аблічча стаханаўцаў коратка была разгледжана ў даследаваннях перыяду перабудовы, прысвечаных праблематыцы развіцця савецкага грамадства ў 1930-я гг. Так, у працы У. Казлова і А. Хлеўнюка [179] на аснове ўспамінаў стаханаўцаў і іншых грунтоўных крыніц была зроблена спроба вывучэння псіхалагічнай характарыстыкі ўдзельнікаў сацыялістычнага спаборніцтва. Аўтары імкнуліся выявіць не столькі асаблівасці развіцця руху ў эканоміцы, а колькі працоўны энтузіязм асобнага героя-стаханаўца з яго асабістым разуменнем вытворчых і сацыяльных працэсаў. У кантэксце ідэй перабудовы сацыяльныя аспекты стаханаўскага руху былі разгледжаны ў манаграфіі Л. Гардона і Э. Клапова [57]. Даследчыкі адзначылі, што антыдэмакратычны рэжым 1930-х гг. ствараў умовы непаслядоўнасці ў свядомасці і паводзінах людзей, што адлюстравалася і на характары працэсу развіцця стаханаўскага руху. Раздвоеная свядомасць, на думку аўтараў, спараджала, з аднаго боку, рэальныя імкненні часткі рабочых да творчай працы і спаборніцтва, з другога боку, нядобрасумленнасць і абыякавасць да ўсялякага актывізму.



Витебский государственный технологический университет

У беларускай гістарыяграфіі 1950 – 1980-х гг. стаханаўскі рух даследаваўся ў рамках характэрнай для савецкага часу праблематыкі. Так, у працах гісторыкаў, прысвечаных сацыяльна-эканамічнаму развіццю БССР у 1930-я гг. вылучалася станоўчая роля руху ў засваенні новых праектных магутнасцяў на прадпрыемствах і ломцы старых вытворчых нормаў, надавалася яго вялікае значанне ў пераўтварэнні Беларускай ССР у аграрна-індустрыяльную рэспубліку [177, 325, 382, 415].

У такім жа кантэксце праводзілася даследаванне стаханаўскага руху ў працах, дзе разглядалася праблема развіцця рабочага класа БССР [130, 138, 159, 160, 394, 477]. Гісторыкамі былі зроблены вывады, што рабочыя рэспублікі на аснове свайго карэннага паляпшэння матэрыяльнага становішча і культурнага ўзроўню паказалі самаадданую працу праз удзел у стаханаўскім руху, якая стала важнай умовай рэканструкцыі гаспадаркі, а ў гады трэцяй пяцігодкі аказала ўплыў на павышэнне абараназдольнасці БССР. В. Паваліхіна ў сваім артыкуле паказала рост сярод рабочых-стаханаўцаў рэспублікі вынаходніцтва і рацыяналізатарства і ўмацаванне сувязі перадавікоў з навукова-даследчымі ўстановамі [357]. Праблемы ўдзелу работніц БССР у стаханаўскім руху прасачыла ў сваіх даследаваннях А. Захватаева [144, 145], дзе толькі прывяла прыклады працоўнага гераізму жанчын і адзначыла іх уклад у станаўленне сацыялізму. Некаторыя аспекты развіцця стаханаўскага руху ў сельскай гаспадарцы закранулі ў сваіх даследаваннях А. Сарокін і М. Касцюк [189, 411]. Яны вызначылі станоўчую ролю сацыялістычнага спаборніцтва ў працэсе ўмацавання калгасаў і саўгасаў, а таксама павышэнні працоўнай актыўнасці сялянства.

Як і ў савецкай гістарыяграфіі ў цэлым, беларускія гісторыкі вялікую ўвагу надавалі вядучай ролі партыйных і камсамольскіх органаў рэспублікі ў працэсе развіцця руху [53, 231, 235, 341, 342]. У манаграфіі С. Лагуна былі вызначаны асаблівасці дзейнасці мясцовых Саветаў у арганізацыі руху на прамысловых прадпрыемствах і МТС [205]. У. Сідарцоў, разглядаючы праблему дзяржаўнай дзейнасці рабочага класа БССР, паказаў ролю сацыялістычнага спаборніцтва ў палітычным выхаванні працоўных, што прывяло да вылучэння стаханаўцаў на выбары ў вышэйшыя дзяржаўныя органы рэспублікі [404].

Пасля распаду СССР з-за ідэалагічных прычын у расійскай гістарыяграфіі знізілася цікавасць да вывучэння стаханаўскага руху і іншых форм сацыялістычнага спаборніцтва. Узнаўленне грунтоўнага даследавання дадзеных пытанняў гісторыкамі адбылося ў межах ажыццяўлення галандска-расійскага навуковага праекта “Мотивация труда в российской промышленности, 1861 – 2000 гг.: вознаграждение,

Витебский государственный технологический университет

побуждение и принуждение”. Сярод даследчыкаў, што прынялі ўдзел у дадзеным праекце, праблемы разгортвання стаханаўскага руху ў першыя пяцігодкі ў сваіх працах закрануў А. Сакалоў [409, с. 80; 410, с. 79]. Ён адзначаў, што стаханаўскі рух развіваўся галоўным чынам на прынцыпах маральнага заахвочвання рабочых, але значнае павелічэнне норм па выніках стаханаўскіх рэкордаў, тэндэнцыі “штурмаўшчыны” і заарганізаванасці зніжалі цікавасць да ўдзелу ў сацыялістычным спаборніцтве. Такія ж меркаванні былі выказаны гісторыкам і ў сумеснай з А. Маркевічам манаграфіі, прысвечанай праблемам матывацыі працоўных паводзін рабочых завода “Серп і молат” [230, с. 150]. Гісторыкі С. Жураўлёў і М. Мухін на прыкладзе аналізу матывацыі працы на Маскоўскім электракамбінаце звярнулі вялікую ўвагу на павышэнне норм і зніжэнне шкалы здзельна-прагрэсіўнай аплаты працы ў выніку разгортвання стаханаўскага руху і выявілі моцную залежнасць яго далейшага развіцця ад адмістрацыйнага ўздзеяння кіраўніцтва прадпрыемства, чым патлумачылі скачкападобны характар колькасці стаханаўцаў [132, с. 106, 120 – 124].

Стаханаўскі рух разглядаўся сучаснымі расійскімі гісторыкамі таксама ў рамках вывучэння асаблівасцяў палітычнага развіцця савецкага грамадства ў 1930-я гг. Напрыклад, А. Хлеўнюк закрануў праблему стаханаўскага руху пры даследаванні механізмаў ажыццяўлення палітычнай улады і паказаў, што інтэнсіўнае разгортванне дадзенай формы сацыялістычнага спаборніцтва стварыла ўмовы для чарговых палітычных акцый па выяўленні “ворагаў народа” сярод гаспадарчых кіраўнікоў, ІТР і рабочых [467, с. 157 – 158]. Гэтую тэму развіў М. Арнаўтаў пры вывучэнні ідэалагічных аспектаў стаханаўскага руху: ён указаў на шырокае распаўсюджванне вобразаў стаханаўцаў у перыядычным друку ў якасці важнага сродку палітычнай прапаганды, арыентаванага на пошук “ворагаў у вытворчасці” [11]. У рамках вывучэння праблемы палітычнай свядомасці сялян Рускай Поўначы ў 1930-я гг. М. Кедроў прааналізаваў механізмы ідэнтычнасці перадавікоў сельскай гаспадаркі і вызначыў апошніх як асобную сацыяльную катэгорыю, што ў структуры грамадства знаходзіліся на адным узроўні з калгаснай адміністрацыяй [175, 176].

Тэму ўдзелу жанчын у стаханаўскім руху разглядзела Ю. Касценка, якая праз аналіз асаблівасцяў жаночага руху ў Расіі ў 1920 – 1930-я гг. у якасці галоўнай прычыны ўдзелу работніц і калгасніц у сацыялістычным спаборніцтве вызначыла атрыманне імі грамадскага прызнання праз уваходжанне ў групу “знатных людзей” [188, с. 21].

Да праблемы матэрыяльнага становішча стаханаўцаў звярнулася А. Асокіна пры разглядзе асаблівасцяў сістэмы дзяржаўнага забеспячэння канца 1920-х – 1930-х гг. Высокі ўзровень матэрыяльнага забеспячэння стаханаўцаў яна адносіць да традыцый карткавай сістэмы,



Витебский государственный технологический университет

таму што, нягледзячы на ўсталяванне адкрытага гандлю ў 1935 г., усё ж захоўваўся востры дэфіцыт на некаторыя тавары і паслугі, да якіх і мелі доступ удзельнікі стаханаўскага руху [339, с. 193 – 194].

Цэласную ацэнку руху паспрабаваў даць расійскі гісторык У. Раговін у кнізе “Сталинский неонэп”, у якой адзначыў, што дадзеная форма сацыялістычнага спаборніцтва сапраўды дазволіла ўскрыць вялікі працоўны патэнцыял рабочага класа і калгаснага сялянства, дала магчымасць цалкам праявіць творчы падыход у працоўнай дзейнасці. У той жа час самай галоўнай крыніцай разгортвання руху гісторык лічыць менавіта матэрыяльнае заахвочванне працоўных [390, с. 153 – 154].

Праблематыку стаханаўскага руху праз аналіз сацыякультурнага аблічча рабочых Расіі ўзнялі ў сваёй манаграфіі С. Постнікаў і М. Фельдман [361], дзе ў адносінах да стаханаўцаў ужылі тэрмін “рабочая арыстакратыя” і вызначылі яе як вузкую прапагандысцка-сімвалічную групу рабочых, паходжанне якой было звязана больш з палітычнымі, чым з эканамічнымі фактарамі.

Тэма стаханаўскага руху была закранута ў шэрагу артыкулаў расійскіх навукоўцаў у адзнаку 80-годдзя яго зараджэння, дзе разглядаліся такія праблемы, як жыццёвы шлях асобных усесаюзнавядомых стаханаўцаў, адлюстраванне сацыялістычнага спаборніцтва ў выяўленчым мастацтве і кіно ў рамках дзяржаўнай прапаганды [14, 482, 486].

Новыя аспекты стаханаўскага руху разглядаліся ў працах некаторых сучасных беларускіх гісторыкаў. Так, гендарныя праблемы руху прааналізавалі Г. Якаўлева і А. Дулаў. На прыкладзе вывучэння становішча жанчын БССР ва ўмовах мадэрнізацыі 1930-х гг. яны выявілі змены ў сацыяльным статусе работніц, што ўдзельнічалі ў руху: стаханаўкі ўвайшлі ў склад новай рабочай арыстакратыі, якая матэрыяльна заахвочвалася і мела магчымасці прасоўвання па службовай лесвіцы. Акрамя важкіх матэрыяльных стымулаў былі адзначаны моцныя маральныя фактары ўдзелу жанчын у далейшым разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва, абумоўленыя атмасферай агульнага ўздыму энтузіязму ў савецкім грамадстве [124, с. 43; 488, с. 306 – 307]. Т. Процька выявіла спецыфіку разгортвання стаханаўскага руху ў межах працэсу станаўлення савецкай таталітарнай сістэмы і ўказала на моцную залежнасць працоўнага энтузіязму ад дзейнасці дзяржаўных органаў, а ў якасці важнага фактару ўдзелу ў стаханаўскіх мерапрыемствах адзначыла імкненне чалавека зацвердзіць сваё надзейнае палітычнае становішча ў грамадстве [369, с. 448 – 452]. У адным са сваіх артыкулаў, прысвечаных харчаванню рабочых БССР у міжваенны перыяд, І. Раманава вызначыла матэрыяльнае становішча стаханаўцаў як прывілеяванае, але пры гэтым яна не лічыць некаторае

Витебский государственный технологический университет

паляпшэнне дабрабыту перадавікоў вытворчасці сапраўдным паказчыкам якаснага ўзроўню жыцця людзей працы [384, с. 83 − 84].

Стаханаўскі рух у заходняй гістарыяграфіі 1950 – 1970-х гг. даследаваўся пераважна ў рамках аналізу савецкай палітычнай сістэмы, гісторыкі звязвалі развіццё сацыялістычнага спаборніцтва са станаўленнем у СССР таталітарызму і вызначалі працоўную актыўнасць рабочых як вынік іх прымусу з боку партыйных і дзяржаўных органаў [492, 493, 500, 505, 510, 512, 516]. У межах адзначанага падыходу сярод заходніх гісторыкаў было таксама распаўсюджана меркаванне, што стаханаўскі рух адмоўна паўплываў на савецкую эканоміку, прывёў да зніжэння жыццёвага ўзроўню людзей і сацыяльнага размежавання ўнутры рабочага класа [491, 495, 496, 499, 506, 507, 513].

Працы гісторыкаў адзначанага вышэй перыяду насілі агульны характар і вызначаліся моцным уплывам сітуацыі халоднай вайны. Значныя зрухі ж у вывучэнні стаханаўскага руху назіраюцца ў заходняй гістарыяграфіі у канцы 1970-х – пачатку 2000-х гг., калі адбылося адмаўленне ад вывучэння СССР як выключна таталітарнай мадэлі дзяржавы, а савецкае грамадства вылучылася ў асобны аб’ект даследавання, пэўным чынам незалежны ад палітычных працэсаў. У сувязі з чым замежнымі гісторыкамі прызнавалася станоўчая роля працоўнага энтузіязму рабочых СССР і вялікая ўвага надавалася вывучэнню сацыяльных аспектаў разгортвання сацыялістычнага спаборніцтва. У гэтым плане адметнымі ў даследаванні праблем стаханаўскага руху можна лічыць працы У. Андрла, Д. Фільтцера, М. Мюлер, С. Коткіна [489, 501, 508, 511]. Адзначаныя гісторыкі закранулі праблемы станаўлення сацыяльнай іерархіі сярод рабочых у выніку разгортвання руху, узаемаадносін стаханаўцаў і кіраўнікоў прадпрыемстваў, працэсы пераходу рабочых у групу тэхнічнай інтэлігенцыі. Даследчыца сацыяльнай гісторыі Расіі Л. Холмс, нягледзячы на станоўчую адзнаку вытворчага ўздыму стаханаўцаў, вызначала, што стаханаўскія кампаніі сталі сродкам чарговай мабілізацыі рабочых [468, с. 97 – 98].

Падрабязны аналіз сацыяльнага становішча стаханаўцаў правёў у сваіх працах Д. Хофман [503, p. 97; 504, p. 137 – 140]. Ён паказаў уплыў стаханаўскага руху на фарміраванне новай сацыяльнай ідэнтычнасці рабочых, пры якой статус стаханаўцаў звязваўся з ладам жыцця “новага чалавека”, што быў характэрны, з пункта погляду гісторыка, таксама для дзяржаўных дзеячаў і партыйных кіраўнікоў. Сацыяльную тэматыку даследаванняў стаханаўскага руху працягнула ў сваёй працы С. Дэвіс, дзе ў рамках вывучэння праблем супраціву насельніцтва Расіі ўладзе ў 1934 – 1941 гг. вызначыла асаблівасці стаўлення працоўных да адзначанай формы сацыялістычнага спаборніцтва, паказаўшы тэндэнцыю незадаволенасці кваліфікаваных рабочых імклівым



Витебский государственный технологический университет

кар’ерным ростам і павышэннем узроўню заработнай платы некаторых перадавікоў-стаханаўцаў [126, с. 38 – 40].

Спробу разглядзець развіццё стаханаўскага руху праз прызму эканамічных законаў зрабіў у сваім даследаванні сучасны амерыканскі гісторык П. Грэгары. Даследчык вызначыў разгортванне руху як заканамерны працэс, прадвызначаны самім характарам савецкай эканомікі 1930-х гг., але пры гэтым паказаў на дысбаланс паміж павышэннем заработнай платы рабочых і імклівым ростам колькасці стаханаўцаў [58, с. 134 – 138].

Вялікую ўвагу развіццю стаханаўскага руху і яго сацыяльных наступстваў надала ў сваіх працах знакамітая амерыканская даследчыца Ш. Фіцпатрык [457, с. 92 – 93, 126 – 128; 458, с. 102 – 103; 459, с. 305 – 310]. Вывучаючы праблемы сацыяльнага становішча і штодзённага жыцця насельніцтва вёскі і горада Савецкай Расіі 1930-х гг, яна вызначыла, што стаханаўскі рух моцна паўплываў на павышэнне сацыяльнага прэстыжу звычайных рабочых і сялян, даў ім магчымасць скарыстацца матэрыяльнымі дабротамі, даступнымі партыйнай эліце і інтэлігенцыі.

Праблеме стаханаўскага руху ў асяроддзі заходніх гісторыкаў былі прысвечаны асобныя манаграфіі. Так, адной з першых кніг замежнай гістарыяграфіі, дзе непасрэдна разглядаліся пытанні руху, можна лічыць даследаванне Л. Сігельбаума [514]. У гэтым даследаванні было вызначана, што шырокае разгортванне стаханаўскага энтузіязму адбывалася на аснове вялікай зацікаўленасці саміх рабочых ва ўдасканаленні і рацыяналізацыі сваёй працы. У той жа час аўтар паказвае, што фарсіраваныя тэмпы індустрыяльнага будаўніцтва не дазволілі ўкараніць дасягненні стаханаўцаў у вытворчасць. Адметнай рысай працы Сігельбаума стала выяўленне ролі стаханаўскага руху і стаханаўцаў у фарміраванні культурнай мадэлі савецкага грамадства 1930-х гг. Другім па часе спецыяльным даследаваннем стаханаўскага руху з’яўляецца кніга італьянскага гісторыка Ф. Бенвенуці [490]. Ён трактаваў стаханаўскі рух як своеасаблівую дзяржаўную палітыку і спецыфічны сацыяльны феномен, што быў звязаны са складваннем ў грамадстве новага тыпу рабочага.

Значным унёскам у вывучэнні праблемы стаханаўскага руху стала манаграфія прафесара Марбургскага ўніверсітэта Р. Майера [507]. Гісторык даказаў, што стаханаўскі рух з’яўляўся моцным каталізатарам сталінскіх рэпрэсій супраць гаспадарчых кіраўнікоў, на якіх ускладвалася асноўная віна за ўсе недахопы ў разгортванні гэтай формы сацыялістычнага спаборніцтва. Акрамя таго, у манаграфіі ўпершыню ў гістарыяграфіі разглядаўся сацыяльна-псіхалагічны механізм развіцця стаханаўскага руху, што быў ахарактарызаваны ў якасці “рэлігійна-



Витебский государственный технологический университет

харызматычнага” феномена, які караніўся ў сялянскай свядомасці з яе асаблівым успрыманнем міфа.

Аднымі з апошніх даследаванняў заходняй гістарыяграфіі, непасрэдна прысвечаных тэме стаханаўскага руху, з’яўляецца кніга амерыканскага гісторыка М. Баклі, дзе знайшла сваё месца праблематыка развіцця руху ў сельскай гаспадарцы, былі прааналізаваны выступленні стаханаўцаў вёскі ў цэнтральным друку і паказаны ўплыў гэтых выступленняў на фарміраванне культу асобы Сталіна [494], а таксама сумесныя з А. Хлеўнюком працы Р. Дэвіса, што на аснове архіўных дадзеных прасачыў уплыў стаханаўскага руху на прамысловае развіццё СССР, вызначыўшы, што дадзеная форма сацыялістычнага спаборніцтва ўзнікла на фоне эканамічнага ўздыму 1934 – 1936 гг. і мела толькі кароткачасовае эфектыўнае ўздзеянне на вытворчасць [497, 515].

Такім чынам, гістарыяграфія стаханаўскага руху налічвае вялікую колькасць даследаванняў, дзе асноўная ўвага засяроджвалася на эканамічных пытаннях і праблеме павышэння прадукцыйнасці працы, што было асабліва характэрна для навукоўцаў савецкага перыяду. Сацыяльныя бакі разгортвання руху былі закрануты савецкімі гісторыкамі фрагментарна і знайшлі больш шырокае адлюстраванне ў замежнай гістарыяграфіі і ў працах некаторых сучасных расійскіх і беларускіх даследчыкаў, аднак тут былі толькі намечаны асноўныя сацыяльна-псіхалагічныя характарыстыкі стаханаўцаў, або даследаванне гэтай сацыяльнай катэгорыі адбывалася ў кантэксце вывучэння агульнага становішча рабочых. У даследаваннях, дзе разглядалася тэма стаханаўскага руху, амаль не закранаeasy пытанне каштоўнасных арыентацый яго ўдзельнікаў і стэрэатыпаў іх сацыяльных паводзін, не былі падрабязна прааналізаваны асаблівасці сацыяльнага статусу стаханаўцаў, праблема фарміравання іх гераічных вобразаў, іх сацыяльнай мабільнасці, па-за ўвагай даследчыкаў засталася таксама праблематыка штодзённага жыцця перадавікоў вытворчасці. У беларускай гістарычнай навуцы ў цэлым адсутнічае комлекснае даследаванне працэсу развіцця стаханаўскага руху на тэрыторыі БССР у 1935 – 1941 гг., дзе разам з эканамічнай праблематыкай асаблівую ўвагу трэба надзяліць яго аналізу як сацыяльнага феномена праз асвятленне вышэйпералічаных пытанняў.

### 1.2 Крыніцы. Метады даследавання

У аснову нашага даследавання былі пакладзены дакументальныя, апавядальныя і выяўленчыя крыніцы, якія не толькі даюць магчымасць прааналізаваць працэс разгортвання стаханаўскага руху ў вытворчасці, але і раскрываюць сацыяльную характарыстыку стаханаўцаў БССР,

Витебский государственный технологический университет

даюць інфармацыю пра асаблівасці іх матэрыяльна-бытавога і культурнага становішча.

Сярод дакументальных крыніц намі былі выкарыстаны пастановы вышэйшых партыйных, дзяржаўных, прафсаюзных органаў СССР і БССР, апублікаваныя ў зборніках дакументаў і матэрыялаў [183, 185, 381]. Гэтыя дакументальныя крыніцы датычыліся розных аспектаў развіцця народнай гаспадаркі, арганізацыі мерапрыемстваў па разгортванні стаханаўскага руху ў галінах эканомікі, паляпшэння бытавых умоў удзельнікаў руху, а таксама пытанняў вылучэння жанчын-перадавікоў на кіруючыя пасады.

Важную ролю для выяўлення асаблівасцяў разгортвання стаханаўскага руху і яго ўплыву на вытворчыя працэсы, колькасці стаханаўцаў па БССР, палітыкі дзяржавы па іх прасоўванні на адміністрацыйна-гаспадарчую працу і папаўненні імі шэрагаў камуністаў адыгралі справаздачныя і статыстычныя дакументы ЦК КП(б)Б, адміністрацыі прадпрыемстваў БССР, апублікаваныя ў зборніках “Основные итоги развития народного хозяйства БССР за вторую пятилетку и намётки на третье пятилетие”, “Развитие социалистического соревнования в Белорусской ССР (1919 – 1941 гг.)”, “Индустриализация Белорусской ССР (1926 – 1941 гг.)”, “Коммунистическая партия Белоруссии в цифрах (1918 – 1988)”, “Решения партии и правительства по хозяйственным вопросам. 1917 – 1967 гг.: сборник документов за 50 лет” [156, 184, 338, 381, 387].

Для вызначэння асноўных мэтаў і задач развіцця стаханаўскага руху, яго месца ў палітычных, ідэалагічных і эканамічных працэсах была выкарыстана стэнаграма выступленняў І. Сталіна на І Узесаюзнай нарадзе стаханаўцаў у Маскве 14 – 17 лістапада 1935 г. [352].

З апублікаваных дакументальных крыніц асобна можна вылучыць улікова-кантрольныя і статыстычныя матэрыялы, якія датычыліся падрыхтоўкі і правядзення Усесаюзнага перапісу 1937 г. у БССР [131]. Гэтыя дакументы даюць нам дадзеныя па колькасці працаздольнага насельніцтва ў горадзе і сельскай мясцовасці.

Для правядзення даследавання былі шырока выкарыстаны неапублікаваныя дакументальныя крыніцы, што захоўваюцца ў архівах Беларусі: фонды Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобласці, Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці, Дзяржаўнага архіва грамадскіх аб’яднанняў Магілёўскай вобласці, Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Полацку. Сярод архіўных крыніц значная колькасць інфармацыі па вызначанай намі тэме была знойдзена ў дакументах партыйных органаў: ЦК КП(б)Б (НАРБ, фонд 4-п), Мінскага гарадскога камітэта КП(б)Б (ДАМВ, фонд 164), Віцебскага гарадскога камітэта КП(б)Б (ДАВВ, фонд 102), Талачынскага раённага камітэта КП(б)Б



Витебский государственный технологический университет

(ДАВВ, фонд 85), Чашніцкага раённага камітэта КП(б)Б (ДАВВ, фонд 105), Быхаўскага раённага камітэта КП(б)Б (ДАГАМВ, фонд 26), Бабруйскага раённага камітэта КП(б)Б (ДАГАМВ, фонд 2952), Полацкага акружнога камітэта КП(б)Б (ДАВВ, фонд 10061), Лепельскага акружнога камітэта КП(б)Б (ДАВВ, фонд 10063) і іншых.

Адзначаныя дакументы ўключаюць у сябе ў першую чаргу справаздачныя матэрыялы – дакладныя запіскі аддзелаў ЦК КП(б)Б, мясцовых партыйных арганізацый, кіраўнікоў прадпрыемстваў па пытаннях разгортвання руху, дзе змяшчаецца падрабязная інфармацыя пра развіццё сацыялістычнага спаборніцтва, колькасць стаханаўцаў па асобных прадпрыемствах і галінах, даюцца дадзеныя па партыйнаму, узроставаму, гендарнаму складу перадавікоў, іх заработнай плаце, мерапрыемствах па іх культурна-бытавому абслугоўванню. Справаздачная дакументацыя органаў КП(б)Б змяшчае ў сябе звесткі пра вылучэнне стаханаўцаў на гаспадарчыя і дзяржаўныя пасады, характарыстыкі перадавікоў, у якіх вызначаліся прыклады іх актыўнага ўдзелу ў грамадска-палітычным жыцці. Для выяўлення асаблівасцяў грамадска-палітычнай дзейнасці стаханаўцаў намі былі выкарыстаны матэрыялы, звязаныя з абмеркаваннем праекта Канстытуцыі СССР і яе далейшым вывучэннем на прадпрыемствах. Сярод справаздачнай дакументацыі партыйных органаў асобнае месца займаюць зводкі органаў Народнага камісарыята ўнутраных спраў (НКУС). Адзначаныя дакументальныя крыніцы даюць падрабязную інфармацыю пра асаблівасці ўзаемаадносін паміж стаханаўцамі і іншымі членамі працоўных калектываў, а таксама звесткі пра антыстаханаўскія настроі. Сярод дакументаў, што захоўваюцца ў фондах партыйных органаў, каштоўнай крыніцай з'яўляюцца стэнаграмы сходаў стаханаўцаў прадпрыемстваў і гаспадарак: адзначаныя крыніцы дазваляюць выявіць асаблівасці грамадскай пазіцыі ўдзельнікаў стаханаўскага руху, іх каштоўнасныя адносіны да працы, асаблівасці іх сацыяльнага статусу.

Важнае месца сярод дакументальных матэрыялаў КП(б)Б займае стэнаграма Пленума ЦК 14 – 17 студзеня 1936 г., дзе былі вызначаны задачы па развіцці стаханаўскага руху ў БССР і адлюстраваны абмеркаванні праблем арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы.

Вялікае значэнне для вывучэння стаханаўскага руху, матэрыяльнага-бытавога забеспячэння яго ўдзельнікаў, правядзення культурнай працы з імі маюць дакументальныя крыніцы прафсаюзных арганізацый. Сярод іх намі былі выкарыстаны дакументы Беларускага рэспубліканскага савета прафесійных саюзаў (НАРБ, фонд 265), Цэнтральнага праўлення прафесійнага саюза рабочых тарфяной прамысловасці БССР (НАРБ, фонд 277), Цэнтральнага праўлення прафесійнага саюза рабочых гарбарнай прамысловасці БССР (НАРБ,



Витебский государственный технологический университет

фонд 283), Беларускага рэспубліканскага камітэта саюза рабочых малочна-мясных саўгасаў (НАРБ, фонд 297), Цэнтральнага праўлення прафесійнага саюза рабочых лесапільнай і дрэваапрацоўчай прамысловасці БССР (НАРБ, фонд 509), Мінскага абласнога камітэта прафесійных саюза рабочых МТС (ДАМВ, фонд 493), Віцебскага гарадскога савета прафесійных саюзаў (ДАВВ, фонд 1021), Гомельскага гарадскога савета прафесійных саюзаў (ДАГомВ, фонд 426), Віцебскага Саюзмалтрэста (ДАВВ, фонд 932).

У адзначаных архіўных фондах размяшчаецца бягучая перапіска паміж цэнтральнымі прафсаюзнымі органамі і прафсаюзнымі камітэтамі прадпрыемстваў, дзе адлюстраваны пытанні бытавога і культурна-масавага абслугоўвання стаханаўцаў і іх сем'яў, у прыватнасці змяшчаецца багаты матэрыял па арганізацыі курортнага адпачынку перадавікоў. Другую катэгорыю дакументаў складаюць пратаколы і стэнаграмы сходаў стаханаўцаў, дзе можна знайсці пэўную інфармацыю пра асаблівасці свядомасці герояў вытворчасці і матывацыю іх паводзін, а таксама шэраг пытанняў, звязаных з арганізацыяй вытворчага працэсу. Вялікі пласт дакументаў прафсаюзных арганізацый займаюць справаздачныя матэрыялы, якія ўключаюць у сябе звесткі пра правядзенне мерапрыемстваў стаханаўскага руху, дакладныя запіскі пра стан руху па асобных прадпрыемствах і раёнах (у іх знаходзіцца інфармацыя, якая датычыцца ўзроўню заработнай платы стаханаўцаў, крыніц фарміравання бюджэту іх сем'яў, харчовага і жыллёвага забеспячэння перадавікоў, іх медыцынскага, культурнага абслугоўвання, цікавымі з'яўляюцца вынікі апытанняў стаханаўцаў, па якіх можна прасачыць узровень матэрыяльнага становішча перадавікоў і характар іх побытавых патрэбаў). Грунтоўнай крыніцай у справаздачнай дакументацыі з'яўляюцца спісы стаханаўцаў па асобных гаспадарчых адзінках, рэгіёнах і БССР у цэлым, дзе ўказваліся ўзрост, працоўны стаж, сацыяльнае паходжанне, а таксама вызначаліся матэрыяльныя і маральныя ўзнагароды перадавікоў за працоўныя рэкорды. Інфармацыю па сістэме аплаты працы стаханаўцаў і іх колькасны склад утрымліваць у сабе статыстычныя дадзеныя прафсаюзных арганізацый.

Апрача пералічаных архіўных фондаў для даследавання намі былі выкарыстаны матэрыялы выканаўчага камітэта Полацкага акружнога Савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў (ЗДА у г. Полацку, фонд 104). Тут змяшчаецца шэраг арганізацыйнай дакументацыі, звязанай з правядзеннем мерапрыемстваў па святкаванні Міжнароднага жаночага дня і 18-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, дзе можна знайсці важныя звескі пра асаблівасці становішча жанчын-стаханавак, удзелу перадавікоў у грамадскім жыцці. Дакументы выканаўчага камітэта таксама ўключаюць у сябе справаздачы па



Витебский государственный технологический университет

разгортванні стаханаўскага руху ў сельскай гаспадарцы асобных раёнаў, спісы стаханаўцаў калгасаў. У адзначаных крыніцах давалася падрабязная характарыстыка працоўнай дзейнасці герояў вытворчасці, прыводзіліся прыклады іх матэрыяльнага забеспячэння.

Сярод неапублікаваных крыніц таксама трэба вылучыць дакументы Віцебскага шчацінна-шчотачнага камбіната (ДАВВ, фонд 96) і Гомельскага кандытарскага камбіната “Спартак” (ДАГомВ, фонд 663), дзе адлюстравана інфармацыя па разгортванні стаханаўскага руху і становішчы стаханаўцаў на асобна ўзятых прадпрыемствах. Асаблівую каштоўнасць маюць улікова-кантрольная дакументацыя, прадстаўленая ў выглядзе індывідуальных картак стаханаўцаў з іх біяграфічнымі звесткамі, характарыстыкамі працоўнай і грамадскай дзейнасці. Вялікую колькасць дакументаў адзначаных прадпрыемстваў складаюць статыстычныя дадзеныя па колькасці стаханаўцаў у цэлым і па асобных цэхах, нормах выпрацоўкі і ўзроўню заработнай платы перадавікоў.

Другую вялікую групу крыніц складаюць апавядальныя. Сярод іх важнае значэння для нашага даследавання маюць папулярныя брашуры, выдадзеныя ў другой палове 1930-х гг., у якіх змяшчаюцца аўтабіяграфіі стаханаўцаў і іх расказы пра здзяйсненні сваіх працоўных рэкордаў. Нягледзячы на тое, што гэтыя брашуры былі надрукаваныя з агітацыйнымі мэтамі для стварэння ідэальнага вобразу стаханаўцаў у грамадстве і ўтрымліваюць у сабе шмат савецкіх моўных штампаў, па змесце адзначаных крыніц можна ў цэлым меркаваць пра сацыяльнае становішча ўдзельнікаў стаханаўскага руху, іх каштоўнасці і нормы паводзінаў, асаблівасці іх стаўлення да чалавека, грамадства і працы. Акрамя таго, гэтыя крыніцы паказваюць на тое, як паляпшаліся ўмовы жыцця стаханаўцаў і якую палітыку праводзіла дзяржава для павышэння іх культурнага ўзроўню.

У якасці апавядальных крыніц былі выкарыстаны ўспаміны, пакінутыя ў 1970-я – канцы 1980-х гг. удзельнікамі стаханаўскага руху Г. Басавым, К. Войтавай, М. Мацулевіч, В. Уласенка, Т. Зубаравай і Г. Каліво. Адзначаныя крыніцы захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці (фонд 9742) і Дзяржаўным архіве грамадскіх аб’яднанняў Магілёўскай вобласці (фонд 6115) і змяшчаюць у сабе аўтабіяграфічныя аповеды перадавікоў, на аснове якіх можна раскрыць матывы працоўнага энтузіязму і зрабіць сацыяльную характарыстыку стаханаўцаў.

У працэсе даследавання намі выкарыстоўваліся матэрыялы, напісаныя партыйнымі дзеячамі. Так, для вызначэння сутнасці сацыялістычнага спаборніцтва і яго месца ў эканоміцы савецкай краіны быў прааналізаваны праграмны артыкул У. Леніна “Как организовать соревнование”, у якім раскрываюцца асноўныя ідэі развіцця працоўнага энтузіязму. Пэўную інфармацыю пра стаханаўскі рух у Заходняй

Витебский государственный технологический университет

Беларусі можна знайсці ў апублікаваным дзённіку першага сакратара ЦК КП(б)Б П. Панамарэнкі [358], дзе ім распавядаецца пра яго сустрэчы з І. Сталіным і паказваецца стаўленне апошняга да пытанняў сацыялістычнага спаборніцтва на далучаных у 1939 г. да БССР тэрыторыях.

Пры правядзенні даследавання асаблівасцяў удзелу стаханаўцаў у палітычным жыцці намі была выкарыстана эпісталярная крыніца, прадстаўленая лістом, адрасаваным асабіста Сталіну, ад стаханаўца Х. з Мінскай электрастанцыі. Гэты ліст быў знойдзены намі ў Дзяржаўным архіве Мінскай вобласці ў фондзе Мінскага гарадскога камітэта КП(б)Б. Каштоўнасць крыніцы заключаецца ў тым, што яна з'яўляецца неадрэдагаванай і ў поўнай меры дазваляе стварыць сацыяльны партрэт стаханаўца, вызначыць яго адносіны да грамадства, палітычнай сістэмы.

Каштоўнай групай крыніц, якая сумяшчае рысы як апавядальнага, так і дакументальнага тыпу, з'яўляецца перыядычны друк. У ходзе даследавання намі былі прааналізаваны матэрыялы часопісаў "Сацыялістычнае будаўніцтва", "Работніца і калгасніца Беларусі", рэспубліканскіх газет "Звязда", "Чырвоная змена", "Рабочий" і "Советская Белоруссия".

У часопісе "Сацыялістычнае будаўніцтва" публікаваліся даклады і выступленні партыйных і дзяржаўных кіраўнікоў БССР па пытаннях стаханаўскага руху, у якіх вызначаліся асноўныя задачы па яго распаўсюджванні, мерапрыемствы па павышэнні дабрабыту стаханаўцаў, іх вылучэнні на адказныя пасады. У часопісе таксама былі надрукаваныя вынікі галіновых канферэнцый, дзе паказваліся новыя нормы выпрацоўкі і дадзеныя па налічэнні заработнай платы за перавыкананне планаў. У артыкулах часопіса можна знайсці інфармацыю пра развіццё стаханаўскага руху ў розных галінах прамысловасці і сельскай гаспадаркі, узровень матэрыльнага забеспячэння перадавікоў прадпрыемстваў і саўгасаў. У артыкулах часопіса "Работніца і калгасніца Беларусі" ўтрымліваецца інфармацыя пра ўдзел жанчын у стаханаўскім руху, прыводзяцца прыклады сацыяльна-бытовога забеспячэння яго ўдзельніц.

Публікацыі ў пералічаных намі вышэй рэспубліканскіх газетах дазваляюць значна дапоўніць дакументальныя звесткі пра разгортванне стаханаўскага руху і становішча стаханаўцаў. У прыватнасці, у газетах быў надрукаваны шэраг пастаноў дзяржаўных і прафсаюзных органаў, што датычыліся паляпшэння матэрыяльных умоў жыцця стаханаўцаў і ўзнагарод за выдатную працу. Багаты матэрыял змяшчаюць у сабе артыкулы і нарысы карэспандэнтаў газет: прыводзяцца прыклады працоўнага гераізму на асобных прадпрыемствах і гаспадарках, факты узаемаадносін у працоўных калектывах пры правядзенні стаханаўскіх мерапрыемстваў, стасункаў паміж стаханаўцамі і адміністрацыяй,



Витебский государственный технологический университет

вызначаецца інфармацыя па харчоваму і жыллёваму забеспячэнню стаханаўцаў, арганізацыі іх адпачынку і вольнага часу, мерапрыемствах, звязаных з узбагачэннем ведаў передавікоў. Шмат матэрыялаў у газетных публікацыях можна знайсці пра дзейнасць Універсітэта выхаднога дня для стаханаўцаў Мінска. Як і ў папулярных брашурах, у газетах друкаваліся расказы стаханаўцаў пра свой жыццёвы шлях і працоўную дзейнасць.

Выконваючы прапагандысцкую функцыю, рэспубліканскія газеты дазваляюць нам вызначыць, якім чынам фарміраваўся гераічны вобраз стаханаўцаў праз перыядычны друк, правядзенне святаў і ўрачыстых мерапрыемстваў. У гэтым жа кантэксце ў газетах вызначаліся прыклады задзейнічання стаханаўцаў у грамадска-палітычных акцыях 1937 – 1938 гг., накіраваных супраць так званых трацкістцкіх контррэвалюцыйных арганізацый. Акрамя таго, прыводзілася інфармацыя пра ўдзел стаханаўцаў у выбарах у мясцовыя Саветы, Вярхоўны Савет БССР і Вярхоўны Савет СССР.

Важнае месца сярод газетных публікацый займаюць эпісталярныя матэрыялы – гэта індывідуальныя і калектыўныя лісты стаханаўцаў у рэдакцыі газет, у якіх пераважна змяшчаліся скаргі на недахопы працы мясцовых кіраўнікоў пры арганізацыі харчавання, адпачынку, забеспячэнні жыллём, таварамі першай неабходнасці, а таксама прыводзіліся прапановы па лепшаму правядзенню вольнага часу. Хаця адзначаныя лісты былі строга адрэдагаваныя, яны змяшчаюць у сабе каштоўную інфармацыю пра асаблівасці ажыццяўлення дзяржаўнай палітыкі, накіраванай на матэрыяльную падтрымку стаханаўцаў і вызначаюць праблемы, якія ўзнікалі пры гэтым. Акрамя таго, па адзначаных лістах можна вылучыць спецыфіку ўсведамлення “знатнымі людзьмі” свайго месца ў грамадстве і іх матэрыяльныя патрэбы. Часта ў лістах стаханаўцы адзначалі недахопы ў арганізацыі вытворчых і тэхналагічных працэсаў асобных прадпрыемстваў.

Пры правядзенні нашага даследавання былі выкарыстаны выяўленчыя матэрыялы – фотаздымкі стаханаўцаў рэспублікі, якія захоўваюцца ў Беларускім дзяржаўным архіве кінафотафонадакументаў. Гэтыя крыніцы дазволілі нам выявіць імёны некаторых удзельнікаў стаханаўскага руху БССР, больш таго, разам з фотаздымкамі размяшчаліся і звесткі пра вылучэнне стаханаўцаў на адказныя пасады, перадачу імі вытворчага вопыту іншым членам працоўных калектываў і працэс атрымання передавікамі адукацыі.

Сярод выяўленчых матэрыялаў пэўную інфармацыю змяшчаюць у сабе фотаздымкі, надрукаваныя ў рэспубліканскіх газетах, якія таксама даюць звесткі пра найбольш знакамітыя імёны стаханаўцаў БССР. Частка фотаздымкаў адлюстроўваюць прыклады матэрыяльна-



Витебский государственный технологический университет

бытавога забеспэчэння стаханаўцаў і арганізацыі іх вольнага часу. Адным з прыкладаў такіх крыніц можна назваць фотаздымак сям'і стаханаўца А. Зубка падчас сямейнага свята. Фота было надрукавана ў адным з нумароў газеты "Звязда" за 1939 г., і па ім можна выявіць некаторыя асаблівасці побыту перадавікоў сельскай гаспадаркі, з другога боку, прасачыць падтэкст паказальных бакоў вясковага жыцця, адлюстраваных ў перыядычным друку на прыкладзе стаханаўцаў.

Тэарэтыка-метадалагічнай асновай даследавання сталі такія прынцыпы, як гістарызм і аб'ектыўнасць. Прынцып гістарызму дазволіў разглядзець уплыў стаханаўскага руху на эканоміку, выявіць асаблівасці сацыяльнага становішча і штодзённага жыцця стаханаўцаў у канкрэтна-гістарычнай сітуацыі, што назіралася ў БССР у сацыяльных, эканамічных і грамадска-палітычных працэсах на працягу 1935 – 1941 гг. На аснове прынцыпу аб'ектывізму стала магчымым, выкарыстоўваючы шырокую базу крыніц і ўлічваючы канцэпцыі, замацаваныя ў гістарычных даследаваннях, атрымаць фактычны матэрыял пра асаблівасці разгортвання стаханаўскага руху і становішча стаханаўцаў у грамадстве.

У працэсе правядзення даследавання былі выкарыстаны такія агульнанавуковыя метады, як аналіз, сінтэз, індукцыя і дэдукцыя. Прымяненне метаду аналізу дазволіла вылучыць характэрныя рысы сацыяльнай катэгорыі стаханаўцаў і розныя бакі іх штодзённага жыцця, а таксама прасачыць станоўчыя і адмоўныя моманты разгортвання стаханаўскага руху ў вытворчасці. З дапамогай метаду сінтэзу на аснове выяўленых асаблівасцяў сацыяльнага і матэрыяльна-бытавога становішча ўдзельнікаў стаханаўскага руху была зроблена цэласная характарыстыка герояў вытворчасці і матываў іх энтузіязму. Дзякуючы метадам індукцыі і дэдукцыі ў даследаванні былі сфармуляваны асноўныя палажэнні, звязаныя з месцам стаханаўцаў у структуры грамадства БССР і спецыфікай іх каштоўнасных арыентацый, норм паводзінаў, успрыманнем рэчаіснасці.

Разам з агульнанавуковымі метадамі ў даследаванні былі выкарыстаны спецыяльнагістырычныя. Сярод іх вялікую ролю адыграў гісторыка-генетычны метад, што дазволіў раскрыць працэс фарміравання гераічных вобразаў стаханаўцаў у рамках разгортвання сацыялістычнага спаборніцтва, а таксама прасачыць эвалюцыю свядомасці працоўных у савецкіх умовах і ўзаемасувязь каштоўнасных арыентацый савецкага грамадства з ростам стаханаўскага энтузіязму. Пры правядзенні даследавання быў таксама выкарыстаны гісторыка-тыпалагічны метад, з дапамогай яго ўдалося вылучыць асноўныя сацыяльныя прыметы стаханаўцаў як асобнай катэгорыі грамадства, спецыфіку іх прывеліяванага становішча ў харчовым і жыллёвым забеспячэнні, ва ўзроўні грашовых даходаў, медыцынскага

Витебский государственный технологический университет

абслугоўвання і арганізацыі вольнага часу. Важнае значэнне пры правядзенні даследавання меў гісторыка-параўнаўчы метад, што дазволіў выявіць спецыфічныя рысы стаханаўцаў сярод іншых рабочых і калгаснікаў як у сацыяльным становішчы, так і ў матэрыяльных умовах жыцця. На аснове адзначанага метаду стала магчымым суаднясенне мэтаў, якія ставіла дзяржава пры ажыццяўленні сваёй палітыкі ў адносінах да стаханаўцаў, і практычнай рэалізацыі гэтай палітыкі, асабліва гэта датычылася спробы стварэння на прыкладзе ўдзельнікаў стаханаўскага руху працоўнай эліты.

На аснове гістырыка-сістэмнага метаду быў прааналізаваны працэс укаранення стаханаўскіх дасягненняў у прамысловасць і сельскую гаспадарку, разглядалася становішча стаханаўцаў ў кантэксце агульнага разгортвання стаханаўскага руху ў БССР, што дало магчымасць вывучыць матывы вытворчага актывізму рабочых і калгаснікаў, а таксма асаблівасці ўключэння перадавікоў у грамадска-палітычнае жыццё рэспублікі. Гісторыка-сістэмны метад дазволіў звязаць асаблівасці штодзённага жыцця стаханаўцаў з матэрыяльнымі стымуламі далейшага разгортвання руху.

Такім чынам, на аснове шырокага выкарыстання крыніц і дасягненняў гістарыяграфіі з дапамогай агульнанавуковых і спецыяльнагістарычных метадаў стала магчымым вырашыць праблематыку, акрэсленую ў нашым даследаванні.

Витебский государственный технологический университет

# ГЛАВА 2
# СТАХАНАЎСКІ РУХ І СТАНОВІШЧА СТАХАНАЎЦАЎ У ГРАМАДСТВЕ

## 2.1 Разгортванне стаханаўскага руху у БССР і яго ўплыў на эканаміку

Індустрыялізацыя ў СССР у канцы 1920-х – 1930-я гг. была адзначана такой спецыфічнай грамадскай з'явай, як сацыялістычнае спаборніцтва, якое па сутнасці павінна было сфарміраваць новыя адносіны да працы ў савецкай краіне, заснаваныя на добраахвотнасці і асабістай зацікаўленасці рабочых ці калгаснікаў у выніках сваёй вытворчай дзейнасці, іх уласнай ініцыятыве ў справе павышэння прадукцыйнасці вытворчасці, пры гэтым меркавалася стварыць альтэрнатыву капіталістычнай канкурэнцыі, што была распаўсюджана ў краінах Захаду. Адзначаная канцэпцыя сацыялістычнага спаборніцтва была выкладзена У. Леніным у артыкуле "Как организовать соревнование" яшчэ ў снежні 1917 г. [216, с. 195 – 199], ўпершыню гэты артыкул надрукавалі ў прэсе ў 1929 г. з мэтай далейшай практычнай рэалізацыі новых прынцыпаў працоўнай дзейнасці, якраз на самым пачатку разгортвання фарсіраванага індустрыяльнага будаўніцтва. Для ажыццяўлення планаў індустрыялізацыі на працягу першых пяцігодак дзяржаўнымі, партыйнымі і прафсаюзнымі органамі сацыялістычнае спаборніцтва было арганізавана ў разнастайных яго формах: добраахвотнае зніжэнне расцэнак і павышэнне норм выпрацоўкі, рух ударнікаў, сустрэчнае планаванне, грамадскі буксір і іншых, на гэтай аснове ў сярэдзіне 1930-х гг. спаборніцтва знайшло свой лагічны працяг у з'яўленні і разгортванні стаханаўскага руху.

Перадумовы ўзнікнення стаханаўскага руху ў савецкай краіне былі акрэслены пастаўленымі дзяржавай задачамі па рэалізацыі чарговага эканамічнага рыўка падчас другой пяцігодкі. Гэта было магчыма зрабіць за кошт арганізацыі больш шырокага па маштабе працоўнага энтузіязму, які меў бы ў сваёй аснове новыя вобразы герояў прамысловасці і сельскай гаспадаркі, што на сваіх прыкладах змаглі б паказаць эталон вытворчага актывізму для астатніх рабочых і калгаснікаў. Разгортванню стаханаўскага руху паспрыяла павышэнне ўзроўню тэхнічнай падрыхтоўкі на прадпрыемствах, калі ў выніку арганізацыі кампаній па здачы дзяржаўнага экзамену па тэхмінімуму ў працоўных узнікала імкненне да далейшага вывучэння магчымасцяў сваёй тэхнікі і вынаходніцтва новых метадаў арганізацыі вытворчага працэсу. Важным фактарам пераходу на новы этап у разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва можна лічыць таксама і адмену ў студзені 1935 г. карткавай сістэмы размеркавання прадуктаў, што



Витебский государственный технологический университет

пэўным чынам змяніла адносіны да вынікаў працы на вытворчых адзінках і стварыла новыя матэрыяльныя стымулы павышэння яе прадукцыйнасці.

Стаханаўскі рух зарадзіўся са знакамітага рэкорда, арганізаванага мясцовымі партыйнымі арганізатарамі на шахце "Цэнтральнае Ірміна" (Данбас) з нагоды Міжнароднага юнацкага дня. Шахцёр А. Стаханаў у ноч з 31 жніўня на 1 верасня 1935 г. за шасцігадзінную змену выдаў 102 тоны вытворчага вугалю пры норме ў 7 тон. Заметка пра рэкорд Стаханава з'явілася ў газеце "Праўда" 2 верасня 1935 г. і на працягу некалькіх месяцаў звесткі пра працоўны подзвіг данбаскага шахцёра праз прэсу распаўсюдзіліся па ўсім СССР. Рабочыя і калгаснікі па прыкладу Стаханава таксама пачалі павышаць прадукцыйнасць працы за кошт удасканалення магчымасцяў сваёй тэхнікі і новай арганізацыі вытворчых працэсаў, так ў галінах прамысловасці і сельскай гаспадаркі пачынаюць з'яўляцца свае стаханаўцы, сярод якіх найбольшую вядомасць атрымалі І. Гудаў, Е. і М. Вінаградавы, М. Сметанін, А. Бусыгін, П. Крыванос і іншыя.

У верасні – кастрычніку 1935 г. стаханаўскі рух узнік у прамысловасці БССР. Першыя ўдзельнікі гэтай формы сацыялістычнага спаборніцтва з'явіліся тут у сферы машынабудавання, якая мела шмат складаных тэхналагічных працэсаў і асабліва патрабавала павышэння тэмпаў вытворчасці для забеспячэння неабходным абсталяваннем астатніх прадпрыемстваў індустрыі, таму ў адзначанай галіне склаліся самыя спрыяльныя ўмовы для зараджэння стаханаўскага руху. Сярод першых стаханаўцаў рэспублікі можна вылучыць, напрыклад, рабочых Мінскага станкабудаўнічага завода імя Кірава А. Худзікава, Ш. Шульмана і Н. Лапіна. За кошт дадатковага вывучэння тэхнічных магчымасцяў сваіх станкоў і размеркавання дапаможнай працы на іншых рабочых яны дабіліся перавыканання вытворчага плана ў 2 – 3 разы [378, с. 18, 24, 25]. У Віцебску на станкабудаўнічым заводзе "Чырвоны металіст" кавалі І. Лін і В. Латышэўскі ўдасканалілі працэс абкаткі і абрубкі дэталяў на паравым прэсе і дасягнулі тым самым дзённай нормы выпуску восей для колаў да 700 штук пры норме 500 штук [140, с. 3; 207, с. 3].

У якасці піянераў стаханаўскага руху таксама праявілі сябе працоўныя вядучых для БССР галін лёгкай і дрэваапрацоўчай прамысловасці. Асаблівай ініцыятывай пры гэтым вылучаліся рабочыя гарбарна-абутковых прадпрыемстваў. Так, аднымі з першых стаханаўцаў БССР сталі браты Г. і З. Скабло з Мінскай абутковай фабрыкі імя Кагановіча, якія пры садзейнічанні партыйнага арганізатара цэха ўдасканалілі метад апрацоўкі скуры і дасягнулі тым самым выпуску прадукцыі да 350 % [250, арк. 25 – 26; 425]. У лік прадпрыемстваў рэспублікі, дзе першым з'явіўся стаханаўскі рух,



Витебский государственный технологический университет

уваходзіў Мінскі гарбарны завод “Бальшавік”, на якім сваю выдатную стаханаўскую працу паказалі строгалі З. Мілікоўскі і Л. Левін [213; 422, с. 12, 22]. У дрэваапрацоўчай прамысловасці самымі вядомымі стаханаўцамі БССР становяцца рабочыя Я. Гладышаў, Р. Рушко, А. Лучкоўскі. Удасканаліўшы вытворчыя магчымасці сваёй тэхнікі, адзначаныя стаханаўцы ў некалькі разоў павысілі нормы выпрацоўкі прадукцыі і палепшылі яе якасць [2, с. 1; 227, с. 24; 487, с. 3].

Як і ў цэлым па СССР, у рэспубліцы акрамя адзначаных намі галін прамысловасці першыя ўдзельнікі стаханаўскага руху ўзнікаюць і сярод работнікаў чыгуначнага транспарту. У шэрагу чыгуначнікаў БССР ініцыятарам новай формы працоўнага энтузіязму стаў, напрыклад, машыніст Мінскага паравознага дэпо Л. Лабко, які павялічыў сярэднюю хуткасць цягнікоў да 45 км за гадзіну, павысіўшы тым самым норму прабегу транспарту на 75 % [435, с. 3]. Падобных высокіх вынікаў таксама дасягнуў у сваёй працы машыніст Віцебскага паравознага дэпо Н. Котнеў [192, с. 3].

З цягам часу ініцыятары стаханаўскага руху ўзнікаюць у астатніх галінах прамысловасці БССР, пры гэтым амаль на кожнай вытворчай аперацыі рабочыя імкнуцца ўдасканаліць тэхналагічныя працэсы і шукаюць новыя метады арганізацыі сваёй працы, якія б павысілі яе прадукцыйнасць. Напрыклад, сярод стаханаўцаў харчовай прамысловасці рэспублікі вядомасць атрымаў П. Хвашчэўскі (Бярэзінскі спіртавы завод), на працэсе дрожжаварэння ён замест аднаго апарата перайшоў працаваць на два і дасягнуў сярэдняй выпрацоўкі прадукцыі да 180 % [433, с. 22]. З ліку будаўнікоў БССР актыўнымі ўдзельнікамі стаханаўскага руху сталі Д. Рагавы, К. Салаўёў, З. Верхавінаў, якія на ўзвядзенні прамысловых і жыллёвых аб’ектаў у сваіх брыгадах удасканалілі тэхніку кладкі цэглы і дасягнулі на аснове гэтага прадукцыйнасці працы да 300 – 400 % [136, с. 19, 21, 22]. Стаханаўцы ўзніклі, напрыклад, і сярод работнікаў аўтадарожнага транспарту рэспублікі. Сваёй выдатнай працай вылучаліся такія шафёры, як А. Крэзо, М. Лушчынскі, В. Благавеснікаў: яны дасягнулі высакаякаснага прабегу сваіх машын і зэканомілі, напрыклад, за кастрычнік 1935 г. кожны да 1500 літраў бензіну [246, арк. 40 – 43].

На самым пачатку свайго развіцця ўдзел у стаханаўскім руху стаў вынікам ініцыятывы працоўных знізу, а таксама арганізацыйнай працы мясцовых органаў кіравання і прафсаюзаў. Так, напрыклад, пры садзейнічанні прафсаюза лесапілення ў кастрычніку 1935 г. стаханаўскі рух актыўна быў разгорнуты на Бабруйскім, Рэчыцкім і Мазырскім лесазаводах [315, арк. 133]. У адрозненні ад папярэдніх форм сацыялістычнага спаборніцтва стаханаўскі рух прадугледжваў не толькі перавыкананне норм: павышэнне прадукцыйнасці вытворчасці дасягалася тут за кошт рацыянальнай арганізацыі тэхналагічных



Витебский государственный технологический университет

працэсаў і максімальнага выкарыстання магутнасцяў тэхнікі, што патрабавала добрых ведаў тэхнічнага мінімуму. У той жа час высокія паказчыкі сталі вынікам ушчыльнення працоўнага дня, калі рабочыя сканцэнтроўваліся на выкананні сваёй асноўнай вытворчай аперацыі і вызваляліся ад іншых лішніх рухаў. Для гэтага стаханаўцы рабілі папярэднюю падрыхтоўку рабочага месца да працы, загадзя забяспечвалі яго неабходнымі інструментамі і сыравінай. Для тых жа мэтаў выкарыстоўваліся метады пераразмеркавання працы, калі кваліфікаваныя рабочыя вызваляліся ад другарадных працэсаў, якія выконвалі замацаваныя за перадавікамі падсобныя рабочыя. Так, стаханаўскі рух быў звернуты ў большай ступені на вынікі працы асобна ўзятых герояў, праз індывідуальныя рэкорды якіх меркавалася заахвочваць працоўную ініцыятыву і павысіць, у выніку, тэмпы вытворчасці.

Ажыццяўленне стаханаўскіх рэкордаў і эфектыўнае прымяненне новых метадаў на прадпрыемствах шмат у чым залежыла ад дзеянняў адміністрацыі, якая нярэдка па сваім меркаванні стварала спрыяльныя ўмовы працы для асобных рабочых, на аснове чаго апошнія павышалі прадукцыйнасць вытворчых працэсаў і станавіліся стаханаўцамі. Напрыклад, стаханавец Н. Гімельштэйн (Мінскі станкабудаўнічы завод імя Кірава) так апісаў сваё ўключэнне ў стаханаўскі рух: "Справа пачалася з агульнага сходу цэха ў час абедзеннага перапынку. Таварыш Гальперын – старшыня нашага заўкома, у першы раз з намі гутарыў аб рэкордах Аляксея Стаханава…Таварыш Гальперын прама назваў імёны людзей і тут жа задаваў ім пытанні аб магчымасці перавыканання іх норм. Ён назваў маё прозвішча і задаў мне пытанне: "Колькі ты можаш даць пры стаханаўскіх метадах работы?" Коратка падумаў і сказаў: "200 %". На наступны дзень па распараджэнні начальніка цэха для Гімельштэйна было спецыяльна ўладкавана рабочае месца і падрыхтаваны ўсе неабходныя інструменты [378, с. 39]. Па падобнай жа схеме, пры садзенічанні адміністрацыі, праходзіла, напрыклад, арганізацыя стаханаўскага руху і на Урэчскім спіртавым заводзе (Слуцкі раён) [433, с. 57].

Безумоўна, што ў большасці сваёй мясцовыя кіраўнікі дапамагалі ўключыцца ў стаханаўскі рух тым рабочым, якія свядома былі гатовыя да прымянення новых метадаў працы ці мелі пэўныя прапановы па паляпшэнні вытворчасці. Аднак на частцы прадпрыемстваў былі зафіксаваны цікавыя выпадкі, калі стаханаўцамі станавіліся члены калектыву, якія праяўлялі сябе як недысцыплінаваныя рабочыя ці катэгарычна адмоўна адносіліся да ідэй стаханаўскага руху. Так, электрасваршчык Пракопкін з торфазавода "Асінторф" у кастрычніку 1935 г. за брак быў зняты заводакіраўніцтвам з працы, аднак па патрабаванні прафсаюзнага камітэта быў адноўлены на працы і пры

Витебский государственный технологический университет

адпаведным уздзеянні ўзяў абавязак працаваць па-стаханаўску. У выніку Пракопкін стаў не толькі працаваць без браку, але выканаў план на 418 % [298, арк. 4]. На Магілёўскім гарбарным заводзе імя Сталіна ў канцы 1935 г. рабочы Шыркоў адмоўна адносіўся да ініцыятывы разгортвання стаханаўскага руху і крытычна асуджаў ва ўдзеле ў ім рабочага Фёдарава. У адказ на гэта апошні растлумачыў, у чым сутнасць гэтай новай формы сацыялістычнага спаборніцтва і расказаў пра свае метады ўдасканалення працы. Пад уздзеяннем гэтай размовы і ўплывам адміністрацыі Шыркоў на наступны жа дзень уключыўся ў стаханаўскі рух і дабіўся высокіх паказчыкаў ў сваёй працы [300, арк. 56]. Адзначаныя выпадкі ўключэння ў стаханаўскі рух, з аднаго боку, можна патлумачыць як эфектыўнае ўздзеянне працоўнага калектыву і кіраўніцтва на працэс перавыхавання тых рабочых, што не жадалі праяўляць сваю вытворчую актыўнасць. З другога боку, пералічаныя меры адміністрацыі насілі, хутчэй за ўсё, прапагандысцкі характар і стваралі прыклад таго, што ў кожным закладзены патэнцыял працоўнага энтузіязму, а таксама вызначалі катэгорыю працоўных, дзеянні якіх можна было кантраляваць за кошт павышэння іх сацыяльнага статусу.

У аграрным сектары БССР першыя стаханаўцы з'яўляюцца сярод работнікаў МТС, асноўная праца якіх напрамую была звязана з прымяненнем сельскагаспадарчай тэхнікі і адкрывала шырокія магчымасці для вынаходніцтва новых метадаў яе максімальнага выкарыстання па прыкладу Стаханава. За кошт удасканалення тэхнічных магутнасцяў трактароў і ўборачнай тэхнікі, змены рэжыму іх працы рабочыя МТС павялічвалі ў некалькі разоў плошчу апрацаванай зямлі. Напрыклад, у Полацкай акрузе сваёй выдатнай працай вылучыўся стаханавец Т. Плешчанок з Асвейскай МТС, які выпрацаваў на сваім трактары за асенні сезон 1935 г. 506 га мягкай пашы [146, арк. 264 – 265]. Станоўчых вынікаў дабіўся стаханавец А. Хомчанка (Забычанская МТС), які выпрацаваў 886 га пашы пры норме ў 380 га і зэканоміў 1600 кг гаручага [419, с. 7]. Восенню 1935 г. стаханаўка Лёзненскай МТС А. Шабашова выпрацавала на сваім трактары 1236 га мягкай пашы і паставіла тым самым рэспубліканскі рэкорд сярод трактарыстаў [75, арк. 6].

У той жа час у другой палове 1930-х гг. у сельскай гаспадарцы вытворчыя працэсы былі яшчэ слаба механізаваныя, а асноўныя аперацыі ў яе галінах былі разлічаны на выкарыстанне пераважна ручной працоўнай сілы. На такага роду ручной працы асаблівую вядомасць у якасці стаханаўцаў атрымлівалі сяляне, якія былі занятыя ў адной з вядучых галін рэспублікі – ільнаводстве. Сярод іх у БССР, напрыклад, сваімі стаханаўскімі рэкордамі вылучыліся льнотрапальшчыцы П. Пярцова, М. Дзяжурная, М. Рагоўская і С. Быкоўская, якія апрацоўвалі за дзень па 50 – 60 кг ільновалакна пры

Витебский государственный технологический университет

агульнапрынятай норме ў 10 – 12 кг. М. Дзяжурная, напрыклад, увогуле паставіла рэспубліканскі рэкорд і натрапала за дзень 66 кг 600 г лёну [226, с. 4]. Пры вырошчванні лёну і яго зборы сваю выдатную працу паказалі стаханаўцы з Дрысенскага раёна У. Спіжаль і М. Апачанка, паляводчыя звенні якіх дасягнулі ўраджайнасці адзначанай сельскагаспадарчай культуры да 8 ц з га [82, арк. 160].

Выдатныя вынікі на працэсах вырошчвання і апрацоўкі лёну, як і ў цэлым па раслінаводству, дасягаліся стаханаўцамі на аснове пераразмеркавання дапаможнай працы на іншых сялян. У некаторых выпадках такія аперацыі выконвалі блізкія сваякі стаханаўцаў. Напрыклад, стаханаўка П. Пярцова толькі трапала лён, а дапаможныя працэсы па яго пераносе і ачыстцы выковала яе дачка [226, с. 4]. А стаханаўцы А. Калбёнак пры апрацоўцы льну дапамагала яе шасцідзесяцігадовая маці [375, с. 16]. Такія выпадкі былі абумоўлены самой спецыфікай арганізацыі працы на вёсцы, калі ў склад паляводчага звяна часта ўваходзілі прадстаўнікі аднаго сялянскага двара ці сям'і. Акрамя таго, павышэнне прадукцыйнасці і разгортванне стаханаўскага руху ў раслінаводстве забяспечваліся за кошт выдатнага выканання агранамічных патрабаванняў у працэсе вырошчавання сельскагападарчых культур.

У жывёлагадоўлі, якая таксама была разлічана на выкарыстанне пераважна ручной працы, высокія паказчыкі пры разгортванні стаханаўскага руху сталі вынікам выдатнага дагляду за жывёламі і ўсталявання сістэмы іх якаснага корму. Так, сярод свінароў рэспублікі сваёй працай стаў вядомы стаханавец М. Зуеў, які за кошт прымянення пералічаных метадаў дабіўся жывога прыплоду свіней да 150 % ад плана і росту іх сярэднесутачнай вагі да 1000 г [197, с. 108]. У сферы авечкагадоўлі стаханавец У. Шкарадзёнак амаль удвая павялічыў вытворчы выхад поўсці ад авечак і дабіўся сярэдняга прыплоду да 1,5 ягнёнка ад аўцаматкі [81, арк. 16].

Першыя месяцы разгортвання стаханаўскагу руху былі вызначаны неразуменнем некаторымі гаспадарнікамі яго сутнасці, у выніку чаго на частцы гаспадарчых адзінак залічэнне ў групу стаханаўцаў праходзіла ў адвольным парадку ці ў якасці грамадскага заахвочвання. Так, у кастрычніку 1935 г. на Бабруйскай швейнай фабрыцы імя Дзяржынскага фабрычны камітэт і дырэктар устанавілі працэнтныя ліміты норм выпрацоўкі, па якіх вызначалася права таго ці іншага рабочага звацца стаханаўцам [334, с. 3]. Залічэнне ў групу стаханаўцаў у якасці прэміі за добрасумленную працу практыкавалася начальнікам аднаго з цэхаў Мінскага станкабудаўнічага завода імя Варашылава [117, с. 3]. Па рэкамендацыі мясцовых гаспадарчых кіраўнікоў газета "Калгаснік Любаньшчыны" залічыла ў лік стаханаўцаў тых рабочых МТС, якія толькі ўзялі на сябе абавязацельствы па



Витебский государственный технологический университет

ўдасканаленні рамонту сельскагаспадарчай тэхнікі, але пакуль не выканалі іх [13, с. 3].

У такой сітуацыі змяняецца палітыка ў адносінах да разгортавання стаханаўскага руху, калі ініцыятыва ў гэтым працэсе пераходзіць ад мясцовых партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый да саюзных і рэспубліканскіх органаў, якія заканадаўча замацоўваюць задачы руху і бяруць над ім цэнтралізаваны кантроль. Падобная тэндэнцыя пачала праяўляцца ўжо пасля І Усесаюзнай нарады стаханаўцаў, якая адбылася 14 – 17 лістапада 1935 г. у Маскве. Рашаючым фактарам разгортвання стаханаўскага руху як мэтанакіраванай дзяржаўнай палітыкі становіцца выступленне на нарадзе І. Сталіна. Ён вызначыў рэвалюцыйную сутнасць руху, што ў адрозненні ад іншых форм сацыялістычнага спаборніцтва ажыццявіў карэнную ломку старых тэхнічных норм, праектных магутнасцяў, вытворчых планаў і стварыў новыя, больш высокія паказчыкі вытворчасці. На думку савецкага лідара, менавіта за кошт стаханаўскіх метадаў працы магчымым было не толькі павысіць яе прадукцыйнасць, але і хуткімі тэмпамі пабудаваць сацыялізм. Таму асноўнай задачай, якая стаяла перад кіраўніцтвам краіны, стала актыўная дапамога стаханаўцам у іх працы і далешае развіццё руху па усім СССР. Пры гэтым Сталін зрабіў вялікі акцэнт на ўсталяванні ў вытворчасці новых норм выпрацоўкі, якія павінны былі стаць сярэднімі паміж старымі нормамі і паказчыкамі працы найбольш вядомых стаханаўцаў [352, с. 363 – 373]. Такім чынам, у інтэрпрытацыі Сталіна стаханаўскі рух пераўтвараецца ў важны сродак, з дапамогай якога можна было паспяхова ажыццявіць чарговы скачок у фарсіраваным індустрыяльным будаўніцтве.

Далейшыя задачы дзяржавы па разгортванні стаханаўскага руху былі вызначаны на Снежаньскім Пленуме ЦК УКП(б) у 1935 г. і прадубляваны на Пленуме ЦК КП(б)Б 14 – 17 студзеня 1936 г. у пастанове “Практычныя мерапрыемствы па разгортванні стаханаўскага руху ў прамысловасці БССР”. Саюзнае і рэспубліканскае кіраўніцтва патрабавала ад мясцовых кіраўнікоў і гаспадарнікаў разгортвання шырокай працы па замацаванні стаханаўскіх рэкордаў і іх далейшай папулярызацыі сярод працоўных, а таксама актыўнага ўкаранення новых стаханаўскіх метадаў ва ўсіх галінах прамысловасці. Арыентуючыся на змест выступлення Сталіна на І Усесаюзнай нарадзе стаханаўцаў, па выніках новых працоўных рэкордаў планаваўся перагляд норм выпрацоўкі ў бок іх павелічэння, што павінна было замацоўвацца на спецыяльных галіновых канферэнцыях [183, с. 193 – 196; 185, с. 185]. Такім чынам, у эканоміцы дзяржава ўсталявала новыя прынцыпы, заснаваныя на карэннай змене паказчыкаў вытворчасці і максімальным прымяненні стаханаўскіх метадаў працы на ўсіх гаспадарчых адзінках. У сувязі з чым 1936 г. аб’яўляўся



Витебский государственный технологический университет

стаханаўскім годам, які павінен быў стаць ключавым момантам у працэсе канчатковага пераводу вытворчасці на новы рэжым працы, пры якім пастаянна б павышалася яе прадукцыйнасць і адпаведна дзейнічалі больш высокія нормы выпрацоўкі [318, с. 15, 45]. У сельскай гаспадарцы стаханаўскай абвяшчалася ў гэты год вясенняя пасяўная кампанія [86, арк. 36].

У выніку ўзрастаючага працоўнага энтузіязму рабочых і калгаснікаў і мэтанакіраванай палітыкі дзяржавы па разгортванні стаханаўскага руху, у рэспубліцы, як у цэлым па СССР, у канцы 1935 г. – першыя месяцы 1936 г. назіраецца сапраўдны ўздым гэтай формы сацыялістычнага спаборніцтва, які абазначыўся павелічэннем колькасці яе ўдзельнікаў і новым павышэннем прадукцыйнасці працы. Калі, напрыклад, на Мінскім гарбарным заводзе імя Куйбышава доля стаханаўцаў на 1 лістапада 1935 г. складала 30,1 %, то на 1 студзеня 1936 г. іх ужо было 40,4 % [246, арк. 31]. На кандытарскім камбінаце “Спартак” на 17 кастрычніка 1935 г. стаханаўцамі былі 78 рабочых (6,5 % ад агульнага складу), на 1 снежня 1935 г. – 183 рабочых (15,1 %), а на 15 студеня 1936 г. – 256 рабочых (23,4 %) [Дадатак А, Табліца А.1].

Актывізацыя стаханаўскіх тэмпаў працы станоўча паўплывала на выкананне вытворчых планаў па ўсёй рэспубліцы. Так, за студзень 1936 г. сярод галін Народнага камісарыята мясцовай прамысловасці высокім узроўнем перавыканання планаў адзначыліся металургічная прамысловасць – 390,4 %, трыкатажная – 148,8 %, гарбарна-абутковая – 138 %, дрэваапрацоўчая – 148,1 % і іншыя [246, арк. 31]. З прадпрыемстваў адзначаных галін асабліва вылучылася, для прыкладу, Добрушская папяровая фабрыка, дзе за кошт уздыму стаханаўскага руху да 22 снежня 1935 г. упершыню датэрмінова быў выкананы дзяржаўны гадавы план па паперы і цылюлозе [251, арк. 39]. Разгортванне стаханаўскага руху ў сельскай гаспадарцы БССР прывяло да росту за 1935 г. усіх відаў жывёл: пагалоўе буйной рагатай жывёлы павялічылася на 23,7 %, коней – на 0,9 %, авечак і коз – на 12,4 %, свіней – на 34,4 %, такі рост адбыўся ўпершыню пасля 1928 г. [37, с. 75]. У прыватнасці па Бабруйскім раёне на пачатак 1936 г. у параўнанні з 1934 г. сярэднегадавы ўдой на 1 карову павялічыўся з 800 літраў да 1300 літраў, сярэдні выхад парасят на 1 свінаматку ад 3 да 6,6 галоў, выхад цялят на 100 кароў ад 73 да 99 галоў, выхад ягнят на 100 аўцаматак – ад 91 да 110 галоў, выхад жарабят на 100 конематак – ад 20 да 23,3 галоў [88, арк. 31]. За кошт прымянення стаханаўскіх метадаў працы частка гаспадарак датэрмінова завяршыла пасяўную кампанію вясной 1936 г. Так, па рэспубліцы пасеў зерневых культур планавалася скончыць да 15 мая, але, напрыклад, калгасы “Камунар” Нараўлянскага раёна, “Новы свет” Лёзненскага раёна і “Чырвоны партызан” Мінскага раёна завяршылі пасяўную кампанію да 1 мая [263, арк. 86; 266, арк. 116, 120, 129]. У



Витебский государственный технологический университет

цэлым вясной 1936 г. планавыя нормы работы пры апрацоўцы мягкага ворыва былі выкананы па БССР на 139,7 % [431, с. 96].

Для далейшага замацавання вынікаў стаханаўскай працы і іх распаўсюджвання сярод астатніх членаў працоўных калектываў па рэспубліцы планавалася правядзенне стаханаўскіх змен, сутак, тыдняў і дэкад. Падчас адзначаных мерапрыемстваў меркавалася стварыць самыя спрыяльныя ўмовы для павышэння прадукцыйнасці вытворчасці ў асобных цэхах ці на прадпрыемствах у цэлым, а таксама выпрацаваць узорную мадэль ажыццяўлення вытворчых працэсаў, па якой прадугледжвалася для працоўных дзейнічаць і далей [267, арк. 21 – 22]. Стаханаўскія суткі былі, напрыклад, праведзены 8 студзеня 1936 г. на віцебскай фабрыцы "Прафінтэрн". Напярэдадні на прадпрыемстве адбыліся сходы, дзе вызначаліся канкрэтныя вытворчыя планы на адзначаныя суткі для структурных падраздзяленняў, а таксама асобных рабочых, абмяркоўвалася прымяненне стаханаўскіх метадаў і іх далейшае пашырэнне. Для павышэння тэмпаў вытворчых працэсаў былі загадзя падрыхтаваны неабходная сыравіна і інструменты, а за кожным цэхам былі замацаваныя члены партыйнага камітэта. У выніку праз стварэнне самых спрыяльных умоў для працы і вызначэння пэўных заданняў для кожнага рабочага стаханаўскімі тэмпамі працы ўдалолся ахапіць 25 % усяго складу фабрыкі, і акрамя вядомых да гэтага ініцыятараў стаханаўскага руху Кагана, Гершмана, Маэўрмана, Савіцкага сваёй выдатнай працай і ўдасканаленнем вытворчасці вылучыліся новыя перадавікі: Смаргон (выканаў 180 % плана), Русіна (180 %), Хахлова (253 %) і іншыя [70, арк. 17 – 19]. Стаханаўская пяцідзёнка была праведзена з 3 па 8 лютага 1936 г. на Чырвонапольскай МТС, дзе за кошт выдатнай арганізацыі вытворчага працэсу норма па рамонту сельскагаспадарчай тэхнікі перавыконвалася ў сярэднім на 250 % за дзень [264, арк. 49]. На Рэчыцкай запалкавай фабрыцы "Х Кастрычнік" 10 студзеня 1936 г. была праведзена стаханаўская змена, а 21 студзеня – стаханаўскія суткі. На аснове іх правядзення з 5 па 15 лютага на прадпрыемстве была арганізавана ўжо стаханаўская дэкада, падчас якой на высокім узроўні было пастаўлена ўзаемадзеянне паміж цэхамі і размеркавана працоўная сіла. Вынікамі дэкады стала тое, што сярэднесутачная выпрацоўка прадукцыі павялічылася на 6,5 % у параўнанні са студзенем 1936 г., прадукцыйнасць працы ў параўнанні з тым жа месяцам павысілася на 8 %, а колькасць стаханаўцаў стала складаць 60 % ад усяго складу рабочых [246, арк. 15 – 16]. Правядзенне падобных мерапрыемстваў павінна было ў далейшым адзначацца паступовым пераходам да стаханаўскага года і шырокім распаўсюджваннем удасканаленых метадаў вытворчасці. Так, напрыклад, Магілёўскі гарбарны завод імя Сталіна з 2 лютага 1936 г. пачаў праводзіць стаханаўскі месяц [246, арк. 50].



Витебский государственный технологический университет

У працэсе развіцця стаханаўскага руху як новай формы сацыялістычнага спаборніцтва, заснаванай на ўдасканаленні магчымасцяў тэхнікі, сярод яго ўдзельнікаў назіраецца рост вынаходніцтва і новых рацыяналізатарскіх прапаноў. Напрыклад, на Віцебскім ігольным заводзе стаханаўцам Хаткоўскім быў сканструяваны апарат для нанізвання іглаў, які дазволіў павялічыць іх выпуск з 4 да 8 тысяч штук [65, арк. 49]. На Мінскім піваварaным заводзе "Беларусь" стаханаўцамі-рацыяналізатарамі быў вынайдзены працэс больш цёплага бражэння пры варцы піва, што павысіла прадукцыйнасць завода да 85 тысяч гекалітраў за год [243, с. 4]. Механік Барысаўскага шклозавода імя Дзяржынскага І. Забалотнікаў вынайшаў машыну для нанясення малюнкаў на сартавы шкляны посуд, машыну для праціранння пробак да графінаў, удасканаліў працу газагенератарных каробак [270, арк. 7]. Па Гомелі за люты – кастрычнік 1936 г. на прадпрыемствах стаханаўцамі было ўнесена 794 рацыяналізатарскія прапановы, з якіх было рэалізавана на практыцы 421 [96, арк. 4].

Новай формай арганізацыі вытворчага працэсу і масавага ўключэння ў сацыялістычнае спаборніцтва становяцца стаханаўскія скразныя брыгады, у склад якіх уваходзілі лепшыя рабочыя, занятыя на розных узаемазвязаных паміж сабой аперацыях, на аснове чаго прадпрыемствы дабіваліся высокіх тэмпаў выпрацоўкі на ўсіх этапах выпуску прадукцыі. Так, у маі 1936 г. пачала сваю дзейнасць стаханаўская скразная брыгада у 1-м хромавым цэху гарбарнага завода "Бальшавік". У склад гэтай брыгады ўваходзілі лепшыя строгалі, мяздрыльшчыкі, дубільшчыкі і падсобныя рабочыя, якія дапамагалі перадавікам у ажыццяўленні вытворчых рэкордаў [406, с. 4]. У Віцебску на панчошна-трыкатажнай фабрыцы імя К. Цэткін была аганізавана стаханаўская скразная брыгада, якая аб'яднала ў сабе асобныя участкі працы трыкатажнага і мотальнага цэхаў. У выніку дзейнасці дадзенай брыгады выкананне плана вязкі павялічылася ад 103 % да 112 %, а працэсу кетлёўкі – ад 129 % да 140 % [141, с. 3].

Стаханаўскі рух атрымаў распаўсюджванне не толькі ў вядучых галінах прамысловасці, транспарту і сельскай гаспадаркі БССР, але і ў іншых сферах эканомікі і грамадскага жыцця. Так, у лютым 1936 г. у Мінску адбылася Усебеларуская нарада стаханаўцаў грамадскага харчавання, дзе вызначалася, што стаханаўскі рух у гэтай сферы праявіўся ў паляпшэнні якасці прыгатаванай ежы, пашырэнні асартыменту блюд і павышэнні культуры абслугоўвання наведвальнікаў сталовак, рэстаранаў і іншых устаноў грамадскага харчавання [454, с. 4]. Па прынцыпе лепшага абслугоўвання пакупнікоў стаханаўскі рух разгортваўся і ў сферы гандлю. Тут у якасці лепшых стаханавак праявілі сябе работнікі гандлёвай сеткі Мінска. Напрыклад, Е. Маразевіч



Витебский государственный технологический университет

(гастраном № 1) у пачатку 1936 г. дабілася павелічэння абароту тавараў на 25 %, а супрацоўніца трыкатажнага аддзела ГУМа Б. Фішельман выканала гандлёвы план за красавік 1936 г. на 219 % [432, с. 8, 11]. З 10 па 20 лютага 1936 г. у БССР была праведзена Усесаюзная стаханаўская дэкада паляўнічага промыслу, падчас якой за кошт прымянення брыгаднага метаду паляўнічыя саўгасаў і калгасаў павінны былі дабіцца высокіх паказчыкаў у нарыхтоўцы пушніны [456, с. 4]. Цікавыя факты разгортвання стаханаўскага руху можна было назіраць у сферы адукацыі. Напрыклад, настаўніца Пруднікава з Гомеля адзначала, што яе ўдзел у стаханаўскім руху знаходзіў сябе ў выяўленні здольнасцяў і інтарэсаў кожнага з вучняў, чым павышалася агульная паспяховасць па школе, ствараліся спрыяльныя ўмовы для выхавання будучых савецкіх грамадзян [93, арк. 81].

Адзначаныя прыклады паказваюць, што стаханаўскі рух на самым пачатку свайго развіцця ўспрымаўся як найвышэйшае праяўленне грамадскай актыўнасці і імкненне да ўдасканалення любога віду дзейнасці, на аснове чаго меркавалася перабудаваць і грамадства ў цэлым. Так, стаханаўскі рух, які першапачаткова разгортваўся ў матэрыяльнай вытворчасці, набыў форму своеасаблівай агульнай ідэі паляпшэння працоўнай дзейнасці, калі на першае месца ставіўся такі фактар, як добрасумленнае і якаснае выкананне сваіх абавязкаў. Падобная эйфарыя ад стаханаўскага руху працягвалася нядоўгі час, і яго праяўленне ў пералічаных вышэй сферах хутка прыпынілася, калі ў цэлым пачалі назірацца крызісныя з'явы ў разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва.

У першым паўгоддзі 1936 г. у адпаведнасці з пастаўленымі мэтамі павышэння тэмпаў вытворчасці на аснове дасягнутых стаханаўскіх вынікаў працы адбываўся перагляд вытворчых магутнасцяў і замацаванне больш высокіх норм выпрацоўкі. Для гэтага па рэспубліцы быў праведзены шэраг галіновых канферэнцый, дзе былі ўсталяваны новыя колькасныя і якасныя паказчыкі. Так, на галіновай канферэнцыі гарбарна-абутковай прамысловасці, што адбылася ў сакавіку 1936 г., для прадпрыемстваў замест ранейшай вытворчай магутнасці ў 3500 тысяч пар абутку былі вылучаны новыя нормы памерам у 5750 тысяч пар, а для дражжавой прамысловасці, напрыклад, нормы выпрацоўкі былі павышаны на 48,8 % [294, арк. 103, 233]. Згодна з рашэннямі адпаведных галіновых канферэнцый тэхнічныя нормы на 24,5 % былі павялічаны на Віцебскай акулярнай фабрыцы, на 53 % – на Гомельскай ложкавай фабрыцы, на 37 % – на Мінскім заводзе "Ударнік" [51, с. 25].

Нягледзячы на тое, што стаханаўскі рух паспрыяў значнаму павышэнню прадукцыйнасці працы і перавыкананню планаў па асобных прадпрыемствах і галінах эканомікі, ажыццявіць запланаванае

Витебский государственный технологический университет

інтэнсіўнае разгортванне адзначанай формы сацыялістычнага спаборніцтва і цалкам перавесці эканоміку на стаханаўскія тэмпы працы не ўдалося. Стаханаўскі рух даваў станоўчыя вынікі там, дзе былі для гэтага рэальныя рэзервы, але пры штучным яго ўвядзенні пачалі назірацца выпадкі дэзарганізацыі кіравання вытворчасцю, збоі ў працэсах выпрацоўкі прадукцыі, былі парушаны вытворчыя сувязі, а на шэрагу прадпрыемстваў не існавала матэрыяльна-тэхнічнай базы для шырокага разгортвання намечаных дзяржавай стаханаўскіх мерапрыемстваў. Пагоня за рэкордамі прыводзіла да празмернай эксплуатацыі тэхнікі, што выклікала яе паломку і пагаршэнне якасці прадукцыі. Стаханаўскі рух суправаджаўся фармальнымі адносінамі кіраўнікоў некаторых гаспадарчых адзінак да яго разгортвання, дзе ўвага надзялілася росту колькасці стаханаўцаў, а не рэальнаму павышэнню прадукцыйнасці працы, акрамя таго, мелі месца такія з'явы, як "штурмаўшчына" і "кампанейшчына", калі стаханаўскія метады працы прымяняліся не сістэматычна, а толькі ў пэўныя адрэзкі часу для таго, каб вывесці прадпрыемства з вытворчага прарыву або для знешняй дэманстрацыі разгортвання сацыялістычнага спаборніцтва. Пералічаныя вышэй тэндэнцыі праяўляліся, напрыклад, ужо ў першыя месяцы 1936 г., калі на прадпрыемствах праводзіліся кампаніі, накіраваныя на пераход да стаханаўскага года. Падчас стаханаўскага тыдня ў студзені 1936 г. на Магілёўскім машынабудаўнічым заводзе імя Дзімітрава не былі дасягнуты высокія вытворчыя паказчыкі з-за недахопу на прадпрыемстве ліставога жалеза і адсутнасці свёрдлаў, замест якіх рабочыя выкарыстоўвалі самаробныя інструменты [261, арк. 166]. У дзень ударніка 11 студзеня 1936 г. Віцебская люстэркавая фабрыка выканала план звыш 200 %, на наступны жа дзень і ва ўсе астатнія дні месяца прадпрыемства выконвала план ніжэй за 70 % [285, арк. 4]. Стаханаўская дэкада, якая пачалася 20 студзеня 1936 г. на Новабеліцкім дрэваапрацоўчым камбінаце імя Гікала, была адменена 25 студзеня з-за матэрыяльна-тэхнічнай непадрыхтаванасці цэхаў [246, арк. 18]. У цэлым частка цагельных, будаўнічых і дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў БССР не змагла замацаваць нормы стаханаўскіх змен і дэкад, што прыводзіла да невыканання планаў вытворчасці [260, арк. 30]. На фармалізм у разгортванні стаханаўскага руху таксама ўказваў член ЦК КП(б)Б Готфрыд на Пленуме партыі 14 – 17 студзеня 1936 г.: "На 10 декабря 1935 года у нас было 11 тысяч стахановцев, сейчас у нас 24 тысячи. Но я этим цифрам не верю, они не дают ещё нам действительного представления о положении вещей. Эти цифры, если хотите, немного пахнут самообманом. Если у нас на самом деле 24 тысячи стахановцев, то, как же можно случиться, что мы не выполняем план первой декады нового 1936 года" [253, арк. 81 – 82].

Витебский государственный технологический университет

У сувязі з увядзеннем новых павышаных норм выпрацоўкі і павелічэннем планавых паказчыкаў пачынаючы з мая 1936 г. адзначаныя намі вытворчыя праблемы яшчэ больш абвастрыліся і мелі месца на некаторых гаспадарчых адзінках да канца другой пяцігодкі. Напрыклад, у маі 1936 г. працоўны калектыў будаўнікоў, у тым ліку стаханаўцы, на ўзвядзенні Вялікага тэатра оперы і балета не змаглі выканаць новыя нормы выпрацоўкі і працягвалі працаваць па старых нарматывах [362, с. 3]. З-за слабай арганізацыі вытворчага працэсу і тэхнічных непаладак у ліпені 1936 г. на прадпрыемствах Віцебска назіраўся спад стаханаўскага руху, што прывяло да невыканання месячнага плана. Так, фабрыка “Сцяг індустрыялізацыі” выканала план толькі на 68 %, а фабрыка імя Кагановіча – на 69 % [445, с. 3]. На Віцебскім ігольным заводзе ў сакавіку 1937 г. пры фармальным перавыкананні стаханаўцамі плана было выяўлена два вагоны неякаснай прадукцыі [73, арк. 48]. Пры правядзенні стаханаўскай дэкады ў лістападзе 1937 г. на Мінскім станкабудаўнічым заводзе імя Варашылава цэхі не былі забяспечаны інструментамі і матэрыяламі, а частка станкоў з-за вялікай нагрузкі спынілі сваю працу, і іх рамонт не быў своечасовы, усе гэта прывяло да выканання плана дэкады толькі на 40 % [439, с. 1]. У той жа час дзяржаўнымі структурамі для прадпрыемстваў ставіліся планы па масавым разгортванні стаханаўскага руху, да чаго апошнія не заўжды былі падрыхтаваныя, на што указвалі падчас сваіх публічных выступленняў і самі стаханаўцы. Для прыкладу, на Усебеларускай нарадзе стаханаўцаў 10 студзеня 1937 г. кіраўніцтва БССР паставіла задачу павелічэння колькасці ўдзельнікаў стаханаўскага руху ў 2 разы да 1 мая 1937 г, на што запярэчыў адзін з перадавікоў, які адзначыў нерэальнасць ажыццяўлення пастаўленай задачы ў такі кароткі прамежак часу [296, арк. 36 – 37]. На той жа нарадзе стаханаўцы дрэваапрацоўкі ўказалі, што рост удзельнікаў стаханаўскага руху не можа быць забяспечаны на высокім узроўні з-за адсутнасці неабходнай сыравіны і яе несвоечасовай дастаўкі [296, арк. 41].

На частцы прадпрыемстваў разам з недахопамі на вытворчых працэсах назіралася тэндэнцыя памяншэння колькасці ўдзельнікаў стаханаўскага руху. Напрыклад, на Мінскім дрэваапрацоўчым заводзе імя Молатава ў ліпені 1936 г. 44 % рабочых не выконвалі месячнага плана, пры гэтым ў параўнанні з красавіком таго ж года колькасць стаханаўцаў зменшылася на 46 чалавек [290, арк. 281 – 282]. Калі на 1 сакавіка 1936 г. на Мінскай абутковай фабрыцы імя Кагановіча налічвалася 465 стаханаўцаў, то праз год, 1 сакавіка 1937 г., іх было ўжо 392 [393, с. 3]. На Гомельскім вагонарамонтным заводзе імя Ланцуцкага у пачатку 1937 г. у вагонным цэху было 599 стаханаўцаў, а ў сакавіку таго ж года іх лік зменшыўся да 411, у зборачным цэху ў студзені 1937 г. стаханаўцамі былі 255 чалавек, а на канец сакавіка – 201 чалавек [469,

Витебский государственный технологический университет

с. 3]. Калі за студзень 1936 г. – сакавік 1937 г. на такіх прадпрыемствах Віцебска, як шчацінна-шчотачны камбінат, фабрыка "Сцяг індустрыялізацыі", акулярная фабрыка, станкабудаўнічы завод імя Кірава назіраўся стабільны рост колькасці стаханаўцаў, то на фабрыцы "КІМ", фабрыцы імя Лекерта, фабрыцы "Прагрэс" колькасць стаханаўцаў змяншалася, на фабрыцы імя Кагановіча і ігольным заводзе дынаміка ліку ўдзельнікаў стаханаўскага руху насіла скачкападобны характар, што было адзначана то ростам, то памяншэннем колькасці адзначанай катэгорыі перадавікоў [Дадатак А, Табліца А.2].

Негатыўныя з'явы ў працэсе разгортвання стаханаўскага руху можна было назіраць і ў сельскай гаспадарцы БССР, якія былі звязаны пераважна з працэсам самой арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва. Так, па Чавускім раёне вясной 1936 г. стаханаўскі рух не быў разгорнуты ў калгасах "Свабода", "Сталінскі шлях", "Новы шлях", "Непераможны", дзе не было зафіксавана ні аднаго стаханаўца [86, арк. 36, 43, 47, 51, 139]. У ліпені 1936 г. М. Гікала на пасяджэнні старшынь райвыканкамаў указваў на тое, што развіццё стаханаўскага руху ў калгасах пры ўборцы ўраджаю адышло на другі план, а прыклады дасягненняў асобных стаханаўцаў не распаўсюджваюцца ў працоўных калектывах [262, арк. 58]. Па Ветрынскім і Дрысенскім раёнах мясцовымі партыйнымі органамі ў снежні 1936 г. было ўстаноўлена, што кіраўніцтва часткі калгасаў не вядзе ніякага ўліку стаханаўцаў пры перавыкананні калгаснікамі норм, а таксама не садзейнічае распаўсюджванню сацыялістычнага спаборніцтва [147, арк. 523, 538]. На некаторых гаспадарчых адзінках стаханаўскі рух хоць і быў разгорнуты, але інтэсіўнае выкананне планавых паказчыкаў прыводзіла да вытворчых збояў. Напрыклад, у саўгасах Віцебскага Саюзмалтрэста засяроджванне сіл на перавыкананні планаў уборкі ўраджаю 1936 г. не дазволіла у дастатковай меры заняцца іншымі сельгаспадарчымі працамі, дзе ў выніку ўзнікалі недахопы [68, арк. 44].

Пералічаныя вышэй недахопы ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы ставіліся ў віну мясцовым кіраўнікам і гаспадарнікам, у рамках чаго і была разгорнута палітычная кампанія у барацьбе са "шкоднікамі" і "сабатажнікамі" стаханаўскага руху.

Пэўнае зніжэнне тэмпаў стаханаўскага руху на асобных гаспадарчых адзінках і праяўленне недахопаў у яго разгортванні не перашкодзілі, аднак, павышэнню прадукцыйнасці вытворчасці, пры гэтым стаханаўскія формы сацыялістычнага спаборніцтва працягвалі захоўваць сваю знакавасць у сферы працы як важны фактар эканамічнага пад'ёму, а рабочыя і калгаснікі імкнуліся ўдасканаліць свае прафесійныя навыкі і паказвалі прыклады гераічнай вытворчай дзейнасці. Так, сярод стаханаўцаў прамысловасці вылучалася катэгорыя двухсотнікоў, якія за кошт удасканалення працы пастаянна выконвалі



Витебский государственный технологический университет

нормы ад 200 % і вышэй. Па Віцебску, напрыклад, на 1 лютага 1937 г. на станкабудаўнічым заводзе імя Кірава налічвалася 64 двухсотніка, на фабрыцы “КІМ” – 40, на фабрыцы імя Лекерта – 10, на шчацінна-шчотачным камбінаце – 8 [73, арк. 53]. У прыватнасці, на апошнім прадпрыемстве двухсотнікамі былі наступныя стаханаўцы: Грэф – сярэдняя выпрацоўка складала 250 % плана, Емяльянаў – 210 %, Галубоўскі – 225 %, Максімушкін – 240 %, Мінц – 280 %, Петрашкін – 290 %, Гольдзін – 230 %, Філіпаў – 290 % [62, арк. 34]. На Мінскай абутковай фабрыцы імя Кагановіча стаханавец Залескі павысіў прадукцыйнасць працы ад 102 % у верасні 1937 г. да 240 % у лістападзе таго ж года [417, с. 4]. У некаторых выпадках праца стаханаўцаў была адзначана перавыкананнем норм у 4 – 5 разоў. Лепшы стаханавец Мінскага станкабудаўнічага завода імя Кірава Гімельштэйн пры выпуску піл выканаў норму за кастрычнік 1937 г. на 500 % [22, с. 1]. Стаханавец Коц (Бабруйская мэблевая фабрыка імя Халтурына) на працэсе дрэваапрацоўкі дабіўся выканная нормы да 400 % [45, с. 2].

У сельскай гаспадарцы стаханаўскія формы працы па-ранейшаму атрымлівалі распаўсюджванне сярод рабочых МТС. Восенню 1936 г. стаханавец В. Ліпень (Пухавіцкая МТС) апрацаваў 1208 га пашы і зэканоміў 2600 кг гаручага, стаханавец Т. Слабодчыкаў (Чырвонапольская МТС) апрацаваў 1223 га, зэканоміўшы 6000 кг гаручага, стаханавец Д. Асадчык (Церахаўская МТС) апрацаваў 1180 га пры эканоміі гаручага ў 2120 кг, стаханавец К. Свірыд з Хойніцкай МТС на малатарне МК1100 намалаціў 1674 ц зерня [399, с. 34]. Актыўна стаханаўскія метады па БССР прымяняліся ў ільнаводстве, дзе ў рамках сацыялістычнага спаборніцтва ў 1936 г. узнікае рух тысячніц, нікіраваны на дасягненне ўраджаю ільну да 1000 кг з гектара. У 1936 г. у Дрысенскім раёне вылучыліся стаханаўкі А. Грыгуць і В. Валенцік, звенні якіх амаль дасягнулі такой мэты і сабралі адпаведна па 9,24 і 8,94 ц ільноваракна з га [147, арк. 160]. Ураджай каля 10 ц з га ў 1937 г. у Чавускім раёне сабралі стаханаўскія звенні В. Дзюбаковай, М. Маханенкавай, К. Лазарэнка і В. Сапраненкавай [474, с. 41].

У гады трэцяй пяцігодкі дзяржаўнымі і партыйнымі органамі стаханаўскі рух вызначаўся як важны элемент павышэння прадукцыйнасці працы, павелічэння колькасці прадукцыі, а таксама ўмацавання абароназдольнасці рэспублікі [280, арк. 7]. На прадпрыемствах былі замацаваны дасягненні другой пяцігодкі і стаханаўцы працягвалі ўдасканальваць сваю працу. Напрыклад, лепшы стаханавец Віцебскага станкабудаўнічага завода імя Кірава Лін, працуючы на працэсе коўкі дэталяў, 6 студзеня 1938 г. даў 218 адзінак прадукцыі за змену пры норме 21 адзінкі, выканаўшы план на 1038 % [329, с. 4]. У лютым 1938 г. падчас стаханаўскага месячніка высокія ўзоры працы паказалі лесарубы БССР: стаханаўцы Я. Астрэйка і



Витебский государственный технологический университет

С. Мікула, працуючы лучковай пілой, выконвалі норму да 570 %, стаханаўцы К. Маславік і М. Чыгір давалі за змену да 70 $м^3$ драўніны (485 % нормы) [171, с. 3]. У шэрагах працоўных акрамя раней вядомых стаханаўцаў узнікалі новыя імёны вытворчых герояў. Так, на Мінскай швейнай фабрыцы "Кастрычнік" сваёй выдатнай працай вылучылася стаханаўка М. Дружыга, а на Мінскім станкабудаўнічым заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі атрымаў вядомасць рабочы Лоўскі [17, 19; Дадатак Б, Малюнак Б.1, Малюнак Б.2]. У студзені 1939 г. лесаруб В. Гоцін з Асіповіцкага леспрамгаса за кошт эфектыўнага размеркавання працы ў сваёй брыгадзе дасягнуў выканання норм да 300 %. З цягам часу па яго метадах пачалі працаваць і астатнія перадавікі дрэваапрацоўчай галіны рэспублікі, што пачалі называцца ў грамадстве гоцінцамі [273, арк. 109 – 110; 382, с. 213]. А на Мінскім аддзяленні Заходняй чыгункі разгарнуўся рух папавінцаў па імені яго ініцыятара – машыніста Папавіна [381, с. 218].

Стаханаўскі рух як форма сацыялістычнага спаборніцтва ў гады трэцяй пяцягодкі атрымлівае шырокае распаўсюджванне і ў сельскай гаспадарцы, што было звязана з умацаваннем тут грамадскай вытворчасці ў форме калгасаў і саўгасаў. У перыядычных выданнях ўсё часцей упаміналіся імёны стаханаўцаў, што праявілі сябе ў жывёлагадоўлі і раслінаводстве. Так, у жывёлагадоўлі па выніках 1938 г. вылучаліся ў якасці самых лепшых стаханавак БССР даяркі С. Ворс, Г. Мелех, Г. Волчанка, якія дасягнулі сярэднегадавых удояў ад 1 каровы да 2000 літраў і вышэй, свінарка Г. Кулікоўская, што дабілася сярэдняга выхаду 18,7 парасят ад свінаматкі [312, арк. 66; 345, с. 6; 421, с. 10; 449, с. 10]. У сферы ільнаводства вядомымі сталі імёны стаханавак М. Пліско і М. Азяевай, якія ў 1939 – 1940 гг. выконвалі нормы на апрацоўцы льну на 150 – 200 % [49, с. 16; 150, с. 14].

Працоўны энтузіязм стаханаўцаў праявіўся падчас трэцяй пяцігодкі ў новай яго форме – руху за шматстаночнае абслугоўванне і сумяшчэнне прафесій, што зарадзіўся летам 1939 г. і паспрыяў далейшаму павышэнню прадукцыйнасці працы. Напрыклад, першай шматстаночніцай Мінскага станкабудаўнічага завода імя Кірава стала зубафрэзероўшчыца Б. Леонас [15; Дадатак Б, Малюнак Б.3]. На Гомельскім станкабудаўнічым заводзе імя Кірава ўдзелам у новай форме стаханаўскага руху быў адзначаны рабочы Кавалёў, які стаў працаваць на 4 фрэйзерных станках, на аснове чаго сістэматычна даваў за змену па дзве нормы [367, с. 3]. Высокай прадукцыйнасці працы дасягнуў таксама стаханавец Верхаглядаў з Магілёўскага трубаліцейнага завода праз сумяшчэнне сваёй асноўнай прафесіі фармоўчшыка з абавязкамі заліўшчыка труб [436, с. 3]. Гэтыя формы стаханаўскага руху таксама артымалі шырокае распаўсюджванне сярод рабочых. Так, на 1 студзеня 1940 г. на Мінскім станкабудаўнічым



Витебский государственный технологический университет

заводзе імя Варашылава налічвалася 20 шматстаночнікаў, а на Мінскай швейнай фабрыцы "Кастрычнік" іх было 30, і 90 стаханаўцаў сумяшчалі выкананне некалькі прафесій [272, арк. 98; 276, арк. 4].

Актывізацыя стаханаўскага руху стала асновай для планавання з боку дзяржавы новага прамысловага скачка, што, як і ў 1936 г., быў адзначаны павышэннем норм выпрацоўкі ў некаторых галінах прамысловасці БССР з арыентацыяй на паказчыкі працы стаханаўцаў. Так, напрыклад, у студзені 1940 г. нормы выпрацоўкі былі павышаны на прадпрыемствах харчовай прамысловасці: у хлебнай прамысловасці – на 12 %, кандытарскай – на 12,2 %, дражжавой – на 12,9 %, махорачнай – на 5 %. Паралельна з павышэннем норм на прадпрыемствах былі зніжаны здзельныя расцэнкі. Па Магілёўскім плодасушыльным заводзе расцэнкі былі зніжаны на 7,4 %, на Барысаўскай макароннай фабрыцы – на 5,2 %, па крухмальных заводах БССР – на 2,3 % [282, арк. 1 – 2].

Стаханаўскі рух паступова набываў масавы характар, і рост удзельнікаў гэтай формы сацыялістычнага спаборніцтва быў відавочным. Напрыклад, на Мінскім гарбарным заводзе "Бальшавік" напрыканцы 1935 г. налічвалася 178 стаханаўцаў, а на пачатак 1938 г. іх было зафіксавана 378 [385, с. 2]. Калі на заводзе "Гомсельмаш" у снежні 1935 г. было 177 стаханаўцаў, то ў верасні 1938 г. – 857 удзельнікаў руху [9, с. 2]. Значны рост колькасці стаханаўцаў назіраецца на вядучых прадпрыемствах Віцебска: на шчацінна-шчотачным камбінаце 1 сакавіка 1937 г. стаханаўцамі былі 463 рабочых, а на 1 студзеня 1939 г. – 608, на фабрыцы "КІМ" за адзначаны перыяд колькасць стаханаўцаў павялічылася з 1726 да 3310 чалавек, на станкабудаўнічым заводзе імя Кірава – з 365 да 435 чалавек, на фабрыцы імя Кагановіча – з 216 да 482 чалавек [72, арк. 21; 275, арк. 15]. На некаторых прадпрыемствах стаханаўцы нават складалі абсалютную большасць ад агульнага складу рабочых. Напрыклад, на 1 студзеня 1941 г. Мінская швейная фабрыка імя Крупскай налічвала 69,7 % стаханаўцаў ад агульнай колькасці рабочых, а на Мінскай скургалантарэйнай фабрыцы імя Куйбышава стаханаўцы складалі 62,9 % [104, арк. 10]. На частцы прадпрыемстваў узнікалі цэлыя стаханаўскія брыгады: найбольш распаўсюджаны яны былі, напрыклад, у лёгкай прамысловасці БССР. Так, на май 1939 г. па Дняпроўскай мануфактуры, Аршанскай ватнай фабрыцы і Якаўлевічскай суконнай фабрыцы было зафіксавана 7 стаханаўскіх брыгад з агульнай колькасцю 214 чалавек [271, арк. 222; 281, арк. 20]. На Мінскім станкабудаўнічым заводзе імя Варашылава ў лютым 1939 г. дзейнічала 14 стаханаўскіх брыгад [275, арк. 24]. Усяго па прамысловасці БССР на 1 верасня 1936 г. сярод рабочых налічвалася 34,8 % стаханаўцаў, на 1 студзеня 1938 г. – 39,4 %, на 1 студзеня 1939 г. – 46,5 %, а на 1 студзеня 1940 г. – 48,6 %. [104, арк. 10; 276, арк. 66]. Колькасны рост стаханаўцаў назіраецца таксама ў сельскай гаспадарцы.

Витебский государственный технологический университет

Па жывёлагадоўчых фермах БССР на 1 студзеня 1936 г. налічвалася 416 стаханаўцаў, а на 1 студзеня 1937 г. іх было ўжо 2157 [308, арк. 56; 431, с. 101]. У 1939 г. стаханаўцы складалі 42 % ад удзельнікаў сацыялістычнага спаборніцтва ў гаспадарках Народнага камісарыята саўгасаў БССР [411, с. 192]. Падобнае павелічэнне колькасці стаханаўцаў, безумоўна, прадвызначалася праяўленнем працоўнага энтузіязму з боку рабочых і калгаснікаў, але пры гэтым нельга адмаўляць і адміністрацыйных мер, калі партыйныя і дзяржаўныя структуры ставілі для прадпрыемстваў і гаспадарак задачы па масавым разгортванні стаханаўскага руху, якія неадкладна павінны былі выконвацца. Акрамя таго, частцы працоўных з боку гаспадарчых кіраўнікоў штучна ствараліся больш спрыяльныя ўмовы для павышэння прадукцыйнасці вытворчасці.

Пры такіх абставінах на фоне значнага росту колькасці стаханаўцаў некаторыя гаспадарчыя адзінкі падчас трэцяй пяцігодкі сутыкалася з шэрагам арганізацыйных і вытворчых праблем, якія мы назіралі яшчэ ў першыя гады разгортвання стаханаўскага руху. Напрыклад, у лютым 1938 г. у БССР была праведзена стаханаўская дэкада на лесанарыхтоўках, дзе у першыя 5 дзён было вывезена 117000 $м^3$ лесу, а ў наступныя 5 дзён з-за тэхнічных збояў тэмпы вывазу былі зніжаны на 12000 $м^3$ [423, с. 2]. На некаторых прадпрыемствах пры павелічэнні тэмпаў вытворчасці назіраліся частыя прастоі і, як вынік, адваротная дынаміка змяншэння ліку стаханаўцаў. Калі на 1 студзеня 1940 г. на прадпрыемствах мясцовай прамысловасці БССР налічвалася 53 % стаханаўцаў ад агульнага складу рабочых, то на 1 лютага таго ж года іх было 48,5 % [272, арк. 245]. Зніжэнне колькасці стаханаўцаў у 1940 г. назіраецца на частцы мінскіх прадпрыемстваў: за перыяд з 1 ліпеня 1940 г. па 1 студзеня 1941 г. на швейнай фабрыцы “Кастрычнік” колькасць стаханаўцаў была зменшана на 40 чалавек, на фабрыцы “Камунарка” – на 59 чалавек, на трыкатажнай фабрыцы “Чырвоны тэкстыльшчык” – на 30 чалавек, на шклозаводзе “Пралетарыят” – на 30 чалавек [104, арк. 10]. Пры вызначэнні колькасці стаханаўцаў па-ранейшаму можна было назіраць праявы фармалізму з боку гаспадарнікаў, калі працоўныя лічыліся стаханаўцамі толькі “на паперы”, не паказваючы ў рэальнасці высокай прадукцыйнасці вытворчасці. Так, ЦК КП(б)Б у лютым 1940 г. на Мінскім станкабудаўнічым заводзе імя Варашылава былі выяўлены факты, калі стаханаўцы вызначаліся начальнікамі цэхаў па сваім меркаванні без прыцягнення грамадскасці, пры гэтым удзельнікамі руху станавіліся рабочыя, якія перавыконвалі нормы несістэматычна [279, арк. 69]. Такі падыход да разгортвання стаханаўскага руху дазваляе сцвярджаць, што ў цэлым лічбы колькасці стаханаўцаў па БССР былі ў некаторых

Витебский государственный технологический университет

выпадках завышаны і не адпавядалі рэальнаму ўдасканаленню вытворчасці.

Слабае тэхнічнае забеспячэнне, арыентаванасць на ручную працу і праблемы з арганізацыяй вытворчага працэсу ў аграрнай сферы абумоўлівалі адсутнасць стаханаўцаў у шэрагу гаспадарак і ў гады трэцяй пяцігодкі. Так, згодна дадзеных НКУС, па Полацкім раёне ў некаторых калгасах у жніўні 1939 г. не вялося ніякай работы па распаўсюджванні стаханаўскага руху, у выніку чаго колькасць стаханаўцаў не толькі скарацілася, але і ўвогуле калгаснікі перасталі ўдзельнічаць у сацыялістычным спаборніцтве [74, арк. 72].

Нягледзячы на пэўныя недахопы, можна лічыць, што разгортванне стаханаўскага руху аказала значны ўплыў на інтэнсіўны рост аб’ёму валавай прадукцыі і павышэнне прадукцыйнасці працы ў эканоміцы БССР. Так, у 1937 г. аб’ём прамысловай прадукцыі вырас у параўнанні з 1932 г. у 2,5 разы, пры гэтым рост прадукцыйнасці працы павысіўся на 65,5 %. За наступныя два гады прадукцыя прамысловасці яшчэ ўзрасла на 19,1 %, а рост прадукцыйнасці працы ў 1939 г. у параўнанні з 1937 г. павысіўся на 25,3 % [156, с. 304, 369 – 370; 338, с.10]. Павысілася валавая прадукцыя сельскагаспадарчых культур. Калі ў 1934 г. валавы збор зерневых культур складаў 2390 тысяч тон, ільноваладкна – 59,7 тон, бульбы – 6926,8 тон, то у выніку павышэння прадукцыйнасці працы да канца 1937 г. меркавалася ўбраць зерневых культур – 2835,9 тысяч тон, ільноваладкна – 97,3 тоны, бульбы – 9062,5 тон [399, с. 25].

Уключэнне Заходняй Беларусі ў склад БССР у рамках здзяйснення сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў савецкай улады ў 1939 – 1941 гг. было адзначана арганізацыяй стаханаўскага руху сярод працоўных, які быў накіраваны на інтэнсіўную рэканструкцыю эканомікі для больш хуткай інтэграцыі з гаспадаркай усходніх абласцей. У першую чаргу вялікае значэнне надавалася пераўтварэнням у вядучых для заходнебеларускага рэгіёна галінах лёгкай і дрэваапрацоўчай прамысловасці, у якіх і з’яўляюцца першыя стаханаўцы. Савецкая ўлада, напрыклад, паставіла мэту зрабіць з Беластока новы цэнтр тэкстыльнай прамысловасці СССР, які знаходзіўся б на адным узроўні з Іванава. У сувязі з чым стаханаўскі рух быў шырока разгорнуты на Беластоцкім тэкстыльным камбінаце, дзе сваю выдатную працу паказалі перадавікі Медлінскі, Высоцкі, Ліўшыц, Мілер, Елін, выконваючы план па выпуску прадукцыі да 200 % [281, арк. 16; 418, с. 3; 479, с. 2]. Да сакавіка 1941 г. колькасць стаханаўцаў на адзначаным прадпрыемстве ўзрасла да 110 чалавек [447, с. 3]. Сярод стаханаўцаў дрэваапрацоўчай галіны выдатна праявіў сябе лесаруб Міцкевіч (Стаўбцоўскі леспрамгас), які арганізаваў звяно з 6 чалавек, што выконвала норму выпрацоўкі ў сярэднім да 300 % [272, арк. 110]. На Скідзельскім



Витебский государственный технологический университет

гарбарным заводзе на 1 мая 1940 г. сваёй стаханаўскай працай вылучылася 47 рабочых [320, с. 4].

Стаханаўскі рух ў Заходняй Беларусі таксама шырока быў разгорнуты ў сферы транспарту і будаўніцтва камунікацый. Так, на Ваўкавыскім, Беластацкім і Гродзенскім чыгуначных вузлах у маі 1941 г. стаханаўцамі з'яўляліся каля 500 рабочых [448, с. 1]. Кіраўніцтва СССР вялікае значэнне надавала фарсіраванай рэканструкцыі ў рэгіёне Днепра-Бугскага канала [358, с. 174], што адпаведна патрабавала вялікіх працоўных намаганняў і ўздыму энтузіязму насельніцтва. Сваёй выдатнай працай тут вылучыліся стаханаўцы-землякопы Голах, Парфёнава, Галынін, якія выконвалі нормы выпрацоўкі да 180 – 200 % [4, с. 4; 114, с. 2].

Нягледзячы на станоўчыя прыклады павышэння прадукцыйнасці вытворчасці і энтузіязму працоўных, у заходніх абласцях БССР не назіралася такога інтэнсіўнага росту стаханаўскага руху, як ва ўсходніх абласцях. Так, напрыклад, у лясной прамысловасці заходнебеларускага рэгіёна на 1 чэрвеня 1940 г. стаханаўцамі з'яўляліся толькі 15,4 % рабочых [278, арк. 59].

Такім чынам, у Заходняй Беларусі пасля яе далучэння да БССР стаханаўскі рух таксама стаў неад'емнай часткай сацыялістычных пераўтварэнняў і з'яўляўся вынікам вялікай арганізацыйнай працы новай улады, што здолела заахвоціць рабочых не толькі да ўдзелу ў грамадскай вытворчасці, але і да праяўленняў высокай ступені працоўнага энтузіязму.

Працэс пераходу да індустрыяльнага грамадства ў СССР, як і ў краінах Заходняй Еўропы, суправаджаўся "фемінізацыяй" галін эканомікі. Ажыццяўленне палітыкі фарсіраванай індустрыялізацыі і калектывізацыі ў савецкай краіне патрабавала як мага больш новых крыніц працы, што выклікала неабходнасць уключэння ў грамадскую вытворчасць жаночай працоўнай сілы.

Пачынаючы з канца 1920-х гг. у індустрыі БССР асабліва актыўна "фемінізацыя" адбывалася ў вядучых для яе галінах лёгкай прамысловасці: трыкатажнай, швейнай, тэкстыльнай і гарбарнай, а пры разгортванні з сярэдзіны 1930-х гг. стаханаўскага руху як новай формы сацыялістычнага спаборніцтва па ўдасканаленні працы і павышэнні яе прадукцыйнасці большасць прамысловых работніц рэспублікі сталі стаханаўкамі менавіта ў гэтых галінах. Так, на красавік 1936 г. на Мінскай скургалантарэйнай фабрыцы імя Куйбышава сярод стаханаўцаў жанчыны складалі 80,9 %, а на Мінскай трыкатажнай фабрыцы – 95,9 % [246, арк. 75]. На Гомельскім аўчынна-шубным заводзе сярод 25 удзельнікаў стаханаўскага руху (на 25 снежня 1935 г.) 19 былі жанчынамі [300, арк. 3]. Большая частка работніц сярод герояў вытворчасці была і на швейнай фабрыцы "Сцяг індустрыялізацыі", дзе



Витебский государственный технологический университет

на сакавік 1936 г. з ліку 419 стаханаўцаў было зафіксавана 360 жанчын [142, с. 3]. Перавага жаночай занятасці ў галінах лёгкай прамысловасці і вялікі працэнт у іх жанчын сярод удзельнікаў стаханаўскага руху тлумачыцца тым, што вытворчыя аперацыі, якія выконваліся тут, былі блізкімі па сваім характары да звычайных хатніх работ і, такім чынам, мелі патрэбу ў асноўным у жаночай працоўнай сіле.

Высокі ўзровень занятасці жанчын назіраўся і ў такіх вядучых галінах прамысловасці рэспублікі, як дрэваапрацоўчая і харчовая, дзе прадстаўніцы жаночага полу таксама актыўна праявілі сябе як стаханаўкі, пераважна на дапаможных аперацыях і на працэсах, якія не былі разлічаны на авалоданне складанай тэхнікай. Так, у снежні 1935 г. па спіртавых заводах рэспублікі колькасць удзельнікаў стаханаўскага руху складала 937 чалавек, сярод якіх жанчын было 227 [433, с. 20 – 21]. Вядомыя ў БССР стаханаўкі З. Таболіна і М. Цыгельніцкая былі, напрыклад, работніцамі кандытарскай фабрыкі "Камунарка". З. Таболіна ўдасканаліла працэс глазіроўкі кандытарскіх вырабаў і выконвала норму на 517 %, а М. Цыгельніцкая на працэсе ўпакоўкі гатовай прадукцыі, дзякуючы добрай арганізацыі свайго працоўнага месца і своечасовай падрыхтоўцы неабходных матэрыялаў, выпрацоўвала больш за 190 % нормы [426, с. 26, 33]. Рэспубліканскую вядомасць атрымалі і стаханаўкі каробачнага цэха Барысаўскай запалкавай фабрыкі Б. Блох, Я. Дзеравяга, М. Кішкурка, якія перайшлі на новыя метады працы і дабіліся выканання норм да 400 % [424, с. 20, 21, 24].

Абсалютная большасць жанчын-стаханавак была сканцэнтравана ў сельскай гаспадарцы рэспублікі. Па-першае, гэта абумоўлівалася самім гендэрным складам вёскі, дзе жаночая частка насельніцтва была большай па колькасці ў параўнанні з мужчынскай. Напрыклад, згодна дадзеным Усесаюзнага перапісу насельніцтва 1937 г., у сельскай мясцовасці БССР пражывала 1926747 мужчын і 2183239 жанчын [131, с. 57]. Па-другое, у сельскай гаспадарцы, нягледзячы на механізацыю вытворчасці, усё ж пераважалі працэсы з выкарыстаннем ручной працы, на якія ў асноўным і прыцягваліся жанчыны і праяўлялі сябе тут у далейшым як удзельнікі стаханаўскага руху. Напрыклад, у шэрагу стаханаўцаў сельскай гаспадаркі Полацкай акругі ў канцы 1935 г. жанчыны складалі 52 % [147, арк. 389 – 391]. У пераліку 14 імён лепшых стаханаўцаў мяса-малочных саўгасаў за 1936 г. СНК БССР было вылучана 10 жанчын-перадавікоў [197, с. 107 – 110].

Жанчыны, занятыя ў сельскагаспадарчай вытворчасці БССР, актыўна ўключыліся ў стаханаўскі рух у малочнай жывёлагадоўлі і свінагадоўлі. Так, у 1936 г. лепшай калгасніцай-стаханаўкай па Полацкім раёне была прызнана свінарка А. Гендзелева, што дасягнула якасных паказчыкаў у сваёй працы пры гадаванні парасят, па Асвейскім

Витебский государственный технологический университет

раёне – даярка Ю. Івашкевіч (дабілася сярэднегадавога надою на адну карову ў 2700 літраў малака), па Дрысенскім раёне – даяркі А. Вахцёрава (1244 літра малака) і П. Цяста (1150 літраў малака), па Ветрынскім раёне – даярка В. Ціханоўская (1800 літраў малака) [146, арк. 264–265]. Сярод работніц саўгасаў рэспублікі выдатна праявіла сябе даярка Е. Башкірава, якая дасягнула рэкордных удояў у 4 – 5 тысяч літраў малака на адну карову за год [197, с. 107].

Значную колькасць сярод стаханаўцаў жанчыны складалі ў ільнаводстве, дзе у працэсе развіцця стаханаўскай кампаніі сялянкі ўдзельнічалі ў руху тысячніц. Жанчыны як стаханаўкі, акрамя таго, актыўна праявілі сябе ў апрацоўцы льновалакна. ЦВК і СНК БССР у снежні 1935 г. выдалі нават асобную Пастанову “Аб узнагароджанні граматамі і падарункамі лепшых калгасніц-ільнотрапальшчыц”, згодна з якой было прэміравана 43 жанчыны-перадавіка [1, с. 1]. Як было сказана вышэй, менавіта на адзначаным сельскагападарчым працэсе былі занятыя вядомыя ў рэспубліцы стаханаўкі П. Пярцова, М. Дзяжурная і С. Быкоўская.

Як вынік, у працэсе мадэрнізацыі савецкага грамадства пачынаецца паступовае сціранне межаў традыцыйнага гендэрнага падзелу працы і засваенне жанчынамі характэрных для мужчын мадэляў сацыяльных паводзін, што прадугледжвалі не толькі ўключэнне ў грамадскую вытворчасць, але і пастаяннае ўдасканаленне метадаў працы, дасягненне яе высокай прадукцыйнасці, удзел у сацыялістычным спаборніцтве.

## 2.2 Асаблівасці статусу стаханаўцаў, іх сацыяльная мабільнасць і роля ў грамадска-палітычным жыцці

З разгортваннем стаханаўскага руху ў асяроддзі рабочых і калгаснікаў вылучылася новая катэгорыя перадавікоў вытворчасці – стаханаўцаў, якая набывае свае спецыфічныя рысы. Рабочы ці калгаснік, атрымаўшы статус стаханаўца, пераходзіў на самую вышэйшую пазіцыю ў шэрагу працоўных і грамадскіх актывістаў. Напрыклад, па вызначэнні ЦСПСБ, сярод перадавікоў вытворчасці вылучаліся тры катэгорыі рабочых: ніжэйшую ступень займалі працоўныя, якія ўдзельнічалі ў сацыялістычным спаборніцтве, на сярэднім узроўні знаходзіліся ўдарнікі, і ў вышэйшую групу перадавікоў уваходзілі стаханаўцы [283, арк. 105]. Падобная класіфікацыя перадавікоў вытворчасці знайшла ў выніку сваё адлюстраванне ў статыстычных матэрыялах прадпрыемстваў. Так, на Віцебскім шчацінна-шчотачным камбінаце ў справаздачы па сацыялістычнаму спаборніцтву за 1938 г. была дакладна вызначана



Витебский государственный технологический университет

колькасць рабочых па катэгорыях стаханаўцаў, ударнікаў і тых працоўных, што прымалі ўдзел ў спаборніцтве [63, арк. 7].

На тое, што стаханаўцы ў шэрагу перадавікоў былі на ступень вышэй за ўдарнікаў, паказвае і працэс залічэння працоўных у групу ўдзельнікаў стаханаўскага руху. Напрыклад, мясцовыя партыйныя органы восенню 1935 г. палічылі памылковымі дзеянні адміністрацыі Мінскай скургалантарэйнай фабрыкі імя Куйбышава, якая прысвойвала статус стаханаўцаў тым рабочым, што давалі звычайнае для ўдарнікаў перавыкананне норм [388, с. 2]. Рабочаму ці калгасніку для таго, каб стаць стаханаўцам, трэба было не толькі перавыконваць нормы выпрацоўкі, але і паказваць больш высокаякасную працу за кошт удасканалення тэхнічных магчымасцяў вытворчага працэсу і новай арганізацыі працоўнай дзейнасці.

Суадносіны паміж становішчам ўдарнікаў і стаханаўцаў прыводзілі ў некаторых выпадках да выкарыстання першых у якасці падсобных рабочых у дапамагу ўдзельнікам стаханаўскага руху. Да стаханаўца Ю. Цэйтліна з Бабруйскага фанернага завода імя Кірава, для прыкладу, адміністрацыя прымацавала ў якасці падсобнай работніцы лепшую ўдарніцу прадпрыемства Полазаву [446, с. 18].

Сацыяльны статус стаханаўцаў меў ідэалагічную афарбоўку: савецкая дзяржава ставіла задачу падкрэсліць высокі прэстыж ў грамадстве тых працоўных, што ўдзельнічалі ў стаханаўскім руху. Таму вельмі часта на афіцыйным узроўні і ў друку яны называліся “знатнымі людзьмі”. Напрыклад, спіс “знатных людзей” на ўзроўні рэспублікі быў складзены СНК БССР па выніках 1935 г., куды ўвайшлі піянеры стаханаўскага руху ў Беларусі: Г. і З. Скабло, С. Розенберг, М. Турэцкі, З. Мілюкоўскі, М. Гуртоўнік, А. Глушакоў, К. Ратнер, Д. Папкова і іншыя [318, с. 23 – 24]. У газеце “Звязда” за красавік 1936 г. лепшыя стаханаўцы лясной прамысловасці Беларусі Шэўко, Туфар, Міцкевіч былі названы “знатнымі людзьмі сплаву” [354, с. 4]. У адносінах да стаханаўцаў сельскай гаспадаркі ў грамадстве былі вызначаны такія статусы, як “знатная даярка”, “знатны свінар”, “знатная цялятніца” і іншыя [197, с. 108 – 109].

Азначэнне “знатныя людзі” прымянялася ў адносінах да перадавікоў вытворчасці яшчэ да разгортвання стаханаўскага руху і разглядалася ў якасці пачэснага і ганаровага статусу, якога можна было дасягнуць дзякуючы вынікам самаадданай працы, прафесійнаму майстэрству і актыўнаму ўдзелу ў грамадскай вытворчасці, што ставілася ў процівагу знаці дарэвалюцыйнага часу, якая займала прывілеяванае становішча ў грамадстве, як правіла, за кошт высакароднага паходжання. Статус “знатных людзей” таксама вызначаў стаханаўцаў як працоўных, якія мелі высокі грамадскі прэстыж за праяўлены энтузіязм у пэўных галінах вытворчасці. Аднак ў адрозненні

Витебский государственный технологический университет

ад папярэдніх па часе перадавікоў стаханаўцы вылучаліся ў грамадстве ў якасці працоўнай эліты, што знайшло сваё адлюстраванне ў імкненні дзяржавы сфарміраваць на іх прыкладзе людзей з узорнымі прафесійнымі і маральнымі якасцямі, забяспечыць іх звышвысокімі заробкамі, аказваць самыя якасныя матэрыяльныя паслугі і павысіць узровень іх культурнага развіцця.

Удзел у стаханаўскім руху адкрываў перад нікому невядомымі раней рабочымі і калгаснікамі перспектыву стаць знакамітымі людзьмі не толькі ў рэспубліцы, але і ва ўсім СССР. Разгортванне руху было адзначана з боку дзяржавы працэсам гераізацыі яго ўдзельнікаў, калі атрыманыя працоўнымі на аснове высокіх вытворчых дасягненняў статусы стаханаўцаў ці "знатных людзей" станавіліся ў прапагандзе тоеснымі статусу герояў. Гераізм стаханаўцаў прадстаўляўся як здзяйсненне працоўных подзвігаў, што былі накіраваны на рэвалюцыйнае пераўтварэнне эканомікі і перавод яе на інтэнсіўныя тэмпы развіцця. Пры гэтым вялікая роля надавалася практычнай значнасці такіх подзвігаў, бо яны паказвалі, як стаханаўцы праз сваю штодзённую самаадданую працу здзяйснялі важныя задачы індустрыяльнага будаўніцтва і калектывізацыі. У сувязі з гэтым першы сакратар ЦК КП(б)Б М. Гікала падчас прыёму ў яго 17 снежня 1935 г. стаханавак-льнотрапальшчыц звярнуўся да іх з наступнымі словамі: "В результате вы нас учите, как нужно без особых разговоров, без шума, сделать маленькое, и одновременно великое дело. И мы прямо скажем людям – берите пример со стахановцев-льноводов, стахановцев промышленности, вот с этих передовых людей, как нужно без шума, не на словах, а на деле выполнять указания нашего великого вождя товарища Сталина" [248, арк. 28].

Як вынік стаханаўцы акрамя таго, што выступалі ў якасці самых лепшых працоўных, уваходзілі ў асобную гераічную катэгорыю людзей, аб'яднаных паміж сабой здзяйсненнем подзвігаў, накіраваных на ўзмацненне палітычнага і эканамічнага становішча рэспублікі і СССР у цэлым. Гераічны вобраз стаханаўцаў разглядаўся ў грамадстве ў тым жа самым кантэксце, што і вобразы герояў Грамадзянскай вайны, герояў-лётчыкаў, "папанінцаў", "чэлюскінцаў" і іншых. Нездарма стаханаўцы надзяляліся, напрыклад, ганаровым правам ад імені ўсіх працоўных выступаць з урачыстым словам наконт здзяйснення подзвігаў героямі авіяцыі ці напісаць ім ліст. Такі ліст, адрасаваны лётчыкам В. Чкалаву, Г. Байдукову і А. Белякову у сувязі з іх беспасадачным пералётам праз Атлантычны акіян у ліпені 1937 г. ад імя рабочых гарбарнага завода "Бальшавік" напісаў стаханавец Л. Левін. У лісце адзначалася: "Ваша адвага і гераізм натхнялі нас, рабочых, стаханаўцаў, на працоўныя подзвігі. Вы ў паветры, а мы ля станкоў, змагаемся за адну і тую ж справу – за пабудову камуністычнага грамадства ў нашай прыгожай



Витебский государственный технологический университет

сацыялістычнай краіне” [212, с. 1]. Праз падобныя прапагандысцкія акцыі адбывалася пацвярджэнне працоўнага энтузіязму стаханаўцаў як найвышэйшага прыкладу грамадскай актыўнасці і паказвалася яго сувязь з іншымі праявамі гераічных паводзін людзей.

Гераічныя вобразы стаханаўцаў фарміраваліся гаспадарнікамі і мясцовымі кіраўнікамі ўжо на ўзроўні прадпрыемства, калгаса, горада ці асобна ўзятага раёна, чым паказваліся магчымасці таго, што ў любым працоўным калектыве героем можа стаць кожны рабочы ці калгаснік, калі ён пакажа высокія тэмпы выпрацоўкі і новыя падыходы да арганізацыі вытворчай дзейнасці. Тыя ўдзельнікі стаханаўскага руху, што паказвалі найбольш выдатныя вынікі ў працэсе вытворчасці, выпрацоўвалі рэкордныя паказчыкі ці з’яўляліся яго ініцыятарамі, пераходзілі ў катэгорыю герояў рэспубліканскага ці саюзнага ўзроўню і станавіліся галоўнымі прыкладамі для пераймання для ўсіх працоўных. Сярод падобных стаханаўцаў у БССР можна назваць такія імёны, як Ю. Цэйтлін, Р. Рушко, І. Гунько, С. Розенберг, браты Г. і З. Скабло, Л. Левін, А. Лучкоўскі, С. Харнас, Д. Папкова, С. Быкоўская, А. Семянідава, М. Дзяжурная, П. Пярцова, М. Рагоўская, М. Цыгельніцкая і іншыя. Некаторыя з іх, як напрыклад, Ю. Цэйтлін, Р. Рушко, М. Дзяжурная, за высокія працоўныя рэкорды атрымалі ўсесаюзную вядомасць.

На сфарміраванасць статусу рэспубліканскіх герояў паказвае і той факт, што рабочых, якія, напрыклад, вызначаліся ў кандытарскай вытворчасці, часта называлі гунькоўцамі па імені перадавіка І. Гунько [426, с. 43], а выдатнікаў працы ў лесапіленні адпаведна − рушкоўцамі ад імені стаханаўца Р. Рушко [473, с. 3]. Так, у БССР складваўся своеасаблівы гераізм рэспубліканскага ўзроўню, дзе ў рамках агульнасаюзнага руху стаханаўцаў, які ўзяў сваю назву ад яго пачынальніка А. Стаханава, узнікалі свае аналагічныя статусы перадавікоў.

Складванне вобразу любога героя звязана з пераўтварэннем фактаў рэальнасці ў спецыфічную сімвалічную форму, дзе вызначаюцца знакавыя для грамадства яго ўчынкі і станоўчыя якасці [407, с. 11]. Перш за ўсё станаўленне такой сімвалічнай формы адбываецца праз стварэнне “міфаў”, што, па разуменні культуролагаў, вызначаюцца як ідэалагічна маркіраваныя апавяданні, якія прэтэндуюць на статус сапраўдных ўяўленняў пра падзеі мінулага, сучаснасці і ўтрымліваюць у сабе прагноз на будучыню, а таксама ўспрымаюцца ў грамадстве як дакладнае адлюстраванне рэальнасці [437, с. 10]. “Міфы” па сваёй сутнасці здольныя пераўтварыць звычайныя падзеі ў новыя і небывалыя ідэі, прадстаўляць рэчы не такімі якія яны ёсць, а якімі яны могуць стаць ці абавязкова стануць [170, с. 342]. Пры гэтым дадзеныя сродкі стварэння вобразу героя абумоўліваюцца больш пачуццямі, чым

Витебский государственный технологический университет

логікай. Менавіта таму для паўнавартаснага эмацыянальнага ўспрымання герояў часта выкарыстоўваюцца разнастайныя візуальныя сродкі, якія павінны ў дадатак да вербальных форм замацаваць гераічны вобраз у свядомасці людзей [407, с. 11]. Такім жа чынам на аснове прыкладаў працоўнага энтузіязму фарміраваліся гераічныя вобразы стаханаўцаў, якія павінны былі паўплываць на ўздым сацыялістычнага спаборніцтва. Вобразы складваліся намаганнямі дзяржавы праз друк і правядзенне ўрачыстых мерапрыемстваў, злётаў, у форме арганізацыі самадзейнасці, фотавыстаў, стварэння кіначасопісаў, а таксама праз творчасць вядомых пісьменнікаў і мастакоў.

На ўзроўні асобнага прадпрыемства, гаспадаркі, горада або раёна сродкамі стварэння гераічных вобразаў стаханаўцаў былі невялікія артыкулы, надрукаваныя ў рэгіянальных ці галіновых газетах, дзе коратка апісваліся працоўныя дасягненні перадавікоў і паказвалася ўкараненне імі новых метадаў у вытворчасць. Так, у газеце "За торф", друкаваным органе заводакіраўніцтва Асінторфа, у студзені 1936 г. была папулярызавана стаханаўская праца лепшых яго рабочых Пімогі і Пракопкіна, паказаны ўплыў іх дзейнасці на перавыкананне планаў прадпрыемства [298, арк. 30].

Акрамя друку важным сродкам фарміравання гераічных вобразаў стаханаўцаў на месцах можна лічыць правядзенне разнастайных злётаў і ўрачыстасцяў. Так, падчас правядзення злётаў стаханаўцаў перадавікі расказвалі пра тое, як яны дасягнулі звышвысокіх паказчыкаў працы і як новыя метады, што выкарыстоўваліся імі, змогуць у далейшым змяніць тэмпы вытворчасці. Часта ў дадатак да гэтага адбываліся візуальныя прэзентацыі вобразаў удзельнікаў стаханаўскага руху. Напрыклад, у час правядзення злёту стаханаўцаў сацыялістычнага земляробства Полаччыны 30 – 31 снежня 1935 г. апрача ўрачыстых пасяджэнняў, дзе стаханаўцы распавядалі пра свае працоўныя подзвігі, была арганізавана фотавыстава партрэтаў лепшых перадавікоў сельскай гаспадаркі Полацкай акругі разам з экспанатамі прадукцыі, якую яны выпрацавалі: ільновалакно, зерневыя культуры ў снапах, гародніна і іншыя [78, арк. 85]. Тым самым успрыманне візуальных вобразаў перадавікоў падмацоўвалася рэальнымі прыкладамі іх працоўнай дзейнасці.

Актыўна фарміраванне вобразаў стаханаўцаў адбывалася падчас дзяржаўных свят. Напрыклад, адміністрацыя Мінскага станкабудаўнічага завода імя Кірава папулярызавала дзейнасць сваіх стаханаўцаў у рамках мерапрыемстваў, прысвечаных святу 1 Мая ў 1936 г., праз працу літаратурнага гуртка, члены якога стварылі некалькі песен пра стаханаўцаў, а таксама праз уладкаванне на тэрыторыі завода стаханаўскай алеі, дзе ў два рады былі вывешаны партрэты лепшых перадавікоў прадпрыемства [165, с. 4]. Цікавым фактам сімвалічнага

Витебский государственный технологический университет

адлюстравання гераічнага вобразу стаханаўцаў стала правядзенне параду, прысвечанага Кастрычніцкім святам, у Бабруйску ў 1935 г. Падчас адзначанага параду быў прадэманстраваны грузавік с канструкцыяй у выглядзе карабля, які сімвалізаваў СССР, і на якім ехалі лепшыя стаханаўцы горада на чале з імправізаванай выявай Сталіна [379, с. 4]. Як бачым, ужо на рэгіянальным узроўні за кошт вербальных і візуальных сродкаў фарміраваліся вобразы сваіх "маленькіх" герояў, якія павінны былі паказаць наяўнасць рэальных умоў для ажыццяўлення вытворчых рэкордаў і гераічнай працы. Так прасоўвалася ключавая ідэя пра магчымасць кожнага працоўнага стаць героем, што праявілася на практыцы ў масавым уключэнні рабочых і калгаснікаў у шэрагі стаханаўцаў.

Калі гаворка заходзіла пра імёны самых лепшых удзельнікаў стаханаўскага руху, дасягненні якіх былі знакавымі для усёй БССР і якія з'яўляліся арыенцірам для кожнага працоўнага ў ажыццяўленні сваіх вытворчых абавязкаў, сродкі стварэння гераічных вобразаў былі больш маштабнымі і разнастайнымі. Менавіта тут мы можам казаць пра актыўную "міфалагізацыю" вобразу стаханаўцаў у межах дзяржаўнага дыскурсу, што знаходзіла сваё адлюстраванне ў публікацыях артыкулаў і нарысаў у рэспубліканскіх перыядычных выданнях. Напрыклад, у газеце "Чырвоная змена" за 11 студзеня 1936 г. ордэнаносцу А. Лычкоўскаму была прысвечана асобная старонка. У артыкулах, размешчаных на гэтай старонцы, паказваліся метады арганізацыі працы, дзякуючы якім ён дасягнуў саюзнага рэкорду па выпрацоўцы драўляных скрынь, а ў далейшым – і сусветнага рэкорду. Пры гэтым апісваліся маральныя якасці стаханаўца, сярод якіх – вернасць Радзіме, імкненне не спыняцца на дасягнутых выніках, самаахвярна выконваць новыя вытворчыя і грамадскія абавязацельствы. Прыводзіліся таксама факты значнага павелічэння заробку Лучкоўскага і павышэння ўзроўню яго матэрыяльнага дастатку [152, с. 2]. У нарысе пра стаханаўку М. Рагоўскую, апублікаваным у газеце "Рабочий" у лістападзе 1935 г., расказвалася пра тое, як выспявалі яе працоўныя рэкорды за кошт удзелу ў грамадскай вытворчасці, і як яе актыўная дзейнасць дазволіла пераадолець вытворчыя і адміністрацыйныя перашкоды, што ўзнікалі пры арганізацыі апрацоўкі льну. Асаблівая ўвага звярталася на тое, што Рагоўская была шэраговай калгасніцай, якая добра ведала сваю справу, і дзякуючы свайму энтузіязму змагла карэнным чынам змяніць прынцыпы працы ў сельскай гаспадарцы і значна павялічыць тэмпы вытворчасці, а таксама шырока распаўсюдзіць свае метады сярод астатніх льнотрапальшчыц [113, с. 2].

Як мы заўважылі, стварэнне гераічных вобразаў стаханаўцаў адбывалася па пэўнай ідэалагічнай схеме, дзе звычайна ўказвалася сітуацыя, якая папярэднічала іх подзвігу і характарызавалася наяўнасцю

Витебский государственный технологический университет

цяжкасцяў ў развіцці вытворчасці і выкананні планаў. Стаханаўцы, у сваю чаргу, прадстаўляліся ў якасці звычайных рабочых і калгаснікаў, якія за кошт свайго энтузіязму не толькі змаглі пераадолець гэтыя цяжкасці, але і змаглі стварыць аснову для пастаяннага павелічэння аб’ёмаў вытворчасці асобных галін прамысловасці і сельскай гаспадаркі, гэта, як меркавалася, павінна было паспрыяць дасягненню заможнага жыцця працоўных. Факты рэкорднага перавыканання норм і прымянення ўдасканаленых метадаў працы стаханаўцамі прапагандаваліся як ключавы сродак пабудовы грамадства, дзе працоўны чалавек будзе пастаянна праяўляць высокую актыўнасць у вытворчасці і атрымліваць за гэта ўвесь пералік самых разнастайных матэрыяльных і духоўных даброт, што складала аснову канцэпцыі “міфа” пра стаханаўскі рух. У рамках гэтай канцэпцыі выпрацоўвалася ідэя аб тым, што стаханаўцы ўжо зрабілі першыя крокі да стварэння такога грамадства і пачалі здзяйсняць мары, пра якія думалі папярэднія пакаленні працоўных. Важным элементам характарыстыкі стаханаўцаў пры гэтым стала апісанне іх маральнага аблічча, якое павінна было лагічна завяршаць прадстаўленне гераічных вобразаў. Усё пералічанае часта дапаўнялася размяшчэннем у друку фотаздымкаў лепшых перадавікоў [Дадатак Б, Малюнкі Б.4, Б.5, Б.6, Б.7, Б.8, Б.9].

Па падобнай жа схеме ў перыядычных выданнях былі складзены аповеды саміх стаханаўцаў пра свой удзел у руху [25, с. 3; 166, с. 3]. Найбольш яскравае адлюстраванне такія аповеды знаходзілі ў агітацыйных брашурах, прысвечаных стаханаўцам асобных прадпрыемстваў і галін. Брашуры грунтаваліся на аснове папярэдне падрыхтаваных апытанняў стаханаўцаў, дзе яны павінны былі расказаць пра сваю працу і новыя метады, якія выкарыстоўваюцца імі ў вытворчасці. Акрамя таго перадавікі абавязаны былі распавесці асабістую біяграфію і вызначыць станоўчыя змены ў сваім штодзённым жыцці. У такіх расказах стаханаўцы звярталі вялікую ўвагу на сваё сацыяльнае паходжанне, дзе яны выступалі як выхадцы з бяднейшага ці сярэдняга сялянства або з рабочых. Як правіла, перадавікі распавядалі пра сваё цяжкае матэрыяльнае становішча да разгортвання стаханаўскага руху і для параўнання прыводзілі прыклады высокага ўзроўню матэрыяльнага і культурнага жыцця па выніках удзелу ў сацыялістычным спаборніцтве. Пры гэтым стаханаўцы дакладна акрэслівалі свой высокі сацыяльны статус сярод астатніх працоўных, які падмацоўваўся фактамі пашаны з боку дзяржавы і актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці [378, с. 26 – 30; 424, с. 22 – 24; 433, с. 27 – 31].

Такага роду працэдуры, па вызначэнні французскага філосафа М. Фуко, выступаюць у грамадстве ў якасці сродкаў самаідэнтыфікацыі суб’екта ці змены яго ідэнтычнасці, своеасаблівай тэхнікі “я” [463, с. 552]. У сталінскім грамадстве публічныя выступленні з расказамі пра



Витебский государственный технологический университет

сябе для катэгорый, што вызначаліся сваім высокім статусам, становяцца асноўным спосабам яго замацавання і ўсталявання грамадскага прызнання [478, с. 13]. У выпадках са стаханаўцамі іх публічныя апавяданні служылі сродкам іх самазацвярджэння як выдатных працоўных і новых “знатных людзей”. Па выніках расказаў пра свой жыццёвы і працоўны шлях стаханаўцы павінны былі ўсвядоміць сваю прыналежнасць да прэстыжнай катэгорыі працоўных і маркіраваць сябе як людзі з самымі выдатнымі якасцямі, што адпаведна знаходзіла сваё пацвярджэнне ў “чыстай” біяграфіі, высокіх працоўных дасягненнях, актыўным удзеле ў грамадскай працы, паляпшэнні матэрыяльнага становішча. Як вынік, праз агітацыйныя брашуры стаханаўцы самі ўдзельнічалі ў стварэнні сваіх гераічных вобразаў, безумоўна, не без кантролю з боку дзяржавы.

Публічныя выступленні лепшых стаханаўцаў БССР можна было назіраць падчас правядзення разнастайных рэспубліканскіх масавых мерапрыемстваў, звязаных з прапагандай стаханаўскага руху. Так, на самым пачатку яго разгортвання ў кастрычніку 1935 г. у межах прыёму лепшых стаханаўцаў БССР у Народным камісарыяце мясцовай прамысловасці пра сябе і сваю працу распавядаў Г. Скабло, у гэты жа месяц адбылася Усебеларуская радыёпераклічка стаханаўцаў швейнай прамысловасці, дзе лепшыя яе прадстаўнікі мелі магчымасць падзяліцца фактамі сваёй біяграфіі і новымі метадамі вытворчасці, што выкарыстоўваліся імі ў працы [443, с. 3; 455, с. 4]. У снежні 1935 г. быў праведзены Усебеларускі злёт майстроў ільну, дзе выступалі лепшыя стаханаўкі сельскай гаспадаркі рэспублікі: С. Быкоўская, М. Дзяжурная, П. Пяроцова [363, с. 3; 365, с. 2; 366, с. 2].

Дзейсным спосабам прадстаўлення гераічных вобразаў лепшых стаханаўцаў БССР былі кіначасопісы, якія ставарала пра іх Белдзяржкіно, пачынаючы са снежня 1935 г. Так, у адным з першых кіначасопісаў былі зняты сюжэты пра ордэнаносца Р. Рушко, стаханаўцаў швейнай і акулярнай фабрык у Віцебску, лепшых стаханавак ільнаводства рэспублікі [221, с. 4]. У кінахроніцы ўдала спалучаўся візуальны рад і інфармацыя пра стаханаўцаў, што найбольш паспяхова спрыяла станоўчаму ўспрыманню працоўнымі вобразаў гэтых вытворчых герояў.

Станаўленне гераічных вобразаў удзельнікаў стаханаўскага руху на рэспубліканскім узроўні адбывалася і за кошт творчасці дзеячаў культуры БССР, перад якімі дзяржаўнымі і партыйнымі органамі былі пастаўлены задачы далейшай папулярызацыі працоўнага энтузіязму стаханаўцаў. Так, у канцы 1935 г. 16 пісьменнікаў Беларусі выехалі ў гарады і вёскі рэспублікі для збору матэрыялаў і напісання літаратурных нарысаў пра стаханаўцаў [233, с. 4]. У Саюзе савецкіх мастакоў БССР у лістападзе таго ж 1935 г. была створана група ў

Витебский государственный технологический университет

складзе выдатных мастакоў і скульптараў В. Волкава, М. Керзіна, З. Азгура, А. Бразера, А. Грубэ і іншых для выканання партрэтаў і скульптур стаханаўцаў. А. Бразерам была, напрыклад, створана скульптура "Група стаханаўцаў" для выставы 1937 г. "Індустрыя сацыялізму" [349, с. 4]. Працэс стварэння вобразу герояў са знакамітых стаханаўцаў рэспублікі з дапамогай літаратурных і мастацкіх твораў паспрыяў замацаванню новага ўвасаблення гэтай катэгорыі перадавікоў не толькі як выключна герояў вытворчасці, але і як сапраўдных народных герояў, што павінны былі стаць прыкладам для выхавання патрыятызму ў савецкім грамадстве.

Пад уздзеяннем працэсу развіцця стаханаўскага руху адбываліся значныя змены ў сацыяльным становішчы тых жанчын, якія прымалі ў ім актыўны ўдзел. Гэтыя жанчыны, стаўшы стаханаўкамі, уваходзілі ў прывілеяваную катэгорыю працоўных, а іх гендэрны статус у грамадстве быў адзначаны новымі сацыяльнымі ралямі герояў вытворчай сферы, якія былі замацаваны да гэтага пераважна за мужчынамі. Менавіта ў ходзе стаханаўскай кампаніі многія жанчыны і атрымалі магчымасць стаць па выніках сваёй выдатнай працы знакамітымі гераінямі, імёны якіх, як мы заўважылі вышэй, сталі вядомыя не толькі ў БССР, але і ў цэлым у Савецкім Саюзе.

Фарміраванне гераічных вобразаў жанчын-стаханавак адбывалася з дапамогай усіх пералічаных намі метадаў дзяржаўнай прапаганды, сярод якіх асаблівае значэнне мелі грамадскія святкаванні Міжнароднага жаночага дня 8 Сакавіка. У другой палове 1930-х гг. з узнікненнем і разгортваннем стаханаўскага руху становіцца абавязковай прысутнасць яго ўдзельніц на ўсіх мерапрыемствах, што арганізоўваліся дзяржавай на дадзенае свята. На гэтых мерапрыемствах адбывалася своеасаблівая прэзентацыя вытворчых дасягненняў жанчын-перадавікоў, станоўчых прыкладаў іх грамадскай дзейнасці і ўзораў высокага матэрыяльнага забеспячэння па выніках выдатнай працы. Напрыклад, у 1936 г. на прамысловых прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах рэспублікі адбыліся ўрачыстыя сходы жанчын, на якіх стаханаўкі распавядалі пра свае працоўныя рэкорды, новыя метады арганізацыі працы, а таксама пра паляпшэнне сваіх бытавых умоў. Гераічны вобраз стаханавак папулярызаваўся на гэтых сходах у шматтыражных газетах і на спецыяльных фота-вітрынах. Падобнымі па характару былі і арганізаваныя на буйнешых прадпрыемствах Мінска святочныя вечары-балі і сумесны вечар удзельніц стаханаўскага руху і партыйнага кіраўніцтва Кагановіцкага раёна сталіцы [237, с. 4].

Удзел стаханавак у грамадскіх святкаваннях 8 Сакавіка, як бачна, праходзіў па тыповай для савецкага часу схеме з дэманстрацыяй дасягненняў у эканамічнай, палітычнай і бытавой сферах. Праз усё гэта ішло паступовае замацаванне новых вобразаў жанчын-гераінь у



Витебский государственный технологический университет

грамадстве, і ў той жа час адбывалася прапаганда новай формы сацыялістычнага спаборніцтва, у якую павінны былі ўключыцца як мага больш работніц і калгасніц, пра што, напрыклад, і было агаворана ў дакументах Прызідыума ЦВК БССР у пачатку 1936 г., звязаных з падрыхтоўкай мерапрыемстваў па святкаванні Міжнароднага жаночага дня [147, арк. 93].

Засваенне новых роляў гераінь і мадэляў сацыяльных паводзін, што адзначаліся актыўнай працоўнай дзейнасцю ў грамадскай вытворчасці, выклікала, аднак, праблему так званай "падвойнай занятасці" жанчын, калі акрамя сваёй працы на прадпрыемствах на іх па-ранейшаму ўскладваліся клопат пра сям'ю і вядзенне хатняй гаспадаркі. Больш таго, "знатны" статус жанчын-стаханавак патрабаваў выконваць свае хатнія абавязкі на такім жа высокім узроўні, як і працу на прадпрыемствах. Удзельніцы стаханаўскага руху павінны былі стаць прыкладам для астатніх жанчын і як перадавікі вытворчасці, і як выдатныя хатнія гаспадыні. Нездарма ў сваім інтэрв'ю ў газету "Звязда" стаханаўка Д. Папкова акрамя таго, што распавядала пра свае вытворчыя дасягненні і паляпшэнне матэрыяльнага становішча, яшчэ адзначыла і змены сваіх адносін да хатніх абавязкаў: "Я хоць і раней сур'ёзна займалася выхаваннем сваіх дзяцей, але цяпер яшчэ больш гэтаму аддаю ўвагі" [143, с. 3].

Нягледзячы на тое, што ў дзяржаўнай прапагандзе статус стаханаўцаў разглядаўся як пачэсны і ганаровы і атаясамліваўся з высокім сацыяльным становішчам, у працэсе разгортвання стаханаўскага руху назіраліся выпадкі, калі рабочыя ці калгаснікі на аснове перавыкананых норм і ўдасканаленай працы залічваліся ў стаханаўцы, але не атрымлівалі ні маральнай, ні матэрыяльнай падтрымкі з боку гаспадарнікаў. Частка кіраўнікоў прадпрыемстваў фармальна адносілася да стаханаўцаў, напрыклад, акружала іх пашанай толькі падчас пэўных святаў, грамадскіх і палітычных мерапрыемстваў. Стаханаўцы ў гэтым выпадку выкарыстоўваліся адміністрацыяй у якасці прывядзення станоўчых прыкладаў працы сваіх вытворчых адзінак для справаздачы ў дзяржаўныя органы. У астатні жа час сацыяльнае становішча лепшых перадавікоў нічым не адрознівалася ад астатніх працоўных. Напрыклад, на Віцебскім цагельным заводзе № 1 імя лепшага стаханаўца Кубышава кіраўніцтва прадпрыемства і прафкам выкарыстоўвалі падчас урачыстасцяў, упаміналі ва ўсіх прывітальных тэлеграмах, запрашалі ў прэзідыумы розных сходаў і канферэнцый, але пры гэтым не аказвалі яму такой пашаны ў звычайныя дні, ніякім чынам не дапамагалі гэтаму рабочаму ў арганізацыі яго працы і быту [286, арк. 130]. На шэрагу іншых прадпрыемстваў Віцебска на працягу лета 1936 г. таксама склалася падобная сітуацыя: гаспадарчыя кіраўнікі ў пагоні за вялікай колькасцю



Витебский государственный технологический университет

ўдзельнікаў стаханаўскага руху, акружаючы ў свой час усялякай грамадскай пашанай і матэрыяльнай падрымкай яго ініцыятараў, паступова забываліся на іх, і стаханаўцы аказваліся па свайму становічшу на адным узроўні са звычайнымі рабочымі [64, арк. 183]. Толькі ва ўрачыстыя дні ўспамінала пра сваіх стаханаўцаў адміністрацыя Мінскага дрэваапрацоўчага завода імя Молатава, у звычайныя жа дні за першую палову 1937 г. перадавікам не садзейнічалі як ў арганізацыі працы, так і ў вырашэнні бытавых пытанняў [151, с. 3]. У выніку статус стаханаўцаў у такіх сітуацыях адыгрываў пэўную адмоўную ролю для яго носьбітаў і ператвараўся ў складаючую частку паказных бакоў жыцця тагачаснага грамадства. Увогуле, пры праяўленні выпадкаў фармалізму і кампанейчшыны ў разгортванні стаханаўскага руху, дзе ставілася задача колькаснага росту яго ўдзельнікаў, а не рэальнага павышэння прадукцыйнасці працы, статус стаханаўцаў, што прыпісваўся частцы працоўных, не адпавядаў сваёй сутнасці, і тым больш не мог быць акружаны грамадскай пашанай або падтрымлівацца матэрыяльна.

Асаблівасцю сацыяльнага статусу стаханаўцаў была яго прывязка да вытворчых дасягненняў: у тым выпадку, калі рабочы ці калгаснік не перавыконваў нормы ці не прымяняў у сваёй працы новыя вытворчыя метады, ён страчваў гэты высокі статус, а разам з ім прэстыж у працоўным калектыве і матэрыяльную падтрымку. Так, напрыклад, статус стаханаўца згубіў адзін з лепшых рабочых Віцебскага лесазавода С. Капышка, які ў жніўні 1936 г. замест ранейшых рэкордных 538 м$^3$ лесаматэрыялаў стаў апрацоўваць толькі 75 м$^3$ [5, с. 3]. Падобны жа выпадак адбыўся ў красавіку 1937 г. на Мінскай кандытарскай фабрыцы "Камунарка", дзе стаханаўцам перастаў лічыцца рабочы Гайд, што ўзначальваў асобную брыгаду. Адзначаная брыгада раней пастаянна выконвала нормы на 200 %, але з-за вытворчых збояў стала даваць не больш за 70 % плану [151, с. 3].

Індустрыяльнае будаўніцтва і калектывізацыя канца 1920-х – 1930-х гг. суправаджаліся працэсам сацыяльнай трансфармацыі, адным з праяўленняў якой была сацыяльная мабільнасць, калі ў выніку карэнных эканамічных і палітычных пераўтварэнняў у савецкай краіне складваліся ўмовы для імклівай змены статусу чалавека ці асобных сацыяльных груп: у грамадстве ўтвараліся новыя катэгорыі насельніцтва, адбывалася міграцыя значнай колькасці вясковых жыхароў у гарады, назіраліся тэндэнцыі актыўнага вылучэння працоўных на адказныя адміністрацыйна-гаспадарчыя пасады.

Безумоўна, што працэс сацыяльнай мабільнасці меў месца і ў стаханаўскім руху, у ходзе разгортвання якога для яго ўдзельнікаў адкрываліся перспектывы прафесійнага росту і прасоўвання ўверх па сацыяльнай лесвіцы. Перадумовай для гэтага стала правядзенне

Витебский государственный технологический университет

партыйным кіраўніцтвам палітыкі па павышэнні культурна-тэхнічнага ўзроўню стаханаўцаў да ўзроўню інжынерна-тэхнічных работнікаў, што было замацавана ў якасці адной з галоўных задач развіцця стаханаўскага руху на Пленуме ЦК КП(б)Б 14 – 17 студзеня 1936 г. [183, с. 196]. Дадзеныя ўстаноўкі партыі былі выкліканы тым, што большасць удзельнікаў руху пры наяўнасці вялікага працоўнага энтузіязму і прымяненні ўдасканаленых метадаў у вытворчасці, першапачаткова мала валодалі менавіта тэарытычнымі ведамі з тэхнічных дысцыплін і мелі звычайна пачатковую адукацыю. Так, напрыклад, адна з лепшых стаханавак Горацкага раёна Г. Каліво мела толькі 4 класы пачатковай школы [91, арк. 10]. З 25 лепшых стаханаўцаў Мазырскага раёна на снежань 1935 г. толькі 3 рабочыя скончылі 7 класаў агульнаадукацыйнай школы, а 2 рабочыя – курсы фабрычна-завадскога навучання [286, арк. 30 – 31]. На пачатак 1936 г. 7 з 8 лепшых стаханаўцаў Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбіната былі непісьменнымі і малапісьменнымі [88, арк. 169]. У такой сітуацыі для ўдасканалення працэсу вытворчасці і павышэння адукацыйнага ўзроўню стаханаўцаў як працоўных з самым высокім статусам патрабавалася ўзбагачэнне іх тэхнічных і агульнаадукацыйных ведаў. У сувязі з гэтым за стаханаўцамі замаўцоўваўся адпаведны грамадскі абавязак, што можна было назіраць у многіх публічных выказваннях перадавікоў. Характэрнай, напрыклад, была прамова стаханаўца П. Сцепанца з Гомельскага вагонарамонтнага завода імя Ланцуцкага, у якой адзначалася вострая неабходнасць у авалоданні новымі ведамі і тэрміновай здачы экзаменаў за курс няпоўнай сярэдняй школы [376, с. 3].

Для ажыццяўлення пастаўленай партыйным кіраўніцтвам задачы павышэння адукацыйнага ўзроўню стаханаўцаў на прадпрыемствах і ў гаспадарках былі арганізаваны курсы, тэхнічныя гурткі і стаханаўскія школы. У пачатку 1936 г. тэхнічная і агульнаадукацыйная вучоба стаханаўцаў разгарнулася па ўсіх цэхах гарбарнага завода “Бальшавік”, дзе для іх быў арганізаваны адукацыйна-тэхнічны гурток [300, арк. 34]. У лютым таго ж года месячныя курсы для стаханаўцаў сельскай гаспадаркі пачалі сваю працу ў Дубровенскім раёне. На адзначаных курсах вывучалася агратэхніка, заатэхнічныя дысцыпліны і агульнаадукацыйныя прадметы [203, с. 4]. Пасля засваення базавых ведаў для стаханаўцаў ствараліся спрыяльныя ўмовы для атрымання адукацыі ў сярэдне-спецыяльных навучальных установах. Так, у пачатку сакавіка 1936 г. пры Бабруйскім лесахімічным тэхнікуме спецыяльна для стаханаўцаў запланавана было адчыніць вячэрняе аддзяленне з тэрмінам навучання ў 3 гады і без адрыву ад вытворчасці [48, с. 4]. Для самых лепшых стаханаўцаў прадпрыемстваў і вытворчых герояў рэспубліканскага ўзроўню ствараліся ўмовы для паступлення і ў



Витебский государственный технологический университет

вышэйшыя навучальныя ўстановы. Напрыклад, на вучобу ў Лінінградскую лесахімічную акадэмію быў накіраваны знакаміты стаханавец БССР, ордэнаносец Лучкоўскі [336, с. 4], а ў Архангельскую лясную прамысловую акадэмію імя Куйбышава паехаў вучыцца Р. Рушко [430, с. 4]. Лепшыя стаханаўкі Віцебска Т. Падскочава і В. Пучкова (фабрыка “КІМ”) накіроўваліся ў 1940 г. адміністрацыяй прадпрыемства для паступлення ў Прамысловую акадэмію БССР [16; Дадатак В, Малюнак В.1].

Такім чынам, для сацыяльнай мабільнасці стаханаўцаў складваюцца ўсе ўмовы, што вызначаліся іх высокім прэстыжам у грамадстве, дасягнутым за кошт выдатных вытворчых вынікаў, з другога боку, канкрэтныя працоўныя дасягненні дадаваліся павышэннем передавікамі ўзроўню сваіх тэхнічных ведаў, што было замацавана ў якасці грамадскага абавязку для поўнай адпаведнасці ганароваму статусу стаханаўца і далейшага здзяйснення яшчэ большых працоўных рэкордаў.

Перш за ўсё, стаханаўцы вылучаліся адміністрацыяй прадпрыемстваў на пасады інжынерна-тэхнічных работнікаў. У 1936 г. стаханавец Кубышаў з Віцебскага цагельнага завода № 1, выконваючы пастаянна норму на 200 %, быў прызначаны майстрам прэса [374, с. 3]. У лістападзе 1938 г. на Бабруйскім лесакамбінаце толькі па адным лесацэху № 1 на пасады ІТР было вылучана 10 стаханаўцаў: рамшчык Стромскі, напрыклад, стаў начальнікам лесацэха № 2, стаханаўцы Дабравольскі, Адзінцоў, Манько – начальнікамі змен [44, с. 3]. За 1937 г. – першае паўгоддзе 1938 г. прадпрыемствамі Народнага камісарыята мясцовай прамысловасці БССР з ліку стаханаўцаў на пасады начальнікаў цэхаў было вылучана 77 чалавек, на пасады майстроў цэхаў – 65 [429, с. 4].

Прэстыж статусу стаханаўцаў у грамадстве і наступныя прызначэнні на гэтай аснове на новыя пасады прывялі ў выніку да таго, што ў некаторых перадавікоў выпрацаваліся моцныя матывы не спыняцца ў сваім прафесійным росце і павышаць свой тэхнічны ўзровень. Напрыклад, стаханавец Казанскі (Віцебскі станкабудаўнічы завод імя Кірава), стаўшы майстрам аддзела механікі, адзначаў: “Моя мечта сбылась, сейчас я поставил перед собой задачу – стать инжинером” [164, с. 2]. Як бачым, удзел у стаханаўскім руху мог ўсведамляцца працоўнымі як крыніца імклівага прасоўвання ўверх па кар’ернай лесвіцы, што ў вялікай ступені прадугледжвалася і самой дзяржаўнай палітыкай.

Нездарма частка стаханаўцаў была вылучана дзяржавай на адказныя адміністрацыйна-гаспадарчыя пасады: кіраўнікоў прадпрыемстваў ці гаспадарчых адзінак. На працягу 1937 г. Народным камісарыятам мясцовай прамысловасці БССР 48 стаханаўцаў было



Витебский государственный технологический университет

прызначана на пасады дырэктароў і намеснікаў дырэктароў прадпрыемстваў, кіраўнікоў трэстаў і начальнікаў упраўленняў. У 1938 г. стаханавец завода “Гомсельмаш” Е. Іофэ быў, напрыклад, вылучаны дырэктарам ложкавай фабрыкі ў Гомелі, стаханавец Мінскай друкарні імя Сталіна І. Каган – дырэктарам адзначанай друкарні [429, с. 4], а перадавік-трактарыст Шыгар узначаліў Капаткевіцкую МТС [167, с. 2]. Прызначэнне стаханаўцаў на пасады гаспадарнікаў было зададзена інтэрпрытацыяй уладай статусу адзначанай катэгорыі перадавікоў як новых людзей, што на рэальных прыкладах выдатна паказалі сябе ў вытворчасці і змогуць у далейшым не толькі быць інжынерамі, але і кіраваць прадпрыемствамі па прынцыпах стаханаўскай працы.

Як вынік, спецыфічнай рысай працэсу разгортвання стаханаўскага руху стала змена сацыяльнага становішча некаторых яго ўдзельнікаў, адзначаная пераходам звычайных, раней невядомых працоўных у сацыяльныя групы ІТР і гаспадарнікаў, на аснове чаго дзяржава далей рэалізоўвала на практыцы палітыку вылучэння лепшых рабочых і калгаснікаў на кіруючыя пасады ў розных галінах эканомікі. У дадзеным выпадку каналамі сацыяльнай мабільнасці становяцца актыўная працоўная дзейнасць стаханаўцаў і звязаны з ёй высокі грамадскі прэстыж, а таксама павышэнне ўзроўню агульнай і тэхнічнай адукацыі.

У выніку актыўнай фемінізацыі грамадскай вытворчасці высокая ступень сацыяльнай мабільнасці была характэрна для жанчын, што ўдзельнічалі ў стаханаўскім руху: яны не толькі атрымлівалі новыя ролі працоўных герояў, перад імі, як і перад мужчынамі-стаханаўцамі, адкрываліся шырокія магчымасці павышэння свайго прафесійнага ўзроўню і прызначэння на адказныя адміністрацыйна-гаспадарчыя пасады, якія раней, як правіла, займалі прадстаўнікі мужчынскага полу. Напрыклад, у склад кіруючага персаналу ніжэйшага і сярэдняга звяна было пераведзена 13 стаханавак Віцебскай ільнопрадзільнай фабрыкі “Дзвіна” да свята 8 Сакавіка ў 1936 г. [238, с. 6]. У тым жа годзе на Мінскай швейнай фабрыцы імя 8 Сакавіка стаханаўкі Малентовіч і Гертэнзон былі вылучаны памочніцамі начальнікаў цэхаў, выдатніцы працы Руткевіч, Міхайлава і Зайдман – інструктарамі брыгад [220, с. 4]. У Гомелі ў 1937 г. стаханаўка А. Сенчыла (камбінат “Спартак”) стала зменным майстрам, ткачыха-перадавік М. Анісавец з арцелі “Гомельскі тэкстыль” была пераведзена на пасаду памочніка майстра [269, арк. 21, 22]. Яскравым прыкладам таго, наколькі перспектыўным было становішча ўдзельніц стаханаўскага руху ў прасоўванні іх на адказныя адміністрацыйна-гаспадарчыя пасады, можна лічыць прызначэнне ў 1938 г. стаханаўкі Мінскай швейнай фабрыкі “Кастрычнік” А. Зелянко на пост дырэктара швейнай фабрыкі імя 8 Сакавіка [20; Дадатак В, Малюнак В.2]. Так, з сярэдзіны 1930-х гг. стаханаўскі рух становіцца

Витебский государственный технологический университет

асноўнай крыніцай для ажыццяўлення дзяржаўнай палітыкі па вылучэнні жанчын на адказныя пасады, пры гэтым перспектывы стаць ІТР і гаспадарнікамі стаханаўкі атрымлівалі зноў-такі ў галінах з пераважна жаночай занятасцю ці на вытворчых працэсах, арыентаваных на жаночую працоўную сілу.

Асаблівую ўвагу ў працэсе вылучэння жанчын на адказныя пасады ўладныя структуры надавалі сельскагаспадарчай вытворчасці, дзе прадстаўніцы жаночага полу складалі абсалютную большасць сярод стаханаўцаў і станавіліся такім чынам галоўным рэзервам папаўнення кіруючых кадраў аграрнага сектару. Неабходнасць актыўнага вылучэння стаханавак сельскай гаспадаркі рэспублікі была вызначана старшынёй СНК БССР М. Галадзедам у снежні 1935 г. на сесіі ЦВК [318, с. 48], а 31 кастрычніка 1936 г. ЦК КП(б)Б выдаў Пастанову аб вылучэнні жанчын-калгасніц на кіруючую працу, у якой была пастаўлена задача на працягу 1 – 2 гадоў дабіцца таго, каб значную частку старшынь калгасаў, калгасных брыгадзіраў, загадчыкаў калгасна-таварных ферм складалі жанчыны. Асноўнымі прэтэндэнтамі на заняцце пералічаных пасад партыйным кіраўніцтвам рэспублікі былі вызначаны, для прыкладу, трактарысткі, якія давалі выпрацоўку на трактарах да 1 тысячы га, а таксама льнаводкі і льнотрапальшчыцы, што дабіваліся ўраджаю льну каля 10 ц з гектара [183, с. 221].

У адпаведнасці з вызначанай палітыкай у 1936 г. на сходах і пленумах сельскіх Саветаў Полацкага раёна на адказную калгасную работу (загадчыцамі ферм, брыгадзірамі і на іншыя пасады кіруючага звяна) было вылучана 27 жанчын з ліку лепшых стаханавак, па мясамалочных саўгасах БССР у тым жа годзе на кіруючую гаспадарчую, прафсаюзную і грамадскую працу было вылучана каля 100 лепшых стаханавак [147, арк. 87; 303, арк. 19]. Некаторыя ўдзельніцы стаханаўскага руху з цягам часу ўзначалілі асобныя гаспадаркі. Так, напрыклад, лепшая стаханаўка Кіраўскага раёна А. Вінаградава ў 1939 г. была вылучана на пост старшыні калгаса імя Кірава [274, арк. 181].

Стаханаўскі рух хаця і паспрыяў новым зменам сацыяльнага становішча жанчын, адкрыўшы ім перспектывы кар'ернага росту і прасоўвання ўверх па службовай лесвіцы, вылучэнне стаханавак на адказныя пасады выклікала ў некаторых выпадках рэакцыі непрызнання за імі гэтых новых роляў. Стаханаўка М. Мацулевіч (г. Віцебск), напрыклад, так успамінала сваё прызначэнне на пасаду майстра: "В 1935 г. в декабре меня назначили как лучшую на должность сменным мастером. Это была первая женщина-мастер в то время, не смотря на то, что моя смена работала хорошо, план перевыполняла, и не было разницы среди женщин и мужчин, работать в то время мастером женщине было очень трудно, не хотели признавать женщину как



Витебский государственный технологический университет

мастера и называли баба-мастер” [77, арк. 5 адв.]. Як бачна, нягледзячы на выдатныя вынікі пры кіраванні вытворчымі працэсамі стаханаўкамі, у грамадстве ўсё яшчэ захоўваліся меркаванні наконт таго, што адказныя пасады павінны займаць выключна мужчыны, а сацыяльны статус кіраўніка прадугледжваў наяўнасць арганізацыйных якасцяў, якімі жанчыны, як здавалася, валодалі не ў поўнай меры. Такім чынам, пераход стаханавак у сацыяльныя групы ІТР і гаспадарнікаў суправаджаўся праяўленнем гендэрных стэрэатыпаў, калі нават актыўны ўдзел у стаханаўскім руху і наяўнасць пэўных тэхнічных ведаў не маглі выступаць у якасці галоўных фактараў прызнання за жанчынамі іх вылучэння ў склад кіруючага персаналу.

Прыналежнасць працоўных да катэгорыі стаханаўцаў акрамя магчымасцяў кар’ернага росту і прызначэння на адміністрацыйна-гаспадарчыя пасады стварала яшчэ і перспектывы ўдзелу ў працы органаў дзяржаўнага кіравання. У першую чаргу як лепшыя прадстаўнікі працоўных стаханаўцы выбіраліся ў склад мясцовых Саветаў. Напрыклад, стаханаўкі фабрыкі “Сцяг індустрыялізацыі” Р. Фурман і Д. Папкова ў 1936 г. сталі дэпутатамі Віцебскага гарадскога Савета [142, с. 3]. У 1938 г. членамі гарадскіх Саветаў дэпутатаў былі абраныя лепшыя стаханаўцы лёгкай прамысловасці БССР А. Падрэзава (Віцебскі шчацінна-шчотачны камбінат) і А. Канапацкі (Мінскі гарбарны завод “Бальшавік”) [270, арк. 11]. Героі сельскагаспадарчай вытворчасці А. Вінаградава і Б. Трушко ў 1939 г. сталі дэпутатамі сельскіх Саветаў [274, арк. 181].

Безумоўна, што ганаровы грамадскі статус стаханаўцаў дазволіў ім удзельнічаць і ў працы вышэйшых прадстаўнічых органаў рэспубліканскага і саюзнага ўзроўню. У самым пачатку развіцця стаханаўскага руху некаторыя яго ўдзельнікі ўвайшлі ў склад Цэнтральных Выканаўчых Камітэтаў БССР і СССР. Так, напрыклад, членам ЦВК БССР стаў ініцыятар стаханаўскага руху на Крычаўскім цэментным заводзе М. Сярожкін [324, с. 4]. Сярод лепшых стаханавак Беларусі, вылучаных да ўзнагароды ў сувязі са святам Міжнароднага жаночага дня ў 1936 г., членамі ЦВК БССР з’яўляліся работніцы Л. Коркіна і В. Саковіч, членам ЦВК СССР выдатніца працы А. Левочкіна [292, арк. 11, 13, 15]. Пасля прыняцця Канстытуцыі БССР 1937 г. лепшыя стаханаўцы былі абраныя ў новы прадстаўнічы орган рэспублікі – Вярхоўны Савет. У 1938 г. яго дэпутатамі сталі, напрыклад, наступныя перадавікі: Е. Пажарная (Дубровенская льняная мануфактура) [32, с. 4], С. Міклашэўская (Лагойская МТС) [174, с. 3], Ф. Шамко (саўгас “Зарэчча” Смалявіцкага раёна) [120, с. 3], В. Шарко (калгас “Чырвоны барацьбіт” Мінскага раёна) [434, с. 3], А. Міцкевіч (калгас “Завет Ільіча” Шклоўскага раёна) [54, с. 9], В. Немчанка (Віцебскі станкабудаўнічы завод імя Кірава) [31, с. 3], С. Музыка



Витебский государственный технологический университет

(калгас “Гігант” Петрыкаўскага раёна) [50, с. 2], Г. Барушкоў (калгас “Бальшавік” Лоеўскага раёна) [397, с. 2], М. Белякоў, Я. Гладышаў (Бабруйскі лесакамбінат) [44, с. 3; 168, с. 3] і іншыя. Брыгадзір-стаханавец з Заслаўскай МТС І. Значонак і вядомы ў рэспубліцы стаханавец конегадоўлі М. Батоўскі былі абраны дэпутатамі Вярхоўнага Савета СССР [127, с. 2; 36, с. 3].

Уваходжанне стаханаўцаў у склад прадстаўнічых органаў улады, канешне, насіла фармальны характар і было ўвасабленнем савецкай палітычнай сістэмы, пры якой абавязковай з’яўлялася дзяржаўная дзейнасць працоўных. У той жа час магчымасць удзелу “знатных людзей” вытворчасці ў працы савецкіх органаў мела сваю адметнасць, што заключалася ў вызначэнні стаханаўцаў як новай апоры ўлады і самых ідэалагічна надзейных рабочых і калгаснікаў.

Такое вызначэнне ролі стаханаўцаў у грамадска-палітычным жыцці праявілася ў далейшым у прызначэнні іх на кіруючыя пасады ў органах улады розных узроўняў. Так, вядомы ў рэспубліцы стаханавец Я. Гладышаў быў, напрыклад, вылучаны старшынёй Бабруйскага гарадскога Савета, у г. Бабруйску акрамя гэтага на пасаду сакратара раённага выканаўчага камітэта быў вылучаны стаханавец Марозаў, а на пост загадчыка раённага аддзела сацыяльнага забеспячэння – перадавік Землянюхін [44, с. 3]. Старшынёй Заслаўскага раённага выканаўчага камітэта стаў згаданы намі вышэй І. Значонак [127, с. 2], а стаханавец-слесар Кузьмін з Рагачова ўзначаліў мясцовы сельскі Савет [269, арк. 23].

Вылучэнне стаханаўцаў на кіруючыя пасады ў мясцовых органах улады прадугледжвала, што “знатныя людзі” прамысловасці і сельскай гаспадаркі валодалі выдатнымі палітычнымі якасцямі, якія, з пункту погляду дзяржавы, сфармаваліся ў перадавікоў падчас удзелу ў разгортванні стаханаўскага руху і актыўнага перавыканання планаў. Таму меркавалася зрабіць з самых лепшых стаханаўцаў не толькі кіраўнікоў прадпрыемстваў і калгасаў, але і прадстаўнікоў улады на рэгіянальным узроўні для далейшага паспяховага ажыццяўлення індустрыялізацыі і калектывізацыі. Так, стаханаўскі рух стаў адным з сродкаў рэалізацыі палітыкі прыцягнення працоўных да кіравання дзяржавай і замацаваў за яго ўдзельнікамі вобраз людзей, адданых савецкім палітычным ідэалам.

Як мы заўважылі вышэй, на прыкладзе стаханаўцаў дзяржава імкнулася сфарміраваць своеасаблівую працоўную эліту, у сувязі з чым яны, праявіўшы сябе выдатна ў вытворчасці, павінны былі ў адпаведнасці са сваім ганаровым статусам актыўна праяўляць сябе і ў грамадскім жыцці, а таксама выступаць у якасці эталона палітычных паводзін. Таму на ўдзельнікаў стаханаўскага руху дадаткова накладвалася выкананне разнастайных грамадскіх абавязкаў.



Витебский государственный технологический университет

Напрыклад, стаханавец І. Трацэўскі з’яўляўся адным з арганізатараў культурнай працы сярод рабочых Рудабельскага спіртзавода [433, с. 31]. У першым хромавым цэху гарбарнага завода “Бальшавік” зборшчыкамі членскіх прафсаюзных узносаў з’яўляліся стаханаўцы Фельдман, Кеўскі, Моўшыкаў, страхавымі дэлегатамі – стаханаўцы Старбінер, Куніцкая, Рабко, Саханевіч, Арэкт, Ліўшыц, зборшчыкамі узносаў у фонд Міжнароднай арганізацыі дапамогі барцам рэвалюцыі – Перавозкін, Вайгель, Гурвіч, Капілевіч, стаханавец Хвашчэўскі быў рэдактарам штодзённай завадской газеты [299, арк. 169 – 170]. На стаханаўца Рубіна (Мінская швейная фабрыка “Кастрычнік”) быў ускладзены абавязак па арганізацыі і правядзенні фізкультурнай працы сярод рабочых [261, арк. 209].

Яскравым прыкладам дэманстрацыі грамадска-палітычнай актыўнасці стаханаўцаў можна назваць іх удзел у правядзенні ваенна-патрыятычнай работы, якая арганізоўвалася для таго, каб прадстаўнікі рабочага класа змаглі разам з Чырвонай Арміяй быць падрыхтаванымі да абароны рэспублікі ад знешніх ворагаў. Безумоўна, што стаханаўцы як “знатныя людзі” разам са сваімі вытворчымі поспехамі павінны былі паказваць і выдатныя прыклады ваеннай падрыхтоўкі астатнім працоўным, дапаўняючы тым самым свой гераічны вобраз праяўленнем новых здольнасцяў. Так, у спісе стаханавак БССР, што былі вылучаны да ўзнагарод у сувязі з Міжнародным жаночым днём у 1936 г., ЦСПСБ у якасці самых актыўных удзельніц ваенна-патрыятычнай працы назваў наступныя імёны: М. Рабава (у 1935 г. атрымала званне пілота, з’яўлялася інструктарам парашутнай справы), Д. Слесарова (здала экзамен на пілота, была парашутысткай, снайперам, удзельніцай пераходу Віцебск – Мінск у супрацьгазах), удзельніцамі пераходу Мінск – Масква ў супрацьгазах былі Г. Кісялёва, А. Еўсюціна, В. Еўсюціна, званне Варашылаўскага стралка насілі Н. Сарба, Е. Лапенкова, Т. Ефрэмава, А. Шляхта [292, арк. 7 – 12]. Званне Варашылаўскага стралка таксама меў згаданы намі вышэй стаханавец Рубін з Мінскай швейнай фабрыкі “Кастрычнік” [261, арк. 129]. На фабрыцы “Сцяг ідустрыялізацыі” ў гонар гадавіны Чырвонай Арміі ў 1936 г. стаханаўцамі была арганізвана праца змены ў супрацьгазах на працягу ўсіх 7 гадзін [460, с. 2].

Яшчэ адным з характэрных праяўленняў грамадска-палітычнай актыўнасці ўдзельнікаў стаханаўскага руху былі кампаніі 1936 г., прысвечаныя абмеркаванню праекта новай савецкай Канстытуцыі і вывучэнню даклада Сталіна на VIII з’езде Саветаў па адзначаным пытанні. Падчас гэтых палітычных кампаній у працоўных калектывах рэспублікі стаханаўцы ў першых радах выступілі з прамовамі, у якіх былі адзначаны перавагі савецкага ладу, наяўнасць усіх спрыяльных умоў для рэалізацыі сацыяльных і палітычных правоў. Напрыклад,

Витебский государственный технологический университет

стаханаўка Мінскай швейнай фабрыкі імя Крупскай Пузік у ходзе абмеракавання праекта Канстытуцыі выказвалася наконт яе наступным чынам: “Сталинская Конституция действительно отражает то, что имеет в жизни наша молодёжь – право на труд, отдых и учёбу”. У пацверджанне гэтых слоў яна прывяла прыклады сваёй выдатнай стаханаўскай працы, а таксама адзначала, якія агульнаадукацыйныя і тэхнічныя веды атрымала [256, арк. 3]. Такімі ж па змесце і па сэнсу былі і іншыя выступленні стаханаўцаў па рэспубліцы [257, арк. 124, 126, 128].

У далейшым, пасля прыняцця Канстытуцыі СССР, стаханаўцы выступалі і як адны з актыўных удзельнікаў працэсу яе вывучэння. Напрыклад, стаханаўцамі завода “Ударнік” у пачатку 1937 г. было арганізавана на сваіх кватэрах дзве гутаркі аб Канстытуцыі з удзелам 65-ці рабочых [257, арк. 130]. Рабочы-стаханавец Магілёўскага трубаліцейнага завода Г. Кавалёў узяў на сябе грамадскі абавязак не толькі вывучаць Канстытуцыю, але і дапамагаць у вывучэнні адзначанага дакумента астатнім рабочым [257, арк. 284].

Мерапрыемствы з удзелам стаханаўцаў, прысвечаныя абмеркаванню праекта Канстытуцыі і яе далейшаму вывучэнню, сталі адлюстраваннем працэсу фарміравання на прыкладзе актыўнасці гэтай сацыяльнай катэгорыі мадэлі палітычных паводзін, згодна з якой абавязковым лічыўся ўдзел кожнага працоўнага ў грамадска-палітычным жыцці, кожны працоўны павінен быў імкнуцца да павышэння ўзроўню сваёй палітычнай асветы і праяўлення актыўнай грамадскай пазіцыі адносна падтрымкі палітычных мэтаў савецкай улады. З другога боку, у адзначаных намі мерапрыемствах меўся і эканамічны аспект: іх арганізацыя стала падставай для разгортвання дзяржавай чарговага ўздыму вытворчага энтузіязму, бо перадавікі павінны былі не толькі паказаць перавагі савецкай прававой сістэмы, але яшчэ і натхніць сваім прыкладам рабочых і калгаснікаў да ўдасканалення працы. Так, напрыклад, вынікам абмеркавання праекта Канстытуцыі на Магілёўскай шаўковай фабрыцы ў ліпені 1936 г. стала тое, што стаханаўцы і астатнія рабочыя ўзялі на сябе абавязацельствы павялічыць выпуск прадукцыі шоўку да 7400 кг супраць 670 кг па норме [258, арк. 124].

Адваротным бокам грамадскай актыўнасці стаханаўцаў стала тое, што яны ў некаторых выпадках былі занадта перазагружаны разнастайнымі абавязкамі, у выніку чаго не мелі рэальных магчымасцяў для павышэння сваёй кваліфікацыі і правядзення вольнага часу. Такая тэндэнцыя, напрыклад, назіралася на прадпрыемствах Мінска. Так, стаханаўка А. Віторская з завода “Ударнік” скардзілася ў газету “Рабочий” на тое, што ў яе не хапае часу для наведвання школы стаханаўцаў з-за пастаяннага ўдзелу ў разнастайных сходах і



Витебский государственный технологический университет

пасяджэннях, на якіх яе прысутнасць з’яўляецца абавязковай [239, с. 3]. На такую ж перагружанасць грамадскімі абавязкамі скардзіўся стаханавец Мінскага станкабудаўнічага завода імя Варашылава М. Старынскі [333, с. 3]. Стаханаўка Ефрэмава (Віцебскі станкабудаўнічы завод імя Кірава) адзначала, што мае тры грамадскія нагрузкі: з’яўляецца членам гарадскога Савета, камсамольскім арганізатарам у цэху і членам актыву камсамольскай ячэйкі на заводзе, таму ў яе не хапае часу для вучобы, выканання хатніх абавязкаў і адпачынку [155, с. 3]. Пералічаныя прыклады паказваюць, што актыўнае выкананне стаханаўцамі адных грамадскіх абавязкаў прыводзіла да немагчымасці выканання іншых, якія таксама ўскладваліся на іх для адпаведнасці свайму высокаму статусу.

Палітычная канцэпцыя стаханаўскага руху і роля яго ўдзельнікаў у палітычных працэсах была сфармулявана Сталіным на І Усесаюзнай нарадзе стаханаўцаў. Згодна з гэтай канцэпцыяй, разгортванне руху павінна было суправаджацца палітычным падаўленнем тых гаспадарнікаў і ІТР, якія не разумелі рэвалюцыйнай сутнасці стаханаўскіх метадаў працы і не жадалі іх распаўсюджваць на сваіх прадпрыемствах [352, с. 375]. Безумоўна, што ўслед за выступленнем Сталіна аналагічныя палітычныя задачы стаханаўскага руху паставіла партыйнае і дзяржаўнае кіраўніцтва БССР. Так, М. Галадзед на сесіі ЦВК БССР у канцы 1935 г. адзначаў наступнае наконт пазіцыі прадстаўнікоў адміністрацыйна-гаспадарчага апарату, незадаволеных распаўсюджваннем новых метадаў працы: “Задача заключаецца ў тым, каб зламаць супраціўленне і непаваротлівасць гэтых людзей, многім з іх дапамагчы перабудавацца, а калі яны не перабудуюцца ў сваёй рабоце, тады вызваліць нашы ўстановы ад такіх людзей” [318, с. 46]. Пры гэтым, па словах старшыні СНК БССР, націск на такога роду супраціўленне кансерватыўных упраўленцаў павінен быў адбывацца не толькі з боку вышэйшых органаў улады, але і ісці знізу, ад саміх стаханаўцаў [318, с. 46]. Канчаткова адзначаная палітычная пазіцыя ўлады адносна разгортвання стаханаўскага руху была замацавана на саюзным узроўні ў рашэннях Снежаньскага Пленума ЦК УКП(б) 1935 г., якія ў БССР былі ўхвалены на Пленуме ЦК КП(б)Б у студзені 1936 г. У адзначаных рашэннях у якасці важнай задачы ставілася выяўленне “класава-варожых” элементаў, якія імкнуліся перашкаджаць стаханаўцам у іх працы [185, с. 193 – 194].

Так, зараджэнне і разгортванне стаханаўскага руху было адзначана новым этапам выяўлення гаспадарчых кіраўнікоў, апазіцыйна настроеных да сталінскай мадэлі індустрыялізацыі, а супярэчнасці паміж стаханаўцамі і гаспадарнікамі набывалі палітычныя рысы. Пры гэтым саюзнае і рэспубліканскае партыйнае кіраўніцтва пацвярджала ролю стаханаўцаў як палітычнай апоры ўлады на асобных вытворчых



Витебский государственный технологический университет

адзінках, ствараючы з перадавікоў непасрэдных удзельнікаў працэсу выкрыцця “класава-варожых элементаў” сярод тых гаспадарнікаў і ІТР, што па якіх-небудзь прычынах не прымалі стаханаўскіх метадаў працы. У выніку на дзяржаўным узроўні эканамічная мэта – павышэнне прадукцыйнасці вытворчасці, была аб’яднана з палітычнай мэтай – умацаваннем таталітарнай сістэмы ўлады [187, с. 206].

Як мы адзначалі вышэй, у працэсе разгортвання стаханаўскага руху на некаторых прадпрыемствах узнікалі цяжкасці, звязаныя з дэзарганізацыяй кіравання вытворчасцю, зніжэннем якасці прадукцыі, недахопам патрэбнай сыравіны. Такая сітуацыя паслужыла прычынай рэалізацыі на практыцы палітычных мэтаў па выяўленні праціўнікаў стаханаўскага руху, калі абвінавачванні выносіліся як у адрас гаспадарчых кіраўнікоў, так і ў адрас працоўных, з асяроддзя рэальнай і ўяўнай апазіцыі. Падобныя палітычныя кампаніі супалі па часе з падрыхтоўкай і правядзеннем працэсаў, накіраваных супраць прадстаўнікоў так званых трацкісцкіх контррэвалюцыйных арганізацый. У выніку чаго абвінавачванні ў трацкізме на месцах пачалі распаўсюджвацца на людзей, што разглядаліся ўладай як праціўнікі стаханаўскага руху. Пры гэтым падставай для абвінавачванняў і повадам для рэпрэсіўных мер магло стаць любое неасцярожнае слова ў адрас стаханаўца, вытворчыя непаладкі, невыкананне плана [467, с. 158]

На Мінскай фанернай фабрыцы імя Крупскай у лютым 1936 г. была арганізавана брыгада стаханаўцаў-камсамольцаў па садзейнічанні стаханаўскаму руху. Акрамя правядзення агітацыйнага рэйда брыгада выявіла факт пераследу стаханавак Брамбарт і Эстрынай з боку майстра цэха, які ў выніку гэтага аўтаматычна быў абвінавачаны ў трацкізме [261, арк. 34]. Пры падобным жа палітычным садзейнічанні стаханаўцаў у жніўні 1937 г. партыйнай арганізацыяй Каўгарскага спіртзавода было выяўлена трое чалавек, якіх вызначылі як трацкістаў і сабатажнікаў стаханаўскага руху. Сярод іх, напрыклад, старэйшаму хіміку Г. інкрымініраваўся зрыў вучобы па тэхнічнаму мінімуму, што, у сваю чаргу, стала тормазам, з пункту погляду партыйнага кіраўніцтва завода, для далейшага развіцця стаханаўскага руху. На аснове выяўленых фактаў так званай падрыўной дзейнасці на адзначаным прадпрыемстве ў прыналежнасці да “варожага трацкісцка-зіноўеўскага цэнтра” была абвінавачана і частка кіраўнікоў Беларускага дзяржаўнага трэста спіртавой прамысловасці. Ім ставілася ў віну ігнараванне стаханаўскага руху праз несвоечасовое забеспячэнне сыравінай Каўгарскага спіртзавода [247, арк. 55 адв., 56 адв.]. У некаторых выпадках стаханаўцы ў працэсе выяўлення “ворагаў народа” ці “сабатажнікаў” супрацоўнічалі з органамі НКУС. Так, у сваім лісце Сталіну стаханавец Х. з Мінскай дзяржаўнай электрастанцыі пісаў наступнае: “Я говорил

Витебский государственный технологический университет

по радио про свою стахановскую работу, помогал НКВД, выкорчёвывал врагов с данного производства, где я работаю” [103, арк. 99].

Вялікі грамадскі рэзананс у 1936 г. у БССР атрымалі справы аграномa Троіцкага (саўгас “Асвея” Віцебскага Саюзмалтрэста) і Віцебскага паравознага дэпо. У першым выпадку ў адносінах да агранома была заведзена крымінальная справа за тое, што ён забараняў, як меркавалася, стаханаўцам перавыконваць нормы выпрацоўкі [68, арк. 15]. Як і ў іншых прыведзеных намі выпадках Троіцкі быў вызначаны як трацкіст і атрымаў 5 гадоў турмы з высылкай у аддаленныя мясцовасці [197, с. 110]. Другі выпадак звязаны з абвінавачваннем у арганізацыі адміністрацыяй дэпо цэлай трацкісцкай контррэвалюцыйнай групы шкоднікаў, што мела, па вызначэнні мясцовых уладаў, мэту сарваць стаханаўскі рух [118, с. 2].

Як мы заўважылі, палітычныя мэты, якія дэклараваліся ўладай у рамках разгортвання стаханаўскага руху, былі накіраваныя на падаўленне перш за ўсё кансерватыўнай пазіцыі гаспадарчых кіраўнікоў, на практыцы ж гэта ўсё выліліся ў больш шырокую палітычную кампанію, падчас якой у шкодніцкай дзейнасці і падрыве мерапрыемстваў сацыялістычнага спаборніцтва мог быць абвінавачаны любы член працоўнага калектыву. Пашырэнне кола людзей, што вызначаліся як праціўнікі стаханаўскаму руху, тлумачылася актывізацыяй палітычных працэсаў супраць часткі партыйных лідараў СССР і разгортваннем маштабных акцый па выяўленні так званых прыхільнікаў трацкізму па ўсёй краіне. Адсюль і любыя няўдачы ў павышэнні прадукцыйнасці вытворчасці разглядаліся ў асноўным у кантэксце сфабрыкаваных справаў трацкісцкіх контррэвалюцыйных арганізацый. На такія палітычныя абставіны, на наш погляд, у некаторай ступені паўплывала і пазіцыя самаго Л. Троцкага адносна стаханаўскага руху, адлюстраваная ім у кнізе “Преданная революция”, дзе ён выказаў сваё негатыўнае стаўленне да дадзенай формы сацыялістычнага спаборніцтва [442]. У рамках палітычных кампаній супраць трацкізму, як мы выявілі, стаханаўцы выступалі ў якасці самых актыўных удзельнікаў выкрыцця новых “ворагаў”, што дазваляе разглядаць іх гераічны вобраз як ідэалагічны антыпод варожым вобразам трацкістаў, сфарміраваных савецкай прапагандай [227, с. 62].

У гэтым сэнсе стаханаўцы павінны былі выступаць не толькі як палітычная апора ўлады, але і як выразнікі незадаволенасці працоўных так званай варожай дзейнасцю прадстаўнікоў трацкісцкіх контррэвалюцыйных арганізацый. На прадпрыемствах БССР у 1937 г., як і ў іншых рэспубліках Савецкага Саюза, з актыўным удзелам стаханаўцаў былі наладжаны паказальныя мітынгі, дзе на перадавікоў ускладваўся абавязак ад імені рабочых выступіць у падтрымку расправы над членамі вышэй адзначаных арганізацый. 24 студзеня 1937 г.



Витебский государственный технологический университет

паказальныя мітынгі прайшлі ва ўсіх цэхах фабрыкі “Камунарка”. На адным з мітынгаў стаханаўка дражэйнага цэха Яцкевіч выступіла з такой прамовай: “Трацкісцкія гады хацелі знішчыць нашу любімую савецкую радзіму і аднавіць капіталізм. Такіх гадаў трэба знішчыць, каб слядоў гэтых злачынцаў не было на нашай зямлі. Наш адказ павінен быць – яшчэ лепш авалодаць вайсковай справай, узмацніць бальшавіцкую пільнасць [485, с. 4].

Канешне ж, такога роду прамовы насілі дэманстрацыйны характар і былі ініцыіраваны ўладай. У той жа час мы можам меркаваць, што гэтыя выказванні часткова адпавядалі палітычным пазіцыям герояў вытворчасці, якія ў іх ужо паспела выхаваць савецкая дзяржава. Тым больш, што частка абвінавачванняў у прыналежнасці да трацкісцкіх арганізацый, як мы адзначалі, была звязана з “сабатажам” стаханаўскага руху, а гэтая форма сацыялістычнага спаборніцтва з’яўляўся галоўнай крыніцай сацыяльнага росту для рабочых і калгаснікаў. На прыкладзе правядзення мітынгаў, накіраваных супраць так званых трацкістаў, ішло далейшае фарміраванне вобразу стаханаўцаў як самых выдатных прадстаўнікоў працоўных. Зыходзячы са стаханаўскіх выступленняў, бачна, што ўзорным у паводзінах для кожнага прадстаўніка рабочага класа станавілася палітычная пільнасць у адносінах да дзейнасці невыяўленых яшчэ ворагаў. У сувязі з чым кожны працоўны павінен быў узмацніць сваю ваенную падрыхтоўку, павышаць узровень палітычнай асветы і самаахвярна праяўляць сябе ў вытворчасці, такую мадэль паводзін і ўвасаблялі на сваім прыкладзе стаханаўцы.

Выступаючы ў якасці самых лепшых працоўных, стаханаўцы ў шэрагу выпадкаў прызначаліся на тыя адміністрацыйна-гаспадарчыя пасады, якія раней займалі людзі, абвінавачаныя ў трацкізме, а ў прыватнасці ў зрыве стаханаўскага руху. Яскравым фактам такой заканамернасці выступае вылучэнне ў канцы 1937 г. на адказныя пасады стаханаўцаў Віцебскага чыгуначнага вузла. Напрыклад, машыніст-крываносавец Мастыхаў быў прызначаны памочнікам рэвізора па бяспецы чыгуначнага руху, а стаханавец Антан стаў старшым інжынерам тэхнічнага бюро. Да гэтага адзначаныя пасады займалі спецыялісты, западозраныя ў прыхільнасці да трацкізму [347, с. 3]. Пасля палітычнай кампаніі 1937 г. “па ліквідацыі шкодніцтва” па прадпрыемтвах Народнага камісарыята лёгкай прамысловасці БССР на кіруючую працу было вылучана 450 рабочых-стаханаўцаў. У даведцы прамысловага аддзела ЦК КП(б)Б “Вынікі выканання плана 1938 г. прамысловасцю БССР” гэтыя стаханаўцы былі названыя новымі людзьмі, сярод якасцяў якіх вызначаліся бальшавіцкая пільнасць і самаадданая праца па ажыццяўленні праграмы далейшага росту прамысловасці [381, с. 197].

Разглядаючы ролю стаханаўцаў у палітычных працэсах, мы не можам не закрануць праблему партыйнасці гэтай катэгорыі перадавікоў. На першапачатковым этапе разгортвання стаханаўскага руху большасць яго ўдзельнікаў з'яўлялася беспартыйнымі. І гэта падцвярджаецца шматлікімі архіўнымі дадзенымі, што датычацца членства ў КП(б)Б стаханаўцаў па асобных прадпрыемствах і рэгіёнах. Напрыклад, у канцы 1935 г. на Бабруйскай швейнай фабрыцы імя Дзяржынскага са 136 стаханаўцаў партыйнымі былі толькі 5 перадавікоў [87, арк. 45]. З 25 стаханаўцаў Рагачоўскага лесазавода толькі двое былі камуністамі (снежань 1935 г.) [286, арк. 30–31]. Па прамысловасці Аршанскага раёна ў жніўні 1936 г. у шэрагу 438 стаханаўцаў беспартыйныя складалі 378 чалавек [290, арк. 131]. Такую акалічнасць можна растлумачыць сацыяльнай характарыстыкай удзельнікаў стаханаўскага руху, большасць з іх (пра што падрабязна будзе сказана ў наступным раздзеле) складалі людзі маладога ўзросту, якія невялікі час былі занятыя ў грамадскай вытворчасці і яшчэ не паспелі ўключыцца ў актыўнае партыйнае жыццё. Другая абставіна заключалася ў спецыфіцы самой сітуацыі, што склалася ў партыі на момант зараджэння і разгортвання стаханаўскага руху, калі адбываліся чысткі ў шэрагах КП(б)Б, праверка і абмен партыйных дакументаў, а прыём у яе члены да лістапада 1936 г. не праводзіўся [184, с. 31, 47].

Наяўнасць вялікага працэнта беспартыйных сярод стаханаўцаў, якія выдатна ажыццяўлялі на практыцы задачы партыйнага курса фарсіраванай індустрыялізацыі і калектывізацыі, дала падставу для абазначэння ў грамадстве такіх перадавікоў вытворчасці, як "беспартыйных бальшавікоў". Гэта назва была ўпершыню выкарыстана Сталіным падчас прыёму ў Крамлі ўдзельнікаў першамайскага парада 1935 г. Сутнасць слова "беспартыйны бальшавік" Сталін растлумачваў так: "Большевик – это тот, кто предан до конца делу пролетарской революции. Таких много среди непартийных. Они или не успели вступить в ряды партии, или они так высоко ценят партию, видят в ней такую святыню, что хотят подготовиться ещё и ещё к вступлению в партийные ряды. Часто такие люди, такие товарищи, такие бойцы стоят даже выше многих членов партии. Они верны ей до гроба" [Цыт. па 438, с. 589]. Адсюль прымяненне статусу "беспартыйны бальшавік" у дачыненні да тых стаханаўцаў, што не былі членамі КП(б)Б, ставіла і іх, згодна з вызначэннем Сталіна, па сацыяльнаму становішчу вышэй за некаторых камуністаў, што стала відавочным, як мы заўважылі раней, пры ажыццяўленні антытрацкістцкіх кампаній, калі стаханаўцы выступалі ў ролі палітычнай апоры ўлады на асобных прадпрыемствах. Беспартыйнасць часткі стаханаўцаў не стала перашкодай і для іх вылучэння на кіруючыя гаспадарчыя пасады. Напрыклад, за першую



Витебский государственный технологический университет

палову 1938 г. па Гомельскай вобласці было вылучана 343 стаханаўца, большасць з якіх складалі беспартыйныя [269, арк. 23].

Прымяненне ў адносінах да стаханаўцаў азначэння “беспартыйныя бальшавікі” было абумоўлена вытворчым гераізмам, як і прымяненне гэтай жа назвы ў адносінах да ордэнаносцаў Чырвонай Арміі і лётчыкаў, папанінцаў, чэлюскінцаў. Вобраз героя азначаў адданасць інтарэсам партыі, і замацаванне за героямі-стаханаўцамі статусу “беспартыйны бальшавік” з’яўлялася пераходнай ступенню да ўступлення іх у КП(б)Б у якасці новага пакалення яе членаў, што будзе вызначацца, як меркавалася, сваім пастаянным імкненнем паказаць вернасць партыі не на словах, а на справе. У сувязі з гэтым М. Гікала у сваім выступленні на Пленуме ЦК КП(б)Б 14 – 17 студзеня 1936 г. адзначаў, што стаханаўскі рух і чысткі ў партыі нездарма супалі па часе, і стаханаўцы як лепшыя прадстаўнікі рабочага класа павінны замяніць людзей, якія дадзеныя чысткі не прайшлі [254, арк. 147].

Зыходзячы з гэтага, партыйнае кіраўніцтва рэспублікі паставіла задачу па ўключэнні стаханаўцаў у шэрагі камуністаў, якая пачала рэалізоўвацца з лістапада 1936 г., калі па рэспубліцы ўзнавіўся прыём у КП(б)Б [184, с. 33]. Актыўнае ж уступленне ўдзельнікаў стаханаўскага руху ў партыю назіраецца з 1938 г., што тлумачылася змяншэннем колькасці камуністаў у выніку правядзення палітычнай кампаніі 1937 г. супраць прадстаўнікоў так званага трацкісцска-зіноўскага цэнтра. Так, калі на 1 студзеня 1937 г. усяго па БССР налічвалася 24735 членаў КП(б)Б, то на 1 студзеня 1938 г. – 22990 членаў [184, с. 37]. Стаханаўцы як найлепшыя прадстаўнікі працоўных, паказаўшы на прыкладзе сваіх вытворчых подзвігаў адданасць партыі, сталі адной з асноўных крыніц яе папаўнення і замены “палітычна ненадзейных” членаў грамадства. Напрыклад, у пачатку 1938 г. з кандыдатаў у члены партыі былі пераведзены знакамітыя стаханаўцы рэспублікі Котляр, Іофэ і Макараў [219, с. 3]. У лютым 1938 г. у члены КП(б)Б быў прыняты ініцыятар стаханаўскага руху на Крычаўскім цэментным заводзе М. Сярожкін [324, с. 4]. У кастрычніку 1938 г. Народны камісарыят лёгкай прамысловасці БССР вылучыў спіс з 33-х лепшых рабочых-стаханаўцаў. Сярод вылучаных перадавікоў 13 чалавек з’яўляліся партыйнымі, пры гэтым 8 з іх уступіла ў партыю ў 1938 г. [270, арк. 6 – 13].

У межах адзначанага працэсу актывізавалася партыйная работа і сярод стаханаўцаў вёскі (тут колькасць беспартыйных сярод стаханаўцаў была значна большай у параўнанні з прамысловасцю: напрыклад, на 1 мая 1938 г. сярод стаханаўцаў саўгасаў “Ціхінічы” Рагачоўскага раёна і саўгаса “Крынкі” Мінскага раёна не было ні аднаго члена партыі [309, арк. 91, 115]). У красавіку 1939 г. па калгасам Тураўскага раёна ў члены КП(б)Б было прынята 7 стаханаўцаў, а кандыдатамі ў члены партыі сталі 29 перадавікоў. У прыватнасці членам партыі стаў знакаміты на ўвесь раён

Витебский государственный технологический университет

стаханавец-брыгадзір калгаса "VI з'езд Саветаў" М. Ханевіч, другі знакаміты стаханавец раёна – С. Маліноўскі (калгас "Труд") быў прыняты ў кандыдаты ў члены партыі [274, арк. 100 – 101].

## 2.3 Сацыяльна-псіхалагічная характарыстыка стаханаўцаў: матывацыя паводзін і працы, каштоўнасныя арыентацыі, успрыманне ў працоўных калектывах

Важным стымулам актыўнай вытворчай дзейнасці людзей можна лічыць пабуджэнне іх да працы, калі ў працэсе заахвочвання на першае месца вылучаюцца маральныя фактары, а імкненне да ўдасканалення вытворчасці абумоўліваецца тымі сацыяльнымі нормамі і каштоўнасцямі, якія стала замацаваліся ў грамадстве і ў адпаведнасці з якімі павінен быў паводзіць сябе кожны яго член [224, с. 200; 517, p. 74]. У працэсе разгортвання стаханаўскага руху адзначаныя акалічнасці працоўнай дзейнасці сталі самым дамінантным яе матывам, бо вытворчы энтузіязм стаханаўцаў з'яўляўся, перш за ўсё, вынікам усталяванай мадэлі сацыяльных адносін і ідэалагічнага выхавання ў савецкім грамадстве. Гэтыя фактары моцна паўплывалі на станаўленне спецыфічнага спосабу мыслення тагачаснага чалавека і яго жыццёвых установак, якія, у сваю чаргу, прадвызначылі характар сацыяльных паводзін і актыўную грамадскую пазіцыю перадавікоў.

На працягу 1920 – 1930-х гг. у рамках савецкай ідэалагічнай сістэмы дзяржавай быў сфарміраваны вобраз "новага чалавека", які павінен быў увабраць у сябе новыя, характэрныя для грамадства будучыні выдатныя працоўныя здольнасці, высокія маральныя якасці і ўзорныя прыклады прыватнага жыцця [202, с. 376]. На афіцыйным узроўні азначэнне "новыя людзі" актыўна выкарыстоўвалася менавіта ў дачыненні да стаханаўцаў. У падобным рэчышчы тлумачыў статус стаханаўцаў, назваўшы іх "новымі людзьмі", першы сакратар ЦК КП(б)Б М. Гікала ў час прыёму ў сябе стаханавак-ільнотрапальшчыц 17 снежня 1935 г. [248, арк. 18; 249, арк. 19]. У адозве сходу жаночага актыву Дрысенскага раёна 19 снежня 1935 г. стаханаўцы таксама былі названыя "новымі людзьмі" і "прыкладам перавыхавання чалавека на новы лад" [146, арк. 92]. Так, удзельнікі стаханаўскага руху ў працэсе яго шырокага распаўсюджвання з падачы дзяржавы выступалі характэрным прыкладам прадстаўнікоў будучага грамадства сацыялізму, якое меркавалася пабудаваць у СССР. Сацыяльны статус стаханаўцаў у такім кантэксце быў вызначаны не толькі высокім грамадскім прэстыжам, але і характарам сацыяльных паводзін, што з'яўляліся самым яскравым адлюстраваннем каштоўнасных арыентацый прадстаўнікоў савецкага соцыуму. У сувязі з гэтым ключавым фактарам



Витебский государственный технологический университет

узнікнення стаханаўскага энтузіязму і праяўлення вышэйшай ступені вытворчай актыўнасці ў шэрагу з эканамічнымі і палітычнымі фактарамі можна лічыць асаблівасці самаго сацыяльна-псіхалагічнага складу рабочых і калгаснікаў з іх спецыфічным успрыманнем працы, чалавека і сацыяльнага асяроддзя.

Праявы стаханаўскага энтузіязму ў паводзінах працоўных сфарміраваліся на аснове рэвалюцыйнасці іх свядомасці, якая была закладзена яшчэ ў пачатку XX ст. і знайшла сваё наступнае развіццё ў сітуацыі сацыяльных крызісаў Першай сусветнай вайны, падзей 1917 г. [360, с. 260], а таксама падчас Грамадзянскай вайны. У новых умовах сталінскіх пераўтварэнняў эканомікі адзначаны рэвалюцыйны настрой працоўных паўстаў ужо ў форме актывізацыі грамадскай і працоўнай дзейнасці, у тым ліку і ў форме ўдзелу ў стаханаўскім руху. Адбылося перарастанне сацыяльна-псіхалагічных рыс, звязаных з імкненнем зрабіць пераўтварэнні ў грамадстве ўзброенным шляхам, у энтузіязм мірнага часу. Асабліва дадзеную заканамернасць можна было прасачыць на прыкладзе стаханаўцаў старэйшага пакалення. Напрыклад, на Чашніцкай папяровай фабрыцы “Чырвоная зорка” актыўнымі стаханаўцамі былі рабочыя, якія прымалі ўдзел у Грамадзянскай вайне ў шэрагах Чырвонай Арміі [67, арк. 38]. Выдатнай вайсковай службай у Чырвонай Арміі падчас Грамадзянскай вайны вызначыўся і адзін са знакамітых стаханаўцаў кандытарскай фабрыкі “Камунарка” П. Шаблоўскі [426, с. 21]. Удзельнікам партызанскага руху супраць “белапалякаў” быў лепшы стаханавец Быхаўскага раёна І. Мандрык [84, арк. 40].

У працэсе разгортвання фарсіраванай індустрыялізацыі і калектывізацыі пад уздзеяннем прапаганды рэвалюцыйныя імкненні да актыўных пераўтварэнняў узмацняліся, станавіліся дамінантамі ў псіхалагічным складзе працоўных, што знайшло сваё адлюстраванне ў сацыялістычным спаборніцтве першай пяцігодкі і грамадскім актывізме, якія ў сваю чаргу сталі асновай для далейшага праяўлення энтузіязму праз удзел у стаханаўскім руху. Так, ў дадзены рух уключаліся тыя рабочыя і калгаснікі, якія былі раней ударнікамі ці добрасумленна адносіліся да выканання сваіх вытворчых абавязкаў і стабільна выконвалі планы выпрацоўкі. Напрыклад, на кандытарскім камбінаце “Спартак” на снежань 1935 г. у карамельным цэху 24 з 26-ці стаханаўцаў, яшчэ ў верасні, да разгортвання на прадпрыемстве стаханаўскага руху, выконвалі нормы ад 101,6 % да 145 % [100, арк. 14 – 15]. На Віцебскім шчацінна-шчотачным камбінаце да свайго ўключэння ў стаханаўскі рух ударнікамі былі наступныя рабочыя: Х. Годеман (ударніца з 1931 г.), М. Захараў (з 1931 г.), Л. Самерсава (з 1932 г.), З. Эцінген (з 1932 г.) і іншыя [62, арк. 4 − 7]. Падобныя тэндэнцыі назіраліся і на астатніх прадпрыемствах рэспублікі.



Витебский государственный технологический университет

Напрыклад, ударнікамі першай пяцігодкі былі такія знакамітыя стаханаўцы БССР, як Г. Дабраўлянін (Багушэўскі спіртзавод) [433, с. 36], Н. Гімпельштэйн (Мінскі станкабудаўнічы завод імя Кірава) [378, с. 36], З. Таболіна (фабрыка “Камунарка”) [426, с. 26]. Часта стаханаўцамі станавіліся працоўныя, якія да свайго ўключэння ў стаханаўскі рух праявілі сябе як грамадскія актывісты. Напрыклад, стаханаўцы-ільнаводы з Жлобінскага раёна У. Максімаў і П. Лысоў былі актыўнымі ўдзельнікамі арганізацыі калгаса “Камуніст” [363, с. 3; 364, с. 2].

Трэба заўважыць, што на праяўленне стаханаўскага энтузіязму паўплывалі некаторыя сацыяльныя фактары. Так, большую частку стаханаўцаў складалі прадстаўнікі маладога пакалення працоўных, якія нядаўна ўключыліся ў грамадскую вытворчасць. Сярэдні ўзрост стаханаўцаў складаў 25 гадоў. На студзень 1936 г. па выбарачнай праверцы ўзроставага складу стаханаўцаў на 16-ці прадпрыемствах Віцебска было выяўлена 65,5 % стаханаўцаў, узрост якіх быў менш за 30 гадоў [65, арк. 50]. Сярод 438 стаханаўцаў прамысловасці Аршанскага раёна ў канцы 1935 г. 259 чалавек былі ва ўзросце ад 18 да 30 гадоў (59,1 % ад агульнага складу) [290, арк. 131]. З 90 стаханавак БССР, прадстаўленых да ўзнагароды ў сувязі з Міжнародным жаночым днём у 1936 г., ва ўзросце ад 17 да 25 гадоў былі 34 стаханаўкі, ва ўзросце ад 25 да 30 гадоў – 15, ва ўзросце ад 30 да 40 гадоў – 16, і ва ўзросце больш за 40 гадоў – 6. Узрост астатніх стаханавак не быў вызначаны [292, арк. 7 −16]. У Дрысенскім раёне ўзрост лепшых стаханаўцаў калгасаў на снежань 1935 г. не перавышаў 23 гадаў [82, арк. 180 – 185].

Сярэдні працоўны стаж большасці стаханаўцаў складаў 3 гады. На самым пачатку разгортвання стаханаўскага руху, 17 кастрычніка 1935 г., у 1 хромавым цэху Мінскага гарбарнага завода “Бальшавік” стаханаўцамі сталі 55 чалавек, сярод іх працоўны стаж менш за 1 год мелі 10 рабочых, ад 1 да 5 гадоў – 21 рабочы, ад 5 да 10 гадоў – 11 рабочых [299, арк. 169 – 170]. Па Рагачоўскаму лесазаводу на 13 снежня 1935 г. налічвалася 25 стаханаўцаў. Працоўны стаж 2 стаханаўцаў складаў менш за 1 год, 14 стаханаўцаў адпрацавалі ў прамысловасці ад 1 да 5 гадоў [286, арк. 30]. У спісе стаханаўцаў БССР, што былі камандзіраваны ЦСПСБ у Маскву на Майскія ўрачыстасці 1936 г., большая частка мела працоўны стаж менш за 5 год [293, арк. 2 – 6]. У сельскай гаспадарцы сярэдні працоўны стаж стаханаўцаў у грамадскай вытворчасці таксама быў невялікім. Напрыклад, стаж у вытворчасці лепшых стаханаўцаў саўгаса “Арловічы” Віцебскага раёна ў кастрычніку 1935 г. складаў у сярэднім 2 гады [68, арк. 10]. Сярэдні вытворчы стаж стаханаўцаў саўгаса імя 1 Мая Заслаўскага раёна на 1 мая 1938 г. быў 3 гады [310, арк. 1]. Невялікі працоўны стаж стаханаўцаў сельскай гаспадаркі можна патлумачыць не толькі іх

Витебский государственный технологический университет

маладым узростам, але і тым, што большасць калгасаў і саўгасаў рэспублікі пачала актыўна ўтварацца ў пачатку 1930-х гг.

Як вынік, у стаханаўскі рух пераважна ўключалася тое пакаленне, працоўная дзейнасць якога пачалася ў гады фарсіраванай індустрыялізацыі і калектывізацыі, а рэвалюцыйныя каштоўнасці папярэдняга пакалення набывалі ў яго новыя якасці, максімальна накіраваныя на актыўныя пераўтварэнні ў вытворчасці. Станаўленне прадстаўнікоў маладога пакалення працоўных як асоб адбывалася менавіта ў савецкіх умовах, калі вызначаныя дзяржавай планы па пабудове сацыялізму станавіліся для іх базавымі каштоўнасцямі і стала замацоўваліся ў працоўнай дзейнасці, імкненні ж зрабіць татальныя змены ў вытворчай сферы і ў грамадстве ў цэлым праяўляліся у іх больш яскрава, чым у працоўных, жыццёвы вопыт якіх склаўся яшчэ ў дарэвалюцыйны час. Даследчык рабочага класа А. Удовін вызначаў у гэтым сэнсе, што для фарміравання псіхалогіі кваліфікаванага прамысловага рабочага быў неабходны вытворчы вопыт больш за 5 гадоў, але ў маладых людзей, што ўдзельнічалі ў стаханаўскім руху, нягледзячы на іх невялікі працоўны стаж, станаўленне псіхалагічных рыс савецкага рабочага класа адбылося за больш кароткі тэрмін і вельмі хутка сфарміраваліся матывы да ўдасканалення вытворчых працэсаў [28, с. 108 – 109]. Фарміраванне ж першага працоўнага вопыту стаханаўцаў сельскай гаспадаркі адбылася разам са станаўленнем калгасаў і саўгасаў, таму і ў матывах працоўнай дзейнасці пераважалі імкненні да ўдасканалення менавіта грамадскіх форм вытворчасці на вёсцы.

Сацыяльную базу для стаханаўцаў прамысловасці складалі ў асноўным перасяленцы з вёскі ў горад, выхадцы з бяднейшага сялянства, серадняков [187, с. 206]. Асабліва яскрава гэта прасочваецца менавіта на прыкладзе БССР, дзе да пачатку індустрыялізацыі канца 1920-х − 1930-х гг. пераважала сельскае насельніцтва, і новы склад рабочых папаўняўся, пачынаючы з першай пяцігодкі, перш за ўсё за кошт былых сялян. У Полацкай лесахімічнай арцелі “Труд” (на 2 лютага 1936 г.) толькі 2 стаханаўцы з 11 былі рабочымі па сацыяльным паходжанні [79, арк. 45]. На Чашніцкай папяровай фабрыцы “Чырвоная зорка” (на 5 снежня 1935 г.) 9 з 27 стаханаўцаў вызначаліся па сацыяльным паходжанні як рабочыя [67, арк. 7 − 8]. Па дадзеным снежня 1936 г. 32 рабочых-стаханаўцы з 39-ці на Азярэцкім лесазаводзе былі выхадцамі з сялян [314, арк. 4 – 5].

У дадзеным выпадку асаблівую ролю ў праяўленні стаханаўскага энтузіязму адыгрываў фактар змены сацыяльнага акружэння ў выніку перасялення з вёскі ў горад. Як адзначае расійскі гісторык У. Булдакоў, у гэтай сітуацыі вялікія масы людзей − носьбітаў архаічнай псіхаментальнасці, трапіўшы ў гарады, у складаны свет урбанізацыі і



Витебский государственный технологический университет

індустрыялізацыі адказвалі на змену сваёй культуры актывізацыяй сваёй дзейнасці [24, с. 33]. У рабочых, што былі перасяленцамі з вёскі, не сфарміравалася да канца прафесійная культура, таму яны з лёгкасцю ўспрымалі карэнныя змены ў вытворчых працэсах, ажыццяўленне якіх магло замацаваць іх прэстыж у працоўным калектыве.

Большасць стаханаўцаў сельскай гаспадаркі па сваім сацыяльным паходжанні адносіліся да серадняковў ці беднякоў, а іх бацькі з'яўляліся членамі калгасаў ці рабочымі саўгасаў з моманту ўтварэння дадзеных гаспадарак. Напрыклад, стаханаўка з калгаса "Тарантова" Чашніцкага раёна М. Доўгая паходзіла з сям'і сераднякоў, якія ўступілі ў калгас з дня яго арганізацыі ў 1931 г. Падобныя характарыстыкі мелі і іншыя стаханаўкі Чашніцкага раёна [67, арк. 13]. З бядняцкіх сямей паходзілі лепшыя стаханаўцы калгасаў Дрысенскага раёна М. Лаўрыненка, І. Матуль, Г. Літвін [82, арк. 180 – 185]. У выніку ўзнікнення новага гаспадарчага ўкладу ў вёсцы станаўленне асобы передавікоў і стэрэатыпаў іх сацыяльных паводзін адбывалася ў тых сем'ях, якія былі ўжо пэўны час задзейнічаны ў грамадскіх формах вытворчасці, на аснове чаго фарміраваліся і адпаведныя матывы самаадданай працы.

Разгледзім некаторыя асаблівасці каштоўнасных арыентацый, прасторава-часавых уяўленняў, успрымання грамадства, працоўнай этыкі і стэрэатыпаў паводзін, што знайшлі сваё адлюстраванне ў энтузіязме стаханаўцаў і вызначалі іх асобны сацыяльны тып.

У інтэнсіўнай ломцы старых вытворчых норм у стаханаўцаў складваліся матывы да карэннай перабудовы эканомікі, пад якой разумелася і ломка ўсяго старога, што існавала ў грамадстве. Такія імкненні абумоўлівалася наяўнасцю ў рабочых і калгаснікаў адпаведных прасторава-часавых уяўленняў, якія сталі асновай для ўздыму працоўнага стаханаўскага энтузіязму. У прыватнасці, час становіцца складовай часткай сістэмы каштоўнасцяў савецкага грамадства. Рабочыя і калгаснікі лічылі ідэальным максімальнае яго запаўненне працоўнай дзейнасцю пры выкананні вытворчых абавязкаў, у такіх умовах важнай і знакавай лічылася кожная хвіліна, якую трэба было выкарыстаць з максімальнай ступенню эфектыўнасці. Такія рысы часавых уяўленняў выліліся ў стаханаўскім энтузіязме ў метад ушчыльнення працоўнага дня. Напрыклад, на кандытарскай фабрыцы "Камунарка" стаханаўка М. Цыгельніцкая, якая спецыялізавалася на завёртцы этыкетак у карамельным цэху, 13 кастрычніка 1935 г. ушчыльніла свой працоўны час, вызваліўшы яго ад лішніх хаджэнняў за этыкеткамі за кошт папярэдняй арганізацыі працоўнага месца, а менавіта за кошт падрыхтоўкі неабходных матэрыялаў. У выніку работніца змагла максімальна скарыстаць кожную хвіліну падчас сваёй змены і перавыканаць план у некалькі разоў [426, с. 34]. Стаханавец-



Витебский государственный технологический университет

дражджавар Т. Куляшоў абгрутнаваў павышэнне прадукцыйнасці вытворчасці менавіта сваімі адносінамі да працоўнага часу. “Я ничего нового не выдумал, − свярджаў стаханавец, − Я лишь уплотнил свой рабочий день, не терея ни минуты; относясь весьма внимательно и вдумчиво к своей работе” [433, с. 45 – 46].

Своеасаблівыя адносіны да свайго працоўнага часу вылучыў стаханавец Глускі (г. Мінск). Ён адзначыў, што прадукцыйнасць працы залежыць ад 4 фактараў. Першым фактарам стаханавец назваў час, які траціцца на падрыхтоўку да пэўнай вытворчай аперацыі, другі фактар абазначыў як рэжым працы або фактар машыннага часу, трэцім фактарам быў дапаможны час, разлічаны на пераход да працы іншага апарата ці дастаўку сыравіны, а чацвёртым – час накладны, звязаны з арганізацыйнымі пытаннямі, той час, калі рабочы, напрыклад, хадзіў іх вырашаць у завадскі камітэт. Пры вылучэнні гэтых 4-х фактараў Глускі сцвярджаў, што дапаможны час павінны быць мінімальным па сваёй працягласці, а накладны час павінен быць зведзены да нуля [284, арк. 53 – 55]. У дадзеным выпадку найбольш яскрава былі адлюстраваны каштоўнасныя адносіны да катэгорыі часу, калі асаблівае значэнне набывалі толькі тыя яго прамежкі, што былі разлічаныя на падрыхтоўку працоўнага месца і непасрэднае выкананне вытворчых абавязкаў. Увесь жа дапаможны час рабочага дня, што траціўся на розныя пазавытворчыя аперацыі, успрымаўся як фактар, які можа стаць перашкодай да ўдасканалення працы. У выніку працоўныя аддавалі перавагу і цанілі час, прывязаны да іх непасрэднай функцыі – выпрацоўкі пэўнай прадукцыі. У прыватнасці, стаханавец Глускі пры такой адзнацы працоўнага часу вылучыў тры ўмовы, з дапамогай якіх можна зрабіць яго больш эфектыўным: выдатная арганізацыя працоўнага месца, правільная арганізацыя рэжыму працы станкоў і ўвядзенне розных прыстасаванняў для звядзення да мінімуму дапаможнага часу [284, арк. 55].

Прыведзеныя вышэй прыклады сведчаць, што каштоўнасныя адносіны стаханаўцаў да часу ў выглядзе ўшчыльнення свайго працоўнага дня як сродку ўдасканалення вытворчасці падштурхоўвалі да ініцыятывы новай арганізацыі працэсу працоўнай дзейнасці, стварыўшы тым самым усе спрыяльныя ўмовы для ўсталявання новых рэкордаў.

З дадзеным успрыманнем часу цесна перапляталіся адпаведныя ўяўленні працоўных пра прастору, якую трэба было скарыць хуткімі тэмпамі для стварэння развітай эканамічнай сферы і новага тыпу грамадства [337, с. 54]. Такая рыса прасторавага ўяўлення, безумоўна, прыводзіла і да ўдасканалення працы: перш за ўсё, гэта адлюстравалася на пераўтварэнні самай блізкай прасторы, непасрэдна звязанай з выкананнем індывідуальных вытворчых абавязкаў. Пры разглядзе



Витебский государственный технологический университет

асаблівасцяў успрымання часу намі было заўважана, што галоўным фактарам усталявання стаханаўскіх рэкордаў была менавіта якасная падрыхтоўка рабочымі свайго працоўнага месца. Такое ўспрыманне прасторы з'яўлялася толькі самым першасным яго праяўленнем, таму што ў больш шырокім сэнсе імкненне да прасторавых пераўтварэнняў прадугледжвала, па ўяўленні працоўных, карэнныя змены не столькі на сваім працоўным месцы, а колькі ва ўсёй гаспадарчай адзінцы, на якой яны працавалі. Такая акалічнасць адносін да прасторы прадвызначалася пэўнай прывязанасцю да таго прадпрыемства ці гаспадаркі, дзе здзяйсняліся вытворчыя абавязкі, і адпаведнай зацікаўленасцю зрабіць свой завод ці калгас лепш за іншыя. Так, у большасці выказванняў людзей, якія ўключаліся ў стаханаўскі рух, назіралася адчуванне еднасці з сваім месцам працы і імкненне паказаць сапраўднасць такіх адносін праз прыклады канкрэтных працоўных паводзін. Напрыклад, стаханавец І. Трацэўскі вызначыў у якасці галоўных умоў свайго энтузіязму любоў да прадпрыемства. Так, ён казаў: "Я полюбил завод, я горел желанием работать на заводе" [433, с. 27]. Гонар за сваё прадпрыемства можна заўважыць у выступленні стаханаўца Слаўкіна (Мінская панчошная фабрыка): "Вырабляем 175 % нормы. Гэта кажа аб тым, што наша маленькае прадпрыемства можа нараўне з усімі гігантамі прамысловасці змагацца за хуткія тэмпы і вялікую прадукцыйнасць" [290, арк. 14]. А стаханаўка П. Пярцова (Лёзненскі раён) успамінала, што новыя метады працы зацікавілі яе пасля таго, як сельсавет, у якім працавала знакамітая льнотрапальшчыца С. Быкоўская, пасля ўсталявання апошняй новага працоўнага рэкорда трапіў на чырвоную дошку. У сваю чаргу, у Пярцовай узнікла жаданне, каб і яе сельсавет, які быў ў той час на чорнай дошцы, трапіў на дошку чырвоную [365, с. 2]. У адзначаных выпадках, як бачым, у сацыяльна-псіхалагічным абліччы стаханаўцаў яскрава праявілася вылучэнне адметнасці прасторы свайго прадпрыемства ці рэгіёна, што стала падставай для яе творчага працоўнага ўдасканалення. У працоўных складвалася імкненне пасля пераўтварэння сваёй мікрапрасторы, а менавіта свайго працоўнага месца, ці пасля дасягнення сваіх працоўных подзвігаў зрабіць ідэальнай прастору і ўсяго працоўнага калектыву.

Прасторавае разуменне працоўных не абмяжоўвалася ўяўленнямі пра пераўтварэнне толькі прасторы сваёй вытворчай адзінкі, бо ў сістэме іх каштоўнасцей прысутнічала меркаванне, што іх сацыяльная прастора − гэта і частка прасторы ўсяго СССР. Прасторавыя структуры набывалі характар неабмежаванасці, вялікага маштабу, адсюль і ўсе энтузіясцкія праяўленні называліся перадавікамі ўнёскам ва ўдасканаленне ўсей краіны. Гэта ўплывала на стаханаўскі запал, дзе безмежнасць прасторавага асяроддзя пабуджала да такой жа неабмежаванай рэалізацыі свайго працоўнага патэнцыялу. Такое



Витебский государственный технологический университет

прасторавае ўспрыманне назіраецца, напрыклад, у выступленнях знакамітых стаханаўцаў Н. Гімпельштэйна і Л. Левіна, дзе адзначалася, што іх стаханаўскі энтузіязм зробіць СССР заможным і культурным [378, с. 41; 424, с. 13]. А стаханаўка В. Уласенка (калгас "1 мая", Мсціслаўскі раён) у сваіх успамінах адзначала наконт сваёй геraічнай працы наступнае: "Приходилось много лишаться в личной жизни ради своевременной поставки качественной животноводческой продукции, в которой так остро нуждалась страна" [89, арк. 11].

Ключавым элементам каштоўнасцей савецкага грамадства 1930-х гг. з'яўлялася станоўчая ацэнка працы. Ва ўмовах мадэрнізацыі характэрнае для традыцыйнай супольнасці азначэнне працы як спосабу забеспячэння жыцця, рэлігійнага выхавання перарастала пад уплывам сацыялістычных ідэй у сродак эканамічнага прагрэсу, праца для чалавека набывала вызначаны прэстыж і бачылася ім не як увасабленне эксплуатацыі, а як магчымасць сваёй самарэалізацыі. Тыя працоўныя, якія сталі стаханаўцамі, заўжды ўказвалі на працу як на найвышэйшую каштоўнасць. Стаханавец Шульман (Мінскі станкабудаўнічы завод імя Кірава), напрыклад, адзначаў: "Праца ў нас з'яўляецца справай гонару, справай славы, справай доблесці і геройства" [378, с. 25]. Знакамітая стаханаўка Т. Зубарава з Магілёўскага раёна ўспамінала: "Работать на общую пользу, знать, что твой труд принесёт людям добро, гордиться высокой общественной оценкой труда – это настоящее счастье. Оно вдвое дороже потому, что мы его завоевали в борьбе со многими трудностями" [90, арк. 12 адв. – 13].

Такія каштоўнасныя адносіны да працы абумовілі ўзнікненне адпаведнага стэрэатыпу сацыяльных паводзін, што характарызаваўся максімальным праяўленнем свайго працоўнага патэнцыялу для ажыццяўлення мэты пабудовы сацыялізму (у гэтай сувязі адным з перадавікоў на агульным сходзе ІТР і стаханаўцаў прадпрыемстваў Мінска 18 снежня 1935 г. вытворчы энтузіязм вызначаўся як дасканалая праца, якая накіравана не для сябе, а на добраўладкаванне ўсяго грамадства [284, арк. 15]). Акрамя таго, рабочы ці калгаснік бачыў, што пры яўнай пашане працы ў соцыуме яе актывізацыя можа прывесці ўвогуле да замацавання новага сацыяльнага статусу, які будзе акружаны яшчэ большымі клопатамі з боку дзяржавы.

У ракурсе каштоўнасных адносін да працы з боку рабочых і калгаснікаў, ва ўмовах з'яўлення новага тэхнічнага абсталявання на гаспадарчых адзінках, узнікае і яе рацыянальнае ўспрыманне, калі станоўчыя вынікі у працоўнай дзейнасці ўсё менш атаясамліваюцца з цяжкімі фізічнымі нагрузкамі ці затратай вялікіх фізічных сіл на выпрацоўку пэўнай прадукцыі, а разглядаюцца як вынік выдатнай арганізацыі вытворчага працэсу, заснаванага, перш за ўсё, на выяўленні новых магчымасцяў тэхнікі. Для прыкладу, стаханаўка Турэцкая з



Витебский государственный технологический университет

Мінскай швейнай фабрыкі “Кастрычнік” такім чынам бачыла новыя спосабы зрабіць працу лепшай: “Стаханаўскі метад, па маёй думцы, не на фізічнай сіле грунтуецца. Некаторыя таварышы лічаць, што тут сілай націскаць трэба. Але тут справа не ў сіле, а ў добрай арганізацыі працы” [392, с. 3]. Так, ва ўмовах пераходу да індустрыяльнага грамадства ў працоўных паступова знікае характэрнае для традыцыйнай супольнасці ўяўленне пра працу як пра дзейнасць выключна фізічнага характару і фарміруецца новыя творчыя падыходы да яе арганізацыі, звязаныя з тэхнічнымі магчымасцямі прадпрыемства і правільным іх выкарыстаннем. Такія змены ва ўспрыманні працы і становяцца па сутнасці базавымі ў вынаходніцтве новых стаханаўскіх метадаў, якія паказваюць, што разам са складваннем індустрыяльнага грамадства ішло складванне і адпаведнай індустрыяльнай псіхалогіі, што ў савецкім варыянце праявілася ў актыўным удзеле ў сацыялістычным спаборніцтве.

У працэсе падобнай трансфармацыі ўспрымання працы яе традыцыйная інтэрпрэтацыя як хрысціянскага самаўдасканалення набывала ў савецкіх умовах форму высокіх маральных прынцыпаў прафесійнай дзейнасці. Так, з пункту погляду стаханаўцаў, немалаважную ролю ў іх вытворчых поспехах адыгрывалі менавіта добрасумленныя адносіны да сваёй справы, а маральны фактар пры ўспрыманні працы праявіўся не толькі ў якасным выкананні рабочымі і калгаснікамі сваіх абавязкаў, але і ва ўдасканаленні метадаў працоўнай дзейнасці. Адзін з перадавікоў саўгаса “Крынкі” Віцебскага Саюзмалтрэста казаў: “Сакрэт нашых поспехаў – вывучэнне сваёй справы, любоўныя і беражлівыя клопаты за жывёлай і тэхнікай” [68, арк. 52]. Стаханаўка Гузарэвіч з Рэчыцкай запалкавай фабрыкі “X Кастрычнік” вызначала, што дбайны нагляд за працай станкоў аказаў вялікі ўплыў на перавыкананне ёю норм выпрацоўкі [296, арк. 40]. Добрае веданне спецыфікі прафесіі і любоў да сваёй працы адзначала як фактар стаханаўскага энтузіязму і работніца Г. Кунісюк з Магілёўскай шаўковай фабрыкі імя Куйбышава: “Я зраднілася з шоўкам. Выраб шаўковай ніткі, адбелка, сартаванне – усё гэта працэсы мне добра знаёмыя” [201, с. 2].

Як мы адзначылі вышэй, стаханаўскі рух стаў самым яркім прыкладам рэалізацыі на практыцы ідэі фарміравання “новых людзей”. Адпаведна ў выніку распаўсюджвання адзначанай канцэпцыі з боку дзяржавы ў жыццёвых установках рабочых і калгаснікаў паступова выпрацоўваецца і новы механізм успрымання чалавека, у рамках якога свае магчымасці і магчымасці кожнага члена савецкага грамадства бачыліся неабмежаванай крыніцай дасягнення эканамічных поспехаў. Гэта натхняла найбольш свядомых энтузіястаў працы да пастаяннага ўдасканалення сваіх здольнасцей, пры гэтым яны разумелі, што

Витебский государственный технологический университет

абсалютна кожны чалавек можа максімальна выкарыстоўваць свае працоўныя магчымасці для пабудовы грамадства сацыялізму. П. Пярцова, напрыклад, пасля выпрацоўкі рэкорднай нормы льновалакна ў 40 кг за дзень вызначала наступнае: “Я бы толькі хацела аднаго – каб мае метады работы сталі здабыткам усіх, каб заўтра знайшліся ўжо такія калгасніцы, якія, працуючы маім метадам ці ўдасканальваючы яго, далі б не 40, а 50 – 60 кілаграмаў” [169, с. 4]. Стаханаўка К. Ежгурава з Віцебскай панчошнай фабрыкі імя К. Цэткін выказвала падобнае ж меркаванне: “Все остальные кетлевщицы могут дать такую же производительность, как мы, стахановки” [323, с. 3].

У рабочых і калгаснікаў стала замацаваліся прынцыпы ўспрымання працоўных здольнасцяў чалавека як вышэйшай каштоўнасці, якія ён можа выдатна праявіць пры любых абставінах. Такая пазіцыя была звязана, з нашага пункта погляду, з пэўнай салідарнасцю людзей працы і іх калектывісцкай псіхалогіяй, дзе яны усведамлялі сваё адзінства у рамках прыналежнасці да аднаго класа ці непасрэдна да адной прафесійнай групы. У такім выпадку здольнасць чалавека паказаць высакаякасную працу пачынае бачыцца перадавікамі ў кожным члене працоўнага калектыву, што становіцца грунтоўнай асновай для перадачы стаханаўскага вопыту астатнім. Напрыклад, на працягу снежня 1936 г. распаўсюджваннем новых метадаў сярод адстаючых работніц актыўна займалася стаханаўка Г. Гусакова (Сіроцінскі льнозавод) [260, арк. 4]. Падобную ж актыўнасць у 1939 г. праявілі на сваіх прадпрыемствах стаханаўка А. Аўдосева (фабрыка “КІМ”) і стаханавец Л. Бельнік (Мінскі станкабудаўнічы завод імя Кірава) [18; 21; Дадатак Г, Малюнак Г.1, Малюнак Г.2]. Так, працэс успрымання чалавека і яго здольнасцей у працоўных цесна быў звязаны з ідэяй калектывізму, якая становіцца эмацыянальным складнікам любой дзейнасці, у тым ліку і вытворчага энтузіязму. Кожны працоўны усведамляў, што ўсе поспехі, якіх ён можа дасягнуць, ён дасягае менавіта ў калектыве, што звязвалася з агульным удзелам у працэсе стварэння новага грамадства і сумесным дасягненнем высокіх вытворчых паказчыкаў.

З аднаго боку, у дзейнасці стаханаўцаў вызначаўся пэўны індывідуалізм, калі яны бачылі знакавасць свайго ганаровага статусу “знатнага чалавека” ў грамадстве і надавалі вялікае значэнне сваім вытворчым поспехам. Можна казаць пра тое, што ў групы стаханаўцаў стала замацаваліся ўяўленні пра сваё месца ў сацыяльнай структуры і яны дакладна ідэнтыфікавалі сябе з самымі лепшымі працоўнымі, якія маюць выдатныя асабістыя, грамадскія і прафесійныя якасці [175, с. 225; 176, с. 158]. Напрыклад, карэспандэнтамі газеты “За торф” стаханаўцам торфазаводаў БССР было зададзена пытанне: “Які ваш самы радасны дзень?” На што перадавікі далі наступныя адказы: “калі

Витебский государственный технологический университет

заваяваў першы рэкорд і аб гэтым загаварыла грамадскасць", "дзень рэкорда пры выпрацоўцы флянсаў", "рэкорд у час стаханаўскай змены" [298, арк. 30]. Яшчэ адзін з перадавікоў тарфяной прамысловасці Беларусі Ф. Зубаў (Гомельскі торфазавод "Бальшавік") адзначаў наконт свайго атрыманага статусу наступнае: "В прошлом году я получил звание знатного стахановца БССР. Этим званием я горжусь, но на этом не успокаиваюсь, я хочу быть и в дальнейшем лучшим бригадиром торфзаводов БССР" [154, с. 3]. Асаблівы гонар за свой статус стаханаўкі адчула С. Быкоўская, калі аказалася сярод лепшых перадавікоў сельскай гаспадаркі СССР на прыёме ў Крамлі. Так, яна ўспаміналa: "Герои нашей родины – стахановцы социалистических полей стали рассказывать о своих горячих буднях, поняла я, что Сталин не напрасно, не попусту уделяет внимание и время этим людям – за большие дела заслужили они этот почёт. Когда я продумала это, мне ещё радостней стало, ещё сильней сердце забилось. Раз, Степанида, и ты среди них, значит, потрудилась не мало" [25, с. 3].

Атрыманыя ганаровыя статусы "знатных людзей", як мы заўважылі, вызначаліся карэннымі зменамі ў самасвядомасці тых працоўных, якія сталі іх носьбітамі, і новым успрыманнем імі свайго месца ў працоўным калектыве, калі стаханаўцы лічылі знакавай падзеяй у сваім жыцці ўсталяваныя імі вытворчыя рэкоды і бачылі, што гэтыя рэкорды сталі асновай для іх сацыяльнай перавагі над астатнімі працоўнымі. На аснове гэтага перадавікі пачалі пэўным чынам вылучаць сябе ў асобную катэгорыю, адрозную ад іншых людзей працы. Апошняе яскрава падцвярджае прыклад, калі стаханаўкі Асіповіцкага шклозавода "Кастрычнік" пры абмеркаванні праекта Канстытуцыі СССР прапанавалі ўнесці ў яе асобны артыкул, які датычыўся б сацыяльнага і палітычнага становішча стаханаўцаў [147, арк. 417]. Так, у працоўных праз стаханаўскі рух замацоўваецца яскравае ўсведамленне сваёй індывідуальнасці, што складвалася пад уплывам палітыкі дзяржавы па стварэнні на прыкладах стаханаўцаў прадстаўнікоў новай эліты. Падобнае ўспрыманне сябе як выдатных працоўных, безумоўна, становіцца моцным матывам далейшага ўдасканалення працы і новых уздымаў энтузіязму, а імкненне да сацыяльнага росту, жаданне належыць да людзей з высокім сацыяльным статусам стала адным з галоўных фактараў уключэння новых рабочых і калгаснікаў у стаханаўскі рух.

Пад уплывам прапаганды самаідэнтыфікацыя стаханаўцаў у якасці лепшых працоўных прыводзіла часта да таго, што яны проціпастаўлялі сябе інжынерна-тэхнічным работнікам і кіраўнікам прадпрыемстваў, лічачы, што лепш ведаюць тэхніку і працэс арганізацыі вытворчасці на прадпрыемствах. Такіх меркаванняў, напрыклад, прытрымлівалася выдатніца працы Гузарэвіч, што на



Витебский государственный технологический университет

Усебеларускай нарадзе стаханаўцаў 10 студзеня 1937 г. указвала на недахопы працы майстра цэха ў выкарыстанні сыравіны. На той жа нарадзе стаханаўка Масленікава (фабрыка "КІМ") свярджала наступнае: "У нас нет плохих работниц, а есть только плохие руководители" [296, арк. 19, 39].

З другога боку, усведамляемая індывідуальнасць стаханаўцаў сфарміравалася ў рамках калектывісцкіх традыцый, што былі закладзены ў савецкім грамадстве, калі асобны працоўны подзвіг успрымаўся рабочымі і калгаснікамі як частка дзейнасці ўсяго працоўнага калектыву. Так, напрыклад, у тэксце сацыялістычнага абавязацельства, якое прынялі стаханаўкі Талачынскага раёна ў пачатку 1936 г., вельмі часта сустракаецца займеннік "мы", а потым у самым канцы – займеннік "я", дзе адлюстроўваліся ўжо задачы асобна ўзятай стаханаўкі [60, арк. 41]. Падобную ж калектывісцкую адметнасць стаханаўскага энтузіязму можна было назіраць у прыпеўцы стаханавак з калгаса "Асвета" Клічаўскага раёна:

Паравоз пару пускае,
Па дарожанцы бяжыць,
Будзем разам мы, дзяўчаты,
Па-стаханаўску рабіць [472, с. 3].

Вылучэнне працоўнымі сваіх персанальных вытворчых поспехаў як складовай часткі ажыццяўлення агульнай мэты прыводзіла да ўзнікнення сапраўднага духу спаборніцтва, калі на аснове стаханаўскіх дасягненняў адбывалася не толькі павышэнне сацыяльнага статусу рабочых ці калгаснікаў, але і ў іх свядомасці фарміравалася імкненне быць лепшымі для таго, каб зрабіць як мага большы ўнёсак у павышэнне тэмпаў вытворчасці свайго працоўнага калектыву ў цэлым. Пра вялікі запал вытворчага энтузіязму і высокую ступень спаборніцтва паміж стаханаўцамі сведчыць наступны расповед Г. Скабло: "За апошні час я павышаю выпрацоўку з дня ў дзень … Зменшчык мой – Фейдеман – ганіць мяне па пятах. Але ж я ўпэўнены ў сабе – не дагоніць". Акрамя духу персанальнага спаборніцтва ў прамове стаханаўца яскрава адчуваецца і атмасфера спаборніцтва паміж калектывамі: "У нас з'явіўся моцны канкурэнт – закройны цэх. Але мы не здаёмся" [241, с. 3]. Энтузіясцкі парыў вытворчага спаборніцтва сярод працоўных быў адлюстраваны, напрыклад, і ў расказе знакамітага стаханаўца Р. Рушко: "Будучи в доме отдыха, услышав, что мои показатели 328 % перекрыл Поздняков, давший 496,3 % плана, я вернулся на сутки, перекрыл показатели Позднякова, дал 657,4 % плана, заработал 46 рублей 28 копеек за смену, и так сохранил за собой авангардную роль комсорга смены" [252, арк. 145].

Такім чынам, калектывізм як характэрная рыса свядомасці працоўных савецкага часу становіцца грунтоўнай асновай для



Витебский государственный технологический университет

разгортвання стаханаўскага руху, а яго ўдзельнікі ў самай вялікай ступені праяўлялі адданасць агульным інтарэсам як сваіх працоўных калектываў, так і грамадства ў цэлым. У рамках адзначанай рысы свядомасці важным стымулам стаханаўскага энтузіязму якраз і становіцца маральнае заахвочванне працоўных, калі за высокія вытворчыя паказчыкі рабочыя і калгаснікі атрымлівалі сімвалічнае прызнанне з боку дзяржавы сваёй знакавай ролі ў жыццядзейнасці грамадства, праз што замацоўвалі свой высокі сацыяльны статус.

Маральнае заахвочванне знаходзіла сваё адлюстраванне, перш за ўсё, у дзяржаўных узнагародах розных узроўняў. Напрыклад, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга быў узнагароджаны стаханавец А. Лучкоўскі (запалкавая фабрыка “Везувій”), ордэн Леніна атрымалі удзельнік стаханаўскага руху з Полацкага хлебзавода А. Будзько і адна з лепшых стаханавак Гомельшчыны Ляшкова [2, с. 3; 63, арк. 28; 98, арк. 27]. Усяго па рэспубліцы за 1935 – 1937 гг. ордэнам Леніна было ўзнагароджана 11 стаханаўцаў, ордэнам Чырвонага Сцяга – 15 стаханаўцаў, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга – 8, ордэнам “Знак пашаны” – 38 [291, арк. 2]. Акрамя гэтага, спосабам маральнага заахвочвання стаханаўцаў з боку дзяржавы становяцца ганаровыя граматы і каштоўныя падарункі. Так, да свята 8 Сакавіка ў 1936 г. граматамі ЦВК і СНК БССР было ўзнагароджана 125 жанчын-стаханавак [3, с. 2]. Стаханавец Г. Басаў з Віцебскага паравознага дэпо, напрыклад, атрымаў у падарунак ад кіраўніцтва рэспублікі імянны гадзіннік [76, арк. 5].

Важнай формай маральных стымулаў да ўдзелу ў стаханаўскім руху станавілася таксама разнастайныя акцыі грамадскай пашаны перадавікоў праз унясенне іх імёнаў у кнігі гонару, прадастаўленне права выступаць у першых шэрагах удзельнікаў урачыстых мерапрыемстваў, уваходжанне ў спіс ганаровых асоб пры напісанні калектыўных лістоў Сталіну і іншых. Напрыклад, у канцы жніўня 1936 г. у адзнаку гадавіны стаханаўскага руху на Мінскім станкабудаўнічым заводзе імя Кірава па цэхах прадпрыемства была праведзена кампанія па заваяванні права быць занесеным у завадскую кнігу гонару [244, с. 3]. У той жа год у рамках стаханаўскіх мерапрыемстваў напярэдадні 1 Мая па Мінску паміж рабочымі было праведзена спаборніцтва за атрыманне гасцявога білета на ўрачыстую трыбуну падчас правядзення святочнага парада [353, с. 4]. Прыведзеныя прыклады маральнага заахвочвання рабочых і калгаснікаў былі моцным стымулам да ўдзелу ў стаханаўскім руху, бо перавага ў іх свядомасці калектыўнага пачатку над індывідуальным стварала імкненне замацаваць сваю знакавую ролю ў працэсе ажыццяўлення агульнай справы пабудовы сацыялізму і зрабіць тым самым сваё сацыяльнае становішча больш стабільным, прызнаваемым з станоўчага боку грамадскасцю і ўладай.



Витебский государственный технологический университет

Як мы адзначылі вышэй, стаханаўцы выступалі ў грамадстве з падачы ўлады ў якасці самых надзейных, з палітычнага пункта погляду, прадстаўнікоў працоўных, што выявілася ў актыўным прасоўванні іх на адказныя гаспадарчыя і дзяржаўныя пасады, дэманстрацыі на іх прыкладзе ідэальных мадэляў паводзін у грамадска-палітычным жыцці. З другога боку, можна лічыць, што ў гэтых працоўных склалася характэрная для савецкага часу палітычная культура, якая ўключала ў сябе адпаведныя ўяўленні пра ўладу, адносіны да палітычнай сістэмы і яе інстытутаў [343, с. 46]. У свядомасці рабочых і калгаснікаў адбылася трансфармацыя традыцыйнага ўспрымання ўлады, калі ранейшыя формы хрысціянскіх уяўленняў пра богаабраную манархію замяняліся ўяўленнямі пра савецкую форму дзяржаўнасці як справядлівую ўладу, прызнаную народам. Пры гэтым у канцы 1920-х – 1930-я гг. цэнтральнае месца сярод палітычных каштоўнасцей пачынае адыгрываць культ Сталіна, які пад моцным уздзеяннем агітацыі і прапаганды бачыўся працоўнымі ў якасці ключавога фактару ўсіх поспехаў краіны. Складванне культу асобы Сталіна было прадвызначана формамі сацыяльных адносін і каштоўнасных арыентацый насельніцтва, якія склаліся яшчэ ў дасавецкі час і характарызаваліся адсутнасцю ў жыццёвым вопыце людзей грамадскай незалежнасці, а таксама асабістай свабоды [483, с. 449; 484, с. 14]. На аснове гэтага ў працоўных узнікала неабходнасць адлюстроўваць свае інтарэсы і памкненні праз палітычную волю харызматычнага лідэра краіны, а іх асабістыя поспехі ставіліся ў заслугу яго дзейнасці.

У гэтым сэнсе вытворчая актывізацыя рабочых і калгаснікаў праз удзел у стаханаўскім руху была значна прасякнута іх верай у вызначальную ролю Сталіна і створанай пад яго кіраўніцтвам палітычнай сістэмы ва ўсіх дасягненнях грамадства. Такое стаўленне да вобразу Сталіна праяўлялася, напрыклад, у моцным эмацыянальным успрыманні стаханаўцамі асабістых сустрэч з ім. Напрыклад, стаханаўка Н. Гаўрылава (калгас “Перамога” Шклоўскага раёна) так распавядала пра прыём стаханаўцаў у Крамлі: “Когда вошёл Сталин, что делалось со мной я не помню. Несколько минут мы стояли, не в силах удержать восторг, свою радость при виде нашего дорого, любимого вождя. Мы всматривались в его лицо, в каждую сединку на его голове, чтобы запомнить на всю жизнь” [41, с. 3].

У рамках сумесных сустрэч стаханаўцаў са Сталіным фарміраваўся яго вобраз кіраўніка, блізкага да народа, чым узмацняўся яго культ асобы. У такіх умовах у стаханаўцаў, якім аддавалася шмат ушанаванняў з боку саюзнага і рэспубліканскага кіраўніцтва, праяўлялася традыцыйнае патрыярхальнае адчуванне наяўнасці любові і апекі з боку Сталіна у адносінах да кожнага працоўнага чалавека. Падобную тэндэнцыю можна асабліва прасачыць у пазацэнзурных

Витебский государственный технологический университет

лістах стаханаўцаў да “правадыра”, дзе найбольш яскрава было адлюстравана адзначанае ўспрыманне яго вобраза. Напрыклад, ліст стаханаўца Х. з Мінска Сталіну быў прасякнуты асабістым даверам да яго ў вырашэнні праблем, звязаных з уступленнем у партыю: стаханавец па прычыне адмовы ў прыняцці яго ў партыю мясцовым кіраўніцтвам просіць Сталіна прачытаць ліст і даць асабісты дазвол на залічэнне ў шэрагі камуністаў. Пры гэтым, калі ў пачатку ліста Х. звяртаецца да Сталіна афіцыйна, як да кіраўніка дзяржавы, на “Вы”, то далей па тэксце апавяданне набывае больш просты па форме зварот, дзе афіцыйнасць змяняецца рыторыкай неабходнасці ў клопаце амаль блізкага чалавека: “Прошу тебя, товарищ Сталин, ответь мне на мою большую просьбу, которую я посылаю тебе как родному отцу…” [103, арк. 99 – 99 адв.].

Як бачым, феномен стаханаўцаў быў адзначаны не толькі наяўнасцю ў сістэме іх каштоўнасцей рэвалюцыйных памкненняў да пераўтварэнняў у вытворчасці і грамадстве, але і характарызаваўся спецыфікай іх палітычнай культуры, дзе важнае месца займала высокая адданасць савецкаму палітычнаму строю, прызнанне знакавай ролі Сталіна ў далейшым развіцці краіны і эмацыянальнае стаўленне да яго асобы з патэрналісцкіх пазіцый, у кантэксце якіх ён разглядаўся як блізкі да працоўных кіраўнік дзяржавы, што заўжды клапоціцца пра іх інтарэсы.

Асаблівы ўплыў на энтузіязм стаханаўцаў аказала прыналежнасць некаторых з іх да КП(б)Б ці ЛКСМБ (Ленінскага камуністычнага саюза моладзі Беларусі), калі актывізацыя вытворчай дзейнасці і імкненне зрабіць сваю працу лепшай вызначалася неабходнасцю адпавядаць статусу камсамольца ці камуніста. Напрыклад, адным з галоўным фактараў свайго ўдзелу ў стаханаўскім руху работніца Завалеева (Мінская швейная фабрыка імя Крупскай) адзначала ўступленне ў ЛКСМБ, членства ў якім абавязвала актывізавацца ў вытворчай сферы і ўдасканальваць метады працы [348, с. 2]. Падобныя матывы да актыўнага ўдзелу ў стаханаўскім руху можна было прасачыць і ў расказе работніцы аднаго з цэхаў фабрыкі “Камунарка” Л. Маскалец: “Я для сябе як партыйнага арганізатара зрабіла тры асноўныя вывады: па-першае, я павінна сваёй работай на вытворчасці служыць прыкладам для рабочых усяго цэха, па-другое, я павінна арганізаваць усю партыйную групу так, каб кожны камуніст цэха стаў стаханаўцам, па-трэцяе, стаць разам з партыйнай групай на чале стаханаўскага руху на фабрыцы і правільна кіраваць гэтым рухам” [426, с. 15]. Так, актыўны ўдзел членаў КП(б)Б і ЛКСМБ у стаханаўскім руху быў абумоўлены асаблівасцю іх грамадскага становішча, у рамках якога яны павінны былі заўжды служыць станоўчым прыкладам для астатніх членаў працоўнага калектыву, быць самымі перадавымі яго

Витебский государственный технологический университет

прадстаўнікамі ва ўсіх справах, што стварала адпаведна матывы да ўдасканалення імі і сваёй вытворчай дзейнасці.

Акрамя ўнутраных матываў працоўных па ўдасканальванні вытворчасці нельга адмаўляць прымяненне і адміністрацыйных мер па разгортванні стаханаўскага руху, калі ўзмацняўся дзяржаўны кантроль за арганізацыяй працоўнага энтузіязму, дзе не толькі актыўна падтрымліваецца ініцыятыва стаханаўцаў, але і ўдзел у руху становіцца своеасаблівым абавязкам для большай часткі працоўных. Характэрным прыкладам такага інтэнсіўнага распаўсюджвання стаханаўскага руху з боку дзяржавы можна назваць дырэктыўны ліст ЦК КП(б)Б за красавік 1936 г. акружным камітэтам, гарадскім камітэтам і раённым камітэтам КП(б)Б і начальнікам палітычных аддзелаў саўгасаў, дзе адзначалася: "При принятии обязательств необходимо управляться тем, что цифры, указанные в договорах, являются средними по республике и перевыполнение их является делом чести каждого звена, бригады, колхоза, совхоза, МТС" [83, арк. 41]. Па меркаванні беларускай даследчыцы Т. Процькі, стаханаўскі энтузіязм на аб'ектах дзяржаўнага значэння вельмі моцна залежыў ад уладных структур. У падцверджанне гэтага быў прыведзены факт, што 26 чэрвеня 1936 г. народны камісар унутраных спраў БССР І. Леплеўскі дакладваў у Маскву пра вынікі стаханаўскага двухдэкадніка па будаўніцтве дарог: "Сделано 896 км дорог при плане 751 км, план озеленения выполнен на 140,4 %. Сейчас в особенности нажимаем на окончание строительства мостов, на вывозку гравия, на сбор местного камня. Нажимаем, чтобы темпы по строительству стратегических дорог, взятые на стахановской декаде, сохранить на достигнутом уровне" [369, с. 449 – 450].

Важную ролю ў разгортванні стаханаўскага руху, як мы заўважылі вышэй, адыграла стварэнне савецкай прапагандай новых вобразаў герояў вытворчасці – стаханаўцаў. Такія перадавікі, як Стаханаў, Бусыгін, Сметанін і іншыя, выступалі прыкладамі таго, што звычайны рабочы ці калгаснік, дзякуючы сваім працоўным дасягненням, можа стаць сапраўдным героем не толькі на сваім прадпрыемстве, але і ў СССР у цэлым. Безумоўна, такія вобразы натхнялі працоўных на ўдасканаленне сваёй працы, а ў іх свядомасці ўзнікала пэўнае захапленне вобразамі герояў-стаханаўцаў (на такі характар успрымання вобразаў стаханаўцаў паўплывала даволі развітая сістэма феномену гераізму ў штодзённай культуры таго часу), усталяваныя рэкорды ўяўляліся як нейкія незвычайныя ці недасягаемыя факты ў сферы вытворчасці. Адна з калгасніц у размове з першым сакратаром ЦК КП(б)Б М. Гікалам так выказалася наконт гэтага: "Праз некаторы час даведаліся мы таксама пра Стаханава. Спачатку не верылі. Няўжо адзін чалавек столькі можа выпрацаваць?" [366, с. 2]. Вобразы ўсесаюзна вядомых стаханаўцаў успрымаліся рабочымі і калгаснікамі ў



Витебский государственный технологический университет

якасці эталонаў дасканалай працы, а метады, якія выкарыстоўвалі ўдзельнікі стаханаўскага руху, выступалі самымі прымальнымі. Напрыклад, Р. Рушко, які стаў у выніку лепшым стаханаўцам у лесапільнай галіне Беларусі, прачытаўшы ў газетах пра рэкорд Стаханава, марыў сустрэцца з ім асабіста і спытаць пра тое, як ён дамогся такой высокай прадукцыйнасці працы [166, с. 3].

З другога боку, разам з захапленнем гераізмам стаханаўцаў працоўныя на аснове прапагандуемай ідэі, што гэтыя новыя героі былі такімі ж звычайнымі людзьмі, як і яны, успрымалі дасягненне такіх рэкордаў магчымым і ў сваёй уласнай працы. Работніца Цыгельніцкая з фабрыкі "Камунарка" адзначала: "Я задумалася над такім пытаннем: Стаханаў такі ж самы чалавек, як і я. Раз ён дасягнуў такіх высокіх паказчыкаў у шахце, чаму нельга мне…дасягнуць такой жа высокай выпрацоўкі на сваёй рабоце?" [426, с. 33 – 34].

Упэўненасць беларускіх працоўных у рэальнасці ўсталявання рэкордаў у вытворчасці ўзмацнялася, калі і ў БССР пачалі ўзнікаць свае мясцовыя героі, менавіта яны сваімі прыкладамі прыводзілі да масавага ўключэння рабочых і калгаснікаў у стаханаўскі рух. Радавыя працоўныя заўважалі, як павышаецца эфектыўнасць вытворчасці іх калег-стаханаўцаў, і імкнуліся паказаць не горшыя вынікі, і, такім чынам, узнікала вытворчае спаборніцтва паміж прадстаўнікамі аднаго і таго ж працоўнага калектыву. На Мінскім станкабудаўнічым заводзе імя Кірава падчас адной змены пачалі спаборнічаць паміж сабой стаханавец Н. Гімпельштэйн і рабочыя з яго брыгады Грозаўскі і Левін. Вынікам гэтага стала тое, што апошнія, арыентуючыся на прыклад Гімпельштэйна, выканалі норму на 436 % і 403 % адпаведна [278, с. 48]. Муляр Д. Рагавы, што працаваў на будаўніцтве Аршанскага льнокамбіната, стаў стаханаўцам, як ён сцвярджае, пад уплывам дасягненняў свайго брыгадзіра З. Верхавінава. Рагавы зазначыў: "4 января 1936 г., работая на строительстве жилдома ИТР вместе с каменщиком-стахановцем Верховиновым,…я видел, как проходила его подготовка к рекордной кладке. Посмотрев на организацию работ, организацию рабочего места и учитывая некоторые недостатки, я заявил начальнику строительства, что при соответствующей подготовке я также дам выработку не меньше Верховинова" [136, с. 19].

Працэс развіцця стаханаўскага руху ў другой палове 1930-х гг. не быў адназначным, і паралельна з імкненнем рабочых і калгаснікаў удасканаліць метады сваёй працы, успрыманнем імі вобразаў герояў-стаханаўцаў у якасці эталонаў дасканалай працоўнай дзейнасці, у часткі людзей узнікалі адмоўныя рэакцыі на стаханаўскі энтузіязм. Асабліва яны праявіліся, калі дзяржаўныя і партыйныя органы пры разгортванні стаханаўскага руху пачалі актыўна скарыстоўваць адміністрацыйны рэсурс з мэтай ахапіць сацыялістычным спаборніцтвам як мага



Витебский государственный технологический университет

большую колькасць працоўных, не ўлічваючы пры гэтым эканамічных магчымасцяў асобных прадпрыемстваў і рэгіёнаў. Працоўныя у такой сітуацыі адчувалі несупадзенне прапагандуемых ідэй стаханаўскага руху і рэальных умоў сваёй дзейнасці. Антыстаханаўскія настроі ў гэтым сэнсе паказалі далейшае развіццё спецыфікі непрымання ў штодзённых практыках авангардысцкіх эксперыментаў першых паслярэвалюцыйных гадоў [444, с. 93].

Напэўна, самыя значныя праявы негатыўных рэакцый працоўных у ходзе правядзення мерапрыемстваў па пашырэнні стаханаўскага руху выявіліся ў адносінах да працы. У выніку актывізацыі адміністрацыйнага апарату па максімальным скарыстанні людскіх рэсурсаў праца для пэўнай часткі рабочых і калгаснікаў страчвала сваю каштоўнасць і бачылася як элемент пэўнага прымусу. Адна з работніц Віцебскай панчошнай фабрыкі імя К. Цэткін заяўляла: “Над нами издеваются, зачем нам работать на четырёх машинах, у нас нет сил, зачем нам стахановцы” [66, арк. 9]. Мелі месца незадаволенасці заканамернасцямі зніжэння расцэнак і павышэння норм выпрацоўкі, калі асобныя поспехі стаханаўцаў пачыналі замацоўвацца як агульнадасягаемыя, што яшчэ больш адштурхоўвала працоўных ад удзелу ў руху і ўзмацняла адмоўныя адносіны да яго. Такія настроі, напрыклад, былі распаўсюджаны на Віцебскай ільнопрадзільнай фабрыцы “Дзвіна”. Адзін з рабочых рамонтнай майстэрні гэтага прадпрыемства казаў: “Начни только работать по стахановскому методу, и не успеешь увеличить количество едениц, как хронометрист сейчас же увеличит норму и снизит расценки” [66, арк. 57]. На гарбарным заводзе “Бальшавік” рабочыя Л. і М. заявілі, што іх нормы з’яўляюцца рэальнымі, і стаханаўскага руху на прадпрыемстве быць не можа [250, арк. 54].

Разглядаемае намі непрыманне стаханаўскага руху параджала ў працоўных адмаўленне створаных савецкай прапагандай вобразаў Стаханава і стаханаўцаў, калі яны ўспрымаліся не героямі працы, а з’яўляліся ўвасабленнем вобраза “чужога”. Дадзены тып нагадвае вобраз “ворага”, але адзначае межы “сваіх”, рубяжы разумення і ідэнтычнасць групы. “Чужым” можна быць толькі ў адносінах да пэўнай абмежаванай групы [335, с. 15]. Такімі “чужымі” ў рамках пэўнага працоўнага калектыву, у вачах некаторых рабочых і калгаснікаў, і станавіліся стаханаўцы. Яны, з аднаго боку, належалі да працоўнага калектыву асобнай гаспадарчай адзінкі, і ў той жа час у межах адной сацыяльнай групы ўспрымаліся як прадстаўнікі іншага мыслення, норм і характару паводзін, штодзённага жыцця.

Працоўная дзейнасць рабочых і калгаснікаў пры ажыццяўленні кампаній стаханаўскага руху пачала рэгулявацца зверху арыентацыяй на яго ўдзельнікаў, што пры размежаванні ідэі і эканамічных

Витебский государственный технологический университет

магчымасцяў пераасэнсоўвалася ў адмоўны вобраз: працоўныя адчувалі, што сацыяльны статус стаханаўцаў толькі ствараў падставу для дадатковай мабілізацыі працоўнай сілы, прыводзіў да абмежавання ў заработнай плаце, матэрыяльным забеспячэнні, да звышнармаванай працы ў дапамогу героям вытворчасці для захавання іх рэкордаў. Так, выпадкі адмоўных выказванняў у адносінах да стаханаўцаў былі зафіксаваны на Якаўлевіцкай суконнай фабрыцы (Аршанскі раён) [268, арк. 186 – 187]. Рабочыя Гомельскай пякарні ў снежні 1935 г. абвінавацілі стаханаўца Ганчарова ў крадзяжы 100 кг цукру [94, арк. 220]. Работніца Д. з фабрыкі “КІМ” заяўляла адносна стаханаўцаў свайго прадпрыемства: “Я буду вытягивать всех троих, они будут стахановцами, а я работаю не меньше их и являюсь не стахановкой” [66, арк. 10]. Характэрнымі ў гэтым сэнсе з’яўляюцца і словы аднаго калгасніка з Полацкай акругі: “Стахановское движение хорошо только для отдельных людей, которые живут хорошо, остальных душат за счёт стахановцев” [80, арк. 10]. Падобныя ўспраманне стаханаўцаў можна было назіраць амаль у кожным працоўным калектыве [259, арк. 77 – 78].

Акрамя незадаволенасці стаханаўскім рухам і стаханаўцамі адмоўныя рэакцыі працоўных праявіліся і ў канкрэтных паводзінах пасіўнага і актыўнага характару. Пасіўныя формы сацыяльных паводзін працоўных знайшлі адлюстраванне ў форме байкоту, ігнаравання мерапрыемстваў, што былі звязаны са стаханаўскім рухам. Напрыклад, рабочы аднаго з віцебскіх прадпрыемстваў, член партыі, у час цэхавых мітынгаў, прысвечаных Усесаюзнай нарадзе стаханаўцаў і прамове Сталіна, адмовіўся выступаць перад астатнімі рабочымі па гэтым пытанні [64, арк. 183]. Праявы актыўных форм паводзін непрымання стаханаўскага руху былі больш разнастайныя і адлюстроўваліся, перш за ўсё, у форме здзекаў і насмешак над перадавікамі вытворчасці. На Мінскай абутковай фабрыцы імя Кагановіча былі адзначаны выпадкі абразлівых адносін з боку рабочых да стаханаўца Л. [261, арк. 206]. На швейнай фабрыцы імя Дзяржынскага (Бабруйск) наконт ініцыятывы стаханаўца Я. прымяніць новыя метады ў працы цэха асобныя робочыя заявілі: “Ты не будь выскочкой и не делай себя героем” [250, арк. 34]. Часта такія здзекі і насмешкі перарасталі ў пашкоджанне абсталявання стаханаўцаў, падкідванне ім няякаснай сыравіны, прадукцыі і нават у збіццё перадавікоў [61, арк. 30, 35; 250, арк. 52; 255, арк. 9].

Такім чынам, адным з праяўленняў індустрыялізацыі і калектывізацыі ў БССР у другой палове 1930-х – пачатку 1940-х гг. стаў стаханаўскі рух як спецыфічная форма вытворчага актывізму, заснаваная на максімальным выкарыстанні магчымасцяў тэхнікі, пераразмеркаванні працы і добраахвотным энтузіязме працоўных. На частцы прадпрыемстваў і гаспадарак стаханаўскі рух даў станоўчыя вынікі і значна павысіў прадукцыйнасць вытворчасці, аднак павышэнне норм і



Витебский государственный технологический университет

тэхнічная непадрыхтаванасць некаторых гаспадарчых адзінак да інтэнсіўнага яго разгортвання прывяла да вытворчых збояў, пагаршэння якасці прадукцыі і змяншэння колькасці перадавікоў. У выніку чаго цалкам перавесці прамысловасць і сельскую гаспадарку на стаханаўскія метады працы не ўдалося. Нягледзячы на гэта, у цэлым па рэспубліцы, дзе за кошт энтузіязму працоўных, дзе за кошт адміністрацыйных рэсурсаў, удалося дасягнуць вялікай колькасці ўдзельнікаў стаханаўскага руху, які паўплываў на рост аб'ёмаў вытворчасці і павышэнне яе эфектыўнасці. У выніку разгортвання стаханаўскага руху ў сацыяльнай структуры ўзнікла новая катэгорыя працоўных – стаханаўцаў, статус якіх характарызаваўся высокім грамадскім прэстыжам і фарміраваннем новых гераічных вобразаў у вытворчай сферы, пры гэтым у БССР узніклі героі рэспубліканскага ўзроўню. Стаханаўцы з падачы дзяржавы выступалі ў якасці своеасаблівай працоўнай эліты і павінны былі стаць узорам савецкіх рабочых і калгаснікаў з выдатнымі вытворчымі здольнасцямі і самымі станоўчымі грамадскімі якасцямі. Прэстыжнае становішча стаханаўцаў абумовіла іх вертыкальную сацыяльную мабільнасць: звычайныя працоўныя за свае вытворчыя заслугі атрымалі магчымасць займаць адказныя адміністрацыйна-гаспадарчыя пасады. Становішча стаханаўцаў у грамадстве было таксама акрэслена палітычным сэнсам, калі стаханаўскі рух становіцца новай крыніцай для вылучэння самых лепшых рабочых і калгаснікаў у склад дзяржаўных органаў улады і папаўнення КП(б)Б, а самі перадавікі пачынаюць выступаць у якасці прыкладу людзей з актыўнай грамадскай пазіцыяй, што вызначалася пераўтварэннем іх у своеасаблівую палітычную апору ўлады ў працоўных калектывах. Вобраз стаханаўцаў, сканструяваны савецкай прапагандай, не быў штучнай з'явай, і іх сацыяльны тып насамрэч увабраў у сябе самыя адметныя псіхалагічныя рысы савецкага грамадства, якія прадвызначылі матывы да праяўлення высокай ступені вытворчага энтузіязму і характарызаваліся імкненнем да карэнных змен у адносінах да часу, прасторы і сацыяльнага асяродка, максімальнай рэалізацыі магчымасцяў чалавека, перавагай ажыццяўлення калектыўных мэтаў над уласнымі, успрыманнем працы як вышэйшай каштоўнасці, станоўчымі адносінамі да савецкай палітычнай сістэмы і асобы Сталіна. Асноўная частка рабочых і калгаснікаў станоўча ўспрыняла стаханаўскі рух і арыентавалася ў сваёй вытворчай дзейнасці на прыклад стаханаўцаў, у той жа час актыўнае выкарыстанне адміністрацыйных метадаў ў працэсе разгортвання стаханаўскага руху выклікала ў часткі працоўных адмоўныя рэакцыі ў адносінах да стаханаўцаў, што праяўляліся ў форме слоўнай абразы перадавікоў ці негатыўных учынкаў у адносінах да іх.

Витебский государственный технологический университет

# ГЛАВА 3
# МАТЭРЫЯЛЬНА-БЫТАВОЕ СТАНОВІШЧА І ЎМОВЫ ЖЫЦЦЯ СТАХАНАЎЦАЎ

## 3.1 Матэрыяльныя ўмовы жыцця

Акрамя маральных стымулаў разгортвання стаханаўскага руху, звязаных з прызнаннем за працоўнымі іх знакавай ролі ў жыцці грамадства, немалаважным фактарам уключэння ў гэтую форму сацыялістычнага спаборніцтва была матэрыяльная ўзнагарода. У развіцці стаханаўскага руху партыйнае кіраўніцтва бачыла не толькі аснову для павышэння прадукцыйнасці працы і інтэнсіфікацыі індустрыяльнага будаўніцтва, але і магчымасці для стварэння заможнага жыцця, паляпшэння быту рабочых і калгаснікаў. І. Сталін на І Усесаюзнай нарадзе стаханаўцаў адзначаў: "Некоторые думают, что социализм можно укрепить путём некоторого материального поравнения людей на базе бедняцкой жизни. Это не верно.… На самом деле социализм может победить только на базе высокой производительности труда, более высокой, чем при капитализме, на базе изобилия продуктов и всякого рода предметов потребления, на базе зажиточной и культурной жизни всех членов общества. Но для того, чтобы социализм мог добиться этой своей цели и сделать наше советское общество наиболее зажиточным, – необходимо иметь в стране такую производительность труда, которая перекрывает производительность труда передовых капиталистических стран" [352, с. 364]. Зыходзячы з гэтага, меркавалася, што ва ўмовах адмены карткавай сістэмы кожнаму чалавеку будуць даступныя прадукты спажывання ў адпаведнасці з выкананай ім працай, і менавіта за кошт актыўнай вытворчай дзейнасці ён зможа стаць заможным. У такім рэчышчы стаханаўцы як прадстаўнікі грамадства з самымі лепшымі вытворчымі паказчыкамі павінны былі першымі дасягнуць высокага матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця, што становіцца ключавой задачай дзяржаўнай палітыкі. Так, згодна з рашэннем паседжання Прэзідыума ЦСПСБ 19 лістапада 1935 г., у плане культурна-бытавога абслугоўвання рабочых асобным раздзелам выступала наладжванне ў першую чаргу бытавых умоў стаханаўцаў [297, арк. 21]. У межах далейшай рэалізацыі дадзенай палітыкі ўслед за рашэннямі снежаньскага Пленума ЦК УКП(б) 1935 г. на Пленуме ЦК КП(б)Б 14 − 17 студзеня 1936 г. прафсаюзным арганізацыям БССР было даручана разгарнуць шырокую работу па павышэнні матэрыяльнага ўзроўню працоўных і іх сямей як важнага фактару разгортвання стаханаўскага руху. Асаблівая ўвага пры гэтым павінна была ўдзяляцца сацыяльна-бытавому абслугоўванню прадпрыемстваў з вялікай колькасцю жанчын для таго, каб дапамагчы

Витебский государственный технологический университет

ім актыўна ўдзельнічаць у новай форме сацыялістычнага спаборніцтва [183, с. 195]. Задача па паляпшэнні матэрыяльна-бытавых умоў стаханаўцаў ставілася і ў наступныя гады, як, напрыклад, гэты было ў Пастанове ЦК КП(б)Б 1937 г. "Аб развіцці стаханаўскага руху ў сувязі з падрыхтоўкай да святкавання 20-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі" [85, арк. 177].

У прамысловасці адным з важных матэрыяльных стымулаў разгортвання стаханаўскага руху была заработная плата, бо ўслед за перавыкананнем планаў рабочымі адбывалася павышэнне іх грашовага акладу. Грашовае стымуляванне стаханаўцаў эфектыўна дзейнічала на тых прадпрыемствах, што былі пераведзены на здзельную аплату працы. На першапачатковай стадыі развіцця руху выкарыстоўвалася ў асноўным прамая здзельшчына, дзе заработная плата налічвалася за колькасць выпрацаванай прадукцыі па ўстаноўленых расцэнках, і грашовы даход стаханаўцаў рос прама прапарцыянальна працэнту перавыканання норм. Па такой сістэме, напрыклад, праходзіў разлік са стаханаўцамі на Барысаўскім аўчынна-шубным заводзе і на шэрагу торфазаводаў БССР [Дадатак Д, Табліцы Д.1, Д.2, Д.3].

Ацэнка працы стаханаўцаў часта праходзіла і па здзельна-прэміяльнай сістэме. Яна складалася з аплаты па прамых здзельных расцэнках і прэмій за перавыкананні якасных і колькасных паказчыкаў. Выплата прэмій была моцным стымулам да ўдзелу ў стаханаўскім руху і павінна была выклікаць у рабочых не толькі імкненне павысіць аб'ёмы выпуску прадукцыі, але і знізіць яе брак, зэканоміць сыравіну, зменшыць прастоі ў вытворчасці, вынайсці новыя метады працы. У снежні 1935 г. з улікам прэміяльнай сістэмы заробак стаханаўцаў Рудабельскага спіртзавода павялічыўся ў сярэднім ад 200 да 450 % [247, арк. 13 – 13 адв.]. На гарбарным заводзе "Бальшавік" у лютым 1936 г. стаханаўцы атрымалі наступныя прэміі за якасць: Бенгіс – 23 рублі 41 капейку, Алешка – 6 рублёў 95 капеек, Гурвіч – 18 рублёў 48 капеек, Шамес – 15 рублёў 25 капеек, Тарасевіч – 14 рублёў 67 капеек [301, арк. 83].

У грашовым стымуляванні працы стаханаўцаў кіраўніцтва рэспублікі аддавала перавагу здзельна-прагрэсіўнай сістэме заработнай платы, калі прадукцыя, што была выраблена ў межах нормы, аплачвалася па звычайных (прамых) здзельных расцэнках, а звыш нормы – па павышаных (прагрэсіўных) расцэнках. У Пастанове Пленума ЦК КП(б)Б 14 − 17 студзеня 1936 г. "Практычныя мерапрыемствы па разгортванні стаханаўскага руху ў прамысловасці БССР у сувязі з рашэннямі Пленума ЦК УКП(б)" гэта сістэма разглядалася ў якасці абавязковай умовы развіцця сацыялістычнага спаборніцтва [183, с. 195]. Практычная рэалізацыя Пастановы знайшла сябе ў правядзенні ў першай палове 1936 г. галіновых канферэнцый, па

Витебский государственный технологический университет

выніках працы якіх ужо за май – чэрвень на здзельна-прагрэсіўную сістэму было пераведзена, напрыклад, 28,8 % рабочых мясцовай прамысловасці БССР, у прыватнасці, у тарфяной прамысловасці – 77 % рабочых, у вапнянай – 62,5 %, у цагельнай – 59,4 % [122, с. 39].

На прадпрыемствах уводзілася шматступенчатая здзельна-прагрэсіўная сістэма, у рамках якой стаханаўцам рабіліся дэферэнцаваныя даплаты за адзінкі прадукцыі, што былі выпучшаны звыш нормы. Пры гэтым чым вышэй быў працэнт перавыканання норм, тым большыя расцэнкі ўстанаўліваліся [51, с. 25]. Так, па рашэнні галіновай канферэнцыі станкабудаўнічых заводаў Беларускага дзяржаўнага трэста металаапрацоўчай прамысловасці ўстанаўлівалася наступная сістэма даплат па прагрэсіўцы: на адказных участках працы пры выкананні нормы на 101 – 120 % павышэнне расцэнак рабілася на 50 %, пры выкананні на 121 – 150 % – на 100 %, пры выкананні на 151 % і больш – на 150 % [294, арк. 202]. На прадпрыемствах гарбарнай прамысловасці пры выпрацоўцы нормы ад 101 да 120 % расцэнкі павялічваліся на 20 %, пры выпрацоўцы 121 – 150 % – на 60 %, пры выпрацоўцы 150 % і вышэй – на 100 % [294, арк. 218]. У гады трэцяй пяцігодкі здзельна-прагрэсіўная сістэма заработнай платы актыўна выкарыстоўвалася пры пераходзе рабочых на шматстаночнае абслугоўванне і сумяшчэнне прафесій. Напрыклад, з студзеня 1940 г. стаханаўцам харчовай прамысловасці БССР у такіх выпадках выплачвалася дадаткова ад 25 да 50 % месячнай стаўкі [282, арк. 3].

На некаторых прадпрыемствах кіраўніцтва імкнулася прымяніць прагрэсіўна-прэміяльную сістэму, калі рабіліся і павышаныя даплаты за перавыкананне норм, і дыферэнцавана выдаваліся прэміі за працэнт зніжэння браку прадукцыі ці эканомію сыравіны. Такая камбінацыя прагрэсіўнай і прэміяльнай сістэм мела месца, напрыклад, на Мінскай скургалантарэйнай фабрыцы імя Куйбышава. Акрамя таго, што заработная плата рабочых тут павышалася па прагрэсіўнай сістэме за прадукцыю, якая была выпушчана вышэй за норму, яшчэ рабіліся выплаты прэмій за эканомію сыравіны, якія знаходзіліся ў прамой звязцы з працэнтамі выкананых норм [Дадатак Д, Табліца Д.4]. У выніку ў лютым 1936 г. на адзначанай фабрыцы стаханавец Палаўнік да свайго асноўнага заробку атрымаў дадаткова па прагрэсіўна-прэміяльнай сістэме 59 рублёў 19 капеек, стаханавец Раманевіч – 84 рублі 28 капеек, стаханавец Гуртоўнік – 48 рублёў 15 капеек [294, арк. 308]. Эфектыўна дадзеная сістэма прымянялася і сярод стаханаўцаў Аршанскай машынна-трактарнай майстэрні [Дадатак Д, Табліца Д.5].

У выніку прымянення розных форм здзельшчыны заработная плата рабочых, якія ўдзельнічалі ў стаханаўскім руху, павялічылася ў сярэднім у 1,5 – 4 разы, што стала цвёрдай матэрыяльнай асновай для захавання ўзятых тэмпаў вытворчасці. Напрыклад, на Магілёўскім

Витебский государственный технологический университет

машынабудаўнічым заводзе імя Дзімітрава ў стаханаўца Самусёнка пры сярэднім выкананні плана да 400 % дзённая заработная плата з верасня 1935 г. па люты 1936 г. павысілася з 13 рублёў 15 капеек да 24 рублёў 2 капеек, у стаханаўца Бунько пры выкананні 250 % нормы – з 8 рублёў 30 капеек да 12 рублёў 82 капеек, у стаханаўца Галецкага пры сярэдніх 220 % – з 10 рублёў 68 капеек да 13 рублёў 94 капеек [261, арк. 165]. Да свайго ўдзелу ў стаханаўскім руху работніца Худзякова (кандытарскі камбінат "Спартак") атрымлівала сярэдні месячны заробак памерам у 80 рублёў, пры пераходзе на стаханаўскія метады працы ў канцы 1936 г. – 280 – 290 рублёў [97, арк. 46]. Грашовы аклад стаханаўца Парфёнава (торфазавод "Асінторф") у маі 1938 г. складаў 1100 рублёў, пры далейшым перавыкананні планаў, у чэрвені – павысіўся да 1588 рублёў [273, арк. 81].

За кошт здзельнай сістэмы тэндэнцыя да павелічэння заработнай платы назіраецца і сярод стаханаўцаў саўгасаў па выніках перавыканання колькасных і якасных паказчыкаў вытворчасці. Так, заработная плата палявога рабочага Ражаева з саўгаса "Арловічы" Віцебскага раёна за кастрычнік 1935 г. узрасла на 30 рублёў і складала 110 рублёў [68, арк. 6]. Да разгортвання стаханаўскага руху месячны заробак работніцы Гуцавай (саўгас імя Ланге Добрушскага раёна) складаў 80 рублёў, у выніку ж павышэння ёю тэмпаў працы больш чым у 2 разы дасягнуў у маі 1936 г. 183 рублёў [59, с. 33].

У калгасах стаханаўская праца сялян прыводзіла да павелічэння колькасці выкананых імі працадзён, што адпаведна аплачваліся большымі сумамі грошай. У 1936 г. стаханаўка Шыло (калгас імя Леніна Бабруйскага раёна) за 700 працадзён атрымала грашовую аплату у памеры 1000 рублёў [88, арк. 27], а стаханаўская праца калгасніцы Альховік (Клічаўскі раён) за 1939 г. была аплачана 1500 рублямі [405, с. 16]. У некаторых калгасах пры аплаце працы стаханаўцаў назіралася спроба ўстанавіць здзельна-прагрэсіўную сістэму. Так, напрыклад, у калгасе "Брыгадзір" Аршанскага раёна ў 1936 г. была ўстаноўлена сістэма грашовай аплаты ў залежнасці ад працэнта перавыкананых норм пры зборы льну: за апрацаваную звыш нормы 0,01 га калгаснікам выплачвалі 50 капеек, за 0,02 га – 1 рубель, за 0,03 га – 3 рублі, за 0,04 га – 4 рублі і г. д. [133, с. 9]. Безумоўна, грашовая аплата працы стаханаўцаў сельскай гаспадаркі была нашмат ніжэй, чым, напрыклад, стаханаўцаў прамысловасці, аднак на вёсцы і такія выплаты былі моцным стымулам для далейшага ўдасканалення вытворчасці.

Даход стаханаўцаў акрамя грошай, атрыманых непасрэдна за выкананую працу, вызначаўся яшчэ дадатковымі сродкамі, што прадастаўляліся ім у выглядзе грашовых прэмій ад адміністрацыі прадпрыемстваў, кіраўніцтва БССР і СССР, прэмій з нагоды пэўных масавых мерапрыемстваў і святаў. Падчас святкавання пяцігадовага

Витебский государственный технологический университет

юбілею Магілёўскай шаўковай фабрыкі ў лістападзе 1935 г. яе стаханаўцы атрымалі прэміі на агульную суму 90 тысяч рублёў [400, с. 1]. Работніцы Блох з Барысаўскай запалкавай фабрыкі на галіновым злёце стаханаўцаў 1936 г. у Маскве ад народнага камісара лясной прамысловасці СССР С. Лобава была выдадзена прэмія памерам у 250 рублёў [424, с. 20]. У выніку разгортвання стаханаўскага руху ў сельскай гаспадарцы таксама актывізавалася практыка выдачы перадавікам падобных прэмій. Так, Цэнтральная конкурсная камісія Народнага камісарыята збожжавых і жывёлагадоўчых саўгасаў СССР 14 лістапада 1935 г. прэміравала брыгадзіра-стаханаўца Ф. Жукоўскага з саўгаса "Замошша" (Мінскі свінагадоўчы трэст) грашыма на суму 250 рублёў, на такую ж суму быў прэміравны стаханавец А. Штырц з гэтай жа гаспадаркі [68, арк. 48 адв.]. У гонар свята 1 Мая ў 1938 г. сумамі ад 100 да 500 рублёў былі прэміраваны лепшыя трактарысты Заслаўскай МТС [106, арк. 75]. Народны камісарыт земляробства БССР у верасні 1938 г. прэміраваў 48 лепшых стаханаўцаў жывёлагадоўлі на агульную суму 13000 рублёў [372, с. 4]. У ліпені 1939 г. рэспубліканскія прэміі па 100 рублёў атрымалі знакамітыя даяркі БССР Каршова і Бярозкіна [153, с. 3].

Адной з прывілей, якія атрымлівалі стаханаўцы, можна назваць вылучэнне ім грашовых дапамог і датацый ад прафсаюзаў і кіраўніцтва прадпрыемстваў для вырашэння бытавых і гаспадарчых праблем. На Віцебскім шчацінна-шчотачным камбінаце ў снежні 1935 г. па касе ўзаемадапамогі незваротна было выдадзена 75 рублёў стаханаўцу Мемухіну і 90 рублёў стаханаўцы Каждан, са сродкаў фабрычнага камітэта стаханаўцы атрымалі 395 рублёў: Багаславяк – 100 рублёў, Любчанка – 70 рублёў, Фішнер – 50 рублёў, Знаткіна – 50 рублёў, Шыдлоўская – 75 рублёў [300, арк. 305]. На фабрыцы "Сцяг індустрыялізацыі" за люты 1936 г. была аказана грашовая дапамога 76-ці стаханаўцам [261, арк. 116], у Уздзенскім леспрамгасе ў студзені 1936 г. − 13-ці стаханаўцам у суме ад 75 да 100 рублёў [245, арк. 34]. У студзені 1938 г. Беларускі рэспубліканскі камітэт Саюза мясамалочных саўгасаў вылучыў стаханаўцы Крошкінай (саўгас "Адаменкі") матэрыяльную дапамогу ў суме 300 рублёў для пакупкі каровы ва ўласную гаспадарку [311, арк. 4].

Такім чынам, уласны бюджэт стаханаўцаў фарміраваўся па сукупнасці з грашовых сродкаў за ўдасканаленне працы, а таксама з прэмій, датацый і дапамог ад дзяржавы і кіраўніцтва гаспадарчых адзінак. У выніку ў параўнанні з астатнімі рабочымі і калгаснікамі стаханаўцы мелі ў распараджэнні значна большыя грашовыя сродкі, што прыводзіла да ўзнікнення дыферэнцыяцыі даходаў у працоўным асяроддзі. Напрыклад, на Віцебскім станкабудаўнічым заводзе імя Кірава ў канцы 1935 г. грашовы даход стаханаўца Пясоцкага быў вышэй сярэдняй заработнай платы рабочых прадпрыемства на 302 %,



Витебский государственный технологический университет

стаханаўца Стралецкага – на 238 %, стаханаўца Пляшкевіча – на 225 % [65, арк. 47]. Знакаміты на ўсю рэспубліку стаханавец Г. Скабло у лістападзе 1935 г. меў асноўны заробак 540 рублёў, у снежні – 624 рублі. Улічваючы прэмію ў лістападзе памерам у 500 рублёў і 1000 рублёў у снежні, вылучаных на рамонт кватэры, Скабло ўсяго атрымаў за адзначаныя месяцы адпаведна 1040 рублёў і 1624 рублі [318, с. 85].

Атрымліваючы вялікія грашовыя сродкі, стаханаўцы, аднак, за іх кошт маглі задаволіць толькі самыя элементарныя жыццёвыя патрэбы. Большая частка грошай перадавікамі ўкладвалася ў паляпшэнне матэрыяльнага становішча сваіх хатніх гаспадарак. Увага тут перш за ўсё ўдзялялася харчаванню (пра што асобная гаворка пойдзе ніжэй) і набыццю неабходных у побыце рэчаў, якія раней працоўныя не заўжды былі ў стане купіць. Згодна з апытаннямі, зробленнымі ЦК КП(б)Б у снежні 1935 г., стаханавец Гладкоў з Гомеля набыў у гэты месяц у сваю кватэру шафу і стол, стаханаўка Верага з Оршы купіла бялізну і радыёфікавала кватэру, стаханавец Рудштейн (Бабруйскі дрэваапрацоўчы завод) заказаў сабе буфет за 500 рублёў [250, арк. 48]. Г. Скабло за лістапад і снежань 1935 г. купіў дзіцячае паліто, пару скуранога абутку, 2 сукенкі, жаночы касцюм, мужчынскую шаўковую кашулю, пару туфель, 2 пары галёшаў, патэфон [123, с. 97]. Стаханаўка Анашка з Віцебскага шчацінна-шчотачнага камбіната свой лістападаўскі заробак 1935 г. патраціла на пакупку абутку дзецям і ўстанавіла радыё, ад якога адмовілася яшчэ ў 1932 г. з-за недахопу сродкаў [65, арк. 48].

Стаханаўцы сельскай гаспадаркі, дзякуючы грашовым выплатам за выдатную працу, таксама змаглі набыць сабе вялікі шэраг рэчаў побыту. У 1936 г. стаханаўка М. Лешкова (саўгас "Пяскі" Гомельскага раёна) на вылучаныя кіраўніцтвам 1000 рублёў купіла сабе канапу, стол, 2 крэслы, шкаф, гардзіны і іншыя рэчы [222, с. 26]. За 1937 – 1938 гг. стаханавец калгаса "Чырвоны партызан" Мінскага раёна Я. Мурашка купіў патэфон, швейную машынку, шафу, 10 венскіх крэслаў, 2 ложкі [236, с. 27 – 28].

Нягледзячы на мінімальнае задавальненне жыццёвых патрэб, матэрыяльнае становішча працоўных, што ўключаліся ў стаханаўскі рух, у параўнанні з гадамі першай пяцігодкі значна палепшылася. Гэта, у сваю чаргу, стварала падставу для асэнсавання стаханаўцамі свайго штодзённага жыцця ў новай якасці: яны пачалі адчуваць магчымасць пастаяннага паляпшэння свайго побыту за кошт актывізацыі вытворчай дзейнасці. Напрыклад, адна стаханаўка з Мінскай швейнай фабрыкі "Кастрычнік" выказала наступнае меркаванне: "Я никогда и не мечтала о такой жизни… Мы работаем на фабрике вдвоём с мужем. Раньше жили скромно и всё от получки до получки, часто приходилось одалживать деньги у товарищей. Теперь мы стахановцы. Наш заработок



Витебский государственный технологический университет

увеличился вдвое. Ни в чём не отказываю своей дочурке Леночке, покупаю ей хорошие вещи. В последнюю получку накупила ей много разных игрушек, куклу купила за 20 рублей. Обеспечена на зиму картофелем и дровами" [383, с. 2]. У такім жа кантэксце прагучалі і словы стаханаўкі С. Ждановіч з Каўгарскага спіртзавода: "Для себя я купила две пары хороших туфель, шёлковое платье, много мануфактуры. Одета, обута, хорошо питаюсь. Да и как мне не радоваться, когда я, бывшая домработница, стала лучшей стахановкой" [433, с. 44]. Падобныя меркаванні былі абумоўлены, хутчэй за ўсё, прапагандай, якую праводзіла дзяржава адносна стварэння заможнага жыцця ў выніку разгортвання стаханаўскага руху. Таму, безумоўна, што яго ўдзельнікі ўспрымалі праявы паляпшэння свайго быту, нават самыя элементарныя, як першыя рысы такога жыцця. Падобнае стаўленне прадвызначалася яшчэ і тым фактарам, што малазабяспечаныя людзі, уключыўшыся ў стаханаўскі рух, не толькі карэнным чынам мянялі свой сацыяльны статус, але і атрымлівалі новыя матэрыяльныя даброты, раней недаступныя для іх з-за нарміраванага забеспячэння і карткавай сістэмы размеркавання тавараў.

Рыторыка пераліčаных вышэй выказванняў паказвае нам, што статус удзельнікаў стаханаўскага руху ва ўяўленнях савецкага грамадства часта звязваўся з дастойным узроўнем жыцця. Таму стаханаўцы імкнуліся набываць самыя лепшыя рэчы побыту для таго, каб адпавядаць свайму высокаму статусу. Набытыя тавары ўспрымаліся стаханаўцамі ў такіх выпадках у якасці сродку яго зацвярджэння. Калі, напрыклад, раней, да таго, як стаць стаханаўцам, рабочы Юрчанка з Мазырскага фанернага завода "Чырвоны Кастрычнік" паліў папяросы коштам 35 капеек, то з набыццём новага статусу пачаў купляць папяросы па 2 рублі [250, арк. 48]. А стаханавец Гарбуноў (Віцебскі лесазавод імя "Праўды") адзначаў наступнае: "На днях распрощался со старой ломаной койкой, она ведь не к лицу стахановцу, и купил никелированную кровать за 175 рублей, оклеил комнату обоями, купил гардины и обзавожусь радио. Сейчас у меня уютная, просторная квартира" [65, арк. 47].

Па прычыне захавання нарміравання прамысловых тавараў да 1 студзеня 1936 г. стаханаўцам часта пры наяўнасці вялікіх сум грошай не ўдавалася купіць усе неабходныя рэчы. На такую праблему указваюць, напрыклад, апытанні ЦК КП(б)Б, зробленыя сярод стаханаўцаў БССР у снежні 1935 г. Згодна з гэтымі апытаннямі, у Гомелі стаханавец Леошка меў праблемы з набыццём сваёй жонцы паліто і бялізны, а стаханавец Бекнераў скардзіўся на адсутнасць у продажы дзіцячага абутку. Сярод 25 апытаных стаханаўцаў Магілёва 15 чалавек не маглі купіць сабе адзенне, абутак і бялізну [250, арк. 50]. Сітуацыя не змянілася і пасля адмены нарміравання, калі дэфіцыт прамысловых тавараў па-



Витебский государственный технологический университет

ранейшаму захоўваўся [125, с. 105]. Так, стаханаўцы торфазавода “Асінторф” у студзені 1936 г. скардзіліся ў прафсаюзную арганізацыю на кепскую працу аддзела рабочага забеспячэння. Адзін з перадавікоў заявіў: “Грошы ёсць, а купіць нечага” [298, арк. 30]. Ад стаханаўцаў шклозавода “Ільіч” (Быхаўскі раён) у сакавіку 1936 г. у рэдакцыю газеты “Рабочий” паступіў ліст наступнага зместу: “На заводе одних штатных рабочих 500 человек, из них 250 стахановцев. Рабочих завода обслуживает лавка сельпо, но в ней почти никогда не бывает необходимых товаров… Промтоваров же здесь в продаже совершенно не бывает” [139, с. 3].

Цяжкасці, звязаныя з немагчымасцю стаханаўцаў купляць дэфіцытныя тавары, звычайна вырашаліся за кошт вылучэння гэтых тавараў у якасці прэмій, што таксама з’яўляліся матэрыяльным стымулам да захавання ўзятых тэмпаў вытворчасці. Напрыклад, стаханавец І. Трацэўскі за выдатную працу быў прэміраваны ад кіраўніцтва свайго прадпрыемства ў студзені 1936 г. касцюмам коштам у 200 рублёў, пазней, у лютым 1936 г. Беларускае галоўнае ўпраўленне спіртавой, крухмальнай і лікёра-гарэлачнай прамысловасці прэміравала яго патэфонам з пласцінкамі на суму 400 рублёў [433, с. 30]. У час правядзення стаханаўскай пяцідзёнкі ў студзені 1936 г. на торфазаводзе “Асінторф” па рашэнні адміністрацыі былі прэміраваны лепшыя стаханаўцы-канаўшчыкі: Сімчанка – радыёпрыёмнікам і патэфонам, брыгадзір Калеснікаў – стуламі, шафай і сталом [298, арк. 29].

Важным стымуляванне стаханаўскага руху за кошт выдачы прамысловых тавараў з’яўлялася на вёсцы. Тут праблема з іх пастаўкай у гандлёвыя кропкі стаяла больш востра, чым у горадзе, больш таго, стаханаўцы сельскай гаспадаркі не мелі такіх вялікіх грашовых сродкаў для іх набыцця, як стаханаўцы прамысловасці. Таму амаль кожны стаханавец калгаса ці саўгаса ў якасці прэміі атрымліваў рознага роду рэчы, неабходныя ў побыце. Падчас правядзення акруговага злёту стаханаўцаў земляробства Полаччыны 4 – 6 студзеня 1936 г. усе лепшыя перадавікі атрымалі прэміі ў выглядзе прамысловых тавараў. Напрыклад, стаханаўка А. Гендзелева была прэміравана швейнай машынкай, стаханавец І. Еронька – мужчынскім касцюмам, А. Яфімаў – мужчынскай кашуляй і джэмперам, А. Сямашка – сукенкай і джэмперам [146, арк. 264 – 265].

Для падтрымкі якасных умоў жыцця стаханаўцаў як працоўнай эліты і далейшага стымулявання вытворчага энтузіязму дзяржава актыўна прадастаўляла гэтай катэгорыі перадавікоў разнастайныя прывілеі ў матэрыяльна-бытавым забеспячэнні. У прыватнасці, для стаханаўцаў быў усталяваны прыярытэтны доступ да тавараў і паслуг. Прыкладам гэтага можна назваць спецыяльны продаж прамысловых тавараў гандлёвымі прадпрыемствамі на даму з усталяваннем сістэмы

Витебский государственный технологический университет

папярэдніх заказаў. У студзені 1936 г. Мінскі гарадскі аддзел гандлю прамысловымі таварамі арганізаваў прыём заказаў і дастаўку тавараў на дом стаханаўцам прадпрыемстваў сталіцы. Брыгада выдатнікаў гандлю наведала кватэры стаханаўцаў абутковай фабрыкі імя Кагановіча, станкабудаўнічых заводаў імя Кірава і імя Варашылава. Гандлёвыя работнікі паказвалі сем'ям стаханаўцаў узоры высакаякасных тавараў, давалі рэкамендацыю наконт таго, які тавар выбраць, пасля гэтага атрымлівалі заказ і дамаўляліся пра час дастаўкі тавараў на дом. У першы дзень правядзення гэтых гандлёвых аперацый стаханаўцы заказалі сабе тавараў на 15000 рублёў. Напрыклад, стаханавец завода імя Варашылава С. Харнас заказаў сваёй жонцы гадзіннік за 200 рублёў, туфлі, галёшы, бялізну, гардзіны для вокнаў і коўдры. Кошт яго заказу склаў 500 рублёў. Стаханавец абутковай фабрыкі Ганіч на 600 рублёў купіў патэфон, фотаапарат, гадзіннік, мэблю, шоўк [368, с. 4]. Меншыя маштабы адзначаная гандлёвая паслуга мела на рэгіянальным узроўні. 52 стаханацаўцам Уздзенскага леспрамгаса мясцовыя гандлёвыя прадпрыемствы за снежань 1935 г. прадалі на даму прамысловых тавараў на суму 2162 рублі [245, арк. 44].

Акрамя гэтага, адміністрацыя прадпрыемстваў перыядычна вылучала стаханаўцам дэфіцытныя тавары ў выглядзе бязвыплатнай выдачы. Так, дырэкцыя і фабрычны камітэт фабрыкі "Камунарка" закупілі для стаханаўкі Цыгельніцкай канапу і 6 венскіх крэслаў [426, с. 34]. Прафсаюзнай арганізацыяй торфазавода "Бальшавік" стаханаўцам было раздадзена прамысловых тавараў на суму 400000 рублёў (у лік гэтых тавараў уваходзілі зімнія і асеннія паліто, касцюмы, абутак) [298, арк. 86 адв.].

Паказчыкам высокага статусу стаханаўцаў у бытавой сферы служыў таксама шэраг іншых паслуг, якія не аказваліся астатнім працоўным. Напрыклад, распаўсюджанай была паслуга бясплатнага рамонту і пашыву абутку стаханаўцаў. За студзень 1936 г. на Віцебскім шчацінна-шчотачным камбінаце стаханаўцам адрамантавалі 60 пар абутку [301, арк. 56], за той жа месяц для стаханаўцаў Магілёўскага гарбарнага завода імя Сталіна была адрамантавана 71 пара абутку і пашыта 15 новых пар [301, арк. 165]. У Мінску гарадскі аддзел унутранага гандлю вылучыў каля 300 талонаў на пашыўку абутку стаханаўцам па індывідуальным заказам [43, с. 4].

У рамках прадастаўлення падобных жа прыярытэтных паслуг на фабрыцы "Сцяг індустрыялізацыі" ў снежні 1935 г. для стаханацаў вылучаліся бясплатныя травмайныя білеты для праезду на працу і назад. Такімі білетамі было забяспечана 93 стаханаўцы прадпрыемства [261, арк. 116].

Прыярытэт для стаханаўцаў існаваў і пры матэрыяльнай падтрымцы іх дзяцей. Кіраўніцтва Мінскай механічнай пральні



Витебский государственный технологический университет

аплачвала 50 % кошту ўтрымання ў дзіцячым садку дзіцяці лепшай стаханаўкі Сідаровіч [288, арк. 26]. Для таго, каб атрымаць грашовую дапамогу па даглядзе за дзіцём, стаж працы саўгасных рабочых, якія былі стаханаўцамі, павінен быў складаць мінімум 4 месяцы, у той час як для астатніх сельскагаспадарчых рабочых – ад 8 да 12 месяцаў [304, арк. 152].

За кошт павышэння сваёй заработнай платы ў выніку значнага перавыканання норм стаханаўцы маглі сабе дазволіць больш якаснае харчаванне, чым астатнія працоўныя. Стаханавец Віцебскага лесазавода імя "Праўды" Капышка, заробак якога павысіўся ў канцы 1935 г. ад ранейшых 7 − 8 рублёў у дзень да 25 − 30 рублёў, казаў, што ні аднаго дня ў яго не праходзіла без мяснога абеда [65, арк. 47]. Жанчыны-стаханаўкі, на якіх быў ускладзены асноўны клопат па вядзенні хатняй гаспадаркі, указвалі на паляпшэнне харчавання сваіх дзяцей. Стаханаўка Дземідзенка (Віцебскі шчацінна-шчотачны камбінат) з заробленых 406 рублёў за лістапад 1935 г. патраціла на прадукты 269 рублёў. Яна адзначала: "Я начала хорошо питаться и обращаю особое внимание на питание ребёнка, чтобы он вырос и воспитывался в лучших условиях, чем я" [65, арк. 47]. Падобныя ж меркаванні выказвала наконт харчавання сваёй дачкі стаханаўка С. Ждановіч з Каўгарскага спіртзавода: "Конфеты, печенье, молоко, масло и другие продукты всегда она имеет в обильном количестве" [433, с. 43]. Паляпшэнне харчавання стаханаўцаў як асноўнай жыццёвай патрэбы прывяло да разумення імі таго, што грашовыя сродкі, атрыманыя за ўдасканаленне вытворчасці, маглі стаць рэальнай асновай пераўтварэння іх штодзённага жыцця ў заможнае. Жанчыны-стаханаўкі, у прыватнасці, пачалі ўспрымаць сваю працу і яе матэрыяльныя вынікі як значны ўнёсак у забеспячэнне харчавання сям'і.

Стаханаўцы прамысловасці акрамя павышэння заработнай платы, за кошт якой маглі палепшыць сваё харчаванне, атрымлівалі і шэраг прыярытэтных паслуг у харчовым забеспячэнні. Была ўстаноўлена практыка дастаўкі прадуктаў харчавання стаханаўцам на дом. Аб такой паслузе для сваіх 25 стаханаўцаў з гандлёвымі прадпрыемствамі ў 1936 г. дамовілася, напрыклад, віцебская фабрыка "Прафінтэрн" [71, арк. 5]. Вялікая ўвага якаснаму харчаванню стаханаўцаў удзялася ў працэсе ажыццяўлення імі сваёй працы. Так, у ходзе стаханаўскіх сутак 8 студзеня 1936 г. на Магілёўскім гарбарным заводзе імя Сталіна спецыяльна для стаханаўцаў у абедзенны перапынак было пасілена харчаванне ў сталоўцы [261, арк. 5]. Пасіленае харчаванне атрымлівалі і стаханаўцы Бабініцкага механізаванага ўчастка падчас свайго вячэрняга адпачынку ў прафілакторыі [8, с. 4]. Актыўна дадатковае харчовае забеспячэнне стаханаўцаў ў якасці ўзнагароды за іх выдатную працу прымянялася падчас разнастайных



Витебский государственный технологический университет

святаў. Так, у Бабруйску лепшым стаханаўцам лесакамбіната на свята Кастрычніцкай рэвалюцыі ў 1935 г. было даслана 20 харчовых пайкоў, а на швейнай фабрыцы імя Дзяржынскага 15 стаханаўцаў атрымалі харчовыя падарункі на сумму 50 рублёў кожны [286, арк. 2, 203]. У 1936 г. спецыяльныя падарункі для стаханаўцаў на Кастрычніцкія святы былі выпушчаны Беларускім трэстам Галоўнага ўпраўлення хлебапякарнай прамысловасці [344, с. 4]. Праз ажыццяўленне падобных паслуг як замацоўваўся прэстыж стаханаўцаў, так і ствараліся новыя стымулы да далейшага разгортвання стаханаўскага руху, калі ў выніку ўдасканалення працы прадугледжвалася павышэнне якасці харчавання рабочых.

Такім чынам, у сферы харчовага забеспячэння стаханаўцы таксама займалі прывілеяванае становішча ў параўнанні з іншымі працоўнымі. Найбольш яскрава гэта праявілася ў стварэнні на прадпрыемствах сістэмы так званых стаханаўскіх абедаў. Такія абеды адпускаліся ў сталоўках па зніжаных цэнах. На Бабруйскім лесакамбінаце для 60 стаханаўцаў абеды адпускаліся па цане 1 рубель 50 капеек, у той час як для астатніх рабочых – па 2 рублі 50 капеек [286, арк.2]. Абед з 3 – 4 блюд для стаханаўцаў гарбарнага завода "Бальшавік" каштаваў ад 1 рубля да 1 рубля 10 капеек [350, с. 3]. У Барысаве стаханаўцы атрымлівалі зніжкі на абеды да 50 % [286, арк. 97]. А на некаторых мінскіх прадпрыемствах для стаханаўцаў абеды ўвогуле былі бясплатнымі [286, арк. 98]. Для наладжвання лепшага харчавання адміністрацыя прадпрыемстваў часта вылучала для стаханаўцаў грашовыя даплаты на набыццё абедаў. Такія датацыі, напрыклад, атрымлівалі ўсе стаханаўцы Віцебскага лесазавода імя "Праўды" [286, арк. 115]. Арганізацыя стаханаўскіх абедаў з'яўлялася лагічным працягам сістэмы абедаў для ўдарнікаў гадоў першай пяцігодкі, калі існавала нарміраванае размеркаванне прадуктаў, пры якім ударнікі пераўтварыліся ў прывілеяваную катэгорыю рабочых на аснове таго, што ім выдавалася павышаная норма прадуктаў харчавання ў сталоўках [210, с. 92]. Стаханаўскія абеды існавалі ўжо ва ўмовах адмены карткавай сістэмы і адсутнасці нарміраванага забеспячэння, якое замянілася для перадавікоў-стаханаўцаў зніжэннем цэн на харчаванне і разнастайнымі даплатамі для яго паляпшэння.

Сістэма стаханаўскіх абедаў, як і ўдарныя абеды, прадугледжвала вылучэнне ў сталоўках для перадавікоў спецыяльных сталоў. Гэтыя сталы лепш абслугоўваліся і адпаведна мелі дабраякасны рацыён. Стаханаўцы мелі магчымасць рабіць папярэднія заказы, што і пастаўляліся на гэтыя сталы. Сталы стаханаўцаў існавалі, напрыклад, па Віцебску на фабрыцы гнутай мэблі, фабрыцы імя Лекерта, шчацінна-шчотачным камбінаце, фабрыцы імя К. Цэткін, у Гомелі – на заводзе "Рухавік рэвалюцыі", аўчынна-шубным заводзе, у Мінску – на гарбарным заводзе "Бальшавік" [65, арк. 48; 93, арк. 57; Дадатак Е,



Витебский государственный технологический университет

Малюнак Е.1]. У некаторых выпадках спецыяльна для стаханаўцаў вылучаліся асобныя памяшканні пад сталоўкі. Так было зроблена ў 1936 г. на кандытарскай фабрыцы “Камунарка” і Мінскай абутковай фабрыцы імя Кагановіча [137, с. 3]. Асобная сталоўка была арганізавана для стаханаўцаў Старадарожскай МТС [108, арк. 61]. Такія асаблівасці харчовага забеспячэння стаханаўцаў аказалі ўплыў на зацвярджэнне іх высокага сацыяльнага статусу, бо ўнутры аднаго працоўнага калектыву ў побыце вылучалася асобная сацыяльная прастора праз наяўнасць спецыяльных сталовак ці сталоў, за якімі маглі сядзець толькі стаханаўцы, і рацыён якіх адрозніваўся як па цане, так і па якасці ад рацыёну сталоў звычайных рабочых.

Арганізацыя сістэмы стаханаўскіх абедаў у працэсе далейшага разгортвання стаханаўскага руху і павелічэння колькасці стаханаўцаў паступова пачала сутыкацца з праблемай фінансавай і матэрыяльнай падтрымкі гэтай прывілеі. На практыцы не ўсе рабочыя, што станавіліся стаханаўцамі, атрымлівалі стаханаўскія абеды, а толькі тыя, хто выпрацоўваў самыя высокія нормы вытворчасці ці першым уключыўся ў стаханаўскі рух. На віцебскім заводзе “Чырвоны металіст”, напрыклад, пры наяўнасці ў канцы 1935 г. 180-ці стаханаўцаў таннымі стаханаўскімі абедамі па 50 капеек забяспечвалася толькі 60 чалавек. Астатнія стаханаўцы былі незадаволеныя такім становішчам і задалі пытанне адміністрацыі: “Чым мы стаханаўцы хужэйшыя за тых?” [286, арк. 115]. Такім чынам, унутры групы стаханаўцаў склалася іерархія ў харчовым забеспячэнні, у рамках якой частка перадавікоў не карысталася ў поўнай меры тымі прывілеямі, якія прадастаўляліся дзяржавай.

Адзначаныя супярэчнасці ў сістэме харчовага забеспячэння ўяўлялі сабой пэўную перашкоду ў разгортванні стаханаўскага руху. Магчыма, па гэтай прычыне ў ЦК КП(б)Б пачалі выказвацца прапановы аб скасаванні стаханаўскіх абедаў. У прыватнасці, загадчык прамыслова-транспартнага аддзела ЦК КП(б)Б Л. Готфрыд заяўляў: “На некоторых предприятиях имеет место, как мне кажется, извращение следующего порядка: в столовых созданы специальные стахановские столы с дотацией от администрации каждому стахановцу в отдельности. В некоторых местах эти стахановские столы, в виду ограниченности дотаций, превращаются в тормоз для роста стахановского движения потому, что количество стахановцев ограничивается количеством стахановских обедов. Везде, где мы обнаружили такого рода факты, мы предложили ликвидировать немедленно это дело” [250, арк. 37]. Пры тым Готфрыд адзначыў, што кожны стаханавец за сваю павышаную заработную плату можа набыць дабраякасны абед без дапамогі адміністрацыі прадпрыемства [250, арк. 37]. Адзначаную пазіцыю можна ахарактарызаваць як спробу адмаўлення ад элементаў



Витебский государственный технологический университет

нарміраванага забеспячэння, што, як мы заўважылі вышэй, мелі месца ў сістэме стаханаўскіх абедаў, і перайсці да такога спажывання прадуктаў, дзе якасць харчавання чалавека вызначалася б не толькі статусам, але і наяўнасцю зробленых грошай.

Тым не менш нельга казаць, што ўсе стаханаўцы прамысловасці за кошт сваёй заработнай платы цалкам маглі забяспечыць сябе і сваю сям'ю харчаваннем. Па гэтай прычыне для іх дадатковага харчовага забеспячэння кіраўнікі прадпрыемстваў і прафсаюзы стваралі ўмовы для вядзення падсобных гаспадарак. Так, прафсаюзы ў Мазыры для кожнага стаханаўца выдзялялі па 0,12 га агародаў [286, арк. 52], а на Аршанскім лесазаводзе для стаханаўцаў прадпрыемства пад індывідуальныя агароды выдалі 6 га зямлі [286, арк. 29]. У лістападзе 1936 г. на Віцебскім шчацінна-шчотачным камбінаце для 29 стаханаўцаў пад агароды было вылучана 10 га зямлі [302, арк. 28]. Часта рабочыя-стаханаўцы атрымлівалі для падсобных гаспадарак у якасці прэмій хатнюю жывёлу. Напрыклад, для стаханаўцаў гарбарнага завода "Бальшавік" у лістападзе 1935 г. было раздадзена для вырошчвання 35 парасят [299, арк. 86 адв.].

Для стаханаўцаў калгасаў паляпшэнне харчовага забеспячэння было асноўным стымулам удасканалення працоўнай дзейнасці, таму што грашовыя даходы тут былі невялікімі, і аплата за перавыкананыя нормы ажыццяўлялася галоўным чынам прадуктамі харчавання. Стаханаўцы, якія перавыконвалі ў некалькі разоў вытворчыя паказчыкі і выпрацоўвалі большую колькасць працадзён, атрымлівалі адпаведна і большую колькасць прадуктаў [Дадатак Е, Малюнак Е.2]. У 1936 г. стаханавец А. Лапко (калгас "Чырованая Бярэзіна" Бабруйскага раёна) атрымаў 1440 кг збожжа, 6400 кг бульбы, 1200 кг агародніны і 400 кг садавіны [88, арк. 27]. У тым жа годзе стаханавец А. Авер'янцаў з Буда-Кашалёўскага раёна атрымаў па выніках стаханаўскай працы 55 пудоў збожжа і 62 пуды бульбы [265, арк. 38, 38 адв.], брыгадзір стаханаўскай брыгады А. Сафронаў з Гомельскага раёна – 72 пуды збожжа і 144 пуды бульбы [265, арк. 77, 77 адв.]. Харчовае забеспячэнне ў сельскай гаспадарцы адыгрывала і ролю своеасаблівай прэміі. У Лепельскай акрузе стаханаўцы атрымлівалі ў калгасах у 1935 г. па 60 – 75 пудоў хлеба авансам [83, арк. 260].

Вялікае значэнне стымуляванне стаханаўскай працы ў выглядзе харчавога забеспячэння мела і для рабочых саўгасаў. Так, за 1935 г. лепшы стаханавец саўгаса "Лучыцкі" (Быхаўскі раён) У. Заіка у дадатак да зробленых 1099 рублёў атрымаў 472 кг збожжа [265, арк. 79], а для стаханаўкі А. Гуцавай з Добрушскага раёна саўгас вясной 1936 г. спецыяльна засеяў 0,10 га бульбы [59, с. 33].

Характэрнай рысай стаханаўскага руху ў сельскай гаспадарцы становіцца тое, што ў ім удзельнічалі ў некаторых выпадках цэлыя



Витебский государственный технологический университет

сем'і. Гэта абумоўлівалася занятасцю іх членаў на вытворчых аперацыях у адным і тым жа паляводчым звяне. У выніку павышаная норма прадуктаў харчавання размяркоўвалася цалкам на сялянскую сям'ю, што калектыўна паказвала стаханаўскія тэмпы працы. Так, у 1935 г. у калгсе імя Р. Люксембург Кармянскага раёна сям'я стаханаўцаў Ефрэменка (муж і жонка) выпрацавалі разам 715 працадзён, за што атрымалі 19,4 пуда збожжа, 97 пудоў бульбы, 9 пудоў агародніны [265, арк. 163]. У сям'і калгасніка Глобава (Лёзненскі раён) стаханаўцамі акрамя яго самаго былі таксама жонка і сын. Цалкам яны выпрацавалі за 1937 г. 1300 працадзён і атрымалі за гэта на ўсю сям'ю 3250 кг хлеба і 6500 кг бульбы [322, с. 3]. Падобнае матэрыяльнае заахвочванне атрымала і стаханаўская сям'я Тамашэвіча (Аршанскі раён): у 1938 г. ёй было вылучана за выкананыя 1114 працадзён 178 пудоў зерня і 417 пудоў бульбы [193, с. 3].

Вынікам матэрыяльнай падтрымкі стаханаўцаў калгасаў можна назваць рост дабрабыту іх прысядзібных уласных гаспадарак. Напрыклад, стаханаўка Крукава (калгас імя Сталіна Сіроцінскага раёна) на 1936 г. мела на ўласным падворку карову, цялё, 2 авечкі, свінню і дробную жывёлу [420, с. 13]. Ва ўласным карыстанні стаханаўца Глобава ў 1937 г. знаходзіліся 2 каровы, 4 аўцы, 12 парасят і хатняя птушка [322, с. 3]. Паляпшэнне матэрыяльнага стану ўласных гаспадарак стаханаўцаў тлумачылася зробленымі дзяржавай саступкамі калгаснікам пасля прыняцця і выдання Узорнага статута сельскагаспадарчай арцелі ў лютым 1935 г., згодна з якім членам калгаса дазвалялася ў вызначаных мерах утрымліваць хатнюю жывёлу і вылучаліся ўчасткі зямлі для ўласнага карыстання памерам да паўгектара, а ў некаторых раёнах – да 1 гектара [387, с. 521]. Рэалізацыя адзначанай палітыкі супала па часе з разгортваннем стаханаўскага руху, таму менавіта на прыкладах стаханаўцаў як новай працоўнай эліты вёскі мясцовыя ўлады імкнуліся паказаць ўзорнае выкананне статута на практыцы. Так, у гаспадарках стаханаўцаў БССР былі яскрава прадстаўлены нормы ўтрымання жывёлы, абазначаныя ў дадзеным дакуменце.

Факты матэрыяльнага становішча стаханаўцаў сельскай гаспадаркі дэкларавалася ўладай як першыя прыкметы ўзнікнення заможнага жыцця на вёсцы, што прадстаўлялася станоўчым вынікам арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва, выдатнага выканання статута сельскагаспадарчай арцелі і высокіх тэмпаў працы ў грамадскай вытворчасці. Такое вызначэнне штодзённага жыцця стаханаўцаў дае нам, напрыклад, пастановачны фотаздымак сям'і ўдзельніка стаханаўскага руху А. Зубка (калгас "Чырвонае світанне" Хойніцкага раёна). Адзначаны фотаздымак быў змешчаны ў газеце "Звязда" за 18 верасня 1939 г., на ім было паказана свята стаханаўскай сям'і з багата



Витебский государственный технологический университет

накрытым сталом, пры гэтым пад фотаздымкам змяшчалася інфармацыя пра выдатную стаханаўскую працу ў калгасе і прыклад высокай матэрыяльнай узнагароды за гэту працу: вызначалася, што за выпрацаваныя 900 працадзён сям'я А. Зубка атрымала аванс памерам у 10 цэнтнераў жыта [462, с. 3; Дадатак Е, Малюнак Е.2].

Напэўна, самай вострай праблемай савецкай штодзённасці 1930-х гг. было жыллёвае пытанне. Таму дзяржава важным матэрыяльным стымулам разгортвання стаханаўскага руху лічыла рашаючае паляпшэнне жыллёвых умоў яго ўдзельнікаў [183, с. 197 – 198]. Перш за ўсё стаханаўцам вылучаліся спецыяльна ўладкаваныя пакоі ў інтэрнатах. Уздзенскім леспрамгасам, напрыклад, у канцы 1935 г. у такія пакоі было заселена 8 стаханаўцаў дадзенага прадпрыемства [245, арк. 44]. Лепшыя пакоі ў інтэрнаце вылучаліся для стаханаўцаў Барысаўскай запалкавай фабрыкі [424, с. 10]. Так, адміністрацыя некаторых прадпрыемстваў пры немагчымасці вылучыць асобнае жыллё ўдзельнікам стаханаўскага руху стварала для іх лепшыя, чым у астатніх рабочых, умовы жыцця ў інтэрнатах.

Стаханаўцам як працоўным з высокім сацыяльным статусам пазачаргова пачалі вылучаць асобныя кватэры. Напрыклад, у студзені 1936 г. у добра ўладкаваную кватэру з барака быў пераведзены лепшы стаханавец Аршанскага льнокамбіната Батурын [286, арк. 12]. Для 12 сямей стаханаўцаў Віцебскага станкабудаўнічага завода імя Кірава былі вылучаны ў верасні 1936 г. лепшыя кватэры ў 7-м камунальным доме [64, арк. 128]. Для лепшых стаханаўцаў Віцебскага саюзмалтрэста пад кватэры ў кастрычніку 1935 г. былі вылучаны 2 дамы [68, арк. 33]. Сімвалічнае значэнне вылучэнне кватэр мела падчас святаў, калі стаханаўцы атрымлівалі іх у якасці ўзнагарод ці прэмій за выдатную працу. Напрыклад, напярэдадні Кастрычніцкіх святаў у 1936 г. новыя кватэры атрымалі стаханаўцы Мінскай абутковай фабрыкі Берштэйн і Чарапахіна [346, с. 2].

У рамках дзяржаўнай палітыкі па паляпшэнні жыллёвых умоў стаханаўцаў спецыяльна для гэтай катэгорыі перадавікоў пачалі будаваць шматкватэрныя дамы. Да канца красавіка 1936 г. планавалася закончыць узвядзенне двухпавярховага дванаццацікватэрнага дома для стаханацаў торфазавода "Чырвоны сцяг" (Смалявіцкі раён) [332, с. 4]. Для стаханаўцаў Магілёўскага трубаліцейнага завода ў лістападзе 1936 г. было пабудавана 2 васьмікватэрных дома [330, с. 4]. У тых выпадках, калі стаханаўцы самі будавалі сабе жыллё, ім вылучаліся грашовыя сродкі для такога будаўніцтва. Так, машыністу-стаханаўцу Самсонаву з Віцебскага чыгуначнага вузла для пабудовы дома было вылучана ад дзяржавы 3000 рублёў [327, с. 1]. Кіраўніцтва Магілёўскага дэпо выдала 4000 рублёў на будаўніцтва дома стаханаўцу Грушэўскаму [195, с. 3]. У

Витебский государственный технологический университет

ліпені 1936 г. на індывідуальнае будаўніцтва дамоў былі адпушчаны крэдыты 25-ці стаханаўцам МТС БССР [109, с. 4].

Пры вылучэнні стаханаўцам жылля дзяржавай ставілася задача і яго добраўпарадкавання, таму перадавікам у якасці прывілей бясплатна аказваліся некаторыя камунальныя паслугі. Так, напрыклад, усім стаханаўцам Барысаўскай запалкавай фабрыкі, што пражывалі ў інтэрнатах і кватэрах, было бясплатна праведзена радыё [424, с. 9]. На фабрыцы "Сцяг індустрыялізацыі" за снежань 1935 г. – люты 1936 г. было адрамантавана 39 кватэр стаханаўцаў і ўстаноўлена 13 радыёкропак [261, арк. 116]. На Мінскім станкабудаўнічым заводзе імя Кірава да свята 1 Мая ў 1936 г. было адрамантавана і радыёфікавана 8 кватэр стаханаўцаў [356, с. 4]. Для некаторых стаханаўцаў Беларускага энергетычнага камбіната ў кватэры былі бясплатна праведзены тэлефоны [286, арк. 12]. У Мазыры стаханаўцаў вызвалілі ад аплаты за электрычнае асвятленне [286, арк. 52].

Неабходным фактарам разгортвання стаханаўскага руху было якаснае медыцынскае абслугоўванне працоўных. Ад стану здароўя стаханаўцаў залежыла, наколькі высокімі будуць тэмпы іх вытворчай дзейнасці. У сувязі з гэтым паўсюдна на прадпрыемствах праводзілася абавязковая дыспансарызацыя ўдзельнікаў стаханаўскага руху з мэтай выяўлення праблем са здароўем. Так, на Мінскім станкабудаўнічым заводзе імя Кірава ў студзені 1936 г. быў праведзены медыцынскі агляд стаханаўцаў прадпрыемства на вылучэнне ім пуцёвак для аздараўлення у прафілакторыях і санаторыях [286, арк. 44]. Па выніках такіх аглядаў для стаханаўцаў, якія мелі патрэбу ў паляпшэнні здароўя страўнікава-кішэчнай сістэмы, уводзілася льготнае дыетычнае харчаванне. Напрыклад, стаханаўцы Мінскай швейнай фабрыкі імя Дзяржынскага атрымлівалі дыетычнае харчаванне за 1 рубель пры звычайным яго кошце ў 3 рублі [286, арк. 203].

Установамі аховы здароўя Мінска, а ўслед за імі і Віцебска з канца 1935 г. у практыцы медыцынскага абслугоўвання спецыяльна для стаханаўцаў уводзіліся новыя паслугі, раней нехарактэрныя для аздраўлення працоўных: у паліклініках уводзіліся спецыяльныя медыцынскія карткі стаханаўцаў для іх пазачарговага прыёму ва ўрачэй-спецыялістаў, практыкавалася паўторнае наведванне хворых стаханаўцаў на даму пасля першага выкліку ўрача, для хворых стаханаўцаў на час хваробы на дом прадастаўляліся ўсе неабходныя рэчы дагляду. Уладныя структуры абавязалі ўстановы па ахове здароўя адпускаць лекі і медыкаменты стаханаўцам са скідкай да 50 %. У бальніцах стаханаўцам вылучалі лепшыя ложкі, бялізну, перадавікі рэгулярна забяспечваліся літаратурай, газетамі і часопісамі. Пры выпісцы з бальніцы стаханаўцы дастаўляліся да дому на таксі ці на іншым транспарце [70, арк. 65–66, 109].

Витебский государственный технологический университет

Вялікая ўвага надавалася ахове здароўя членаў сямей стаханаўцаў: ім таксама ствараліся самыя лепшыя ўмовы для падтрымкі здаровага ладу жыцця, асабліва гэта датычылася падрастаючага пакалення. Напрыклад, для сістэматычнага медыцынскага агляду дзяцей-немаўлят стаханавак Мінска Народным камісарыятам аховы здароўя прызначаліся лепшыя медсёстры Інстытута аховы мацярынства і младзенства [319, с. 13].

Дзяржава, аказваючы матэрыяльную падтрымку стаханаўцам, патрабавала ад гэтых вытворчых герояў і членаў іх сямей стварэння ўзорных умоў працы і быту. Напрыклад, стаханаўка М. Багданава (Мінская фабрыка "Чырвоны тэкстыльшчык") лічыла неабходным для сябе як прыгожа апранацца, так і пастаянна клапаціцца пра дабрабыт свайго жылля і чысціню працоўнага месца [135, с. 3]. Абавязак па павышэнні культуры свайго быту ўзяў на сябе ў маі 1936 г. стаханавец Ягораў з Магілёўскага гарбарнага завода імя Сталіна. Пры гэтым перадавік адзначаў, што за падобную працу трэба брацца з такой жа энергіяй, як і за выкананне прамфінплану [134, с. 3]. Прыняцце такіх абавязкаў знаходзіла сваю далейшую практычную рэалізацыю. У снежні 1935 г. стаханаўкі Дубровенскай фабрыкі "Дняпроўская мануфактура" актыўна ўдзельнічалі ў конкурсе на лепшую кватэру, дзе пераможцай аказалася ткачыха Л. Порына [475, с. 14]. На паседжанні жонак стаханаўцаў, якое праходзіла 10 студзеня 1936 г. на Бабруйскім лесакамбінаце, адна з яго ўдзельніц адзначала, што стварае дома свайму мужу самыя спрыяльныя бытавыя ўмовы, напрыклад, гатуе яму лепшыя абеды, для таго, каб ён і ў далейшым па-стаханаўску выконваў сваю працу [88, арк. 313].

Некаторыя заходнія і расійскія гісторыкі адзначаныя штодзённыя практыкі стаханаўцаў звязваюць з канцэпцыяй "культурнасці", што была замацавана ў савецкім грамадстве ў 1930-я гг. і вызначала неабходнасць стварэння высокіх стандартаў жыцця, якаснага пераўтварэння свайго прыватнага асяроддзя [38, с. 206 – 216; 204, с. 68 – 77; 498, p. 22; 502, p. 149 – 182]. Стварэнне ўзорных умоў працы і быту стаханаўцамі зацвярджала іх сацыяльны статус лепшых прадстаўнікоў грамадства: яны, паказваючы выдатныя вынікі працоўнай дзейнасці, павінны былі прадэманстраваць, што і іх штодзённае жыццё таксама знаходзіцца на адпаведным высокім узроўні. На аснове гэтага для астатніх працоўных ствараўся прыклад таго, якім чынам трэба было сачыць за сваім знешнім выглядам, як ўладкоўваць сваё працоўнае месца, жыллё, хатнюю гаспадарку, што таксама павінна было паўплываць на эфектыўнае ажыццяўленне вытворчай дзейнасці. У выніку вобраз стаханаўцаў прадстаўляўся як мадэль новага чалавека, у якой спалучаўся працоўны энтузіязм і імкненне да актыўнага добраўпарадкавання сваёй штодзённасці.



Витебский государственный технологический университет

Хоць на афіцыйным узроўні ўмовы жыцця ўдзельнікаў стаханаўскага руху дэкларываліся дзяржавай як прыклад дасягнення працоўнымі заможнасці, а прыярытэтныя паслугі ў бытавой сферы павінны былі падцвярджаць прэстыжны сацыяльны статус стаханаўцаў, сапраўднае прывілеяванае становішча з атрыманнем найбольш якасных бытавых даброт захоўвалася толькі за вузкай катэгорыяй самых лепшых перадавікоў БССР, так званымі "маякамі" стаханаўскага руху. Большасць жа стаханаўцаў магла задаволіць толькі самыя элементарныя жыццёвыя патрэбы, пры гэтым у некаторых выпадках матэрыяльная падтрымка ўдзельнікаў стаханаўскага руху была вельмі абмежаванай, калі іх побыт мала чым адрозніваўся ад побыту астатніх працоўных або назіраліся пэўныя праблемы ў стварэнні нават мінімальна неабходных умоў жыцця. Напрыклад, на Мінскім дрэваапрацоўчым заводзе імя Р. Люксембург адміністрацыя змагла забеспечыць стаханаўцаў толькі некаторымі льготамі ў сферы харчавання і не звяртала пільнай увагі на ўладкаванне ўсіх астатніх бакоў іх побыту. Так, рамшчык-стаханавец Садаўнічэнка некалькі разоў звяртаўся ў завадскі камітэт, каб яму не давалі зніжкі на абед, а лепш бы на гэтыя грошы даставілі дровы [286, арк. 99]. Увогуле пры абследаванні ЦСПСБ матэрыяльна-бытавога становішча стаханаўцаў адзначанага завода ім задалі пытанне: "Ці адчуваецца розніца паміж абслугоўваннем стаханаўцаў і не стаханаўцаў?" На што быў дадзены адзін з адказаў: "Пакуль розніцы ніякай няма, толькі абед на 40 капеек танней" [286, арк. 99]. Кур'ёзная сітуацыя склалася на Барысаўскай запалкавай фабрыцы, дзе стаханаўка Булыгіна з-за цяжкага матэрыяльнага стану мела намер кінуць сваіх дзяцей, якіх не магла забяспечваць усім неабходным для іх росту і выхавання [286, арк. 100 – 101].

Найбольш востра недахопы матэрыяльнага забеспячэння стаханаўцаў праявіліся ў жыллёва-камунальнай сферы. Так, на працягу жніўня 1936 г. ніхто з адміністрацыі фабрыкі "КІМ" не быў у лепшых стаханаўцаў на кватэрах па пытаннях вырашэння камунальных праблем. Разам з тым Віцебскі гарадскі камітэт КП(б)Б выявіў, што гэтыя стаханаўцы жывуць у дрэнных умовах і маюць патрэбу ў дапамозе фабрычнай прафсаюзнай арганізацыі [64, арк. 51 – 52]. У 1937 г. стаханаўцу Д. Гольдзіну (Мінская абутковая фабрыка імя Кагановіча) адміністрацыя прадпрыемства абяцала вылучыць кватэру ў новым доме, але не засяліла яго туды, праз некаторы час кватэра яму была вылучана ўжо ў іншым доме, аднак і ў гэтым выпадку засяленне не адбылося, і перадавік быў вымушаны размяшчацца ў памяшканні фабрычнага камітэта [435, с. 3].Частка стаханаўцаў, не атрымаўшы належных жыллёва-бытавых умоў, сама скардзілася на камунальныя цяжкасці ў органы ўлады ці газеты. Напрыклад, у 1936 г. шэраг лістоў з такімі скаргамі паступіў у газету "Звязда". Стаханаўка Н. Бенік (Мінская

Витебский государственный технологический университет

швейная фабрыка “Кастрычнік”) адзначала ў сваім лісце наступнае: “Кватэрныя ўмовы мае дрэнныя. Жыву ў памяшканні, якое вось-вось абваліцца. Нягледзячы на гэта, фабком не ідзе мне насустрач. Абмежваліся толькі тым, што яшчэ ў 1935 г. зрабілі абследаванне маёй кватэры. І колькі б я пасля гэтага ні зварочвалася ў фабком, заўсёды атрымлівала адказ: “Мы нічым не можам дапамагчы” [370, с. 3]. У такой жа сітуацыі аказаўся стаханавец Ляшчук з завода “Гомсельмаш”. Ён пісаў: “На заводе “Гомсельмаш” я працую шосты год. У сучасны момант з'яўляюся стаханаўцам, выконваю план на 250 %. Але жыллёвыя ўмовы мае надта дрэнныя: пакой цесны, столь працякае. З 25 маіх заяў аб рамонце або перамене пакоя жакт ні на адну не адказаў. Тады я звярнуўся да свайго заўкома. Апошні хутка адгукнуўся. Выслаў брыгаду, якая абследвала маё становішча. Пасля абследвання заўком напісаў адносіну ў жылсаюз і да старшыні жакта, але старшыня адказаў, што я ў яго не адзін, і нічога не зрабіў” [371, с. 3].

Прыведзеныя прыклады паказваюць, як у некаторых выпадках фармальна падыходзілі да вырашэння бытавых праблем стаханаўцаў дзяржаўныя органы і асобныя гаспадарнікі, калі для справаздачнасці мінімальна вылучаліся асобныя льготы і прымаліся пэўныя рашэнні па матэрыяльнаму забеспячэнню, якія не мелі далейшай практычнай рэалізацыі. Гэта абумоўлівалася і самім працэсам развіцця стаханаўскага руху, дзе з цягам часу большая ўвага звярталася на рост колькасці яго ўдзельнікаў, а не на іх матэрыяльную падтрымку. Акрамя гэтага, на асобных гаспадарчых адзінках адсутнічалі дастатковыя фінансавыя і матэрыяльныя сродкі для бытавога абслугоўвання усіх перадавікоў.

У такіх сітуацыях для стаханаўцаў складваліся ўмовы жыцця, якія супярэчылі іх стратэгіям паводзін, накіраваным на паляпшэнне матэрыяльнага становішча за кошт актывізацыі працы. Частка ўдзельнікаў стаханаўскага руху не ўспрыняла вынікаў сваёй удасканаленай працы як паўнавартасны ўнёсак у павышэнне ўласнага дабрабыту і дабрабыту грамадства ў цэлым. Напрыклад, стаханавец Кубышаў з Віцебскага цагельнага завода № 1 заявіў: “Кроме того, что мы даём государству больше продукции и значительно подняли свою зарплату, мы никакого обслуживания совершенно не чувствуем” [286, арк. 130]. Часта стаханаўцы з-за матэрыяльных праблем і недахопаў пры выплаце заработнай платы адмаўляліся ад далейшага ўдзелу ў руху, а ў некаторых выпадках зусім звальняліся з прадпрыемстваў. Так, у пачатку 1936 г. заработная плата 13 стаханавак фабрыкі “КІМ”, якія перайшлі працаваць з 12 машын на 24 машыны, павысілася толькі на 20 %, у выніку чаго работніцы патрабавалі, каб іх назад перавялі на 12 машын [65, арк. 33]. Па прычыне матэрыяльных цяжкасцяў у красавіку 1937 г. на Мінскай абутковай фабрыцы імя Кагановіча звольнілася 30 стаханаўцаў, у ліпені таго ж года заявы на

Витебский государственный технологический университет

звальненне падалі 20 стаханаўцаў Мінскага станкабудаўнічага завода імя Варашылава [344, с. 3; 470, с. 3].

## 3.2 Арганізацыя вольнага часу

Вольны час вызначаецца ў сацыялогіі як сукупнасць відаў дзейнасці, накіраваных на задавальненне фізічных, духоўных і сацыяльных патрэб людзей па-за працай [391, с. 132]. Пры гэтым у вольны час не ўваходзіць выкананне якіх-небудзь пазавытворчых абавязкаў [416, с. 77], напрыклад, грамадскай нагрузкі.

Значную частку вольнага часу займае рэкрэацыя альбо адпачынак, што ў вузкім сэнсе разумеецца як працэс ўзнаўлення фізічных і эмацыянальных сіл, якія былі выдаткаваныя на выкананне працы і іншых няўхільных заняткаў [115, с. 827; 194, с. 300]. Добра арганізаваны адпачынак у савецкай дзяржаве быў не толькі сродкам узнаўлення сіл для далейшага ажыццяўлення працоўнай дзейнасці, але і фактарам павышэння прадукцыйнасці працы, бо лічылася, што чалавек, які добра адпачыў, будзе і працаваць з падвоенай энергіяй у параўнанні з яго калегам, які праігнараваў адпачынак [111, с. 125]. Таму адпачынку стаханаўцаў як людзей, што перавыконвалі ў некалькі разоў нормы і павышалі прадукцыйнасць працы, дзяржава надавала асаблівую ўвагу. Пра гэта, напрыклад, сведчыць Пастанова Пленума ЦК КП(б)Б 14 – 17 студзеня 1936 г. “Практычныя мерапрыемствы па разгортванні стаханаўскага руху ў прамысловасці БССР”, дзе ў шэрагу эканамічных і палітычных умоў разгортвання руху былі вылучаны і культурна-бытавыя, сярод якіх, напрыклад, паляпшэнне дзейнасці дамоў адпачынку [183, с. 195].

Для правядзення адпускоў стаханаўцам часта прадастаўляліся пуцёўкі на курорты. Так, у снежні 1935 г. на курорты было накіравана 6 стаханаўцаў з Віцебскага лесазавода імя “Праўды”: 2 – у Жалезнаводск, 2 – у Кіславодск і 2 – у Ялту [317, арк. 15]. Ініцыятар стаханаўскага руху сярод абутнікоў БССР − абцяжчык Г. Скабло правёў свой водпуск летам 1937 г. у Гаграх, а стаханавец Мінскай абутковай фабрыкі імя Кагановіча В. Фельдман – у Кіславодску [7, с. 4]. У некаторых выпадках пуцёўкі на курорты выдаваліся стаханаўцам у якасці прэмій за выдатную працу. Такую прэмію, напрыклад, атрымаў у кастрычніку 1935 г. ад Прэзідыума ЦСПСБ стаханавец М. Зобак з Мінскай абутковай фабрыкі [350, с. 3].

Пры арганізацыі курортнага адпачынку асаблівыя клопаты дзяржава праяўляла ў адносінах да жанчын-стаханавак. У пансіянаце імя М. Горкага на паўднёвым беразе Крыма 22 чэрвеня 1936 г. было адкрыта спецыяльнае аддзяленне маці і дзіцяці, разлічанае для адпачынку стаханавак са сваімі дзецьмі ва ўзросце ад 3 да 8 гадоў.

Витебский государственный технологический университет

Сюды летам 1936 г. з БССР былі накіраваныя лепшыя стаханаўкі дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў [317, арк. 167 – 168]. Такая ўвага да адпачынку стаханавак тлумачыцца не толькі зацікаўленасцю ў стварэнні спрыяльных умоў для ўзнаўлення іх фізічных сіл, але і зменамі, што адбыліся з сярэдзіны 1930-х гг. у сацыяльнай палітыцы савецкай дзяржавы, калі ўзмацнілася апека над сям’ёй і мацярынствам з мэтай паляпшэння дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне, і жанчыны-стаханаўкі ў выніку адны з першых адчулі такую апеку.

Большая частка пуцёвак для стаханаўцаў прадугледжвала правядзенне адпускоў ў Беларусі – у санаторыях, прафілакторыях і дамах адпачынку. Такія пуцёўкі, напрыклад, атрымалі за студзень – сакавік 1936 г. 111 рабочых-стаханаўцаў фабрыкі “Сцяг індустрыялізацыі” [261, арк. 117]. З лесазавода “Пралетарый” у санаторый “Сасноўка” было накіравана ў снежні 1935 г. 4 стаханаўцы [317, арк. 31].

Канешне, свой водпуск на курортах ці ў дамах адпачынку мог правесці любы рабочы БССР. Так, на Віцебскім лесазаводзе імя “Праўды” разам з 6 стаханаўцамі пуцёўкі на курорты атрымалі ў снежні 1935 г. 7 рабочых [317, арк. 15]. Але стаханаўцы мелі пры атрыманні паслуг курортна-санаторнага адпачынку, як і ва ўсіх сферах штодзённага жыцця, пэўныя прывілеі. 15 снежня 1935 г. Прызідыумам Усесаюзнага цэнтральнага савета прафесійных саюзаў была выдадзена Пастанова “Аб парадку прадастаўлення пуцёвак у дамы адпачынку, санаторыі і курорты стаханаўцам”. Згодна з ёй пуцёўкі выдаваліся сярод рабочых у першую чаргу стаханаўцам незалежна ад іх стажу працы на асобным прадпрыемстве і агульнага працоўнага стажу. Астатнія рабочыя маглі атрымаць пуцёўкі толькі тады, калі яны прапрацавалі на адным прадпрыемстве не менш за 2 гады і мелі агульны вытворчы стаж не менш за 5 гадоў. Аднак і ў гэтым выпадку пуцёўкі ў першую чаргу выдаваліся лепшым ударнікам і кваліфікаваным рабочым вядучых прафесій [317, арк. 23]. Пастанова паказвае, што парадак выдачы пуцёвак характарызаваўся ярка выражанай дыферэнцыяцыяй, пры якой перавага ў іх атрыманні залежала ў сукупнасці ад вопыту працоўнай дзейнасці, кваліфікацыі і вытворчых дасягненняў. Стаханаўцы выступалі тут як прыярытэтная катэгорыя: ім, каб пазачаргова атрымаць пуцёўкі дастаткова было наяўнасці толькі апошняга крытэрыя, які вызначаўся іх статусам, што быў дадзены за ўдасканаленне працы.

Наколькі прывілеяваным было становішча стаханаўцаў у сферы адпачынку, паказвае працэдура выдачы пуцёвак на асобных прадпрыемствах БССР. У снежні 1935 г. на заводзе “Інтэрнацыянал” уся вылучаная 31 пуцёўка ў дамы адпачынку дасталася стаханаўцам, на Мінскім фанерным заводзе “Чырвоны Кастрычнік” сярод 23 пуцёвак, што былі выдзелены для рабочых, стаханаўцы атрымалі 22, на Мінскім

Витебский государственный технологический университет

станкабудаўнічым заводзе імя Варашылава стаханаўцам выдадзены 2 пуцёўкі ў дамы адпачынку з 3-х запланаваных, на Віцебскім станкабудаўнічым заводзе імя Кірава усе 5 пуцёвак атрымалі рабочыя-стаханаўцы [287, арк. 79, 82, 84, 87]. Пуцёўкі на курорты, у дамы адпачынку і санаторыі выдаваліся стаханаўцам бясплатна, кошт іх аплачвалі прафсаюзы і часткова страхавыя касы асобных прадпрыемстваў і арганізацый.

Падобныя перавагі пры атрыманні паслуг санаторна-курортнага адпачынку акрамя стаханаўцаў прамысловасці мелі і ўдзельнікі стаханаўскага руху, што былі занятыя ў сельскагаспадарчай вытворчасці. Галоўным чынам гэта былі стаханаўцы з машынна-трактарных станцый і саўгасаў. Так, у студзені 1936 г. 9 стаханаўцаў з Дзяржынскай, Капыльскай і Слуцкай МТС пазачаргова атрымалі бясплатныя пуцёўкі на курорты ў Кіславодск і Звенігарад, а ў дамы адпачынку з гэтых станцый паехала 5 перадавікоў. Усяго за студзень 1936 г. на усесаюзных курортах і ў санаторыях з БССР адпачыла 72 стаханаўцы МТС [427, с. 4]. У анкетах, што запаўняліся рабочымі саўгасаў для атрымання пуцёвак на курорты і ў санаторыі, можна было сустрэць абавязковую графу аб тым, ці з'яўляецца прэтындэнт на пуцёўку стаханаўцам або ўдарнікам [307, арк. 136]. На аснове такіх анкет у 1937 г., напрыклад, ў працэсе вылучэння пуцёвак на курорты па мяса-малочных саўгасах БССР першачаргова складаліся спісы стаханаўцаў. Затым спісы накіроўваліся ў раённыя адборачныя камісіі, што канчаткова вызначалі імёны перадавікоў, якія паедуць адпачываць на курорты [306, арк. 34]. У 1936 г. на адзін з саўгасаў Гомельскага раёна было вылучана 7 пуцёвак, дзе 1 пуцёўка была разлічана для адпачынку на курорце і прызначалася для ўдзельніка стаханаўскага руху [305, арк. 120]. Па Віцебскім раёне ў снежні 1935 г. ад Саюзмалтрэста ў дом адпачынку планавалася накіраваць толькі аднаго, самага лепшага стаханаўца [69, арк. 58].

Праз нізкі ўзровень сацыяльна-бытавога забеспячэння калгаснікаў у параўнанні з рабочымі і адсутнасць у калгасах прафсаюзных арганізацый на гэтыя гаспадаркі прыходзілася невялікая колькасць пуцёвак, і абсалютную іх большасць атрымлівалі менавіта ўдзельнікі стаханаўскага руху. Так, у Жыткавіцкім раёне вясной 1938 г. у санаторыі БССР і на курорты Азоўскага мора на льготных умовах мясцовай адміністрацыяй былі адпраўлены толькі тыя калгаснікі, што паказалі стаханаўскія прыклады працы [181, с. 4]. У большасці выпадкаў пуцёўкі для правядзенне курортна-санаторнага адпачынку калгаснікі вымушаны былі набываць за ўласны кошт, што зноў-такі маглі зрабіць пераважна стаханаўцы, дзякуючы іх шырокай грашовай падтрымцы з боку дзяржавы. Напрыклад, у маі 1938 г. калгасніцы-стаханаўкі Капароўская і Фальковіч з сельскагаспадарчай арцелі "Труд"



Витебский государственный технологический университет

набылі пуцёўкі ў санаторыі коштам па 750 рублёў за ўласныя грошы [182, с. 4]. Усё гэта вызначала становішча стаханаўцаў у калгасах як сапраўды прывілеяванае сярод астатніх іх членаў, што не мелі магчымасці атрымаць нават элементарныя ўмовы для адпачынку. Акрамя таго, адпачынак для стаханаўцаў калгасаў спецыяльна арганізоўваўся ў раённых дамах калгасніка. Напрыклад, Лёзненскі раённы выканаўчы камітэт 25 снежня 1935 г. накіраваў у адзін з такіх дамоў 25 лепшых стаханаўцаў, сярод якіх былі вядомыя на ўсю рэспубліку передавікі льнаводства – Быкоўская, Пярцова, Кавалёва. [428, с. 4].

Рэкрэацыя ўдзельнікаў стаханаўскага руху вылучалася сваёй прывілеяванасцю праз адкрыццё ў БССР спецыяльных дамоў адпачынку, прызначаных менавіта для гэтай катэгорыі перадавікоў. У лістападзе 1935 г. ЦК Саюза запалкавай і фанернай прамысловасці СССР было запланавана будаўніцтва асобнага дома адпачынку для стаханаўцаў гэтай галіны ў Беларусі [330, с. 4]. 1 чэрвеня 1936 г. быў адчынены дом адпачынку для стаханаўцаў Барысаўскай запалкавай фабрыкі [424, с. 7 – 8]. У маі таго ж года за 15 км ад Бабруйска пачалося ўзвядзенне новага дома адпачынку для стаханаўцаў Бабруйскага лесакамбіната [119, с. 4].

Важным фактарам далейшага разгортвання стаханаўскага руху з'яўлялася стварэнне спрыяльных умоў адпачынку не толькі падчас адпускоў, але і ў прамежках часу паміж выкананнем вытворчых абавязкаў на працягу працоўнага тыдня. На гэта паказвае прыклад, калі у канцы 1935 г. на торфазаводзе "Чырвоная Беларусь" для брыгады грузчыкаў торфу быў пабудаваны цёплы барак, уладкаваны для адпачынку пасля працоўнага дня (тут меўся стол для чытання газет, кніг, гульні ў шашкі і даміно). Менавіта пасля пабудовы барака брыгада стала працаваць па-стаханаўску і павялічыла прадукцыйнасць працы да 150 % [298, арк. 5]. Так, добра арганізаваны адпачынак, з аднаго боку, цалкам задавальняў патрэбы ва ўзнаўленні фізічных сіл у працэсе ажыццяўлення працы, с другога – стаў моцным стымулам да яе ўдасканалення.

Каб замацаваць станоўчую дынаміку стаханаўскага руху, адміністрацыяй прадпрыемстваў і прафсаюзамі часта адкрываліся асобныя ўстановы для правядзення адпачынку стаханаўцаў пасля працоўнага дня. Напрыклад, намаганнямі кіраўніцтва Мінскага гарбарнага завода "Бальшавік" і мінскіх станкабудаўнічых заводаў ў снежні 1935 г. для 37 стаханаўцаў быў адкрыты бясплатны прафілакторый, дзе перадавікі адпачывалі без адрыву ад вытворчасці [Дадатак Ж, Малюнак Ж.1]. Асабліва адкрыццё такіх устаноў было важным для тых стаханаўцаў прамысловасці, што працавалі не на адным сталым месцы, а на адкрытай мясцовасці, напрыклад, на

Витебский государственный технологический университет

лесанарыхтоўках ці на здабычы торфу. Так, прафсаюзнай арганізацыяй Нова-Беліцкага лесакамбіната за зімні сезон 1935 – 1936 гг. было арганізавана 6 начных прафілакторыяў для стаханаўцаў, кошт забяспечанасці кожнай з гэтых устаноў складаў па 10000 рублёў [316, арк. 86]. З 15 студзеня 1936 г. пачалі сваю працу начныя санаторыі для стаханаўцаў-лесарубаў Уздзенскага і Полацкага леспрамгасаў [245, арк. 44]. Стаханаўцы ў гэтых санаторыях на працягу 21 дня бясплатна харчаваліся і адпачывалі. [321, с. 4]. На торфазаводах “Асінторф”, “Чырвоны сцяг” (Смалявіцкі раён) і “Бальшавік” (Гомельскі раён) для стаханаўцаў былі адчынены ў 1936 г. аднадзённыя дамы адпачынку. Штодзень у іх адпачывала па 30 чалавек. На абсталяванне дамоў было асігнавана прафсаюзам тарфянікаў 50000 рублёў [6, с. 4]. Дзейнасць падобных устаноў стварала для стаханаўцаў у ходзе вытворчага працэсу такія ж спрыяльныя ўмовы адпачынку, як і падчас правядзення імі адпускоў. Гэта дазваляла перадавікам пастаянна ўзнаўляць свае фізічныя сілы для падтрымкі ўзятых рэкордных тэмпаў працы і стварала для астатніх рабочых прыклад таго, што пры пераходзе на стаханаўскія метады працы ім будуць прадастаўляцца такія ж якасныя ўмовы адпачынку.

Стаханаўцам спрыяльныя ўмовы для іх адпачынку пасля працоўнага дня ствараліся таксама ў спецыяльна абсталяваных пакоях пры клубах і рабочых інтэрнатах. Так, напрыклад, клуб Беларускага энергетычнага камбіната для адпачынку стаханаўцаў меў спецыяльны пакой, абсталяваны мягкай мэбляй, кветкамі і патэфонам [286, арк. 12]. У інтэрнаце торфазавода “Грэбнёва” адпачынак стаханаўцаў быў арганізаваны ў падобным жа культурна абсталяваным пакоі [298, арк. 45]. Да пачатку мая 1936 г. спецыяльна абсталяваныя пакоі для стаханаўцаў былі ўладкаваныя пры клубах 15 торфазаводаў БССР [295, арк. 6].

Вялікая ўвага надавалася арганізацыі адпачынку стаханаўцаў па выхадным дням у гарадскіх парках культур. Напрыклад, фабрычна-завадскімі камітэтамі Гомеля ў сакавіку 1936 г. асобна выдаткоўваліся сродкі для правядзення стаханаўцамі вольнага часу ў Парку культуры і адпачынку і на Пралетарскім лузе, дзе перадавікі атрымалі бясплатны доступ да наведвання атракцыёнаў і ўсіх забаўляльных мерапрыемстваў [95, арк. 109].

Імкненне падкрэсліць высокі сацыяльны статус стаханаўцаў і стварыць ім самыя якасныя ўмовы для баўлення вольнага часу праявілася ў арганізацыі дачнага адпачынку, што быў уласцівы ў XIX – пачатку XX стст. для заможных катэгорый насельніцтва. У часы новай эканамічнай палітыкі дачны адпачынак узнікае зноў, у асяроддзі партыйнага кіраўніцтва і інтэлігенцыі [211, с. 252], а ў штодзённым жыцці рабочых ён з’яўляецца толькі ў другой палове 1930-х гг., калі

Витебский государственный технологический университет

першыя дачы атрымалі стаханаўцы. Так, у пачатку студзеня 1936 г. дырэкцыяй Віцебскай цагельні № 1 на арэнду дач для стаханаўцаў было выдаткавана 3000 рублёў, а на 1 Мая запланаваны выезд на гэтыя дачы 20-ці стаханаўскіх сямей [110, с. 4]. Да свята 1 Мая ў 1936 г. дачы за горадам атрымалі і 8 сямей стаханаўцаў Мінскага станкабудаўнічага завода імя Кірава [356, с. 4]. Дачны адпачынак, да свайго шырокага распаўсюджвання ў рабочай штодзённасці, быў для стаханаўцаў прыкметай прыналежнасці да тых сацыяльных катэгорый, што мелі прывілеяванае становішча ў савецкім грамадстве і выступалі ў ім у якасці эліт.

Важна было не толькі на аснове добра арганізаванага адпачынку падрыхтаваць стаханаўцаў да здзяйснення новых вытворчых рэкордаў, але і прапанаваць ім разнастайныя формы баўлення вольнага часу, праз якія павінна было адбывацца далейшае іх духоўнае, эстэтычнае і ідэйнае развіццё як самых лепшых прадстаўнікоў працоўных. Адным з сродкаў ажыццяўлення гэтай мэты сталі спецыяльна арганізаваныя для ўдзельнікаў стаханаўскага руху бясплатныя экскурсіі па гарадах і знакамітых мясцінах СССР. Беларускай канторай таварыства пралетарскага турызму і экскурсій у маі 1936 г. для стаханаўцаў былі вылучаны пуцёўкі на пяцідзённыя экскурсіі: у Ленінград − 25 пуцёвак, у Кіеў – 20 пуцёвак і на Дняпроўскую гідраэлектрастанцыю (ДнепраГЭС) – 10 пуцёвак [355, с. 4]. ЦК прафесійнага саюза запалкавай і фанернай прамысловасці СССР летам 1936 г. арганізаваў экскурсію 130-ці стаханаўцам з іх сем'ямі па Волзе па маршруце Горкі – Астрахань. У гэтай экскурсіі прынялі ўдзел і 37 стаханаўцаў з БССР, сярод якіх былі перадавікі з Рэчыцкага фанернага завода, Мінскага фанернага завода "Чырвоны Кастрычнік", Барысаўскай запалкавай фабрыкі і іншых прадпрыемстваў [481, с. 4]. Пры падтрымцы прафсаюзных арганізацый 20-ці лепшым стаханаўцам МТС Мінскай вобласці летам 1939 г. былі выдадзены бясплатныя пуцёўкі для паездкі ў Маскву і Ленінград [104, арк. 24]. Праз правядзенне адзначаных экскурсій прадугледжвалася як зрабіць вольны час стаханаўцаў больш разнастайным і актыўным, так і пазнаёміць іх з усімі дасягненнямі савецкай краіны, каб пэўным чынам натхніць на далейшае павышэнне прадукцыйнасці працы. Так, экскурсійны накірунак адпачынку стаў адным з фактараў рагортвання стаханаўскага руху і змяшчаў ў сабе аспект ідэалагічнага выхавання стаханаўцаў, што абавязкова прысутнічаў пры арганізацыі амаль усіх форм іх вольнага часу.

Высокі ўзровень баўлення вольнага часу стаханаўцаў дасягаўся за кошт актыўнага прылучэння іх да культуры. Так, для азнаямлення стаханаўцаў БССР з творамі класікаў музыкі і савецкіх кампазітараў Беларускі радыёкамітэт з 15 студзеня 1936 г. прыступіў да сістэматычнай арганізацыі радыёканцэртаў па заяўках перадавікоў.



Витебский государственный технологический университет

Першы радыёканцэрт адбыўся па заяўках стаханаўцаў Мінскага станкабудаўнічага завода імя Варашылава, а на 24 студзеня, напрыклад, быў запланаваны другі канцэрт – ужо па заяўках стаханаўцаў буйных прадпрыемстваў рэспублікі. Усяго за студзень 1936 г. было атрымана больш за 200 заказаў на выкананне твораў Бетховена, Шуберта, Моцарта, Шастаковіча, Пракоф'ева і іншых кампазітараў. Па просьбе стаханаўца з Оршы Батурына па радыё былі расказаны кароткія біяграфіі Бетховена і Чайкоўскага [380, с. 4]. З мэтай павышэння актыўнасці стаханаўцаў у занятках музыкай для іх была адкрыта спецыяльная музычная школа, якая пачала сваю працу 3 лютага 1936 г. пры Мінскім клубе металістаў. У школе, мяркуючы па колькасці пададзеных заяў, выказалі жаданне навучацца звыш 200 чалавек, але разлічана яна была толькі на 90 месцаў. Навучаліся тут стаханаўцы мінскіх станкабудаўнічых заводаў імя Кірава і Варашылава, а таксама члены іх сямей. Школа мела класы скрыпкі, народных інструментаў, спеваў і раяля [240, с. 4]. Як бачым, правядзенне працы па распаўсюджванні культуры з боку дзяржавы ў рамках арганізацыі вольнага часу стаханаўцаў ракрывала іх духоўныя патрэбы, што заканамерна ўзнікалі пасля паляпшэння матэрыяльнага становішча і праяўляліся ў актывізацыі назапашвання новых ведаў, а таксама імкненні стаць непасрэднымі ўдзельнікамі культурнага працэсу. З другога боку, такія імкненні часта прадпісваліся стаханаўцам адміністрацыяй прадпрыемстваў для падцвярджання іх высокага сацыяльнага статусу.

Распаўсюджанай формай азнаямлення стаханаўцаў з культурнымі здабыткамі былі асобна праводзімыя для гэтай катэгорыі перадавікоў сустрэчы з творчай інтэлігенцыяй Беларусі і СССР, а таксама вечары, прысвечаныя юбілеям знакамітых дзеячаў культуры. Напрыклад, у Цэнтральным беларускім клубе 29 снежня 1935 г. была наладжана творчая сустрэча стаханаўцаў Мінска з народным артыстам БССР У. Галубком, на якой ён расказваў пра дзейнасць свайго тэатра. Пасля гэтага перадавікі прадэманстравалі свае здольнасці ў тэатральнай самадзейнасці, а на наступны дзень, 30 снежня, за кубкам гарбаты адбыліся гутаркі на творчыя тэмы [314, арк. 48]. 1 лютага 1936 г. на кватэры стаханаўца Г. Скабло адбыўся вечар, прысвечаны творчасці М. Мойхер-Сфорым. На мерапрыемства былі запрошаны пісьменнікі, артысты тэатраў Мінска і стаханаўцы буйных прадпрыемстваў. Акрамя чытання стаханаўцамі твораў М. Мойхер-Сфорым, з дакладам, прысвечаным стагоддзю пісьменніка, выступіў прафесар-літаратуразнавец Браншэйн, свае творы прачытаў І. Харык, А. Аскельрод і паказалі выступленні артысты тэатраў [441, с. 4]. На Мінскай абутковай фабрыцы 2 чэрвеня 1936 г. была арганізавана творчая сустрэча артыстаў тэатра У. Меерхольда са стаханаўцамі

Витебский государственный технологический университет

прадпрыемства. На ўрачытым паседжанні У. Меерхольд і намеснік дырэктара тэатра Д. Атаўмян падкрэслілі важнасць самадзейнасці ў развіцці тэатральнага мастацтва [34, с. 4]. Гэтую заканамернасць, па сутнасці, і павінны былі паказаць на сваім прыкладзе стаханаўцы: пасля ўрачыстага паседжання перадавікамі, членамі гурткоў мастацкай самадзейнасці фабрыкі, была паказана невялічкая тэатральная пастаноўка [34, с. 4].

Удзел пералічаных імянітых тэатральных рэжысёраў і пісьменнікаў у творчых вечарах стаханаўцаў паказвае на тое, якую вялікую ўвагу надавала дзяржава фарміраванню з апошніх развітых у духоўным плане асоб, прадстаўляючы іх як сапраўдную працоўную эліту. У сувязі з чым на стаханаўцаў ускладваўся абавязак па дэманстрацыі сваіх ведаў у сферы літаратуры і мастацтва, а таксама актыўнага ўдзелу ў культурным жыцці. На аснове гэтага ў дзяржаўнай прапагандзе замацоўваўся тэзіс, што людзі, якія выдатна працуюць фізічна, удасканальваюць вытворчасць, могуць мець і вялікія здольнасці ў разумовай працы і рэалізацыі свайго творчага патэнцыялу.

З мэтай духоўна-эстэтычнага развіцця стаханаўцаў адміністрацыяй прадпрыемстваў і прафсаюзамі сістэматычна вылучаліся бясплатныя білеты для наведвання культурных устаноў. Напрыклад, фабрычным камітэтам фабрыкі "Сцяг індустрыялізацыі" для стаханаўцаў былі закуплены 3 ложы ў 2-ім Беларускім дзяржаўным тэатры, якія былі замацаваныя за 24 перадавікамі з членамі іх сямей [261, арк. 116; 286, арк. 43]. Адміністрацыя Мінскага станкабудаўнічага завода імя Кірава закупіла для стаханаўцаў у Беларускім дзяржаўным тэатры 8 месцаў, цырку – 5 месцаў, оперным тэатры – 16 месцаў [286, арк. 43]. 16 сталых месцаў у Беларускі дзяржаўны тэатр закупіў гарбарны завод "Бальшавік" [300, арк. 34]. На торфазаводзе "Асінторф" для стаханаўцаў было адведзена 36 месцаў у кінатэатры, для наведвання якога былі выдадзены сталыя прапускі [298, арк. 90]. Такія льготы павінны былі садзейнічаць узбагачэнню дасведчанасці стаханаўцаў ва ўсіх культурных дасягненнях краіны, што можна параўнаць з імкненнем наблізіць іх да таго культурнага ўзроўню, які раней быў характэрны для вышэйшых саслоўяў ці інтэлігенцыі. Пры гэтым высокі сацыяльны статус стаханаўцаў падкрэсліваўся наяўнасцю ў культурных установах спецыяльных сталых месцаў, якія не маглі займаць астатнія рабочыя.

Актыўную дзейнасць па павышэнні культурнага ўзроўню стаханаўцаў разгортвалі рабочыя клубы. Для частага наведвання мерапрыемстваў дадзеных устаноў удзельнікам стаханаўскага руху таксама прадастаўляўся бясплатны доступ з вылучэннем спецыяльных месцаў. Напрыклад, асобныя сталыя месцы для стаханаўцаў і іх жонак былі адведзены у Мінскім клубе металістаў [286, арк. 43]. За стаханаўцамі і членамі іх сямей клубам Беларускага энергетычнага



Витебский государственный технологический университет

камбіната былі замацаваныя такія ж месцы на тэатральныя пастаноўкі і кінасеансы [286, арк. 12]. Практыка вылучэння сталых бясплатных месцаў у клубах назіралася пры арганізацыі вольнага часу стаханаўцаў мясамалочных саўгасаў рэспублікі [313, арк. 8]. А па ініцыятыве прафсаюзнай арганізацыі кандытарскай фабрыкі "Камунарка" ўвогуле быў адчынены спецыяльны клуб, наведваць які маглі выключна стаханаўцы [426, с. 31].

Рабочымі клубамі для стаханаўцаў часта наладжваліся асобныя мерапрыемствы. Клуб "Суботнік" Віцебскага чыгуначнага вузла паказаў спецыяльна для стаханаўцаў у канцы 1935 г. 2 тэатральныя пастаноўкі, з гэтымі ж пастаноўкамі ажыццяўляўся выхад на кватэры лепшых перадавікоў [289, арк. 35]. У студзені 1936 г. клубам металістаў для 4-х стаханаўцаў Мінскага станкабудаўнічага завода імя Кірава на даму былі праведзены кінасеансы [286, арк. 43]. 23 сакавіка 1936 г. у клубе імя Сталіна адбыўся канцэрт для стаханаўцаў Мінскага чыгуначнага вузла. На канцэрце адбылося выступленне самадзейных калектываў чырвонаармейцаў, стаханаўцаў Мінскай абутковай фабрыкі, лепшых артыстаў оперы і балета [10, с. 4; 33, с. 3].

Па сутнасці, менавіта рабочыя клубы, дзе праходзіла баўленне вольнага часу большасці працоўных, сталі самым галоўным асяродкам па распаўсюджванні культуры паміж стаханаўцаў, бо магчымасць пастаяннага наведвання, скажам, тэатраў прадастаўлялася не для ўсіх перадавікоў. Акрамя таго, як мы заўважылі, дзейнасць клубаў канцэнтравалася на правядзенні асобнай культурнай працы з ўдзельнікамі стаханаўскага руху, праз што іх вольны час рабіўся больш разнастайным і насычаным.

Цэнтральнай установай у БССР, што спецыяльна арганізоўвала вольны час стаханаўцаў, можна лічыць Універсітэт выхаднога дня ў Мінску. Дадзены Універсітэт не быў навучальнай установай у прамым сэнсе гэтага слова, не прызначаўся для атрымання пэўнай адукацыі, а быў адкрыты з мэтай узбагаціць веды перадавікоў вытворчасці ў розных галінах навукі і тэхнікі, аб палітычным становішчы ў СССР і свеце. Дзейнасць Універсітэта выхаднога дня прадугледжвала і арганізацыю забаўляльных і культурных мерапрыемстваў. Ініцыятарамі яго адкрыцця выступілі Прамысловы аддзел ЦК КП(Б)Б, Мінскі гарадскі камітэт партыі і Народны камісарыят мясцовай прамысловасці. Наведваць Універсітэт маглі толькі стаханаўцы мінскіх прадпрыемстваў з членамі сваіх сямей [396, с. 4], пры гэтым агульнаадукацыйная падрыхтоўка герояў вытворчасці павінна была складаць не менш за 2 класы [450, с. 4]. Спачатку ва Універсітэт планаваўся набор 230 стаханаўцаў Мінска [451, с. 4], у працэсе ж падачы заявак на наведванне гэтай установы выявілася вялікая колькасць жадаючых трапіць сюды (што паказвае на актыўную пазіцыю стаханаўцаў у тым, каб зрабіць



Витебский государственный технологический университет

баўленне свайго вольнага часу больш разнастайным), таму набор павялічылі да 500 чалавек [453, с. 4], але ў выніку арганізатары вымушаны былі спыніцца на лічбе ў 480 наведвальнікаў [260, арк. 22]. Права наведваць Універсітэт атрымалі толькі самыя лепшыя стаханаўцы мінскіх прадпрыемстваў, якія найбольш вылучыліся ў вытворчасці і грамадскай працы. Напрыклад, з гарбарнага завода "Бальшавік" ва Універсітэт было прынята 14 стаханаўцаў [300, арк. 15], а з Мінскай шчотачнай фабрыкі – 15 [300, арк. 23].

Універсітэт выхаднога дня быў адкрыты 1 сакавіка 1936 г. у памяшканні Цэнтральнага дома тэхнікі [452, с. 4]. У азнаямляльнай праграме Універсітэта былі вылучаны цыклы лекцый па разнастайных галінах ведаў: пытанні тэхнікі, літаратуры, музыкі, эканамічнай геаграфіі, гісторыі, міжнародных адносін [396, с. 4; 451, с. 4]. Для чытання лекцый былі запрошаны лепшыя спецыялісты з БССР, Масквы і Ленінграда. Па прычыне зменнай шкалы выхадных дзён на прадпрыемствах працу Універсітэта для стаханаўцаў планавалася ўвесці ў 2 змены. Паміж лекцыямі меркавалася наладжванне невялікіх музычных перапынкаў і танцаў. Акрамя наведвання лекцый стаханаўцы маглі праводзіць свой адпачынак ў добра абсталяваных пакоях з більярдам, шашкамі, шахматамі і патэфонам [396, с. 4]. Для баўлення вольнага часу пры Універсітэце было арганізавана і некалькі гурткоў: рыбалоўны, шахматна-шашачны, народных і заходніх танцаў [42, с. 4; 196, с. 4]. Пакуль дарослыя наведвальнікі Універсітэта слухалі лекцыі або ўдзельнічалі ў іншых мерапрыемствах, іх дзеці адпачывалі ў спецыяльна ўладкаваных пакоях [26, с. 4].

Прывядзем некаторыя прыклады працы Універсітэта выхаднога дня. 6 красавіка 1936 г. у праграме гэтай установы былі запланаваныя ранішнія і вячэрнія мерапрыемствы. Ранішняя частка прадугледжвала правядзенне 2 лекцый: прафесара Э. Змачынскага па праблеме "Жыццё і дзейнасць вялікага хіміка Мендзялеева" і акадэміка І. Замоціна на тэму "Жыццё і творчасць Пушкіна". Пасля лекцый стаханаўцы маглі праслухаць музычны канцэрт, што быў пастаўлены па творах Пушкіна. У вячэрнія мерапрыемствы ўваходзіла таксама 2 лекцыі: лекцыя супрацоўніка Народнага камісарыята замежных спраў Прынца з цыкла "Агрэсіўныя планы германскага фашызму і становішча ў Заходняй Еўропе" і акадэміка І. Замоціна на пушкінскую тэму. У канцы вячэрняй праграмы меркавалася правесці той жа самы канцэрт, што і ў ранішняй частцы [450, с. 4]. У верасні і кастрычніку 1936 г. стаханаўцы і іх жонкі праслухалі наступныя лекцыі: Прынца "Ваенна-фашысцкі мяцеж у Іспаніі", прафесара Сніткова "Аб новых поспехах у тэлебачанні", спецыяліста з Масквы Левіна "Праблема Балкан і Малой Антанты", Героя Савецкага Саюза С. Слепава аб новых дасягненнях авіяцыі [26, с. 4].



Витебский государственный технологический университет

Такім чынам, дзейнасць Універсітэта выхаднога дня садзейнічала вылучэнню вялікай долі пазапрацоўнага часу стаханаўцаў на засваенне новых ведаў з разнастайных навук і актыўны ўдзел у культурным жыцці. Адначасова баўленне вольнага часу тут цесна перапляталася з ідэалагічнай працай, якая прадугледжвала пастаяннае прадастаўленне інфармацыі пра палітычны стан СССР і замежных краін, на аснове чаго ставілася мэта сфарміраваць са стаханаўцаў патрыятычна настроеных асоб, гатовых пры любых умовах падтрымліваць савецкі строй. Працэс стварэння і функцыянавання Універсітэта таксама ўказвае на тое, што сярод стаханаўцаў у сферы вольнага часу існавала своеасаблівая іерархія: як мы заўважылі вышэй, наведваць гэтую ўстанову маглі толькі самыя лепшыя стаханаўцы, і пры чым толькі сталічныя. Таксама Універсітэт выхаднога дня праводзіў больш разнастайную і якасную праграму пры арганізацыі вольнага часу, чым, напрыклад, звычайныя рабочыя клубы, якія наведвала большасць ўдзельнікаў стаханаўскага руху.

Цікавай формай арганізацыі вольнага часу стаханаўцаў становяцца балі, правядзенне якіх было перанята з побыту дваранскага саслоўя дарэвалюцыйнага перыяду. Спецыяльна арганізаваныя балі для стаханаўцаў таксама павінны былі зацвердзіць высокі сацыяльны статус гэтай катэгорыі перадавікоў. Акрамя таго, адзначаная форма вольнага часу служыла прыкладам паляпшэння матэрыяльнага становішча рабочых па выніках сацыялістычных пераўтварэнняў, яе мэтай было паказаць, што для кожнага чалавека, які ўдасканаліў сваю працу, становяцца даступнымі тыя формы штодзённага жыцця, якія раней былі характэрны толькі для заможных людзей. Балі сталі яркім адлюстраваннем ідэі вясёлага і культурнага баўлення вольнага часу, якую імкнулася распаўсюдзіць савецкая дзяржава ў сваёй прапагандзе. З другога боку, у рамках той жа прапаганды балі з’яўляліся сродкам разгортвання стаханаўскага руху, калі праз дэманстрацыю якаснага баўлення вольнага часу яго ўдзельнікаў планавалася зацікавіць іншых рабочых у актывізацыі працоўнай дзейнасці для дасягнення падобнага ж узроўню жыцця.

У канцы 1935 г. баль стаханаўцаў правёў Мінскі станкабудаўнічы завод імя Кірава. На баль былі запрошаны госці-стаханаўцы з іншых мінскіх прадпрыемстваў: з станкабудаўнічага завода імя Варашылава, гарбарнага завода “Бальшавік”, шчотачнай фабрыкі імя Крупскай. У шэрагу мерапрыемстваў балю былі праведзены танцы, у буфеце завода арганізаваны банкет, на якім прысутнічалі акрамя саміх стаханаўцаў іх сваякі, былыя рабочыя, сакратар партыйнага камітэта і дырэктар завода. Пасля банкету быў наладжаны невялікі музычны канцэрт. На імправізаванай сцэне выступаў завадскі джаз-аркестр, а за ім – хор. У канцэрце свае творчыя



Витебский государственный технологический университет

здольнасці ў музыцы і спевах праявілі і стаханаўцы. У ходзе правядзення балю спецыяльнай "лятучай поштай" стаханаўцам былі ўручаны чырвоныя пакеты з грашовымі прэміямі [116, с. 4]. Адзначаны факт стаханаўскага балю, па-першае, можна лічыць характэрным прыкладам дэманстрацыі павышэння ўзроўню жыцця рабочых, што знайшло сваё ўвасабленне ў разнастайнасці форм вольнага часу, якія былі прадстаўлены для герояў вытворчасці. Пры гэтым запрошаныя на баль былыя рабочыя, расказваючы пра сваё цяжкае становішча падчас царскага рэжыму [116, с. 4], прыводзілі параўнаўчыя прыклады для адзнакі штодзённага жыцця стаханаўцаў як сапраўды заможнага. Па-другое, баль уяўляў сабой узнагароду стаханаўцам за іх выдатную працу, што азнаменавалася ў сукупнасці з арганізацыяй вольнага часу выдачай грашовых прэмій. Па-трэцяе, на балі стаханаўцы змаглі паказаць, што яны могуць не толькі здзяйсняць свае працоўныя подзвігі, але і актыўна займацца творчасцю. Па падобнай жа схеме ў снежні 1935 г. – студзені 1936 г. прайшлі балі і балі-маскарады для стаханаўцаў шэрагу віцебскіх прадпрыемстваў, Мінскай швейнай фабрыкі "Кастрычнік", Мінскай кандытарскай фабрыкі "Камунарка", у жніўні 1936 г. – баль, прысвечаны гадавіне стаханаўскага руху, у клубе Мінскай абутковай фабрыкі, у студзені 1939 г. – навагодні баль стаханаўцаў Магілёўскай шаўковай фабрыкі [12, с. 4; 52, с. 4; 286, арк. 42; 395, с. 4; Дадатак Ж, Малюнак Ж.2].

Балі, арганізаваныя першапачаткова для стаханаўцаў, сталі ў далейшым адной з распаўсюджаных форм вольнага часу рабочых і прапаноўвалі шырокую праграму па яго баўленню. У савецкіх умовах змянілася сутнасць баляў: паколькі яны арганізоўваліся для людзей працы, то і ўсе іх складаючыя павінны былі адпавядаць інтарэсам і патрэбам пралетарыяў. Таму балі мелі спрошчаны характар і з'яўляліся па змесце добра арганізаванымі мерапрыемствамі савецкага тыпу, што адлюстравалася, напрыклад, у паказе мастацкай самадзейнасці, папулярызацыі новых метадаў працы і дэманстрацыі клопату дзяржавы пра дабрабыт рабочых.

Выступаючы эталонам дасканалай працы, стаханаўцы аўтаматычна станавіліся эталонамі і ў сферы вольнага часу: яны ў якасці самых лепшых прадстаўнікоў працоўных служылі ўзорам таго, як кожны рабочы ці калгаснік павінен бавіць свой пазапрацоўны час. Дадзенае палажэнне было звязана і з неабходнасцю дасягнення стаханаўцамі адзначанай намі вышэй "культурнасці", якая павінна была праяўляцца ў высокім узроўні ведаў і актыўным духоўным развіцці працоўных [38, с. 214]. Менавіта таму ў аповедах стаханаўцаў пра здзяйсненне сваіх вытворчых рэкордаў мы можам заўважыць і прыклады высокай культуры баўлення вольнага часу. Так, слесар-стаханавец Галаўня з Мінскага станкабудаўнічага завода імя Кірава



Витебский государственный технологический университет

адзначаў: “Стаханаўскі рух мяне арганізаваў не толькі на падняцце прадукцыйнасці працы, але… і ўвогуле культурнага ўзроўню. Чытаю мастацкую літаратуру, часта наведваю тэатр, кіно” [378, с. 56]. Пра баўленне свайго вольнага часу распавядаў і стаханавец І. Трацэўскі: “Люблю читать художественную литературу. Мною прочитаны произведения “Чапаев”, “Овод”, “Бабьи тропы”, “Поднятая целина”, “Как закалялась сталь” и другие. Очень люблю кино” [433, с. 31]. Падобныя выказванні насілі агітацыйны характар і раскрывалі тыя грамадскія абавязкі, што ўскладаліся на стаханаўцаў, каб адпавядаць у культурным плане свайму высокаму статусу. На наяўнасць такіх абавязкаў паказвае і той факт, што дырэкцыя Мінскай гарадской бібліятэкі кожны выхадны наведвала кватэры стаханаўцаў, прыносіла ім новыя кнігі і правярала засваенне прачытаных кніг [373, с. 4]. Мастацкую літаратуру стаханаўцам перыядычна дастаўлялі супрацоўнікі клуба Гомельскай абутковай фабрыкі “Труд”, а затым таксама правяралі, наколькі добра передавікі засвоілі змест гэтай літаратуры [92, арк. 95].

У той жа час стаханаўцы ў выніку павышэння ўзроўню свайго жыцця і ўсведамлення знакавай ролі свайго статусу ў грамадстве самі пачалі цікавіцца ўсімі здабыткамі культуры, жадалі атрымаць новыя веды і актыўна ўдзельнічаць у культурным жыцці. Так, стаханавец з “Гомсельмаша” Лосеў адзначаў, што вялікую цікавасць у яго выклікала кніга “Тихий Дон”, якую ён, нягледзечы на пэўныя цяжкасці, старанна імкнуўся прачытаць да канца [96, арк. 67]. Брыгадзір стаханаўскай брыгады Крымянеўскі (Мінскі станкабудаўнічы завод імя Кірава) пачаў цікавіцца паэзіяй і нават спрабаваў пісаць вершы [476, с. 22].

Праяўленнем узорнага баўлення вольнага часу з’яўляўся актыўны ўдзел стаханаўцаў у гуртковай працы, мастацкай самадзейнасці і ў спартыўна-масавых мерапрыемствах. На Віцебскім шчацінна-шчотачным камбінаце па ініцыятыве стаханаўцаў быў арганізаваны гурток танцаў. Таксама стаханаўцы прымалі ўдзел у працы ўсіх гурткоў пры клубе камбіната: у струнным гуртку – 4 чалавекі, у драматычным – 3, у духавым – 4, у хоры – 22, у балетным – 6, у гуртку беларускай літаратуры – 5, у гуртку яўрэйскай літаратуры – 2 [300, арк. 305]. У драматычным гуртку, што быў арганізаваны пры клубе Мінскага фанернага завода “Чырвоны Кастрычнік”, займалася 28 стаханаўцаў, а ў струнным аркестры – 13 [286, арк. 12]. Актыўны ўдзел стаханаўцаў у культурным жыцці мы таксама бачылі, калі аналізавалі прыклады правядзення для перадавікоў творчых сустрэч і стаханаўскіх баляў. У студзені 1939 г. у адзнаку XVIII з’езду УКП(б) была праведзена лыжная эстафета з удзелам 124 стаханаўцаў МТС, дзе лепшыя трактарысты БССР павінны былі паказаць свае спартыўныя здольнасці і актыўныя адносіны да ўдасканалення фізічнай формы [108, арк. 59].



Витебский государственный технологический университет

Узорнымі формамі баўлення вольнага часу ўдзельнікамі стаханаўскага руху з’яўляліся стаханаўскія вечары і стаханаўскія выхадныя дні. Яны арганізоўваліся з мэтай зрабіць вольны час перадавікоў вытворчасці насычаным разнастайнымі відамі дзейнасці, тым самым для астатніх рабочых стваралася ідэальная мадэль паводзін у пазапрацоўны час. Таксама адзначаныя мерапрыемствы праводзіліся для далейшай папулярызацыі стаханаўскіх метадаў працы.

Рабочымі клубамі Віцебска на працягу 1936 г. часта праводзіліся сямейныя вечары за кубкам гарбаты на кватэрах асобных стаханаўцаў [286, арк. 18]. На гэтыя вечары, як правіла, запрашаліся ў якасці гасцей стаханаўцы з аднаго прадпрыемства. Так, 8 студзеня 1936 г. сямейны вечар адпачынку быў праведзены на кватэры лепшага стаханаўца завода “Чырвоны металіст” Ліна. Ён запрасіў да сябе ў госці двух сваіх калег па працы – рабочых Палаткоўскага і Бляхмана, а яго малодшы сын – 10 аднакласнікаў. На вечары стаханавец Лін расказаў пра свой жыццёвы шлях, адзначыў, як змянілася яго матэрыяльнае становішча ў лепшы бок пасля разгортвання стаханаўскага руху. Успамінамі пра падзеі 1905 г. у Віцебску падзяліўся Палаткоўскі, а старэйшы сын Ліна расказаў гасцям пра новыя метады працы ў металаапрацоўцы. У канцы вечара на кватэры быў прадэманстраваны кінафільм [223, с. 4]. Стаханаўскія вечары перыядычна наладжваліся на кватэрах перадавікоў Бабруйскага фанернага завода партыйнымі арганізатарамі і камуністамі. На гэтых вечарах прапрацоўваліся матэрыялы І Усесаюзнай нарады стаханаўцаў, праходзілі чытанні твораў мастацкай літаратуры і вяліся таварыскія гутаркі за вячэрай [446, с. 33].

Наладжванне стаханаўскіх выхадных дзён таксама ўключала ў сябе пералік тых форм баўлення вольнага часу, што з’яўляліся абавязковымі для кожнага працоўнага чалавека. Стаханаўскі выхадны дзень быў арганізаваны, напрыклад, у снежні 1935 г. Віцебскім клубам металістаў. Пачалося адзначанае мерапрыемства ў памяшканні клуба ў 12 гадзін дня. Да гадзіны дня стаханаўцы гулялі ў даміно і шахматы. Гульнёй у шахматы кіраваў запрошаны для гэтага спецыяліст. Пасля гульні была праведзена гутарка на тэму “Стаханаўскі метад і яго значэнне”. Па завяршэнні гутаркі стаханаўцы перайшлі ў залю, дзе была арганізавана мастацкая самадзейнасць. У перапынку для перадавікоў быў прыгатаваны абед. Увечары выхаднога дня адбылося чытанне ўрыўка з кнігі “Как закалялась сталь” і прагляд фільма “Светлы горад” [351, с. 2]. 22 снежня 1935 г. правядзенне выхаднога дня для 200 сямей стаханаўцаў наладзіў клуб фабрыкі “Сцяг індустрыялізацыі”. Працягваўся гэты стаханаўскі выхадны дзень з 12 гадзін дня да 7 гадзін вечара. У шэрагу мерапрыемстваў была прадэманстравана кінастужка “Пышка”, арганізаваны калектыўныя гульні, выступленне тэатральнага джазу і фабрычнага гуртка [286, арк. 43]. Мясцовыя партыйныя органы і

Витебский государственный технологический университет

работнікі культуры Гомеля арганізавалі стаханаўскі выхадны дзень ў сакавіку 1938 г. для лепшых чыгуначнікаў. Падчас адзначанага мерапрыемства была прадстаўлена музыкальная праграма, праведзены калектыўнае чытанне мастацкай літаратуры і абмеркаванне новых метадаў працы [112, с. 4].

На аснове арганізацыі стаханаўскіх вечароў і стаханаўскіх выхадных дзён замацоўваліся ўзоры правільнага баўлення вольнага часу, згодна з якімі кожны з працоўных па стаханаўскаму прыкладу павінен быў праводзіць свой адпачынак на працягу тыдня і па выхадным дням у форме азнаямлення з мастацкай літаратурай, кінафільмамі, музыкай і тэатральнымі пастаноўкамі, праводзіць час за разнастайнымі гульнямі, цікавіцца дасягненнямі ў савецкай эканоміцы, палітыцы, сацыяльнай сферы, рэвалюцыйным мінулым рэспублікі і абмяркоўваць гэта апроч якіх-небудзь бытавых праблем у сямейных гутарках або ў коле калег. Складвалася ў выніку дэмастрацыйная мадэль сацыяльных паводзін у побыце, носьбітамі якой сталі стаханаўцы як людзі, што ўмеюць не толькі выдатна працаваць, але і выдатна бавіць свой вольны час.

Пры арганізацыі вольнага часу прывілеямі і якаснымі паслугамі маглі карыстацца члены сямей стаханаўцаў. Як мы заўважылі вышэй, стаханаўцы разам з сваімі сем’ямі мелі сталыя абанементы на наведванне культурных устаноў і права ўдзельнічаць у мерапрыемствах Універсітэта выхаднога дня. Дзяржаўным трэстам дрэваапрацоўчай прамысловасці БССР для правядзення летняга адпачынку ў 1936 г. на паўднёвым беразе Крыма вылучаліся пазачарговыя пуцёўкі не толькі для стаханаўцаў, але і для іх жонак [317, арк. 167 − 168].

Вялікая ўвага ўдзялялася арганізацыі вольнага часу дзяцей стаханаўцаў, якія мелі ў адзначанай сферы сярод астатніх прадстаўнікоў падрастаючага пакалення пэўныя перавагі, і для якіх таксама, як і для іх бацькоў, праводзіліся асобныя мерапрыемствы і ствараліся лепшыя ўмовы для адпачынку. Напрыклад, падчас правядзення стаханаўскай дэкады 20 студзеня – 1 лютага 1936 г. на Віцебскім фанерным заводзе ў апошні яе дзень для дзяцей перадавікоў было арганізавана мерапрыемства, якое ўключала ў сябе ранішнік, катанне на санках і лыжах [70, арк. 54]. У рамках мерапрыемстваў, прысвечаных Новаму году, спецыяльна для стаханаўскіх дзяцей Віцебскім гарадскім саветам прафесійных саюзаў 1 студзеня 1936 г. быў праведзены святочны ранішнік [70, арк. 5]. На зімовых канікулах у дамы адпачынку ў БССР у канцы 1935 г. было накіравана 290 вучняў, дзяцей стаханаўцаў, а 48 піянераў адправіліся на экскурсію ў Ленінград [242, с. 4]. У лютым 1937 г. УЦСПС (Усесаюзным цэнтральным саветам прафесійных саюзаў) сярод мясамалочных саўгасаў БССР былі размеркаваны бясплатныя

Витебский государственный технологический университет

пуцёўкі для адпачынку ў Алушце, разлічаныя для дзяцей ўдзельнікаў стаханаўскага руху [306, арк. 54].

Адпачынак стаханаўскіх дзяцей набываў сімвалічнае значэнне, калі лепшыя паслугі сярод іх атрымлівалі тыя, хто паказаў выдатныя вынікі ў вучобе. Так дзяржава імкнулася прадэманстраваць, што ў сем'ях лепшых працоўных, стаханаўцаў, выхоўваюцца лепшыя вучні рэспублікі, якія падобна сваім бацькам павінны мець якасны адпачынак. Летам 1936 г. ЦК прафсаюзаў запалкавай і фанернай прамысловасці СССР пры падтрымцы Цэнтральнай дзіцячай экскурсійна-турыстычнай станцыі арганізаваў для лепшых выдатнікаў вучобы, дзяцей стаханаўцаў, экскурсію па маршруце ДнепраГЭС – Днепр – Чорнае мора – Адэса – Кіеў. Для БССР было вылучана 11 пуцёвак: 7 – для дзяцей стаханаўцаў Бабруйскага лесакамбіната і 4 – для Гомельскага лесазавода. Ад апошяга на экскурсію, напрыклад, паехалі выдатнікі вучобы Рузоўскі Андрэй, Шэйман Юзік, Бараноўская Вера і Крыфункс Эсфір [317, арк. 149, 159, 160 – 161].

Арганізацыя вольнага часу блізкіх сваякоў стаханаўцаў, як бачым, таксама знаходзілася на высокім узроўні. Так ствараўся прыклад таго, што ў кожнага працоўнага існавала магчымасць якаснага забеспячэння ўмоў жыцця сваіх сямей за кошт ўдасканалення вытворчай дзейнасці. З другога боку, стварэнне якаснага адпачынку і вылучэнне некаторых прывілей у сферы вольнага часу для членаў стаханаўскіх сямей паказвае на тое, што прэстыжнае становішча ў грамадстве мела і гэтая катэгорыя людзей.

Спроба на прыкладзе стаханаўцаў стварыць якасны ўзор вольнага часу сутыкалася ў некаторых выпадках з недахопамі ў яго арганізацыі з боку прафсаюзаў ці адміністрацыі прадпрыемстваў. У такіх сітуацыях перадавікі не атрымлівалі элементарныя ўмовы для баўлення вольнага часу, тыя, якія павінны былі мець усе працоўныя. У сувязі з гэтым ад стаханаўцаў, напрыклад, паступалі лісты ў рэспубліканскія газеты са скаргамі. Так, вялікі шэраг лістоў са скаргамі паступаў у 1936 г. ад стаханаўцаў Гомеля ў газету "Рабочий". Стаханавец Гомельскага станкабудаўнічага завода імя Кірава Кажамякін адзначаў: "Если спросить у председателя завкома, как рабочие-стахановцы проводят свой выходной день, он не сумеет ответить. Завком считает, что он должен обслуживать рабочих тогда, когда предприятие работает, а в дни отдыха – это не его дело" [178, с. 3]. Ад стаханаўцаў Максюка і Гарбароўскага (лесазавод імя Гікала) паступіў ліст з наступным зместам: "В мужском общежитии комбината имени Гикало живут свыше 200 рабочих. Среди них десятки стахановцев. После работы жильцы представлены сами себе. Никакой культурно-массовой работы здесь не организовано. При общежитии имеется ленинский уголок, но там даже газеты не найти" [228, с. 3]. На

Витебский государственный технологический университет

згаданым жа камбінаце стаханаўцы былі незадаволеныя і працай рабочага клуба, створанага пры прадпрыемстве. У сваім лісце стаханаўка Кацура напісала: “Рабочий коллектив комбината имени Гикало имеет свой клуб. Помещение клуба неплохое, но ни порядка, ни работы в нём нет. Рабочие-стахановцы в часы, свободные от работы, хотят культурно отдохнуть. А работа клуба до сих пор не перестроена. Как правило, днём в клубе ничего не бывает. По вечерам же вся деятельность клуба сводится к киносеансам” [173, с. 3].

Безумоўна, што пералічаныя лісты былі строга адрэдагаваныя і мелі мэту паказаць выяўленыя на месцах недахопы ў сацыяльна-бытавым забеспячэнні працоўных. У той жа час скаргі дазваляюць зразумець, наколькі фармальным быў у некаторых выпадках падыход кіраўніцтва прадпрыемстваў да арганізацыі вольнага часу стаханаўцаў, калі знешне ствараліся спрыяльныя ўмовы для яго баўлення, як, напрыклад, пастаянны доступ перадавікоў у клубы, а па змесце мелася абмежаваная, ці ўвогуле адсутнічала, праграма культурных мерапрыемстваў.

Праблемы, што ўзнікалі пры арганізацыі вольнага часу стаханаўцаў, былі звязаны і з недахопам у асобных прадпрыемстваў фінансавых сродкаў для стварэння адпаведнага высокага ўзроўню яго баўлення. Напрыклад, Барысаўскі сушыльны завод і Віцебская абутковая фабрыка “Прагрэс” за кастрычнік – снежань 1935 г. па фінансавых прычынах не змаглі адправіць у дамы адпачынку і санаторыі ні аднаго стаханаўца [287, арк. 150, 196]. Прафсаюзная арганізацыя Віцебскага завода імя Камінтэрна не мела дастатковых сродкаў для закупкі стаханаўцам сталых месцаў у культурных установах. Таму адзін з перадавікоў дадзенага прадпрыемства заявіў наступнае: “За апошнія месяцы я не быў ні ў кіно, ні ў тэатры” [286, арк. 97].

У лютым 1936 г. арганізоўваліся экскурсіі стаханаўцаў БССР у Ленінград і Кіеў на 2 тыдні. У сувязі з чым Цэнтральны прафсаюз лесапілення і дрэваапрацоўкі Беларусі 25 студзеня даслаў на Мінскі лесазавод ліст з прапановай закупіць пуцёўкі на адзначаныя экскурсіі. Кошт экскурсіі ў Ленінград быў роўны 215 рублям, у Кіеў – 210 рублям. Пры гэтым неадкладна патрабавалася прадставіць заяўку на колькасць пуцёвак, а таксама перавесці грошы на бягучы рахунак Цэнтральнага прафсаюза [317, арк. 77]. Аднак заявак і грошай ад лесазавода не паступіла. 8 лютага кіраўніцтва Цэнтральнага прафсаюза яшчэ раз напомніла пра магчымасць адправіцца на экскурсіі і папярэдзіла пра заканчэнне тэрміну іх аплаты [317, арк. 76]. У адказ завадскі камітэт лесазавода 23 лютага даслаў наступны ліст: “Завком лесозавода Розы Люксембург сообщает, что в настоящее время на текущем счету



Витебский государственный технологический университет

завкома нет средств, а по сему отсылка стахановцев на экскурсию невозможна [317, арк. 75].

Прыведзеныя факты працэсу арганізацыі вольнага часу паказваюць нам, што не ўсе стаханаўцы атрымлівалі спрыяльныя ўмовы для яго баўлення, а некаторыя з перадавікоў не маглі нават карыстацца самымі звычайнымі паслугамі. Гэта азначала немагчымасць стварэння якіхсьці эталонаў у адзначанай сферы штодзённасці на прыкладзе абсалютна ўсіх стаханаўцаў. Гэтымі эталонамі зноў-такі станавілася абмежаваная група ўдзельнікаў стаханаўскага руху, што найбольш праявілі сябе ў вытворчасці і грамадскай працы. Менавіта ім прадастаўляліся ўсе пералічаныя вышэй прывілеі і магчымасці актыўна ўдзельнічаць у культурных мерапрыемствах. Як мы заўважылі, акрамя прычын фінансавага і матэрыяльнага характару такое становішча складвалася яшчэ з прычын адміністрацыйных, звязаных з пазіцыяй часткі кіраўнікоў і гаспадарнікаў, якія ставілі мэту ўцягнуць у стаханаўскі рух як мага большую колькасць працоўных, а пытанні арганізацыі вольнага часу стаханаўцаў адыходзілі пры гэтым на другі план.

Такім чынам, разгортванне стаханаўскага руху адбывалася ў рамках новага падыходу ў пабудове сацыялізму, што быў замацаваны ў другой палове 1930-х гг. і прадугледжваў дасягненне заможнага жыцця працоўнымі па выніках іх актыўнай вытворчай дзейнасці. Адсюль важным фактарам развіцця працоўнага энтузіязму становіцца матэрыяльнае стымуляванне. Яно знайшло сваё адлюстраванне ў павышэнні грашовага даходу рабочых і калгаснікаў, якія ўдзельнічалі ў стаханаўскім руху, на аснове чаго перадавікі змаглі палепшыць стан сваіх хатніх гаспадарак і займелі шырокую магчымасць набываць неабходныя рэчы побыту, што, праўда, было звязана з задавальненнем толькі самых элементарных матэрыяльных патрэб. З мэтай далейшага стымулявання стаханаўскага руху і замацавання высокага сацыяльнага статусу стаханаўцаў для гэтай катэгорыі перадавікоў устанаўліваўся прыярытэтны доступ да тавараў і паслуг, уводзіліся прывілеі ў харчовым забеспячэнні, жыллёвым будаўніцтве і медыцынскім абслугоўванні. Аднак сапраўднае прывілеяванае становішча з наяўнасцю ўсіх якасных матэрыяльных даброт мела толькі абмежаваная катэгорыя стаханаўцаў БССР, тыя перадавікі, які ўключыліся першымі ў стаханаўскі рух ці паказвалі самыя лепшыя вынікі працы. Фармальны падыход да разгортвання стаханаўскага руху і адсутнасць дастатковага фінансавання прыводзілі ў некаторых выпадках да абмежаванай матэрыяльнай падтрымкі стаханаўцаў або немагчымасці стварыць ім самыя неабходныя ўмовы жыцця. Прыклад арганізацыі вольнага часу стаханаўцаў БССР паказвае, што гэтая сфера штодзённага жыцця таксама з’яўлялася важным фактарам разгортвання стаханаўскага руху:

Витебский государственный технологический университет

ад якасці адпачынку як складаючай часткі вольнага часу залежыў працэс узнаўлення фізічных сіл перадавікоў для далейшага ўдасканалення працы. Таму стаханаўцам вылучаліся пазачарговыя і бясплатныя пуцёўкі на курорты і ў санаторыі, ствараліся самыя спрыяльныя ўмовы адпачынку на працягу працоўнага тыдня, чым падкрэсліваўся і высокі сацыяльны статус “знатных людзей”. Для зацвярджэння адзначанага статусу, а таксама духоўна-эстэтычнага развіцця стаханацаў як лепшых працоўных дзяржава ў рамках арганізацыі вольнага часу актывізавала меры па павышэнні ўзроўню яго баўлення: перадавікам забяспечваўся бясплатны прыярытэтны доступ у культурныя ўстановы, наладжваліся спецыяльныя мерапрыемствы, у Мінску быў адчынены асобны ўніверсітэт выхаднога дня, што забяспечваў якаснымі паслугамі ў сферы вольнага часу самых лепшых сталічных стаханаўцаў. У працэсе арганізацыі вольнага часу стаханаўцаў ствараліся ўзорныя формы яго баўлення ў выглядзе уцягнення перадавікоў у працу гурткоў і спартыўна-масавыя мерапрыемствы, праз правядзенне стаханаўскіх вечароў і стаханаўскіх выхадных дзён, што ўвабралі ў сябе абавязковыя для кожнага чалавека мадэлі паводзін у пазапрацоўны час. Тым не менш і ў сферы баўлення вольнага часу сярод стаханаўцаў назіралася пэўнае размежаванне, дзе самыя лепшыя паслугі атрымлівалі так званыя “маякі” стаханаўскага руху. У цэлым спецыфіка матэрыяльна-бытавога забеспячэння стаханаўцаў паказвае, што на іх прыкладзе дзяржава зрабіла спробу стварыць ідэальную мадэль штодзённасці, паводле якой меркавалася ў савецкіх умовах не толькі сфарміраваць чалавека з выдатнымі вытворчыя навыкамі і грамадскімі якасцямі, але і забяспечыць на высокім узроўні яго ўмовы жыцця выключна па выніках працоўнай дзейнасці, выпрацаваць у яго імкненне да актыўнага ўдзелу ў культурным жыцці і засваенні новых ведаў.

Витебский государственный технологический университет

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Праведзенае даследаванне дазваляе зрабіць наступныя высновы:

1. Стаханаўскі рух стаў асновай для карэнных зменаў у арганізацыі вытворчага працэсу, што адзначыўся рэкордным перавыкананнем норм і высокім уздымам працоўнага энтузіязму. У першыя месяцы разгортванне стаханаўскага руху праходзіла па ініцыятыве мясцовых партыйных, камсамольскіх і дзяржаўных органаў. Пачынаючы з канца 1935 г., саюзнае і рэспубліканскае кіраўніцтва ўзяло дадзены працэс пад свой кантроль і выкарыстала стаханаўскі рух для чарговага эканамічнага рыўка, у сувязі з чым, арыентуючыся на дасягненні стаханаўцаў, былі павялічаны нормы выпрацоўкі і планы выпуску прадукцыі. На аснове гэтага ставілася задача перавесці ўсю прамысловасць і сельскую гаспадарку на стаханаўскія метады працы. На практыцы такая задача сутыкнулася з шэрагам цяжкасцяў, звязаных з непадрыхтаванасцю часткі прадпрыемстваў і гаспадарак да інтэнсіўных тэмпаў вытворчасці, што прыводзіла да вытворчых збояў, паломак абсталявання, пагаршэння якасці прадукцыі. Разгортванне стаханаўскага руху на гэтым фоне суправаджалася такімі з’явамі, як “штурмаўчшына” і “кампанейшчына”, што адзначаліся несістэматычным выкарыстаннем стаханаўскіх метадаў працы і прымяненнем іх пераважна для вырашэння праблем па невыкананні планаў. У некаторых выпадках назіралася змяншэнне колькасці стаханаўцаў або дынаміка іх ліку насіла скачкападобны характар. Пералічаныя вышэй тэндэнцыі захоўваліся на працягу ўсёй другой пяцігодкі, што не дазволіла ажыццявіць намечаных планаў па развіцці сацыялістычнага спаборніцтва. У той жа час дзе за кошт энтузіязму працоўных, дзе за кошт адміністрацыйных мер стаханаўскі рух стаў масавай з’явай, і ў яго ўключылася на некаторых прадпрыемствах большая частка працоўных. Падчас трэцяй пяцігодкі стаханаўскі рух набыў новыя формы ў выглядзе шматстаночнага абслугоўвання і сумяшчэння прафесій, за кошт чаго назіраўся рост працэнта яго ўдзельнікаў. Аднак пры гэтым негатыўныя з’явы пры разгортванні руху працягвалі мець месца ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы, што часта было абумоўлена фармалізмам гаспадарнікаў у арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва і ва ўліку колькасці перадавікоў. У цэлым жа можна лічыць, што дзякуючы прымяненню стаханаўскіх метадаў, удалося павысіць прадукцыйнасць вытворчасці і павялічыць аб’ёмы выпуску прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі, замацаваць новыя спосабы эфектыўнага пераразмеркавання працоўнай сілы.

2. Разгортванне стаханаўскага руху ў БССР было адзначана не толькі зменамі ў эканоміцы, што праявіліся ў павышэнні прадукцыйнасці працы ў галінах прамысловасці і сельскай гаспадаркі,

Витебский государственный технологический университет

